АРХІВАРЫУС

Выпуск 2

Мінск
2004

КАМІТЭТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
ПРЫ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ
ДАКУМЕНТАЗНАЎСТВА І АРХІЎНАЙ СПРАВЫ

Серыя: гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства

АРХІВАРЫУС

Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў

Выходзіць з 2001 года

Выпуск 2

Мінск
2004
БелНДІДАС

Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі
БІБЛІЯТЭКА
25800

УДК 930.25(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)
А 87

Серыя заснавана ў 1998 годзе

Рэцэнзенты: доктар гістарычных навук Г. Я. Галенчанка,
доктар гістарычных навук З. В. Шыбека

Рэдкалегія: А. К. Галубовіч (старшыня), С. А. Рыбчонак (адказны сакратар), У. І. Адамушка, А. Ф. Аляксандрава, У. М. Дзянісаў, У. В. Фядосаў

Рэкамендавана Навуковай радай
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 2 / Рэдкал.: А. К. Галубовіч (старш.) і інш. — Мн.: БелНДІДАС, 2004. — 197 с. — (Серыя: гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства).

А 87

ISBN 985-6733-06-05

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны другі выпуск «Архіварыуса», які асвятляе шырокае кола пытанняў гісторыі, крыніцазнаўства, археаграфіі, спецыяльных гістарычных дысцыплін.

Прызначаецца гісторыкам, архівістам, краязнаўцам, усім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

УДК 930.25(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN 985-6733-06-05

© НГАБ, 2004

УСТУП

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі прадстаўляе чытачам чарговы выпуск «Архіварыуса». Гэты зборнік, як і папярэдні, складзены па дакументах і матэрыялах XVI — пачатку XX ст. Структура зборніка складальнікамі ў асноўным захавана.

Мы працягваем знаёміць чытача з гісторыяй самога архіва, архівістамі-навукоўцамі, якія захоўвалі і захоўваюць наша нацыянальнае гістарычнае багацце — памяць і не даюць ёй зысці ў нябыт. Магчыма, у наступных зборніках з'явіцца дадатковы раздзел, прысвечаны пэўным асобам, выдатнейшым архівістам, лёс якіх звязаны з айчыннымі архівамі.

Пяць раздзелаў папярэдняга зборніка пашырыліся яшчэ адным: «Крытыка і бібліяграфія». Складальнікі мяркуюць, што ён дасць змястоўную і карысную інфармацыю аб універсальных гістарычных выданнях пра Беларусь, якія выходзяць не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Чытач зможа пазнаёміцца з новым праектам Аддзела спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі НАНБ «Metriciana» і з высокапрафесійнымі разважаннямі і высновамі У. М. Свяжынскага пра выданне «Радзівіліяды» ў Вільні і іншымі матэрыяламі.

Гісторыя — гэта заўсёды факты, а ў нашым выпадку аўтары прыводзяць не толькі проста факты, а дакументы, першакрыніцы. Які артыкул не вазьмі з раздзелаў: «Гісторыя» ці «Публікацыя архіўных дакументаў», абавязкова знойдзеш новыя, яшчэ не друкаваныя звесткі, а звесткі пра С. Слуцкую і П. Багрыма В. Бабковай, І. Гашкевіча І. Вернер ці М. Шагала У. Дзянісава — гэта проста адкрыцці, але ні адно адкрыццё ніколі не ставіць кропку пасля сябе, усе яны маюць працяг. Здаецца, пра княгіню і беларускую святую С. Слуцкую сказана і напісана шмат, а вось В. Бабкова пасля новай знаходкі ў біяграфіі княгіні дала навукоўцам роздум над загадкай аб працягласці яе зямнога жыцця. Колькі ж яна пражыла — 25 гадоў, а ці то 27? Цікава, што абедзве лічбы засведчаны рукапісамі. Падобныя пытанні дзесяткі гадоў даследуюцца і дыскусіруюцца навукоўцамі, і толькі новыя архіўныя знаходкі могуць даць адказ. Сведчанне гэтаму — артыкул Зм. Яцкевіча «Радавод Адама Ганорыя Кіркора ў святле новых архіўных дакументаў». Наступныя ж выданні могуць здацца недасведчанаму ва ўсіх нюансах крыніцазнаўства чытачу яўнымі памыл-

камі. Напрыклад, чаму ў адным і тым жа дакуменце адно і тое ж прозвішча ці то геаграфічная назва маюць розныя варыянты напісання: Сегал— Сагал— Шагал у артыкуле У. Дзянісава «Новыя дакументы да біяграфіі і радаводу Марка Шагала». Тут проста патрэбна ведаць, што такое напісанне характэрна для складальнікаў дакументаў таго перыяду. А рознае ўжыванне назвы Менск і Мінск у артыкуле Г. Брэгера «З гісторыі маёнтка Дамашкавічы» аўтар зрабіў свядома. Ён ужыў напісанне назвы згодна з часам яго змянення.

Бясспрэчна, што без глыбокага ведання крыніцазнаўства не абысціся пры працы з архіўнымі дакументамі. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляюцца артыкулы Р. С. Жаўняркевіча, А. А. Лашкевіча, У. М. Свяжынскага з адпаведнага раздзела.

Вельмі добра, калі паралельна з дакументамі айчынных архіваў будуць ісці расповеды і пра замежныя архівы і захаванні там матэрыялаў, якія тычацца нашай гісторыі. Мы будзем толькі ўдзячны аўтарам, якія папоўняць раздзел «Архівазнаўства» сваімі даследаваннямі з замежных архіваў, як гэта зрабіў на старонках зборніка А. Дзярновіч.

Чарговае выданне «Архіварыуса» — гэта свайго роду візітная картка архіва, якая адлюстроўвае багацце і унікальнасць змешчаных у ім матэрыялаў, над якімі яшчэ патрэбна будзе папрацаваць. Гэта магчымасць сказаць важкае слова аб гісторыі свайго народа, Айчыны, нацыянальнай свядомасці, аб тым, чаго мы варты ў сусвеце.

А. К. Голубович

Национальному историческому архиву Беларуси — 65 лет

Много это или мало, можно судить по хранящимся в нем документам — величайшей кладези «исторической памяти» Беларуси за XIV — начало XX в. На его полках находится 1,5 млн. дел протяженностью более 12 км.

История архива — это еще и память о белорусских архивистах, сотрудниках Витебского и Виленского архивов древних актов А. М. Сазонове, М. Л. Веревкине, А. П. Сапунове, Д. И. Довгялло и др., трудами которых и сегодня пользуются историки и архивисты.

Помнит архив и Д. Ф. Жилуновича (Тишку Гартного), В. И. Пичету, М. В. Мелешко и других подвижников, в трудных условиях 20—30-х годов сумевших собрать и сохранить комплексы архивных фондов.

1938 г. — Могилевский исторический архив реорганизован в Центральный государственный исторический архив. Первым директором архива стал Э. М. Баренбаум. Именно под его руководством были заложены основные принципы работы архива. К 1941 г. в архиве числилось 1560 фондов объемом более 382 тыс. дел.

Великая Отечественная война нанесла огромный ущерб документам и научно-справочному аппарату. Имущество архива было уничтожено и разграблено.

Понимание задач, стоящих перед архивом, позволило его директорам С. А. Юрченко, К. П. Петрову, Д. Ф. Яськовой, П. Е. Мурашко и М. Ф. Шпакову с 1944 по 1963 г. организовать работу по реэвакуации и учету документов своего профиля, упорядочению возвращенных фондов и их использованию.

Мы с благодарностью вспоминаем наших коллег Могилевского исторического архива Г. А. Ахрамовича, О. П. Тюрину, Л. Н. Яновскую и др., которым в 40 — начале 50-х годов, в самый тяжелый период в истории архива, пришлось восстанавливать заново его работу.

Обеспечение сохранности документов, создание научно-справочного аппарата и организация использования документов архива были основной задачей архива в 50—60-х годах.

1963 г. — в соответствии с постановлением Совета Министров БССР от 11 ноября 1963 г. «О мерах по улучшению архивного дела в БССР» ЦГИА БССР переведен из Могилева в Минск, где ему были переданы до-

кументы дореволюционных фондов из Государственного архива Минской области, а также комплекс древних актов из ЦГИА БССР в г. Гродно.

Перевод архива в Минск позволил объединить документальные исторические материалы почти за 600-летний период.

Возглавил архив И. В. Рощин, позже Ю. А. Капица, Н. И. Стихарев, Н. К. Лещенко, П. М. Судзиловский. Именно в 60—80-х годах была проведена работа по уточнению истории фондообразователей по комплексам документов, объединенных в ЦГИА, созданию научно-справочного аппарата, каталога архива (из тематических карточек Могилевского исторического архива, Минского областного по дореволюционным фондам и тематическим карточкам вновь созданного архива), подготовке ряда обзоров по фондам архива и т. д.

В организации использования документов были продолжены традиции, заложенные белорусскими архивистами прошлых лет. Это публикации статей и информаций в периодической печати, участие в теле- и радиопередачах, в конференциях.

Сотрудники архива совместно с Институтом истории АН БССР готовили к изданию сборники документов: «Восстание в Литве и Белоруссии (1863—1864 гг.)». «Белоруссия в эпоху феодализма», т. 1—4, «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв. Владение Сморгонь. Владение Тимковичи», «Белоруссия в эпоху капитализма», т. 1, «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии, конец XIV в. — 1648 г.», т. 1 и др.

Это годы тесных контактов архивистов с научно-исследовательскими учреждениями.

В этот период в архиве трудилась славная плеяда неутомимых историков-архивистов: В. П. Миронов, Т. Е. Леонтьева, Э. Л. Козловская, Т. А. Воробьева, Е. Л. Бравер, Н. К. Булыга, Н. Л. Рябцевич, Б. З. Пригожина, Н. И. Сергунина, Ю. С. Сидельникова и др.

С 1992 г. по июнь 1995 г. архив входил в состав Национального архива Республики Беларусь. Директором был Е. И. Барановский.

С 1995 г. — Национальный исторический архив Беларуси, директор А. К. Голубович.

Согласно Закону «О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь» архив осуществляет хранение документов общенационального значения и относится к научно-исследовательским учреждениям.

В своей работе сотрудники архива главное внимание уделяют обеспечению сохранности документов. Здесь работают и над созданием автоматизированной информационно-поисковой системы (опись, ка-

талог, указатели, базы данных), которая позволит повысить интенсивность использования информационных ресурсов и сделает их доступными.

Национальный исторический архив Беларуси использует многообразные формы для знакомства с богатством своих фондов не только специалистов в той или иной области, но и всех, кому интересно прошлое Беларуси, личные истоки.

Над документами архива работает широкий круг исследователей — историки, археологи, филологи, писатели, кинорежиссеры, художники, музыканты, архитекторы, краеведы и т. д. Оказываемые архивом услуги носят в основном бесплатный характер. На договорной основе ведется лишь исполнение запросов тематического и генеалогического характера, копирование документов.

НИАБ — участник международных и республиканских научных конференций, семинаров.

Имя НИАБ известно благодаря публикациям сборников документов, выставкам, радио- и телевизионным передачам, а также проводимой архивом работе по воссоединению разрушенных историческими катаклизмами XX в. семейных и родственных связей.

В эти годы (1996—2002) были подготовлены и изданы сборники документов: «Беларусь у актавых кнігах XVI—XVIII стст.», вып. 1 «Магілёўскі магістрат. 1580—1581, 1588 гг.»; «Метрыка Вялікага княства Літоўскага», кн. 44 (1559—1566); «Гербоўнік беларускай шляхты», т. 1. Продолжается работа над другими сборниками.

Немаловажно и то, что архив имеет свой печатный орган «Архивариус», раскрывающий хотя бы частично богатейшие его фонды. Меняются времена, но работа в нем не становится менее привлекательной и романтичной.

История и современность органически включают в себя наследие прошлого. Сотрудники архива Н. Н. Левчик, Л. М. Лисова, Г. Е. Акулович, Г. Н. Кутукова, С. Я. Трацевская, А. Ф. Александрова, С. А. Рыбчонок, И. Л. Новикова, Г. В. Барсукова, Л. Д. Гусакова, О. В. Бобкова и др. — это, прежде всего, люди, обладающие прекрасными знаниями, многие с опытом работы, беспредельно любящие свою профессию, свой архив, специалисты, которые являются примером для молодых сотрудников.

К счастью, ушло в прошлое время, когда об архиве говорили как о чем-то далеком. Сегодня он —хранитель памяти истории, которую должны знать мы и наши потомки.

I. ГІСТОРЫЯ

Г. М. Брэгер

З гісторыі маёнтка Дамашкавічы

Паселішча Дамашкавічы існавала ўжо ў пачатку XV ст. і належала разам з навакольнымі сёламі вялікаму князю літоўскаму Вітаўту Кейстутавічу. 13 студзеня 1407 г.* вялікі князь Вітаўт выдаў віленскаму старосту (пазней — ваяводзе) Войцеху Манівіду** прывілей, пісаны на лацінскай мове, на валоданне шэрагам велікакняжацкіх валасцей, адна з якіх уключала палову вёскі Мсціж з паселішчамі Дзядзелавічы, Дамашкавічы, Кашылавічы і Гасцілавічы[1]. Першай датай згадкі Дамашкавічаў у дакументах можна лічыць 1407 г. Віленскі ваявода Войцех Манівід ад першага шлюбу з княжной Уллянай, дачкой смаленскага князя Святаслава Іванавіча, пакінуў адзінага сына Івашку Манівідавіча. Ён памёр у канцы 1422 г. і быў пахаваны ў Віленскім катэдральным касцёле ва ўласнай так званай Манівідаўскай капліцы, якую заснаваў незадоўга да смерці. Івашка Манівідавіч аддзедзічыў бацькоўскія маёнткі, займаў высокія пасады — падольскага і крамянецкага старосты (з 1437 г.), троцкага (з 1443 г.) і віленскага (1458) ваяводы. Незадоўга да смерці, 1 верасня 1458 г., ён напісаў тэстамент, якім завяшчаў свае асноўныя маёнткі сынам Яну і Войцеху Манівідавічам навечна, а некаторую частку маёнткаў жонцы Ганне ў пажыццёвае трыманне[2]. Па смерці Ганны гэтыя маёнткі атрымалі яе сыны. У дакуменце не згадваюцца Дамашкавічы і некаторыя іншыя паселішчы, што дае падставу меркаваць аб тым, што ў тэстаменце Івашка Манівідавіч пазначыў толькі цэнтры буйных маёнткаў і валасцей без дэталізацыі (гэта звычайная рэч, бо тэстаменту папярэднічалі дароўныя запісы, дзе маёнткі апісваліся больш падрабязна). Сярод маёнткаў, пацверджаных жонцы Ганне, маюцца «Кореки» (Харэцкая воласць), якія найбліжэй да Дамашкавічаў, Мсціжа і інш. Можна меркаваць, што гэтай назвай пазначана ў тэстаменце ўсё навакольле, дэталізаванае ў прывілеі 1407 г., у прыватнасці і Дамашкавічы.

---

* З 1583 да 1797 г. — усе даты (акрамя агавораных) па грыгарыянскаму стылю, астатнія — па юліянскаму.

** Яго ўласнае імя Манівід Кайлікінавіч, які пры хросце атрымаў імя Войцех (Альберт — па лаціне).

Пазней адзіным трымальнікам манівідаўскіх маёнткаў згадваецца толькі Войцех Івашкавіч Манівідавіч, віленскі кашталян (яго брат Ян хутка памёр). Ён не меў дзяцей, таму пасля яго смерці ў 1475 г. частка яго маёнткаў адышла да вялікага князя літоўскага і караля польскага Казіміра, а астатнія падзялілі сёстры нябожчыка Ядзвіга, жонка Алехны Судзімонтавіча, і Соф'я, жонка Мікалая Радзівілавіча (Радзівіла), віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ (з 1492 г.). Мяркуючы па пазнейшых дакументах, Дамашкавічы і іншыя навакольныя сёлы атрымала Соф'я Манівідаўна, якая ўнесла іх у дом Радзівілаў.

Па смерці Мікалая Радзівілавіча ў 1509 г. яго чацвёра сыноў здзейснілі некалькі падзелаў бацькоўскіх і матчыных маёнткаў. Канчатковы падзел адбыўся 6 лютага 1520 г. па смерці аднаго з братоў, віленскага біскупа Альбрыхта Радзівіла, паміж Мікалаем, віленскім ваяводам і канцлерам ВКЛ (з 1510 г.), Янам, вялікім маршалкам ВКЛ, і Юрыем, гарадзенскім старостам, Радзівіламі[3]. На жаль, Дамашкавічы ў гэтым дзельчым дакументе не згадваюцца, але вышэй названую Харэцкую волась браты падзялілі між сабой на роўныя часткі. Мяркуецца, што перад тым яе трымаў нябожчык Альбрыхт Радзівіл, якому пэўныя запісы зрабіў яшчэ пры жыцці бацька Мікалай Радзівілавіч[4]. Верагодней усяго Дамашкавічы трапілі старэйшаму брату Мікалаю Мікалаевічу Радзівілу. Ён памёр на рубяжы 1521 і 1522 гг. Яго маёнткі атрымалі ўдава Альжбета Багданаўна Саковічаўна і сыны Ян Мікалай, жамойцкі староста, Станіслаў і Мікалай, жамойцкі біскуп. Пасля пэўных судовых спрэчак і некалькіх прызначэнняў тэрмінаў падзелу маёнткаў яны нарэшце завяршылі раздзел, занатаваўшы яго на дакуменце[5]. Гэты дакумент не датаваны, але польскія даследчыкі мяркуюць, што падзел мог адбыцца 25 снежня 1526 г. (на Божае Нараджэнне), у тэрмін апошняга прызначэння падзелу каралём Жыгімонтам I[6].

Паводле дзельчага дакумента ўсе маёнткі былі размеркаваны на чатыры часткі. На трэцюю частку прыйшліся маёнткі Муснікі, Міткаўскі дварэц, Жырклішкі, Андрэеўскі, двор Паляны, двор Зебіна (Зембін) з двума сёламі Дамашкавічы і Мыціжане (Мсціж) і зямля Айнароўская. Да гэтай часткі належала сялян 324 чалавекі (сямействы). Сёлы Дамашкавічы і Мсціж насялялі так званыя «даннікі» — сяляне, якія выплачвалі падатак пану натуральнай данінай, у дадзеным выпадку мёдам. З гэтых сёлаў сяляне давалі 34 пуды і 2 бязмены мёду ў год[7].

У дакуменце не пазначана, каму якая частка дасталася, таму можна высоўваць толькі пэўныя меркаванні. Малодшыя браты хутка памерлі, не пакінуўшы дзяцей: Станіслаў каля 1531 г., а Мікалай у 1528 г. Іх ча-

сткі дасталіся старэйшаму брату жамойцкаму старосце, падчашаму ВКЛ Яну Радзівілу. Апошні памёр у 1542 г. Маці Альжбета Саковічаўна перажыла сыноў і памерла паміж 1542 і 1544 гг. Толькі пасля смерці, 17 сакавіка 1544 г., яе ўнучкі, дочкі нябожчыка Яна Радзівіла, Ганна, Петранэля і Альжбета Радзівілаўны разам з маці, падляшскай кашталянкай Ганнай Янушаўнай Кастэвічаўнай, падзялілі сваю спадчыну. Малодшай сястры Альжбеце, тады яшчэ незамужняй, паміж іншымі маёнткамі дастаўся двор Зебіна з 99 з паловай службаў людзей[8]. У той час Альжбетай апекаваўся навагародскі ваявода Грыгорый Грыгор'евіч* Осцік. Хутка маці трох сясцёр памерла, і яны ў Вільні ў 1545 г. незадоўга да дня св. Дароты, які прыходзіцца на 6 лютага, здзейснілі дадатковы падзел маёнткаў, склаўшы дзельчы ліст[9]. У дакуменце больш падрабязна апісваюцца паселішчы, якія прыпалі на кожную з сясцёр. Альжбеце між іншымі маёнткамі дасталіся двор і места (горад) Зембін з сёламі Мезузане (Мсціж), Замошша, Хмялевічы, Дамашкаўцы і Будзінічы. Цяпер апекунамі незамужняй Альжбеты былі земскі маршалак ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны, падчашы ВКЛ Мікалай Юр'евіч Радзівіл Руды і крайчы ВКЛ Ян Янавіч Радзівіл.

Неўзабаве Альжбета Радзівілаўна выйшла замуж за бэлзскага ваяводзіча Ераніма (Яраша) Сіняўскага (Сяняўскага). У студзені 1553 г. Альжбета сваім лістом запісала мужу трэцюю частку належачых ёй маёнткаў, сярод якіх і двор Зебіна, з умовай атрымання іх па смерці мужа дзецьмі, а калі дзяцей у іх не будзе, то Е. Сіняўскі меў права вечнасці на маёнткі. Астатнія дзве часткі маёнткаў яна запісала мужу ў суме 4000 коп грошаў; за гэтыя грошы маёнткі мелі выкупіць у яго дзеці, а ў адсутнасці патомства — іншыя яе сваякі. Дароўны ліст быў пацверджаны каралём[10].

Вельмі мала захавалася дакументаў сярэдзіны XVI ст., якія датычаць канкрэтных здарэнняў у вёсках. Нам пашчасціла адшукаць такі дакумент, датычны вёскі Дамашкавічы. Такім чынам, 21 верасня 1551 г. у суд ураднікаў віленскага ваяводы звярнуўся Юрый Крыжаноўскі, зембінскі ўраднік бэлзскага ваяводзіча Е. Сіняўскага, са скаргай на княгіню Сямёнавую Багданавіча Адынцэвіча Настассю Сангушкаўну. Справа ў тым, што ў нейкай звадзе падданы яе маёнтка Нястанавічы Аляксей Амяльянавіч забіў з вёскі Дамашкавічы селяніна (маёнтак Зембін) Івана Кузьміча Папка. Справа была вырашана на карысць скаржніка[11].

Альжбета Радзівілаўна памерла недзе да пачатку 1562 г., не пакінуўшы дзяцей. Паводле яе запісу, маёнткі ўзяў у трыманне муж, ка-

* Так у дакуменце.

мянецкі падкаморы, галіцкі і каламыйскі староста Еранім Мікалаевіч Сіняўскі. Так як дзяцей у іх не было, права ўласнасці на маёнткі аспрэчвалі сёстры нябожчыцы Ганна Радзівілаўна, жонка віцебскага ваяводы Станіслава Пятровіча Кішкі, і Петранэля Радзівілаўна, жонка полацкага ваяводы Станіслава Станіслававіча Давойны, падаўшы скаргу ў велікакняжацкую канцылярыю. Аднак 26 чэрвеня 1563 г. кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст адклаў разгляд справы на пазнейшы час з-за пачатку вайны з Маскоўскім княствам[12].

Хутка памерла і Петранэля Радзівілаўна, таксама не пакінуўшы дзяцей. Таму на пачатку 1566 г. у канцылярыю ВКЛ звярнулася са скаргай на Е. Сіняўскага толькі адна Ганна Радзівілаўна Станіслававая Кішчыная. Пад час судовага разбіральніцтва кароль скасаваў запіс нябожчыцы Е. Сіняўскаму як супярэчны Статуту ВКЛ і 15 лютага 1566 г. разам з панамі-радай аб'явіў вырак, паводле якога маёнткі Альжбеты, у тым ліку і Зембін з сёламі Дамашкавічы, Мсціж і інш., прысуджаліся навечна Ганне Кішчынай. У сваю чаргу яна мела кампенсаваць Е. Сіняўскаму яго ўнёсак у дом жонкі і іншыя выдаткі[13]. У 1567 г., паводле Попіса войска ВКЛ, Ганна Кішчына выстаўляла на вайну з маёнтка Зембін шэсць з паловай коней[14], што адпавядала прыкладна 65 службам сялян.

Муж Ганны Радзівілаўны віцебскі ваявода С. П. Кішка памёр яшчэ ў 1554 г., таму яна трымала ўсе маёнткі, як уласныя, так і мужнія. Дачакаўшыся паўналецця сваіх сыноў Яна і Станіслава Кішкаў і замужжа дачкі Ганны Кішчанкі Крыштафавай Зяновічавай, маці 22 чэрвеня 1574 г. здзейсніла падзел уласных маёнткаў[15]. У гэты час маёнтак Зембін і некаторыя іншыя былі ў застаўным трыманні розных асоб, на жаль, пакуль не ўдалося высветліць якіх. Гэтыя маёнткі мелася выкупіць у будучым з заставы і асобна падзяліць пароўну.

Ёсць ускосныя дадзеныя, што маёнтак Зембін трымаў у заставе у суме 2200 коп грошаў смаленскі кашталян Астафій Тышкевіч, самы малодшы сын падляшскага ваяводы Васіля Тышкевіча. А. Тышкевіч памёр недзе ў 1570-я гг. бяздзетна, таму права заставы перайшло спадчынай яго роднай сястры Аляксандры Тышкевічаўне. Аляксандра спачатку была замужам за гарадзенскім і магілёўскім старостам Аляксандрам Грыгор'евічам Хадкевічам (памёр у 1570-я гг.), потым за крайчым ВКЛ, валадзімерскім старостам князем Канстанцінам Канстанцінавічам Астрожскім (памёр у 1588 г.). Пасля смерці мужа на выкуп яго маёнткаў у Валынскім ваяводстве і на іншыя патрэбы яна шмат грошаў пазычала ў свайго служэбніка Юрыя Быстрама. Каб яму аддзячыць, Аляксандра Тышкевічаўна здзейсніла для яго 20 кастрычніка 1590 г. дароўна-пра-

дажны запіс на шмат якія свае маёнткі, у тым ліку падаравала яму застаўную суму 2200 коп грошаў на маёнтку Зембін[16]. Ю. Быстрам некаторы час трымаў Зембін у сваёй пасэсіі (у 1590—1591 гг.), бо маюцца звесткі, што ён не дапускаў у 1591 г. падачы маёнтка, паводле дэкрэта Галоўнага Трыбунала ВКЛ, троцкаму кашталяну князю Аляксандру Пронскаму за даўгі Аляксандры Тышкевічаўны, якая ў той час ужо трэці раз была замужам за снятынскім і сакальскім старостам Мікалаем Язлавецкім. За гэтыя дзеянні ў 1593 г. кароль Жыгімонт III вынес на А. Тышкевічаўну і Ю. Быстрама баніцыю (пазбаўленне права ўласнасці на маёмасць да вырашэння справы)[17]. Памерла А. Тышкевічаўна ў 1597 г.

У хуткім часе адзіны сын віцебскай ваяводзінай Ганны Радзівілаўны Станіслававай Кішчынай і адзіны яе спадкаемца Станіслаў Станіслававіч Кішка (яго брат Ян Кішка памёр у 1591 г.) выкупіў з заставы ў нашчадкаў А. Тышкевічаўны маёнтак Зембін, так як у дакументах уласнікам Зембіна ён ужо згадваецца з 1598 г.[18] С. С. Кішка быў вядомым рэлігійным дзеячам. З 1608 г. абраны віленскім канонікам, у 1615—1618 гг. — духоўным рэферэндарам ВКЛ, а ў 1618 г. папай рымскім прызначаны жамойцкім біскупам. Памёр С. С. Кішка ў 1626 г.

На пачатку XVII ст. С. С. Кішка, аддзяліўшы ад свайго маёнтка Зембін сяло Дамашкавічы, аставіў яго свайму суседу, уласніку маёнтка Дзядзілавічы, Яну Трызне. Справа ў тым, што Дамашкавічы аддзяляліся ад Зембіна землямі маёнтка Дзядзілавічы, што было нязручна для С. С. Кішкі. Пазней (пасля 1612 г.), па смерці Я. Трызны, С. С. Кішка пазычыў у яго ўдавы Ягнешкі Казімераўны і яго сыноў Аляксандра і Адама Трызнаў яшчэ пэўную суму грошаў і пацвердзіў ім застаўнае трыманне сяла Дамашкавічы. Відаць, маці братоў Трызнаў хутка памерла, бо ў самым канцы снежня 1613 г. віленскі схаластык, сакратар ЯКМ* кс. Станіслаў Кішка прадаў, не выкупляючы з заставы, згаданае сяло Дамашкавічы братам Аляксандру і Адаму Трызнам за 4000 коп грошаў. Пра гэта вядома з дакумента пільнасці ад 9 студзеня 1614 г. братоў Трызнаў разам з возным Менскага ваяводства ў канцылярыі Менскага земскага суда, дзе павінен быў з'явіцца С. С. Кішка і прызнаць у актавых кнігах свой прадажны ліст. Аднак Кішка ў той дзень на прызнанне ліста не з'явіўся, аб чым Трызны атрымалі згаданы дакумент пільнасці[19]. Відаць, крыху пазней С. С. Кішка актыкаваў у кнігах Менскага земскага суда свой прадажны ліст, бо з тых часоў сяло Дамашкавічы належала да маёнтка Дзядзілавічы Трызнаў.

---

* Яго каралеўская міласць.

Браты Трызны падзялілі бацькоўскія маёнткі. Дзядзілавічы трымаў Аляксандр Трызна, будучы лідскі падкаморы. Перад смерцю ў 1633 г. ён напісаў тэстамент, якім, між іншым, запісаў свае маёнткі Голдава Лідскага павета і Дзядзілавічы Менскага ваяводства жонцы Крыстыне Давідаўне Швайкоўскай у пажыццёвае трыманне. Так як дзяцей у іх не было, маёнткі ўдавы мелі права выкупіць сваякі нябожчыка. Хутка па смерці мужа Крыстына Швайкоўская выйшла замуж паўторна за берасцейскага ваяводзіча Антонія Яна Тышкевіча і 9 мая 1634 г. прадала маёнткі Голдава і Дзядзілавічы за 40 000 злотых брату першага мужа Адаму Трызне і яго жонцы Гальшцы Друцкай-Горскай. Афіцыйна А. Трызна ўступіў у права ўласнасці маёнткамі 28 лютага 1635 г.[20]

У 1637 г. на ўласніка маёнтка Дзядзілавічы Адама Трызну скардзіўся харужы ВКЛ Мікалай Сапега аб захопах земляў яго маёнтка Мсціж[21]. Калі А. Трызна памёр — не вядома, але ўжо ў 1650-я гг. маёнткам валодаў яго сын Казімір Крыштаф Трызна.

28 красавіка 1658 г. уласнік маёнтка Дзядзілавічы Казімір Крыштаф Трызна склаў інвентар свайго іншага маёнтка Дамашкавічы Менскага ваяводства пры аддачы яго ў заставу за пазычаныя грошы Аляксандру Прычэўскаму[22]. З гэтага дакумента вынікае, што пры сяле Дамашкавічы панамі Трызнамі быў збудаваны панскі двор (фальварак), да якога належалі сяляне Дамашкавічаў і іншых навакольных вёсак. Гэты фальварак аддаваўся ў застаўнае карыстанне розным асобам, а самі ўласнікі жылі ў сваёй галоўнай рэзідэнцыі — у маёнтку Дзядзілавічы. На жаль, у інвентары не захаваўся аркуш з апісаннем будынкаў двара (толькі ёсць пачатак са слоў «будаванне дворнае...»). Дарэчы, гэта быў новы двор, пабудаваны на іншым месцы, бо ў інвентары апісваюцца сенажаці «пад дваром былым». У склад маёнтка ўваходзілі сёлы Езяраны, або Дамашкавічы з засценкам Задзедзені, Васількаўка, Верацеі і Зарэчча, або Шыліна Слабада. Згадваецца царква, якая хутчэй за ўсё знаходзілася ў сяле Дамашкавічы. Верагодна, у той час яна была прыходскай. Пры апісанні дворных палеткаў упамінаецца возера Дамашкаўскае. У сяле Езяраны, або Дамашкавічы, было 13 валок зямлі; яе апрацоўвалі двое баяраў і 22 служэбныя чалавекі (сяляне-гаспадары). Сярод гэтых валок была адна генеральская (якую трымаў генерал, або возны), а таксама папоўскія ўчасткі зямлі (што гаворыць пра існаванне прыходскай царквы). Сяляне з адной валокі зямлі адбывалі пэўныя павіннасці двару штогод: паншчыну (праца на панскіх палетках) 4 дні ў тыдзень, чыншу (грашовы падатак) давалі 2 капы грошаў, дзякла (натуральны падатак) па бочцы жыта і аўса, 4 гарнцы мёду, адзін пуд пянькі, 4 курыцы, 20 яек, дзесятак

ільну; таксама павінны былі даваць па падводзе да Вільні, вартаваць пачаргова панскі двор, жанчыны прасці панскі лён і інш.

У канцы 1660-х — пачатку 1670-х гг. К. К. Трызна развёўся са сваёй жонкай Ганнай Лотскай, стаўшы манахам Базыльянскага ордэна пад імем Клеменс. Айцец Клеменс Трызна 28 сакавіка 1674 г. пацвердзіў старыя фундушы царкве Пакрова св. Багародзіцы ў сваім маёнтку Дзядзілавічы[23]. У дакуменце апісаны вёскі, якія ўваходзілі ў парафію Дзядзілавіцкай царквы, сярод іх няма Дамашкавічаў, што гаворыць аб існаванні яшчэ ў той час парафіяльнай царквы ў сяле Дамашкавічы. У хуткім часе К. Трызна ўзначаліў Віленскі Свята-Духаўскі базыльянскі кляштар. Паміж 1674 і 1678 гг. Клеменс Трызна прадаў менскаму земскаму пісару Тэадору Валадковічу і яго жонцы Рэгіне Кастравіцкай маёнтак Дзядзілавічы. Яшчэ раней, у 1669 г., Валадковічы набылі ў бельскага падкаморыя Юзафа Карпа і яго жонкі Гальшкі Сапяжанкі суседні маёнтак Мсціж. Недзе да 1688 г. (год смерці Т. Валадковіча) Валадковічы, выдаючы замуж сваю дачку Петранэлю за менскага старосту Яна Міхала Завішу, запісалі ім тыя маёнткі Мсціж і Дзядзілавічы. Па смерці свайго першага мужа Петранэля Валадковічаўна паўторна выйшла замуж за упіцкага маршалка Аляксандра Падбярэскага[24]. Але ў хуткім часе, 9 чэрвеня 1709 г., яны прадалі маёнткі Мсціж, Дзядзілавічы, Дамашкавічы, Замасточча, Вотруб, Гаравіцы і інш. за 19 166 бітых талераў і 4 тынфы ашмянскаму падстолію Міхалу Слізню[25].

Міхал Брунон Слізень быў сынам ашмянскага стольніка, сакратара ЯКМ Аляксандра Казіміра Слізня. Займаў пасады польнага стражніка ВКЛ (1698), ашмянскага падстолія (1708—1715), нарэшце скарбавага пісара ВКЛ (1715—1729). Памёр М. Б. Слізень перад 12 мая 1729 г. З жонкай Евай з Комараў меў сына Юзафа і дачок Людвіку (памерлую ў дзявочым стане) і Ганну Заранкавую[26]. Юзаф Слізень, які адлзедзічыў бацькоўскія маёнткі, быў платэльскім старостам, генерал-ад'ютантам (генерал-маёрам) войска ВКЛ. З жонкай Зузанай Кваснеўскай меў чатырох сыноў — Тадэвуша, Яна, Міхала і Рафала Слізняў[27]. Ю. Слізень памёр каля 1751 г., пакінуўшы малалетніх сыноў. Жонцы ён запісаў 20 000 злотых, забяспечаных на сваіх маёнтках[28].

Зузана Кваснеўская трымала мужнія маёнткі разам з сынамі. З цягам часу старэйшыя сыны Тадэвуш і Ян памерлі. Пасля гэтага яна дазволіла малодшым сынам Міхалу і Рафалу Слізням падзяліць бацькоўскія маёнткі паміж сабой.

Такім чынам, 13 кастрычніка 1778 г. у Мінску браты склалі дзельчы ліст. Смаленскаму стольніку Міхалу Слізню дасталіся маёнтак Мсціж з

фальваркамі ў Менскім ваяводстве і фальварак Княгінін у Ашмянскім павеце. Старадубскаму стольніку, палкоўніку войск ВКЛ Рафалу Слізню — маёнтак Дзядзілавічы з мястэчкам Дзядзілавічы і сёламі Зарэчча, Гарэлае, Кленнікі і Разліцце, фальварак Вотруб з сялом Вотруб, фальварак Дамашкавічы з сёламі Дамашкавічы, Лушчыцы, Васількаўка, Шылы і Верацеі, фальварак Замасточча з сёламі Асавы і Замасточча, з корчмамі, млынамі і возерам Дамашкаўскім. Тэрмін узяцця маёнткаў у пасэсію быў прызначаны на 23 красавіка 1779 г.[29] У той жа дзень браты выдалі маці лісты на забеспячэнне грашовай сумы, запісанай ёй нябожчыкам Юзафам Слізнем. Міхал забяспечыў сваю частку сумы на фальварках Гарэлы Луг і Берзлены, а Рафал — на маёнтку Дзядзілавічы[30]. 13 кастрычніка 1778 г., быў складзены інвентар маёнтка Дзядзілавічы з фальваркамі з апісаннем мяжы маёнтка, дворных земляў і вёсак[31]. Між іншым, у інвентары даецца апісанне фальварка Дамашкавічы з вёскамі[32]. На жаль, апісання панскага двара тут не маецца. У вёсцы Дамашкавічы пражывала 18 сялян-гаспадароў (сямействаў), адна гаспадарка пуставала, была карчма.

Пазней Рафал Слізень быў генерал-ад'ютантам войск ВКЛ, займаў пасады скарбавага пісара ВКЛ (1781), інстыгатара* ВКЛ (з 1782 г.), крэўскага старосты[33]. Рафал Слізень ажаніўся ў 1780 г. на дачцэ свайго траюраднага брата генерал-маёра Стэфана Міхайлавіча Слізня Тэклі (з дзевяткавіцкай** лініі). Тэкля, як адзіная дачка і спадчынніца свайго бацькі, 23 верасня 1780 г. зрабіла зрэчны запіс на свае маёнткі на карысць мужа, пакідаючы сабе пажыццёвае права карыстання. У сваю чаргу Рафал Слізень 27 снежня 1780 г. лістом запісаў жонцы пажыццёвае валоданне сваімі маёнткамі Дзядзілавічы, Замасточча, Дамашкавічы і Вотруб[34]. У мястэчку Дзядзілавічы Р. Слізень пабудаваў каталіцкі касцёл, які быў прызначаны парафіяльным, і 31 мая 1798 г. напісаў для касцёла і яго святара фундушавы ліст на пляцы і землі, а таксама даход з сумы 1400 злотых з маёнтка Дзядзілавічы[35].

Пасля друга падзелу Рэчы Паспалітай Менскі павет разам з Дзядзілавічамі, Дамашкавічамі і інш. увайшоў у склад Расійскай імперыі. У 1795 г. быў утвораны Барысаўскі павет, у складзе якога апынуліся і Дамашкавічы. Рафал Слізень з жонкай Тэкляй са Слізняў меў адзінага сына Стэфана і дачок Зофію, Марыяну і Німфу[36]. Незадоўга да смерці Р. Слі-

---

* Інстыгатар — службовая асоба Задворнага асэсарскага суда ВКЛ, публічны абвінаваўца з боку дзяржавы (вялікага князя літоўскага), абаронца скарбовых інтарэсаў у справах з прыватнымі асобамі (шляхтай).

** Лінія Слізняў, галоўнай рэзідэнцыяй якіх быў маёнтак Дзевяткавічы Слонімскага павета.

зень напісаў тэстамент, паводле якога маёнткі пераходзілі ва ўласнасць сына Стэфана, а дочкам запісваліся грашовыя сумы. 28 мая 1817 г. Рафал Слізень памёр[37] і, хутчэй за ўсе, быў пахаваны ў касцёле маёнтка Дзевяткавічы Слонімскага павета Гродзенскай губерні, сваёй галоўнай рэзідэнцыі, дзе жыў апошнія гады перад смерцю.

Стэфан Слізень, слонімскі харужы, ажаніўся ў пачатку 1815 г. на Канстанцыі з Валовічаў. 3 лютага 1815 г. яго бацька Р. Слізень выдаў дакумент, якім забяспечваў сыну дзедзічнае валоданне маёнткамі з правам спадчыннасці яго дзецям, а нявестцы — пажыццёвае. У сваю чаргу С. Слізень выдаў 16 сакавіка 1815 г. бацьку ліст з умовай, што калі ў яго не будзе дзяцей, то па яго смерці маёнткі павінны атрымаць яго сёстры і дваюрадны брат Юзаф Слізень. Канстанцыя Валовічаўна ўнесла ў дом мужа С. Слізня пасагу на 165 000 руб.[38] Літаральна праз два дні пасля смерці Рафала Слізня, 30 мая 1817 г., возным была здзейснена інтрамісія (афіцыйная падача ў валоданне) мужу і жонцы Стэфану і Канстанцыі Слізням на маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі Дзядзілавічы, Замасточча, Дамашкавічы, Рафалаў і Вотруб і вёскамі паводле запісаў нябожчыка[39]. А 27 чэрвеня 1817 г. была зроблена дадатковая інтрамісія на гэты ж маёнтак на карысць Канстанцыі паводле запісу мужа ад 2 чэрвеня 1817 г. ёй на пажыццёвае валоданне[40]. 1 кастрычніка 1817 г. муж і жонка Слізні выдалі Крыштафу Рыбінскаму (К. Рыбінскі быў аканомам маёнтка Дзядзілавічы з фальваркамі яшчэ пры Рафале Слізні) генеральную пленіпатэнцыю (даверанасць) на кіраванне Дзядзілавічамі і іншымі іх маёнткамі ў розных губернях[41].

У хуткім часе ў Стэфана і Канстанцыі Слізняў нарадзілася двое сыноў. Уладыслаў быў ахрышчаны 28 снежня 1818 г. у Слонімскім парафіяльным касцёле, а Альфрэд — 28 чэрвеня 1819 г. у Палонкаўскай уніяцкай царкве[42]. Але муж і жонка жылі ў разладзе. Стэфан абвінавачваў Канстанцыю ў нявернасці, хлуслівасці і іншых грахах. Ён скасаваў запісы для жонкі на пажыццёвае валоданне маёнткамі, таксама аддаляючы ад спадчыны і дзяцей, якіх не прызнаваў сваімі. Гэтым скарысталіся свае С. Слізня — сёстры і дваюрадны брат Юзаф Слізень, якія завялі ў судовых установах справы аб няслушным трыманні і спусташэнні маёнткаў Канстанцыяй Слізневай[43]. 21 сакавіка 1819 г. у Менскай рымакаталіцкай кансісторыі пачаўся разгляд справы аб разводзе Стэфана і Канстанцыі Слізняў, які завяршыўся 6 красавіка 1821 г. дэкрэтам аб прызнанні сапраўднасці шлюбу і дзяцей, народжаных ад С. Слізня[44].

С. Слізнем была пададзена апеляцыя ў вышэйстаячую інстанцыю. Прысуд Менскай кансісторыі быў прыпынены. На час выра-

шэння справы рэзалюцыяй Слонімскай дваранскай апекі ад 24 мая 1821 г. апекуном малалетніх Уладыслава і Альфрэда Слізняў быў прызначаны сенатар, камергер імператарскага двара, сапраўдны тайны дарадца граф Мікалай Навасільцаў[45].

Стэфан Слізень меў слабае здароўе і хутка памёр (8 красавіка 1824 г). Пахаваны быў на наступны дзень, 9 красавіка, адміністратарам Дзядзілавіцкага касцёла кс. Габрыэлем Жыхоўскім у дварэ Мсціж, маёнтку яго дваюраднага брата Юзафа Слізня, дзе пражываў апошнія гады асобна ад сям'і[46]. Толькі пасля яго смерці дайшла чарга разгляду па апеляцыі справы аб разводзе ў Магілёўскай рыма-каталіцкай кансісторыі, дзе справа слухалася з 18 чэрвеня па 2 ліпеня 1824 г. Магілёўская кансісторыя поўнасцю пацвердзіла вырак Менскай кансісторыі[47]. Маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі заставаўся ў пажыццёвым валоданні Канстанцыі з Валовічаў Слізневай, а яе малалетнія дзеці пад апекай графа М. Навасільцава. Аднак маёнтак быў абцяжараны рознымі даўгамі: казённай нядоімкай з 1822 г., працэнтамі з пазыкі Віленскага універсітэта, няўплатай ануаты Дзядзілавіцкаму касцёлу. Таму на спагнанне гэтых даўгоў маёнтак быў аддадзены пад кіраўніцтва Барысаўскай дваранскай апекі, якая прызначыла адміністратарам маёнтка з 1 мая 1826 г. былога барысаўскага маршалка графа Піуса Тышкевіча[48].

Час ад часу ўвесь маёнтак Дзядзілавічы або яго асобныя фальваркі, у тым ліку і Дамашкавічы, аддаваліся кантрактамі ў арэнднае трыманне розным асобам. Так, галоўны аканом маёнткаў Канстанцыі Слізневай К. Рыбінскі кантрактам ад 4 сакавіка 1821 г. даў у трохгадовую арэнду Караліне з Занеўскіх Краеўскай фальваркі Замасточча і Дамашкавічы з выплатай 2550 руб. штогод. Інтрамісія адбылася 14 красавіка[49]. Праўда, праз год К. Краеўская адмовілася ад Дамашкавічаў, пакінуўшы сабе толькі Замасточча[50]. Акрамя таго, увесь маёнтак Дзядзілавічы ў 1832 г. арандаваў нейкі Івашкевіч, а ў 1833 г. на арэнду фальварка Дамашкавічы быў заключаны кантракт з Альшэўскім[51].

У 1835 г. К. Слізнева прызначыла генеральным аканомам маёнтка Дзядзілавічы з фальваркамі Фердынанда Людвікавіча Бадынскага, які служыў ёй да 1840 г. Аднак уласніца не заплаціла яму ўсіх належных грошаў за службу і не кампенсавала яго выдаткаў. У 1848 г. паводле прашэння Ф. Бадынскага была заведзена справа ў Барысаўскім павятовым судзе, куды ён прадставіў пералік сваіх прэтэнзій. Між іншым, Ф. Бадынскі паведамляў, што пад час кіраўніцтва ён пабудаваў новыя корчмы, у тым ліку і ў вёсцы Дамашкавічы, у фальварку Дамашкавічы і інш., займаўся рамонтам пабудоў. Акрамя таго, з 1838 па 1845 г. ён

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
БІБЛІЯТЭКА
25810

сумесна з Ксаверыем Зубовічам трымаў арэндай фальваркі Дамашкавічы, Вотруб і Замасточча[52].

Канстанцыя Слізнева з сынамі рэдка бывалі ў Дзядзілавічах. Яны пражывалі то ў Вільні, то ў Варшаве, намагаліся з'ехаць у Кракаў[53]. З 1835 г. маці з сынам Альфрэдам Слізнем стала пасялілася ў Санкт-Пецярбургу[54] (несумненна, Альфрэд паступіў у СПб універсітэт). Канстанцыя Слізнева памерла каля 1843 г. Інтрамісія на маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі была здзейснена на карысць Альфрэда Слізня 26 ліпеня 1843 г.[55], а 3 верасня 1843 г. у Барысаўскім павятовым судзе былі складзены «отказной» ліст (ліст на перадачу права ўласнасці) і «отказная» кніга (у якой мелася падрабязнае апісанне маёнтка) для А. Слізня[56]. На жаль, гэтыя дакументы не захаваліся. 30 лістапада 1844 г. А. Слізень падаў прашэнне ў Менскую палату грамадзянскага суда (МПГС) аб выдачы яму пасведчання аб свабоднасці (адсутнасці даўгоў) маёнтка Дзядзілавічы з фальваркамі Вотруб, Замасточча, Дамашкавічы і Рафалаў. Гэта пасведчанне неабходна было для пазыкі грошаў пад заклад маёнтка ў Санкт-Пецярбургскім апякунскім савеце[57]. Пасля праверкі ўсіх спраў па маёнтку ва ўстановах Менскай губерні 30 студзеня 1845 г. МПГС журнальнай пастановай загадала выдаць А. Слізню пасведчанне, якое датавана 5 лютага 1845 г.[58] 31 кастрычніка 1845 г. МПГС атрымала паведамленне ад СПб апякунскага савета з экспедыцыі ашчаднай казны па пазыках, што А. Слізень у СПб ашчаднай казны пазычыў 6 верасня 1845 г. 51 660 руб. і дадатковых 8610 руб. серабром, у лік чаго заклаў свой маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі і вёскамі з 861 рэвізскай душой (дарослых мужчын)[59].

У той жа час, у кастрычніку 1844 г., быў складзены падрабязны інвентар усяго маёнтка Дзядзілавічы, у тым ліку і фальварка Дамашкавічы з вёскамі[60]. Тут даецца кароткае апісанне дворных пабудоў фальварка: дом жылы на каменным падмурку, пабудаваны з дрэва, з дранічным дахам, даўжынёй 26, а шырынёй 15 аршынаў, стары; поварня (кухня), пабудаваная з дрэва, з дранічным дахам, даўжынёй 28, а шырынёй 9 аршынаў, старая; два драўляныя свірны, старыя; пяць драўляных асецяў — для жывёлы, малацьбы хлеба, захоўвання хлеба ў снапах, захоўвання сена і саломы, тры з іх добрыя, а два старыя; драўляная цяпліца, старая. На вясковых могілках знаходзілася драўляная царква з дранічным дахам, старая. Да фальварка належалі чатыры корчмы: у вёсках Васількаўка, Шылы, Дамашкавічы і засценку Васількаўка пры млыне.

У вёсцы Дамашкавічы была драўляная карчма без падмурка, з дранічным дахам, даўжынёй 24,5, а шырынёй 13 аршынаў, у добрым стане.

Да яе належалі драўляныя свіран і асець, пры карчме было ворыва 7,5 морга і сенажацяў 3 моргі. Штогадовы даход з карчмы складаў 40 руб. Да фальварка належаў вадзяны млын у засценку Васількаўка на рэчцы Васільчанка, драўляны, з млынавым колам і валюшам. Дворнай зямлі ў трох зменах (участках) было 124, 109 і 117 моргаў, агародаў 3 моргі, а з дворных сенажацяў скошвалася штогод 83 вазы сена. Дворнай жывёлы налічвалася 20 авечак і 8 розных птушак. Да фальварка належалі тры вёскі — Шылы, Васількаўка і Дамашкавічы. У вёсцы Дамашкавічы было 9 сялянскіх гаспадарак (сямействаў) з ворыўнай зямлёй і адно сямейства батракоў (агароднікі). Насельніцтва вёскі налічвала 35 мужчын і 37 жанчын. Па тыпу падаткаабкладання сялянскія двары размяркоўваліся такім чынам: 3 двары цяглых сялян, 4 двары баяр 2-га класа і 2 двары зямянаў. Усяго ў трох вёсках фальварка Дамашкавічы пражывала 111 мужчын і 122 жанчыны.

12 мая 1845 г. Мінскі губернскі камітэт для разгляду і складання інвентароў панскіх маёнткаў разгледзеў і зацвердзіў выпэй апісаны інвентар маёнтка Дзядзілавічы[61]. Гэты камітэт быў прызначаны для кантролю колькасці панскіх сялян у маёнтках, зацвярджэння уніфікаваных павіннасцяў сялян і падрыхтоўкі да сельска-гаспадарчай рэформы і адмены прыгоннага права.

21 жніўня 1846 г. аканом маёнтка Дзядзілавічы Адам Пагоскі склаў статыстычнае апісанне маёнтка. Прывядзём некаторыя дадзеныя, датычныя фальварка Дамашкавічы. У ім пазначаны наступныя пабудовы: дом эканамічны, дом для прыслугі, стайня, вазоўня, асець для жывёлы, хлебных асецяў дзве, асець для сена, сушня, свіран. Да фальварка належалі таксама вадзяны млын, сельскі хлебны магазін (для захоўвання сялянскага хлеба), тры корчмы. Тут знаходзілася возера. Пры апісанні двара Дзядзілавічы згадваецца цагельня (у інвентары 1844 г. яе няма), аднак з пазнейшых дакументаў вядома, што цагельны завод знаходзіўся каля вёскі Дамашкавічы. Лясы маёнтка выкарыстоўваліся толькі для ўнутраных патрэб, а кантракты на высечку і вываз дрэва не заключаліся[62].

19 лютага 1861 г. быў абвешчаны Маніфест імператара Аляксандра II аб адмене прыгоннага права ў Расіі. Былыя прыгонныя сяляне надзяляліся зямлёй, за якую павінны былі выплачваць грошы на працягу 49 гадоў дзяржаўнай казне. Памешчыкам жа грошы за сялянскія надзелы, так званую выкупную пазыку, выплачвала дзяржава. Захавалася справа аб выкупе зямлі сялянамі маёнтка Дзядзілавічы ў памешчыка Альфрэда Слізня. У 1862 г. была складзена Устаўная грамата маёнтка, у

якой распісваліся ўсе ўмовы выкупу зямлі сялянамі[63]. Паводле гэтай граматы, у вёсцы Дамашкавічы надзяляліся зямлёй дзве гаспадаркі цяглых сялян, пяць гаспадарак баяраў 2-га класа і адна гаспадарка зямяніна. Акрамя таго, у вёсцы жылі тры сямействы батракоў, якія не мелі ворыўнай зямлі, а толькі прысядзібныя агароды[64]. Вёскі маёнтка Дзядзілавічы аб'ядноўваліся ў сельскія грамады. У Дамашкавіцкую сельскую грамаду ўваходзілі вёскі Дамашкавічы, Лушчыцы, Вотруб, Васількаўка і Шылы. 11 сакавіка 1866 г. сяляне гэтай грамады падпісалі прыгавор аб згодзе наконт надзеленай ім зямлі[65]. У гэтым жа годзе быў зацверджаны выкупны акт маёнтка Дзядзілавічы[66]. Паводле гэтых дакументаў, між іншым, сялянам вёскі Дамашкавічы быў пакінуты прагон для жывёлы праз панскія землі да возера, а за ўласнікам маёнтка засталася дарога ад фальварка Дамашкавічы да цагельні, якая размяшчалася каля вёскі Дамашкавічы сярод сялянскіх земляў. Гэта гаворыць аб тым, што цагельня была пабудаваная яшчэ да скасавання прыгону. Галоўная выкупная ўстанова (ГВУ) у Санкт-Пецярбургу зацвердзіла выкупны акт. Сяляне ўсяго маёнтка меліся выкупляць 4376 дзесяцін зямлі, за якую памешчыку была прызначана выкупная пазыка ў памеры 26 065 руб. 69 кап. 15 ліпеня 1868 г. ГВУ даслала ліст у Мінскую губернскую па сялянскіх справах установу з прапановай выплаціць гэтыя грошы СПб ашчаднай казне, дзе быў закладзены маёнтак Дзядзілавічы на пагашэнне часткі доўгу А. Слізня[67]. Акрамя таго, у згаданай справе захаваліся планы ўсіх вёсак маёнтка Дзядзілавічы, у тым ліку і вёскі Дамашкавічы[68].

Невядома, ці поўнасцю Альфрэд Слізень разлічыўся з СПб ашчаднай казной па сваёй пазыцы 1845 г., але 6 верасня 1868 г. пад заклад маёнтка Дзядзілавічы ён узяў у той жа казны новую пазыку ў памеры 45 567,5 руб.[69]

Альфрэд Слізень быў жанаты на Элізе (Елізавеце) Восіпаўне Тышкевіч, з якой меў двух сыноў Станіслава-Эдуарда-Леапольда (нарадзіўся 1 студзеня 1854 г.)[70] і Генрыха-Альфрэда-Юзафа (нарадзіўся 4 лютага 1872 г.)[71] і дзвюх дачок Марыю і Сафію. А. Слізень памёр у 1882 г., калі трое апошнія былі яшчэ непаўналетнія[72]. Спачатку апекуном малых дзяцей нябожчыка быў брат удавы Альгерд Восіпавіч Тышкевіч[73]. А 8 жніўня 1886 г. Слонімская дваранская апека прызначыла Елізавету з Тышкевічаў Слізень апякуншай над яе дзецьмі і маёнткамі нябожчыка мужа[74].

Елізавета Слізень разгарнула дзейнасць па распрацоўцы дрэва ў лясах маёнтка Дзядзілавічы. 15 снежня 1882 г. яна звярнулася з прашэннем у Мінскае губернскае праўленне дазволіць высечку і продаж

15 000 штук будаўнічага лесу, а 3 ліпеня 1883 г. дадатковае прашэнне падаў апякун А. В. Тышкевіч[75]. Распрацоўка лесу ў маёнтку Дзядзілавічы дазвалялася пры ўмове своечасовай выплаты пазыкі СПб ашчаднай казне, дзе маёнтак быў закладзены, і выплаты пэўнага працэнта ад кошту прададзенага дрэва. Аднак 12 мая 1895 г. СПб ашчадная казна скардзілася мінскаму губернатару аб нявыплаце Слізнямі пазыкі[76]. Вырубка лесу была прыпынена, а на пакрыццё доўгу казне было прапанавана прадаць з таргоў дворную жывёлу маёнтка. У 1896 г. пазыка СПб ашчаднай казне нарэшце была поўнасцю выплачана, і маёнтак вызваляўся з-пад цяжару даўгоў[77].

Па дасягненні малодшымі Слізнямі паўналецця былі распачаты дзеянні па падзелу маёнткаў нябожчыка Альфрэда Слізня. 23 лістапада 1892 г. Гродзенскі акруговы суд вынес пастанову аб прызначэнні членам сям'і Слізняў пэўных частак у спадчыне: маці Елізавета Восіпаўна з Тышкевічаў Слізень мела права на $^{2}/_{14}$ часткі маёмасці, сыны Станіслаў і Генрых — па $^{5}/_{14}$ кожны і дочкі Марыя і Сафія Слізні — па $^{1}/_{14}$. Афіцыйная падача маёнтка Дзядзілавічы ва ўласнасць Слізням была здзейснена 21 снежня 1893 г. судовым прыставам Мінскага акруговага суда Бурцавым. Падзел усёй маёмасці паміж Слізнямі адбыўся 20 жніўня 1895 г. і афіцыйна замацаваны актам у канторы слонімскага натарыуса. 11 сакавіка 1896 г. дзельчы дакумент быў зацверджаны старшым натарыусам Мінскага акруговага суда і занесены ў вячыстыя кнігі Мінскага натарыяльнага архіва, адкуль 2 красавіка таго ж года быў выдадзены выпіс Генрыху Слізню[78]. Паводле гэтага дзельчага запісу Генрыху Слізню пераходзіў ва ўласнасць, між іншым, маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі Дамашкавічы, Замасточча, Вотруб і Рафалаў і засценкамі Гаравец, Езяршчына, Шылянкі і Гарадьшча. Плошча зямельных угоддзяў маёнтка складала, паводле пасведчання Мінскай казённай палаты, 8973 дзесяціны, а паводле пасведчання СПб ашчаднай казны, дзе маёнтак быў закладзены за пазыку, — 10 024 дзесяціны. Самі Слізні сцвярджалі, што ў маёнтку Дзядзілавічы 12 411,32 дзесяціны зямлі, што і было запісана ў дзельчы акт.

Маці Елізавета Слізень замест нерухомай маёмасці на сваю частку згадзілася атрымаць 102 500 руб., якія меліся ёй заплаціць дзеці.

Новы ўласнік Дзядзілавічаў Генрых Альфрэдавіч Слізень, разлічыўшыся ў 1896 г. з СПб ашчаднай казной, сам меў патрэбу ў грошах для далейшага развіцця гаспадаркі маёнтка. Для атрымання грашовага крэдыту ў 1897 г. ён звярнуўся з прашэннем у Мінскае аддзяленне Дзяржаўнага банка. Ён прасіў выдзеліць пазыку ў памеры

30 000—50 000 руб., гэтыя грошы ён меркаваў выкарыстаць на ўдасканаленне гаспадаркі, пабудову новых будынкаў, расчыстку кустоўя пад сенажаці і ворыва, асушэнне балот, пакупку насення і ўгнаенняў і інш.[79] Паводле статыстычнага апісання, маёнтак быў ацэнены ў 120 000 руб. Зваротны капітал складаў 10% ад ацэначнага кошту — 12 000 руб., таму Мінскае аддзяленне Дзяржбанка згадзілася адкрыць крэдыт у памеры 9000 руб.[80] Але Галоўная кантора Дзяржбанка 29 студзеня 1898 г. дала дазвол Мінскаму аддзяленню толькі на 6500 руб. крэдыту[81]. Г. А. Слізень, выкарыстаўшы крэдыт, пагасіў яго ў 1902 г.[82] З дакументаў вядома, што гаспадаркай маёнтка Дзядзілавічы доўгі час займаўся аканом Апалінары Бярнардавіч Радзевіч, які атрымаў даверанасць на гаспадаранне ад Слізняў яшчэ 30 студзеня 1890 г.[83] Ён жа кіраваў гаспадаркай маёнтка і пры Г. А. Слізні[84].

30 кастрычніка 1908 г. Генрых Слізень прадаў маёнтак Дзядзілавічы з фальваркамі і засценкамі графу Восіпу Аскаравічу Тышкевічу за 650 000 руб. Гэтая здзелка была зацверджана старшым натарыусам Мінскага акруговага суда 13 лістапада таго ж года[85]. Кіраваць гаспадаркай нованабытага маёнтка граф В. А. Тышкевіч запрасіў дваранiна Фадзея Міхайлавіча Рудзінскага, якому выдаў даверанасць 18 лістапада 1908 г.[86] Новы гаспадар праз свайго аканома распачаў дзейнасць па прамысловай распрацоўцы лясоў маёнтка. 3 жніўня 1910 г. ён атрымаў ад Упраўлення ваенных зносін (Галоўнага ўпраўлення Генеральнага штаба) дазвол на пабудову ў маёнтку Дзядзілавічы вузкакалейнай чыгункі[87]. А 12 лістапада 1910 г. Ф. М. Рудзінскі падаў прашэнне ў Мінскі губернскі лесаахоўны камітэт аб дазволе расчысціць лясны ўчастак у 102 дзесяціны ў межах будуемай чыгункі[88]. У сваім наступным прашэнні ад 29 красавіка 1911 г. ён паведамляе, што Лесаахоўны камітэт у 1896 і 1902 гг. дазволіў былому ўласніку маёнтка Г. Слізню высечку лесу ў розных участках усяго плошчай 2500 дзесяцін, з якіх толькі невялікая частка была высечана. На гэты раз аканом прасіў даць дазвол на высечку лесу ў іншых межах, пры чатырох фальварках маёнтка для павелічэння іх сельскагаспадарчых угоддзяў: 934 дзесяціны пры фальварку Замасточча, 288 дзесяцін пры фальварку Дамашкавічы, 643,7 дзесяціны пры маёнтку Дзядзілавічы і 461 дзесяціну пры фальварку Гаравец[89].

Незадоўга да гэтага, 17 лютага 1911 г., Ф. М. Рудзінскі ад імя гр. В. А. Тышкевіча заключыў дамову з пінскім купцом 1-й гільдыі габрэем Давідам Саламонавічам Берманам на распрацоўку дрэва ва ўсіх лясных дачах маёнтка Дзядзілавічы тэрмінам да 1 студзеня 1916 г.[90] Паводле дамовы, Д. С. Берман набыў у В. А. Тышкевіча бу-

даўнічы лес для выбарачнай высечкі, прамысловай распрацоўкі і далейшага продажу, за што заплаціў 100 000 руб. наяўнымі і 450 000 руб. векселямі, якія меўся выкупляць грашыма ў пэўныя тэрміны.

Вузкакалейная чыгунка, якая была ўжо пабудавана, разам з платформамі, вагонамі і адным новым паравозам перадавалася ў карыстанне купцу. Д. С. Берман меўся размясціць сваю лесараспрацоўчую кантору ў фальварку Дамашкавічы. Таму, паводле дамовы, яму ў карыстанне перадаваліся ўсе жылыя і халодныя пабудовы ў фальварку, пры чыгункі і на прыстанях на рацэ Бярэзіна, акрамя мураванага дома і гаспадарчых пабудоў у Дамашкавічах і Лізенталі і аднаго пакоя ў будынках на прыстані. Мог ён таксама выкарыстоўваць розныя станкі, запасныя рэльсы, кузні і іншыя прыстасаванні і матэрыялы, што знаходзіліся ў фальварку Дамашкавічы. Д. С. Берману дазволена было правесці ва ўсім маёнтку Дзядзілавічы тэлефонную сувязь, будаваць і рамантаваць пабудовы ў Дамашкавічах і пры чыгункі.

Д. С. Берман прызначыў кіраўніком (прыказчыкам) распрацоўкі лесу ў Дзядзілавічах габрэя Лейбу Гіршавіча Залескага, якому 28 лістапада 1911 г. выдаў даверанасць[91]. Л. Г. Залескі здзяйсняў нагляд за распрацоўкай лесу, маёмасцю і рухам чыгункі, разлічваў рабочых за працу, якіх налічвалася да 300 чалавек. У Л. Г. Залескага было некалькі памочнікаў (пісар, загадчык склада, бухгалтар і інш.), таксама габрэі. Жылі яны ў фальварку Дамашкавічы, дзе размяшчалася лесараспрацоўчая кантора, некаторыя нават з сем'ямі. Аднак у хуткім часе да паліцэйскіх уладаў Барысаўскага павета пачалі паступаць скаргі ад мясцовых сялян і дваран-арандатараў на згаданых габрэяў, якім паводле закона забаранялася пражываць без спецыяльнага дазволу ў сельскай мясцовасці (так званая «рыса аселасці»). Відаць, спрацавала звычайная зайздрасць мясцовых жыхароў да прадпрымальных людзей, да таго ж габрэяў. Барысаўскае павятовае паліцэйскае ўпраўленне хутка разгледзела справу, і паліцэйскі спраўнік выдаў загад аб высяленні габрэяў з Дамашкавічаў.

Ужо 20 і 22 снежня 1911 г. лясны прамысловец Д. С. Берман падаў прашэнне і скаргу ў Мінскае губернскае праўленне (МГП) аб прыпыненні высялення яго прыказчыкаў, спасылаючыся на атрыманы дазвол на часовае знаходжанне іх у гэтых краях, а таксама на заняпад працы без кіраўніцтва[92]. Галоўны прыказчык лесараспрацовак Л. Г. Залескі прасіў адтэрміноўкі высялення на месяц, каб разлічыць рабочых і перадаць справы новаму прыказчыку[93]. 21 лютага 1912 г. МГП выдала пастанову, якой усё ж такі пацвердзіла вырак барысаўскага спраўніка аб высяленні габрэяў, але адтэрмінавала да 1 чэрвеня 1912 г.[94] Аднак 6 красавіка

1912 г. паверацы Д. С. Бермана падаў скаргу ў Правячы Сенат у Санкт-Пецярбургу, у сувязі з чым прасіў прыпыніць высяленне прыказчыкаў[95]. Д. С. Берман, не спадзеючыся на станоўчае вырашэнне праблемы, падаў 8 красавіка прашэнне ў МГП аб дазволе пакінуць для нагляду за працамі хаця б двух прыказчыкаў[96]. Нарэшце, 28 красавіка ён атрымаў дазвол мець у фальварку Дамашкавічы двух прыказчыкаў — Залескага і Шапіру, але без іх сем'яў і толькі да канца 1912 г.[97] Да вырашэння справы ў Сенаце мінскі губернатар 31 студзеня 1913 г. дазволіў пражыванне ў Дамашкавічах толькі аднаму прыказчыку-габрэю[98]. Нарэшце, 24 лютага 1914 г. Сенат выдаў указ, якім пацвердзіў пастанову МГП ад 21 лютага 1912 г. аб высяленні ўсіх габрэяў з Дамашкавічаў[99]. Сенат не пажадаў улічваць ніякіх просьб і нюансаў справы і нават не разглядаў прашэнні, матывуючы тым, што яны былі пададзены не самімі пацярпелымі, прыказчыкамі, а паверанымі Д. С. Бермана. Ідэалогія антысемітызму ў Расійскай імперыі была замацавана заканадаўствам, і нават ніякі здаровы сэнс і эканамічныя выгоды не маглі яе парушыць.

Граф Восіп Аскаравіч Тышкевіч памёр недзе на рубяжы 1912—1913 гг. (а не ў 1914 г., як мяркуюць Р. Афтаназы і іншыя даследчыкі), так як ужо 22 студзеня 1913 г. Барысаўская дваранская апека прызначыла апекунамі маёнткаў нябожчыка Лагойск, Антанопаль, Дзядзілавічы і інш. у Барысаўскім павеце Міхала Генрыхавіча Валовіча і Людвіга Восіпавіча Уняхоўскага[100]. Спадкаемцы В. А. Тышкевіча (гл. ніжэй) 20 лютага 1913 г. выдалі ім даверанасці на кіраванне маёнткамі нябожчыка, вырашэнне ўсіх судовых спрэчак па яго маёмасці і падрыхтоўку да яе падзелу[101]. У В. А. Тышкевіча з жонкай Марыяй-Крыстынай, дачкой вядомага польскага мастака Юзафа Брандта, не было дзяцей. Сваю маёмасць ён завяшчаў жонцы, а таксама па невядомых прычынах даволі далёкім сваякам — Станіславу Іванавічу Шадурскаму, Марыі-Казіміры-Юліі Казіміраўне Шадурскай і Маргарыце Казіміраўне Шадурскай, жонцы берлінскага адваката Эхінгера[102]. Інтарэсы ўдавы графіні Марыі Тышкевіч прадстаўляў Л. В. Уняхоўскі, а астатніх — М. Г. Валовіч. Відаць, спачатку былі нейкія судовыя разбіральніцтвы аб праве ўласнасці на маёмасць нябожчыка (бо засталіся іншыя яго сваякі) (справы, на жаль, не знойдзены), аднак 17 студзеня 1914 г. Мінскі акруговы суд (МАС) сваёй пастановай зацвердзіў удавіе і Шадурскім права спадчыннасці па В. А. Тышкевічу і выдаў ім 17 лютага таго ж года выканаўчы ліст на ўвядзенне ў валоданне маёнткамі, у тым ліку і Дзядзілавічамі[103]. Пэўны час яны валодалі маёнткам Дзядзілавічы сумесна[104]. Аднак у 1915 г. імі быў зроблены падзел маёнткаў В. А. Тышкевіча і зацвержа-

ны старшым натарыусам МАС 27 жніўня 1915 г. з занясеннем у вячыстыя кнігі Мінскага натарыяльнага архіва[105]. Паводле дзельчага акта маёнтак Дзядзілавічы з фальваркам Дамашкавічы і інш. дастаўся Марыі Тышкевіч у $^3/_4$ частках і Марыі Казіміраўне Шадурскай у $^1/_4$ частцы.

Пад час сумеснага валодання маёнткам Дзядзілавічы спадкаемцамі В. А. Тышкевіча гаспадаркай кіраваў аканом Пашкевіч. Захавалася скарга сялян вёскі Дамашкавічы на яго ад 15 мая 1915 г. аб забароне прагону сялянскай жывёлы на вадапой да возера[106].

Ёсць некаторыя звесткі пра маёнтак Дзядзілавічы паводле Усерасійскага сельскагаспадарчага перапісу ў 1916 і 1917 гг. Так, у 1916 г. маёнтак Дзядзілавічы Восаўскай воласці Барысаўскага павета арандаваўся дваранінам Юліянам Сцяпанавічам Філіповічам; у сезон 1914—1915 гг. было засеяна 245,5 дзесяціны арэнднага ворыва, а ў сезон 1915—1916 гг. — 168 дзесяцін[107]. У 1917 г., паводле картак формы № 1 (суцэльны перапіс сельскіх гаспадарак), домаўласнікам маёнтка пазначана толькі графіня Марыя Тышкевіч, дваранка, полька, у маёнтку не пражывала. Гаспадарка асобная, прыватнаўласніцкая, зямлі 12411,32 дзесяціны. Зямля здавалася ў арэнду наступным асобам: 1) Міхалу Аляксандравічу Лынскаму 3061 дзес. ворыва, 1919 дзес. сенажацяў, 7431 дзес. леса і іншых угоддзяў за грошы на адзін год (асноўны арандатар маёнтка); 2) 22 арандатарам з засценка Гаравец 444 дзес. асобных участкаў на 6 гадоў; 3) дробным хутаранам Дзядзілавіцкай сельскай грамады 165 дзес. бестэрмінова; 4) фальварак Замасточча, 150 дзес., здаваўся на тры гады (паводле перапісу 1916 г. — двараніну Восіпу Адольфавічу Дэрэваеду[108]; 5) 6 арандатарам хутара Гародзенка 102 дзес. асобных участкаў бестэрмінова[109]. Паводле выбарак з пазямельных зводаў павятовых земскіх управаў (карткі формы № 3), уласнікамі маёнтка Дзядзілавічы запісаны спадкаемцы графа В. А. Тышкевіча Марыя Тышкевіч і Марыя Шадурская. Зямлі ў маёнтку, абкладваемай падаткамі, — 12 194,82 дзес. і не абкладаваемай — 216,5 дзес., усяго — 12 411,32 дзес.; ацэначны кошт зямлі — 276 859,5 руб.[110] У вёсцы Дамашкавічы сяляне валодалі зямлёй (паводле розных памераў) плошчай 219,14 ці 222,55 дзес.[111]

Трэба сказаць яшчэ некалькі слоў пра царкву ў вёсцы Дамашкавічы. Як ужо згадвалася, у сярэдзіне і 2-й палове XVII ст. у вёсцы была парафіяльная уніяцкая царква. Калі Дамашкавіцкая парафія была скасавана і вёскі далучаны да Дзядзілавіцкай парафіі, невядома, відаць, недзе на рубяжы XVII—XVIII стст. Паводле Генеральнай візіты цэркваў Лагойскага і Мядзельскага дэканатаў, складзенай 2 студзеня 1763 г. (стары стыль), Дзядзілавіцкая царква і парафія адносіліся да Лагойскага дэкана-

та; у парафію ўваходзіла і вёска Дамашкавічы з прыпісной капліцай[112]. Паводле Генеральнай візіты Дзядзілавіцкай парафіяльнай царквы Барысаўскага дэканата, складзенай 21 сакавіка 1806 г., сама царква была ў поўным заняпадзе і разбурэнні, замест якой калятар Рафал Слізень меўся пабудаваць новую царкву ў вёсцы Асавы, на што атрымаў дазвол ад Брэсцкай кансісторыі ў 1805 г.[113] У візіце даецца апісанне філіяльнай (прыпісной) царквы св. Юрыя ў вёсцы Дамашкавічы. Яна была пабудавана з бярвён, з двума жалезнымі крыжамі, дах пакрыты дранiцай, адны дзверы, столь і падлога з тарцiц, чацвёра вокнаў. Унутры быў вялікі (галоўны) алтар з абразом Панны Марыі, драўляная мэнса, драўляны крыж, дзве пары драўляных ліхтароў, алавяны келіх, маленькі алтарны звон і іншыя богаслужэбныя рэчы. Перад царквой вісеў звон на слупах. Гэтая царква не мела фундуша. У Дамашкавічах парафіяне пражывалі ў 16 хатах[114]. 18 снежня 1819 г. была складзена візіта Асаўскай парафіяльнай царквы, пабудаванай у 1810 г. замест старой у Дзядзілавічах. У філіяльнай царкве св. Юрыя ў Дамашкавічах набажэнства адбывалася тры разы ў год — у дні св. Юрыя, Небаўзняцця Панны Марыі і Нараджэння Панны Марыі. Фундуша і асобнага каплана царква не мела[115]. У 1886 г. прыпісная драўляная Георгіеўская царква ў вёсцы Дамашкавічы была ўжо вельмі старая і спарахнелая[116].

Трэба яшчэ дадаць, што ў адным дарэвалюцыйным выданні апісваецца, што каля Дамашкавіч, пры возеры, у лесе знаходзілася высокая гара, на якой, паводле народнага падання, яшчэ на пачатку XIX ст. існавала высокая вежа, пабудаваная на ўрадавыя грошы[117].

---

[1] Semkowicz W. Przywileje Witolda dla Moniwida, starosty wileńskiego, i testament jego syna Jana Moniwidowicza // Ateneum Wileńskie. Wilno, 1923. R. 1. № 2. S. 256—258; Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachta polska w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. Poznań, 1989. T. 3. S. 16—17.

[2] Semkowicz W. Przywileje Witolda... S. 260—262; Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich... S. 19.

[3] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси (далей — АСД). Вильна, 1870. Т. 7. С. 7—12.

[4] Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI w. Warszawa — Poznań, 1985. S. 57—59.

[5] АСД. Вильна, 1867. Т. 1. С. 32—34.

[6] Malczewska M. Op. cit. S. 72.

[7] АСД. Т. 1. С. 34.

[8] НГАБ, КМФ-18 (Літоўская метрыка). Воп. 1. Спр. 242. Арк. 282адв.—283адв.

[9] Там жа. Арк. 284—287.

[10] Там жа. Спр. 35. Арк. 122адв.—124адв.

[11] Там жа. Спр. 243. Арк. 41—43.

[12] Там жа. Спр. 39. Арк. 534—535адв.

[13] Там жа. Спр. 249. Арк. 575—586адв.
[14] Русская историческая библиотека. Пг., 1915. Т. 33, стб. 449.
[15] НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 5700. Арк. 10адв.
[16] Там жа. Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 188—190 (176—178).
[17] Там жа. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 283. Арк. 180—181.
[18] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею... (далей — АВАК) Вильна, Т. 31. С. 281—282.
[19] Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Н/В 1241/18.
[20] АВАК. Вильна, 1875. Т. 8. С. 117—119.
[21] НГАБ. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 789адв.
[22] Там жа. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 756—759адв.
[23] Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 492—493адв.
[24] Там жа. Спр. 4. Арк. 790—790адв.
[25] Там жа. Арк. 791; Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 310адв.
[26] Urzednicy centralni i dygnitarze Wielkiego ksienstwa Litewskiego XIV—XVIII wieku. Spisy. Kórnik, 1994. S. 115, 193, 244; НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 310адв.
[27] НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 312адв.—313.
[28] Там жа. Ф. 1841. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 53; Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 945—946адв.
[29] Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 947—952адв.
[30] Там жа. Арк. 945—945адв., 946—946адв.
[31] Там жа. Ф. 155. Воп. 1. Спр. 128. Арк. 201—233.
[32] Там жа. Арк. 219—223.
[33] Urzednicy... S. 50, 117, 244; НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 316адв.—318адв.
[34] НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 314; Ф. 588. Воп. 2. Спр. 173. Арк. 56—59, 60—64.
[35] Там жа. Ф. 146. Воп. 2. Спр. 478. Арк. 35—36адв.
[36] Там жа. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 318адв.
[37] Там жа. Ф. 1601. Воп. 1. Спр. 112. Арк. 375—377адв.
[38] Там жа. Спр. 208. Арк. 227адв.—230.
[39] Там жа. Спр. 112. Арк. 292—293адв.
[40] Там жа. Арк. 384—385адв.
[41] Там жа. Арк. 664—665адв.
[42] Там жа. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 947. Арк. 322—323.
[43] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 25—30адв.; Спр. 569. Арк. 1—3адв.
[44] Там жа. Ф. 1601. Воп. 1. Спр. 215. Арк. 1—1адв.
[45] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 22—22адв.
[46] Там жа. Ф. 1601. Воп. 1. Спр. 205. Арк. 32адв.—33.
[47] Там жа. Спр. 215. Арк. 1—37адв.
[48] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 40—43.
[49] Там жа. Ф. 1601. Воп. 1. Спр. 178. Арк. 27адв.—28адв.
[50] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 31—35адв.
[51] Там жа. Ф. 155. Воп. 1. Спр. 387. Арк. 17—20адв.
[52] Там жа. Арк. 1—12адв., 56—56адв.
[53] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 77, 85—85адв.
[54] Там жа. Ф. 155. Воп. 1. Спр. 387. Арк. 1—12адв.
[55] Там жа. Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 1255. Арк. 91—91адв.
[56] Там жа. Ф. 28. Воп. 1. Спр. 712. Арк. 2—3адв.
[57] Там жа. Ф. 146. Воп. 2. Спр. 478. Арк. 1—1адв.
[58] Там жа. Арк. 39—78, 79—81адв.
[59] Там жа. Ф. 146. Воп. 2. Спр. 478. Арк. 86—87.

[60] Там жа. Ф. 27. Воп. 6. Спр. 99. Арк. 26—32.
[61] Там жа. Арк. 48—52адв.
[62] Там жа. Ф. 142. Воп. 1. Спр. 242. Арк. 2адв.—4.
[63] Там жа. Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 1255. Арк. 103—122.
[64] Там жа. Арк. 114адв.—115, 122.
[65] Там жа. Арк. 80—80адв.
[66] Там жа. Арк. 334.
[67] Там жа. Арк. 73—73адв.
[68] Там жа. Арк. 324.
[69] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 8110. Арк. 2.
[70] Там жа. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3008. Арк. 19.
[71] Там жа. Арк. 171—172.
[72] Там жа. Арк. 168, 171—172; Ф. 299. Воп. 2. Спр. 8110. Арк. 1—1адв.
[73] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 8110. Арк. 5—5адв.
[74] Там жа. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3008. Арк. 171—172.
[75] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 8110. Арк. 1—1адв., 5—5адв.
[76] Там жа. Спр. 10227. Арк. 1—3.
[77] Там жа. Ф. 146. Воп. 2. Спр. 478. Арк. 96.
[78] Там жа. Ф. 28. Воп. 1. Спр. 712. Арк. 2—3адв.
[79] Там жа. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 330. Арк. 1.
[80] Там жа. Арк. 2—4адв.,7—7адв.
[81] Там жа. Арк. 11.
[82] Там жа. Арк. 38.
[83] Там жа. Ф. 333. Воп. 4. Спр. 7148. Арк. 2; Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 1255. Арк. 577.
[84] Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 5939. Арк. 3.
[85] Там жа. Ф. 28. Воп. 1. Спр. 2238. Арк. 2; Ф. 333. Воп. 4. Спр. 13849. Арк. 1—2адв.
[86] Там жа. Воп. 2. Спр. 20. Арк. 2—2адв.; Ф. 299. Воп. 2. Спр. 17643. Арк. 159—159адв.
[87] Там жа. Воп. 2. Спр. 20. Арк. 3.
[88] Там жа. Арк. 1.
[89] Там жа. Воп. 1. Спр. 2238. Арк. 1—1адв.
[90] Там жа. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 17643. Арк. 146—154адв.
[91] Там жа. Арк. 109—110.
[92] Там жа. Арк. 14, 18—18адв.
[93] Там жа. Арк. 17—17адв.
[94] Там жа. Арк. 38—43.
[95] Там жа. Арк. 64.
[96] Там жа. Арк. 80.
[97] Там жа. Арк. 78.
[98] Там жа. Арк. 108.
[99] Там жа. Арк. 163—163адв.
[100] Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 7902 (справа без пагінацыі).
[101] Там жа. Ф. 581. Воп. 2. Спр. 3430. Арк. 10, 12.
[102] Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Część I. Wielkie Księstwo Litewskie. Tom 1. Wojewodztwa mińskie, mścislawskie, połockie, witebskie. Wrocław etc., 1991. S. 99.
[103] НГАБ. Ф. 581. Воп. 2. Спр. 3430. Арк. 4—6.
[104] Там жа. Арк. 2.
[105] Там жа. Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 1255. Арк. 689.
[106] Там жа. Арк. 691.

[107] Там жа. Ф. 325. Воп. 2. Спр. 160. Арк. 5—5адв.
[108] Там жа. Арк. 4—4адв.
[109] Там жа. Спр. 636. Арк. 1—1адв.
[110] Там жа. Арк. 8.
[111] Там жа. Арк. 40.
[112] Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41235. Арк. 2адв.
[113] Там жа. Спр. 41254. Арк. 51—52адв.
[114] Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41254. Арк. 51адв., 52.
[115] Там жа. Спр. 41256. Арк. 682—683адв.
[116] Памятная книжка Минской епархии на 1887 г. Мн., 1886. С. 630—631.
[117] Описание церквей и приходов Минской епархии. Т. 2, Борисовский уезд. Мн., 1879. С. 311.

И. Л. Вернер

Неизвестные факты биографии И. А. Гошкевича

Белорусская земля дала миру немало ярких личностей, талантливых, гениальных людей. Одним из них является Иосиф Антонович Гошкевич — дипломат, ученый-языковед, исследователь Китая и Японии, натуралист, ориенталист, проживший интересную, полную приключений жизнь.

7 октября 1852 г. из Кронштадта отплыл фрегат «Паллада», находившийся в составе российской миссии для заключения договора с Японией. К главе миссии адмиралу Е. В. Путятину в качестве секретаря был прикомандирован писатель И. А. Гончаров, переводчиком — И. А. Гошкевич. Гончаров в своих очерках неоднократно с иронией упоминает о том, как страдал Гошкевич от морской болезни. Ничего удивительного в этой болезни не было, и, несомненно, Гончаров ошибался, называя Гошкевича «происходящим из малороссов», так как в действительности Иосиф Антонович был родом из краев, лежащих далеко от морских просторов — из Беларуси.

Долгое время исследователям биографии И. А. Гошкевича не удавалось установить, когда и где именно появился будущий «беловолосый консул». Не так давно в фондах НИАБ были обнаружены документы, относящиеся к ранним годам его жизни. Родился И. А. Гошкевич 4 апреля 1814 г. в селе Стреличеве Речицкого уезда Минской губернии, о чем свидетельствует запись о его крещении, сделанная 23 апреля того же года в метрической книге Стреличевской Михайловской церкви. Родителями будущего ученого и путешественника были священник этой церкви Антоний Иванович Гошкевич и его жена Гликерия Яковлевна[1].

Антоний Иванович Гошкевич вышел из семьи священника, в 1804 г. закончил Могилевскую семинарию и был определен служителем

Могилевской духовной консистории. В 1806 г. перешел из Могилевской в Минскую епархию также в чине канцелярского служителя, а в 1809 г. был рукоположен в священники Стреличевской церкви[2].

Семья священника жила в деревянном доме на церковной земле в большой нужде. В 1833 г. Антоний Гошкевич в своем прошении епископу Минскому и Гродненскому о назначении ему жалованья так описывает свое бедственное положение: «на содержание священно и церковно служителей никакой хлебной ссылки не производится, а притом по причине крайней бедности прихожан своих священно и церковно служители принуждены исправлять все церковно-приходские требы большей частию безо всякой за свои труды награды. Остается только продовольствоваться им одной пахотной землей, которой при сей церкви находится две уволоки. ... А посему прожитие священно и церковно служителей вельми скудно»[3].

В семье Антония Гошкевича воспитывалось четверо сыновей и дочь. Старший брат Федор был определен пономарем Рудобельской церкви в Бобруйском уезде, а затем переведен в Якимо-Слободскую церковь Речицкого уезда[4]; Иосиф учился в Минской духовной семинарии, получая из семинарского правления пособие в девять-десять рублей ассигнациями; двое младших братьев также учились: Андрей — в Слуцком уездном духовном училище, Иоанн — в Слуцком приходском училище[5].

В 1835 г. Иосиф Гошкевич закончил курс Минской духовной семинарии «первым разрядом» и был направлен для продолжения обучения в С.-Петербургскую духовную академию[6]. Вскоре он получил известие о том, что в августе 1836 г. умер его отец — Антоний Иванович Гошкевич, а над младшими братьями и сестрой Анной назначены опекуны[7]. Через год Анна вышла замуж за определенного в Стреличевский приход молодого священника Иакова Зморовича[8]. Брат Андрей по окончании Минской духовной семинарии служил учителем Ляданского духовного училища, в 1846 г. был рукоположен в священники Якимо-Слободской церкви Речицкого уезда[9], а в 1855 г. скончался в селе Липове в доме своего тестя протоиерея Адама Фирасевича, оставив вдову Антонину Адамовну и детей: Антона, Андрея и Софью[10].

Иосиф Антонович Гошкевич, вылетев из родного гнезда, в далеком С.-Петербурге усердно учится в духовной академии, проявляя незаурядные способности в изучении иностранных языков. Инициирует литографированный перевод Старого Завета с древнееврейского языка на русский. Синод воспринимает это как крамолу, и в нака-

зание его высылают за пределы страны и назначают в Русскую духовную миссию в Пекине. В Китае Гошкевич провел около десяти лет. Будучи от природы любознательным и целеустремленным, Иосиф Антонович за годы работы в миссии собрал интересные сведения из области астрономии, метеорологии, ботаники.

Осенью 1852 г. Гошкевич был отправлен с миссией Е. В. Путятина в Японию. При проведении переговоров с японскими властями он выступает в качестве переводчика. Результатом этих усилий явилось заключение 7 февраля 1855 г. первого русско-японского договора. В то время Япония была достаточно закрытым государством, к иноземцам здесь относились настороженно, однако Гошкевичу благодаря своей доброжелательности, тактичности удавалось находить общий язык с местными властями и населением. В ходе переговоров Иосиф Антонович проявил большой дипломатический талант, и именно поэтому Путятин рекомендовал назначить его консулом Российской империи в Японии. Иосиф Антонович Гошкевич был одним из первых иностранцев, которым разрешалось проникать во внутренние территории Японии и даже посещать столицу государства Эдо.

Русская миссия открылась осенью 1858 г. в г. Хакодате на острове Хакайдо. При участии И. А. Гошкевича при консульстве действовала русская школа, педагогом которой И. В. Маховым была составлена русская азбука для японцев. По инициативе Иосифа Антоновича в С.-Петербург были направлены для обучения шесть молодых самураев. В госпитале, устроенном при консульстве, местному населению оказывалась бесплатная медицинская помощь. Гошкевич подарил японским морякам фонарь и барометр, под его руководством один из жителей г. Хакодате освоил фотодело и открыл первое фотоателье.

Семь лет, которые И. А. Гошкевич исполнял обязанности русского консула в Японии, были наполнены сложными, а порой и опасными событиями. В 1865 г. он вернулся в Россию. Отойдя от государственной службы, Иосиф Антонович поселился в Беларуси, где приобрел имение Мали (в настоящее время в Островецком районе Гродненской обл.). Здесь он продолжил научную деятельность в области восточной филологии, подготовил к изданию книгу «О корнях японского языка». Умер И. А. Гошкевич в октябре 1872 г. и был погребен на кладбище д. Островцы.

Деятельность Иосифа Антоновича Гошкевича была высоко оценена потомками: изданный им в 1857 г. первый в России «Японско-русский словарь» был награжден медалью Петербургской АН и Деми-

довской премией, в белорусском г. Островце и японском г. Хакодате ему поставлены памятники, создан международный фонд им. Иосифа Гошкевича, содействующий укреплению белорусско-японских связей.

Литература

Гончаров И. А. Фрегат «Паллада»: Очерки путешествия в двух томах. М., 1976.
Грицкевич В. П. Беловолосый консул // От Немана к берегам Тихого океана. Мн., 1986.
Грыцкевіч В. П. Жыццё і дзейнасць Іосіфа Гашкевіча // Беларусіка-Albaruthenica. 8. Беларусь—Расія—Японія: Матэрыялы першых Астравецкіх краязнаўчых чытанняў, прысвечаных памяці Іосіфа Гашкевіча. Мн., 1997. С. 11—15.
Орлов В. А. Путешествие длиною в жизнь. Там же. С. 19—22.

---

[1] НИАБ. Ф. 136. Оп. 13. Д. 514. Л. 594—594об.
[2] Там же. Оп. 1. Д. 40481. Л. 98—99.
[3] Там же. Д. 9827. Л. 2—2об.
[4] Там же. Д. 26670. Л. 1—1об.
[5] Там же. Д. 40627. Л. 107—108.
[6] Там же. Д. 11217. Л. 5—5об.
[7] Там же. Д. 12684. Л. 8—8об.
[8] Там же. Л. 7.
[9] Там же. Д. 20521. Л. 3—5, 12—13.
[10] Там же. Д. 26404. Л. 1—1об., 5.

А. Л. Грывянёў

Царква Святой Марыі Магдаліны на Старажоўскіх могілках у Мінску (з пачатку XIX ст. да нашых дзён)

Аб Мінскай царкве Святой Марыі Магдаліны ў дарэвалюцыйны і наш час напісана шмат. Ёсць матэрыялы як энцыклапедычнага характару, так і больш шырокія. Напрыклад, З. В. і С. Ф. Шыбекі ў працы па даследаванні г. Мінска даюць яе гісторыю з 1847 г. — моманту ўзвядзення новага будынка царквы[1]. У гістарыка-дакументальнай хроніцы «Памяць» аб храме сказана больш падрабязна[2].

Гэты артыкул — спроба агляду існавання храма з часу яго ўзвядзення да нашых дзён на падставе дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (некаторыя з іх уведзены ў абарот больш грунтоўна, чым раней) і прац даследчыкаў.

У НГАБ захавалася некалькі спраў з рознымі звесткамі пра царкву[3]. Ёсць нават яе асобны фонд, але, на жаль, толькі адна справа — спіс людзей, што ўтрымліваліся ў багадзельні пры царкве, за 1858—1870 гг.[4] Большая частка іх знаходзіцца ў іншых фондах. Гэта ў асноўным фонды «Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя» і «Канцылярыя мінскага

губернатара», а таксама «Мінскае губернскае праўленне», «Мінская гарадская дума» і «Беларускі свяшчэнны праваслаўны Сінод»[5].

Магчыма, у архіве выяўлены не ўсе дакументы, што тычацца царквы.

Дакументальна зафіксаваную гісторыю месца, дзе пабудавана і знаходзіцца да нашага часу Мінская могільнікавая царква Св. Марыі Магдаліны, удалося высветліць з XVI ст. У 1592 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III дазволіў мінскім мяшчанам пабудаваць на р. Пярэспе млын і папяровую фабрыку. Праз 30 гадоў, у 1623 г., мінскі суддзя Марцін Валадковіч ахвяраваў на царкву і манастыр Св. Пятра і Паўла свой маёнтак — фальварак Пярэспу[6].

Як лічыць гісторык Х. Крыванос, ужо ў XVIII ст. на гэтым месцы, недалёка ад вышэйзгаданага фальварка, што належаў манастыру, узніклі першыя могілкі праваслаўных жыхароў горада. Пазней яны сталі вялікімі, вядомымі як Старажоўскія. Для абслугоўвання іх і заснавалі на Пярэспе праваслаўную царкву[7]. Напрыканцы XVIII ст. тут была яшчэ паўночная ўскраіна Мінска, дзе ў прадмесці Старажоўка, пры ўездзе з боку Стара-Віленскага тракта, знаходзілася старажытная застава[8].

Пытанне аб пабудове царквы ўпершыню ўзняў у 1796 г. архімандрыт Петрапаўлаўскага манастыра Лазар[9]. Практычна справу вырашылі толькі праз некалькі гадоў, пры мінскім губернатары Захары Якаўлевічы Карнееве. У 1802 г. Мінскім гарадскім магістратам быў выкуплены ў лютэранскага таварыства драўляны будынак гарадской уніяцкай мітрапаліцкай Георгіеўскай царквы[10]. Гэта царква даўно не дзейнічала. У тым жа годзе, піша Х. Крыванос, яе перанеслі на могілкі і асвяцілі ў імя Св. Марыі Магдаліны[11]. У буклеце, прысвечаным 150-годдзю Мінскай Свята-Марыі-Магдалінінскай царквы, называецца іншая дата асвячэння храма — 1804 г.[12]

Адначасова пры царкве пабудавалі багадзельню[13].

У час нашэсця войск Напалеона ў царкве быў парахавы склад. Пасля заканчэння Айчыннай вайны 1812 г. яе занава асвяцілі ў 1813 г.[14]

У сярэдзіне 1820-х гадоў драўляны будынак царквы састарэў. 1825 г. датуецца ахвяраванне імператарам Аляксандрам I грошаў на рамонт Мінскай Пакроўскай (мела і такую назву? — *А. Г.*) могільнікавай царквы[15].

Пасля пажару 1835 г., што знішчыў драўляны будынак царквы Св. Марыі Магдаліны, паўстала пытанне пра новы[16]. Сродкаў на яго не знайшлі. Таму аб'явілі добраахвотны грашовы збор ахвяраванняў. Да 1839 г. назапасілі каля 5000 руб. асігнацыямі. Тады ж вырашылі

царкву будаваць мураванай, але невялікай[17]. Распрацавалі некалькі варыянтаў пабудовы[18]. Адзін з планаў быў дазволены ўказам Сінода ад 17 ліпеня 1841 г.[19] З-за недахопу сродкаў новы будынак залажылі толькі ў 1844 г.[20] Канчаткова мураваная царква пабудавана ў 1847 г.[21] Тады ж храм асвяцілі ў імя Св. Марыі Магдаліны[22]. Будаўніком царквы лічыўся прапаіерэй Мінскага кафедральнага Петрапаўлаўскага сабора Пётр Еліноўскі, што памёр у 1870 г. і пахаваны ў склепе царквы пад алтаром[23].

Як адзначана ў адной з прац па гісторыі храма, пры яго будаўніцтве былі ўвасоблены асноўныя рысы руска-візантыйскага архітэктурнага стылю, што атрымаў распаўсюджванне ў Расіі з 30—40-х гг. XIX ст. Будынак царквы стаў асноўнай архітэктурнай дамінантай гэтага раёна горада[24].

Царква мае сіметрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю: цэнтральны амаль квадратны ў плане асноўны храмавы аб'ём, да якога далучаюцца прамавугольны прытвор з захаду і прамавугольная апсіда з рызніцамі па баках з усходу. Асноўная частка будынка царквы (асноўны аб'ём) з чатырохсхільным дахам у цэнтры завершана цыбульчатым купалам з крыжам. Купал пастаўлены на высокім цыліндрычным барабане з чатырма паўцыркульнымі праёмамі. Над апсідай узвышаецца невялікая галоўка на тонкім высокім барабане, што таксама ўвенчана крыжам.

Галоўны фасад храма створаны тарцовай сцяной прытвора і высокай вежай — званіцай. У цэнтры сцяны — уваходны партал з паўкруглым акном, над якім з абодвух бакоў партала знаходзяцца спараныя паўкалонкі, над імі — шырокі фрыз і карніз.

Больш падрабязна апісанне будынка царквы можна знайсці ў гісторыка-дакументальнай хроніцы Мінска «Памяць»[25].

У выкарыстаных крыніцах ёсць некаторыя разыходжанні па даце аднаўлення багадзельні. Так, у справе аб адкрыцці самастойнага прыхода царквы называецца 1840 г.[26] Некаторыя даследчыкі нашага часу адзначаюць, што пасля пажару 1835 г. яна была занава пабудавана адначасова з новым, мураваным, будынкам царквы, г. зн. у 1847 г.[27] У кліравай ведамасці Мінскага кафедральнага Петрапаўлаўскага сабора за 1875 г. (да якога ў гэты час царква Св. Марыі Магдаліны была прыпісной) гаворыцца, што багадзельню пабудавалі ў 1849 г.[28] У 1864 г. драўляная багадзельня магла прыняць да дваццаці чатырох чалавек[29]. Яна ўтрымлівалася за кошт Мінскай гарадской думы[30]. У 1844—1870 гг. праз багадзельню прайшло семдзесят два чалавекі. Такія звесткі ёсць у спісе людзей,

што знаходзіліся ў ёй у вышэйзгаданыя гады. Спіс пачаты 1 студзеня 1858 г., у розныя месяцы якога тут размяшчалася дваццаць чалавек[31].

Спачатку царква не мела ўласнага прыхода, бо з'яўлялася прыпісной да Мінскага кафедральнага Петрапаўлаўскага сабора[32]. Пра гэта ёсць і ў гістарычна-статыстычным апісанні Мінскай епархіі рэктара Мінскай духоўнай семінарыі архімандрыта Мікалая, дзе царква Св. Марыі Магдаліны ўпамінаецца сярод васьмі праваслаўных цэркваў, што дзейнічалі да 1864 г. ў Мінску[33].

Да канца 70-х гг. XIX ст. не было магчымасці выдзяляць царкве сродкі на ўтрыманне святароў. Таму па нядзелях, на святы і ў дні памінання памерлых набажэнствы адпраўляліся святарамі Петрапаўлаўскага кафедральнага і Кацярынінскага сабораў[34].

Толькі ў 1879 г. па хадайніцтву епіскапа Мінскага і Тураўскага Яўгена ўказам Сінода ад 16 мая гэтага года было дазволена заснаваць самастойны прыход пры Мінскай Марыінскай могільнікавай царкве замест скасаванага — Будчанскай Траецкай царквы Слуцкага павета, што згарэла. Да яго прылічылі 800 жыхароў г. Мінска — асоб мужчынскага і жаночага полу. Раней яны належалі да шматлікага прыхода Мінскага Кацярынінскага сабора[35].

У «Памятной книжке Минской епархии на 1887 г.» называецца прыходская могільнікавая царква на Пярэспе ў г. Мінску ў імя Св. Жанок Міраносіц[36].

Прыход меў сваю царкоўна-прыходскую школу[37].

Пасля трагічных падзей першай сусветнай і грамадзянскай войнаў на Пярэспе ўжо не было месца для пахаванняў. Таму ў 1922 г. Старажоўскія могілкі закрылі.

У сувязі з гэтым у пачатку 30-х гг. закрылі і царкву Св. Марыі Магдаліны. У храме размясцілі склад аддзела камунальнай гаспадаркі Мінскага гарвыканкама[38].

Барацьба розных плыняў унутры праваслаўнай царквы ў СССР у 1920-х гг. не абышла бокам і Мінскую епархію. У дакументах Мінскага епархіяльнага ўпраўлення (за 1926 г. — *А. Г.*) пратаіерэй Мінскай могільнікавай 1-й царквы на Пярэспе Язвіцкі характарызуецца як «ярый мелхиседековец»...[39]

Толькі ў час Вялікай Айчыннай вайны веруючыя вярнулі сабе храм... У 1949 г. царкву зноў закрылі, а яе будынак перайшоў у веданне камісарыята ўнутраных спраўаў. З гэтага часу ў перабудаваным храме знаходзіўся архіў[40] — Цэнтральны дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў БССР (размяшчаўся да 1986 г.)[41].

Трэба адзначыць, што да пачатку 1950-х гг. царква захоўвала свой першапачатковы выгляд. Пры яе рэканструкцыі ў 1950 г. многае ў помніку змянілі, але асноўныя канструкцыі будынка захаваліся.

У 1990 г. храм быў перададзены Беларускаму Экзархату. Спачатку набажэнства праходзіла ў падвальным памяшканні храма. У сакавіку 1990 г. пачаліся работы па аднаўленні яго першапачатковага выгляду.

Храм аднавілі за сем месяцаў, да восені 1990 г. 25 лістапада таго ж года мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх усея Беларусі Філарэт справіў яго асвячэнне.

Святар Фёдар Поўны, былы настаяцель Свята-Аляксееўскага храма-помніка рускай славы ў Лейпцыгу (былой ГДР), перадаў храму часцінку святых мошчаў Марыі-Магдаліны[42].

У 1992 г. побач з царквой, з паўднёвага боку, была пастаўлена невялікая мураваная Свята-Прадцечанская царква, якую асвяцілі 24 лютага 1995 г. У гэтым храме спраўляецца таінства хрышчэння[43].

Як вышэй згадана, царква заснавана на месцы, дзе было шмат пахаванняў, першыя з якіх датуюцца XVIII ст.[44] Пра больш познія гаворыцца ў адносіне Маскоўскай канторы Сінода пракурору, правадзейнаму статскаму саветніку і кавалеру В. М. Міхайлаву ад 30 снежня 1844 г., г. зн. часу, калі ішла перапіска аб узвядзенні новага будынка царквы пасля пажару 1835 г., аб неабходнасці пошуку дабрачынцаў на пабудову храма. У ёй адзначана, што на Старажоўскіх могілках «покоятся тела многих знаменитых лиц и многих тысяч воинов, окончивших жизнь в 1807 году и в несчастную годину 1812 года...»[45]

Нашчадкі аддалі даніну ўсім пахаваным на гэтым вякамі намоленым месцы. У буклеце, прысвечаным 150-годдзю Мінскай Свята-Марыі-Магдалінінскай царквы, гаворыцца, што ў яе агароджы пастаўлены манумент у іх памяць[46]. Гэта адбылося 13/26 чэрвеня 1993 г. па благаславенню мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі Філарэта ў сувязі з 200-годдзем Мінскай епархіі*.

Два стагоддзі існуе на былых Старажоўскіх могілках у Мінску царква Св. Марыі Магдаліны[47]. Не ўвесь гэты час яна дзейнічала і выкарыстоўвалася па прамому прызначэнню[48]. Пасля пажару 1835 г. не адразу паставілі новы будынак[49]. Трохі больш за два дзесяцігоддзі працы ў савецкі перыяд, у тым ліку ў час нямецка-фашысцкай акупацыі[50]. Але гэта дробязі ў параўнанні з лёсам іншых храмаў, як праваслаўных, так і іншых рэлігійных канфесій, знішчаных у час ваяўнічай барацьбы з рэлігіяй пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

---

* Надпіс на мануменце. — *А. Г.*

Зараз царква мае выгляд, які ў асноўным не вельмі адрозніваецца ад мураванага будынка, пастаўленага ў 1847 г.[51]

Дакументы НГАБ, што тычацца царквы, даюць магчымасць не толькі ведаць яе гісторыю, але і выкарыстоўваць іх практычна, на аднаўленча-рэстаўрацыйных работах.

---

[1] Шыбека З. В. і Шыбека С. Ф. Культавыя будынкі // Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. Мн., 1994. С. 301—302.

[2] Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска: Кн 1-я. Мн., 2001. С. 452—454.

[3] НГАБ. Ф. 24. Воп. 1. Арк. 555, 919; Ф. 136. Воп. 1. Арк. 2879, 6800, 35465, 43450; Ф. 295. Воп. 1. Арк. 29; Ф. 299. Воп. 5. Арк. 644; Ф. 2786. Воп. 1. Арк. 237.

[4] Там жа. Ф. 1457. Воп. 1. Арк. 1.

[5] Там жа. Ф. 136, 295, 299, 24, 2786.

[6] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 2.

[7] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 38.

[8] Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска: Кніга 1-я. Мн., 2001. С. 452.

[9] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 38.

[10] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 29. Арк. 11; Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. С. 454.

[11] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 39.

[12] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 2.

[13] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 29. Арк. 12.

[14] Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 2879. Арк. 5.

[15] Там жа. Спр. 6800. Арк. 13.

[16] Там жа. Арк. 45.

[17] Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. С. 454.

[18] НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6800. Арк. 176адв.—181.

[19] Там жа. Арк. 215—216адв.

[20] Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6800. Арк. 283адв.

[21] Там жа. Арк. 536.

[22] Там жа. Арк. 538.

[23] Минский кафедральный Петропавловский собор / Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям (Приложение к Минским епархиальным ведомостям за 1878 г.). Мн., 1878. С. 20.

[24] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 2.

[25] Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. С. 453.

[26] НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35465. Арк. 55адв.

[27] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 2.

[28] НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 43450. Арк. 3.

[29] Архимандрит Николай. Историко-статистическое описание Минской епархии. СПб., 1864. С. 175.

[30] Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. С. 454.
[31] НГАБ. Ф. 1457. Воп. 1. Спр. 1.
[32] Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 43450. Арк. 1адв.; Спр. 6800. Арк. 47.
[33] Архимандрит Николай. Историко-статистическое описание Минской епархии. С. 174—176.
[34] НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35465. Арк. 53—53адв., 55.
[35] Там жа. Арк. 53адв., 57—61.
[36] «Памятная книжка Минской епархии на 1887 г.» Мн., 1886. С. 12.
[37] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 40.
[38] Там жа.
[39] НГАБ. Ф. 2786. Воп. 1. Спр. 237. Арк. 8.
[40] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 40.
[41] Чарняўская Т. І. Мінская царква Марыі Магдаліны // Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993. С. 322.
[42] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 3.
[43] Там жа.
[44] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 38.
[45] НГАБ, ф. 136. Воп. 1. Спр. 6800. Арк. 283.
[46] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 3.
[47] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 39; Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 2.
[48] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 40.
[49] НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6800. Арк. 45, 176адв.—181, 215—216адв., 283адв., 536, 538; Чарняўская Т. І., Седлярэвіч Т. І. Царква Марыі Магдаліны // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. С. 454.
[50] Крыванос Х., Зайцаў В. Менская царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны // Вестник Белорусского Экзархата. 1990. № 5. С. 40; Чарняўская Т. І. Мінская царква Марыі Магдаліны // Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993. С. 322.
[51] Минская Свято-Марии-Магдалининская церковь — 150 лет // Буклет. Мн., 1997. Л. 3.

В. В. Губина

Конфессии Северо-Западного края Российской империи в литературе XIX в.

Название «Северо-Западный край» впервые было употреблено в указе о преобразовании северо-западных губерний от 30 декабря 1842 г. В XIX — начале XX в. обозначало северо-западную часть Российской империи, включавшую территории Виленской, Витебской, Гродненской, Ковенской, Могилевской и Минской губерний. Широко использовалось после восстания 1863—1864 гг.

Исследования XIX в. в области православного, католического и униатского вероисповеданий можно разделить на два направления: богословское и светское.

Богословское направление являлось более узким в силу того, что затрагивало непосредственно вопросы веры. Главный аспект богословия XIX в. состоял в том, чтобы указать отличительные черты христианских конфессий, выявить приоритетную сторону православия и описать обряды, таинства, внутреннее убранство храмов, ссылаясь на Священное Писание и на наставления отцов древней церкви. Соответственно, богословское направление было практически православным, так как священнослужителям многонационального и многоконфессионального государства, каким являлась Российская империя, необходимо было паству удержать на своей стороне.

Идея польской государственности постоянно давала о себе знать, и католические ксендзы ее поддерживали в силу претензии католического костела на абсолютную власть, т. е. полного окатоличивания населения, проживавшего на данной территории. Поэтому православное духовенство пыталось привлечь на свою сторону верующих мерами назидательными через издание православной богословской литературы нравственного толка.

Поскольку церковь в то время не отделялась от государства, то соответственно она выражала государственные интересы, и в какой-то степени ее действия носили политический характер, хотя и завуалированный. Стоит только отметить, что активное издание полемической, наставительной богословской литературы выпадает на XIX в. — век, богатый политическими событиями. Мы знаем многое об Отечественной войне 1812 г., восстаниях 1830—1831 и 1863—1864 гг. Естественно, что и разделы Речи Посполитой наложили отпечаток на умы того времени.

В 1805 г. были опубликованы «Нравственные богословии: В пользу обучающегося юношества и всех христиан, хотящих познавать и использовать свои должности»[1]. Именно подрастающему поколению адресовалась подобная книга. С раннего возраста закладываются основы формирования человека и его подчинения власти.

Основные нравственные принципы излагались в «Духе Массильона, епископа Клермонскаго, или Мыслях избранных из его творений о различных предметах нравственности и благочестия», изданном в 1808 г. при поддержке Святейшего Синода[2].

Список богословских публикаций продолжился в 1816 г. переизданием произведения Иоанна Златоуста «Беседы о покаянии»[3], а также в

1820 г. Макария Египетского «Преподобнаго отца нашего Макария Египетскаго, нареченнаго Великим, духовныя преполезныя беседы о совершенстве, христианам приличном, и о снискании котораго им стараться надлежит, в которых истинные христиане, яко в некоем священном кладезе, целение от недугов душевных и самое спасение неоскудно почерпать могут»[4]. Под истинно христианским благочестием подразумевалось православное. Авторы не скупились на цитаты из оригинальных произведений Златоуста, Макария Египетского и епископа Клермонского, посредством которых и строилось доказательство о необходимости служить христианской (православной) церкви.

Однако помимо воспитательной богословской литературы православные священники издавали различные толкования сути православных должностей и иерархии, которые служили инструкциями духовенству и давали возможность ознакомиться со структурой церковной организации подданным империи. Примером могут служить следующие из них: «О должностях пресвитеров приходских» (1801)[5] и «Духовный регламент» (1802)[6].

Светские произведения начала XIX в. представляют собой энциклопедические издания. Так, в работе «Картина России, изображающая историю и географию, хронологически, генеалогически и статистически со включением обозрения по духовной, военной и гражданской ея частям, как в первобытном ея состоянии, так и в царствование государя императора Александра I» (1807)[7] освещается иерархия православной церкви с древнейших времен до Александра I, что представляет собой исторический момент. В большой степени здесь собран статистический материал с перечислением епархий всех вероисповеданий, монастырей и верховного духовенства. Вполне естественно, что в книге восхваляются деяния русских царей: Петра I, Екатерины II и Александра I, которые способствовали проведению ряда реформ в государстве, в том числе и церковных. В отношении конфессий автор использовал лишь статистические данные, указав количество только православных построек. Сведения о католическом и униатском вероисповеданиях сводятся к перечислению епархий и занимают небольшой объем в произведении.

Интересной представляется пометка в книге: «Собрано из верных источников», а какие источники считались верными, неизвестно.

В 1818 г. Яков Орлов, профессор всеобщей и церковной истории, опубликовал «Памятник событий в церкви и отечестве, содержащий в себе: историю церковных праздников, жития святых, историческое изображение состояния греко-российския церкви и духо-

венства, деяния всех российских государей, славные подвиги полководцев»[8]. Обращает на себя внимание структура работы: автор приводит примечательные события из российской истории, произошедшие в январе—феврале с древнейших времен до 1814 г. Каждое событие приурочено к деяниям какого-либо святого православной церкви. Помимо деяний, автор составил перечень всех святых IX—XII вв. и описал состояние православной церкви в указанный период.

В 1827 г. униатский епископ Иосиф Семашко, встав на путь православия, выступил зачинателем перемен в области изучения церковной истории. Он изложил свой взгляд на униатскую церковь как на православную по сути. В своем труде в форме записок И. Семашко привел план реорганизации этой церкви, получивший полное одобрение со стороны правительства. Факт включения духовного лица в полемику об униатском вероисповедании и его месте не только в духовной жизни паствы, но и в политической можно считать переломным в историографии, так как священники, и православные, и униатские, прекратили издавать только нравственные наставления для христиан и занялись политикой.

Однако в светской литературе еще сохранялся интерес к древней церкви. Если И. Семашко открыто выступал с критикой современной ему униатской конфессии, то Иродион Ветринский для оправдания превосходства православия адресовал российскому императору свой труд «Памятники древней христианской церкви или христианских древностей, с описанием таинств, богослужения, храмов, праздников, постов, иерархии, разных соборных постановлений и всех обрядов и обычаев, бывших в древней христианской церкви» (1829—1844)[9], в котором обращался к древнему периоду в силу того, что православная церковь сохранила первоначальный облик, каковой существовал у христианской церкви до ее раздела в 1054 г. Характерным для этой работы является перечень требовний, согласно которым формировался интерьер православного храма, оставшийся неизменным. Истинного христианина (православного) церковь должна была привлекать своим внутренним убранством, а не внешним. Не случайно в произведении отсутствует характеристика внешних форм храма. Более того, описывая интерьер, И. Ветринский опирался на Священное Писание, подчеркивая тем самым древность православного вероисповедания.

Во второй половине XIX в. вопросы религии рассматривались уже в контексте политической истории, а не богословия.

гледжана, як ужо вышэй сказана, ягонай першай інструкцыяй ад 24 мая 1863 г. У 5-м артыкуле адзначалася, што вайскова-павятовыя начальнікі павінны былі «постоянно с некоторой частью находящихся в их распоряжении войск очищать уезды от… мятежных скопищ»[8]. Генерал-губернатар і камандуючы Віленскаю ваеннаю акругаю асабіста кантраляваў ход барацьбы з паўстанцамі. Гэта вынікае з ягонага загада мінскаму ваеннаму губернатару і камандуючаму войскамі ў Мінскай губерні ад 11 чэрвеня 1863 г. У ім паведамлялася, што шэраг камандзіраў карных злучэнняў імкнуцца пазбягаць непасрэдных сутыкненняў з паўстанцкімі атрадамі і абмяжоўваюцца перастрэлкамі на адлегласці. У сувязі з гэтым М. М. Мураўёў распарадзіўся адхіліць такіх афіцэраў, напрыклад маёра Нарвскага палка Азоўскага, падпалкоўніка артылерыі Булгарына і інш., ад займаемых імі пасадаў[9]. У дакументе адсутнічае якая-небудзь інфармацыя аб прычынах такіх паводзінаў гэтых вайскоўцаў. Лічачы па прозвішчах, яны маглі быць мясцовага паходжання. Таму мы можам выказаць меркаванне, што альбо яны спачувалі паўстанню, альбо проста не жадалі выказваць вялікага службовага імпэту супраць сваіх землякоў, а магчыма, і сваякоў.

Да сярэдзіны лета 1863 г. урадавыя войскі змаглі разбіць найбольш буйныя паўстанцкія атрады, што змяніла і тактыку барацьбы з імі. Аб гэтым сведчыць і прадпісанне штаба Віленскай ваеннай акругі камандуючаму войскамі ў Мінскай губерні ад 13 ліпеня 1863 г., у якім загадваецца выкарыстоўваць супраць «мяцежнікаў» невялікія вайсковыя адзінкі (не болей роты). З мэтаю вышуку паўстанцаў і кантролю мясцовых дарог меркавалася выкарыстоўваць разам з сельскай вартаю казацкія сотні, што меліся амаль у кожным павеце. Затрыманых з ліку абшарнікаў, шляхты і ксяндзоў загадвалася судзіць ваенна-палявым судом на працягу 24 гадзін, а смяротныя прысуды выконваць адразу пасля зацвярджэння іх вайскова-павятовымі начальнікамі[10].

Апошнія непасрэдна кіравалі дзеяннямі армейскіх часцей па ліквідацыі паўстанцкіх груп. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, данясенні пінскаму вайскова-павятоваму начальніку ад афіцэраў Нарвскага, Палтаўскага, Пскоўскага і Шуйскага пяхотных палкоў аб пошуку і разгроме паўстанцаў[11].

Адначасова ваенная барацьба з паўстанцамі падмацоўвалася шэрагам мерапрыемстваў паліцэйскага характару. Прыкладам можа быць цыркуляр мінскага грамадзянскага губернатара А. Л. Кажэўнікава ад 28 чэрвеня 1863 г. аб увядзенні асобага нагляду над продажам і набыццём кос. Усе, хто жадаў набыць гэты тавар, павінны былі

звярнуцца да мясцовых паліцэйскіх уладаў дзеля атрымання спецыяльнага білета, які даваў права на ажыццяўленне пакупкі. У сваю чаргу, усе прадаўцы павінны былі паведамляць паліцыі аб колькасці кос, што знаходзяцца ў іх для продажу, і прадаваць толькі па адпаведных білетах. Перадача альбо перапродаж кос іншым асобам, акрамя прадаўцоў і пакупнікоў, без ведама і дазволу ўладаў строга забараняліся. Парушальнікі ўмоў гэтага цыркуляра павінны былі разглядацца як удзельнікі паўстання і пакараны адпаведным чынам[12].

17 ліпеня 1863 г. мінскі ваенны губернатар загадаў устанавіць кантроль за судаходствам на ўсіх водных шляхах агульнымі намаганнямі паліцыі, сельскай варты і воінскіх камандаў. Непасрэднае кіраўніцтва гэтым было ўскладзена на вайсковых начальнікаў паветаў і станаў, аб чым сведчыць, напрыклад, адпаведны загад кіраўніку 3-га стану Слуцкага павета ад 29 ліпеня 1863 г.[13]

Падобныя меры мелі на мэце спыніць усе магчымыя каналы забеспячэння паўстанцаў зброяй, боепрыпасамі, харчам і іншымі прыладамі дзеля канчатковага іх разгрому. Але каб дасягнуць сапраўднай перамогі, расійскім уладам было неабходна, як слушна адзначыў у сваіх успамінах ад'ютант цара Аляксандра II і шэф корпуса жандараў, а ў дадзены час кіраўнік справаводства ў канцылярыях М. М. Мураўёва П. А. Чарэвін, абаперціся на які-небудзь стан мясцовага грамадства краю[14]. Было вырашана выкарыстаць напружаныя сацыяльныя адносіны паміж апалячаным дваранствам Беларусі і Літвы і сялянствам, якое ў апошнія дзесяцігоддзі перад адменай прыгоннага права пазбавілася значнай часткі сваёй зямлі на карысць першага. Трэба адзначыць, што ўжо ў першых сваіх маніфестах і дэкрэтах паўстанцкія ўрады Варшавы і Вільні абвясцілі аб перадачы сялянам ва ўласнасць той зямлі, якой яны карысталіся на момант выдання вышэйназваных дакументаў. Аднак гэта было зроблена ў агульна-дэкларатыўным выглядзе без канкрэтызацыі таго, якім чынам зямельная рэформа будзе рэалізоўвацца на практыцы. Таксама ў іх нічога не гаварылася аб вяртанні раней адабраных надзелаў. У падобнай сітуацыі царская адміністрацыя змагла скарыстаць незадаволенасць сялян у барацьбе з паўстаннем, што знайшло сваё адлюстраванне ў стварэнні сельскай варты, фактычна дапаможных вайскова-паліцэйскіх фарміраванняў, перадачы сялянам зямельных надзелаў і маёмасці шляхты і аднадворцаў — удзельнікаў паўстання, што прадугледжвалася адпаведнымі палажэннямі мураўёўскіх інструкцый. Іх рэалізацыяй павінны былі займацца ваенныя і грамадзянскія ўлады краю. Так, 18 чэрвеня 1863 г. мінскі грамадзянскі губернатар А. Л. Кажэўнікаў на-

кіраваў вайсковым начальнікам паветаў, павятовым спраўнікам і мясцовай палаце дзяржаўных маёмасцяў загад аб перадачы ў распараджэнне сельскіх грамад зямельных надзелаў і сядзіб шляхты, аднадворцаў, іншых разначынцаў, якія прымалі ўдзел у паўстанні. Надзелы і сядзібы павінны былі быць размеркаваны сярод беззямельных і малазямельных сялян, а таксама сярод тых, хто прымаў удзел у барацьбе з паўстанцамі. На сельскія грамады ўскладаўся абавязак весці назіранне за паводзінамі мясцовай шляхты, аднадворцаў, службоўцаў адміністрацыі маёнткаў, дваровай чэлядзі, якія пражывалі на землях адпаведнай грамады[15].

Адначасова ўлады праводзілі дыферэнцыраваную палітыку ў адносінах да тых паўстанцаў, якія з'явіліся з павіннай, у залежнасці ад іх сацыяльна-класавай прыналежнасці. У сваім прадпісанні ад 17 ліпеня 1863 г. М. М. Мураўёў дазволіў начальнікам паветаў «водворять на прежних местах жительства с отдачею на благонадежное поручительство...» тых сялян, аднадворцаў і мяшчан, што добраахвотна вярнуліся з паўстанцкіх атрадаў. Былых жа паўстанцаў з ліку абшарнікаў, службоўцаў і наогул шляхты і разначынцаў загадвалася трымаць пад арыштам да асабістага распараджэння генерал-губернатара. З мэтаю прымусіць землеўладальнікаў адмовіцца ад падтрымкі паўстанцкага руху і забяспечыць лаяльнасць з боку сялянства было прадпісана ў выпадках нападу паўстанцаў на мясцовых святароў альбо сялян з тых маёнткаў, на тэрыторыі якіх гэта адбывалася, канфіскоўваць свойскае быдла і гаспадарчы інвентар. Канфіскаваную маёмасць неабходна было размяркоўваць сярод тых сялян і святарскіх сем'яў, якія пацярпелі ад наступстваў паўстання або садзейнічалі ўладам у барацьбе з ім[16].

Загадам камандуючага войскамі і часовага вайсковага губернатара Мінскай губерні генерал-лейтэнанта В. І. Забалоцкага на чыншавую шляхту ў час дзеяння ваеннага становішча ў краі было распаўсюджана выкананне пастойнай і фурманкавай павіннасцяў, якія раней абавязаны былі выконваць толькі сяляне[17]. Пазней, 25 жніўня 1863 г., галоўны начальнік краю распарадзіўся ўскласці фурманкавую павіннасць на ўсю шляхту, абшарнікаў і мяшчан так званага «польскага паходжання», г. зн. у асноўным беларусаў каталіцкага веравызнання, паколькі этнічныя палякі складалі невялікую долю насельніцтва Беларусі[18].

У сувязі з падаўленнем узброенага супраціўлення М. М. Мураўёвым восенню—зімою 1863—1864 гг. былі выдадзены новыя дадаткі да інструкцый аб ваенна-грамадзянскім кіраванні ў паветах Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў ад 24 мая 1863 г. Паколькі адпаведна атрыманым дадзеным шэраг кіраўні-

коў паўстання з надыходам халоднага надвор'я распусцілі свае атрады і частку з іх размясцілі на зімніх кватэрах, пераважна ў абшарніцкіх маёнтках і шляхецкіх ваколіцах, то вайскова-павятовыя начальнікі і паліцэйскія службоўцы павінны былі прасачыць, каб усе мясцовыя жыхары заносіліся ў спецыяльныя абывацельскія кнігі. Загадвалася весці асаблівае назіранне за панскімі сядзібамі і фальваркамі, рыма-каталіцкімі кляштарамі, пляцанямі, дамамі ксяндзоў з мэтаю вышуку ўдзельнікаў паўстання (§ 1)*. Шляхецкія ваколіцы і аднадворныя грамады падлягалі калектыўнай адказнасці за садзейнічанне паўстанцам. Яны аблагаліся спецыяльным штрафным зборам. Службовыя асобы гэтых ваколіц і грамад павінны былі несці персанальную адказнасць (§ 3). Таксама быў уведзены строгі нагляд за тымі абшарнікамі і шляхтаю гэтак званага «польскага паходжання», якія вярталіся з-за мяжы па асобаму царскаму ўказу (§ 7). З мэтаю канчаткова паралізаваць дзейнасць паўстанцкага падполля пацвярджалася ранейшая забарона ўсім мясцовым абывацелям, акрамя сялян, ад'язджаць са свайго сталага месца жыхарства болей чым на 30 вёрст без дазволу павятовых альбо губернскіх улад (§ 6).

Паколькі ў шэрагу сельскіх школ працягвалася выкладанне польскай мовы, а рыма-каталіцкае святарства спрабавала прапагандаваць сярод праваслаўных сялян «польскі» (каталіцкі) катэхізіс, то вайскова-павятовыя начальнікі, паліцэйскія чыноўнікі і міравыя пасрэднікі павінны былі забяспечыць навучанне ў школах Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Ковенскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў выключна на рускай мове, не дапускаць распаўсюджвання сярод вясковага насельніцтва польскамоўных дапаможнікаў і сярод праваслаўных каталіцкіх катэхізісаў (§ 8). Забаранялася таксама ўжыванне польскай мовы ў афіцыйнай перапісцы сельскіх адміністрацыйных устаноў (§ 11)[19].

Асноўнымі накірункамі дзейнасці ваенна-паліцэйскіх і цывільных уладаў у канцы 1863—1864 гг. былі захады па ліквідацыі паўстанцкага падполля з мэтаю прадухілення новага ўздыму ўзброенай барацьбы, а таксама меры па вышчасненні альбо значным абмежаванні выкарыстання польскай мовы і ўплыву рыма-каталіцкага касцёла, які лічыўся адным з аплотаў «польскаці» ў краі. У сваім сакрэтным лісце вайсковаму губернатару Мінскай губерні ад 24 снежня 1863 г. галоўны начальнік краю яшчэ раз нагадваў пра абавязак вайсковых начальнікаў паветаў прымаць меры «для очищения подведомственных им местностей от революционной организации». Ён падкрэсліваў, што калі яны не будуць своечасова

* Тут і ў далейшым спасылкі на параграфы новых дадаткаў да інструкцыі аб вайскова-грамадзянскім кіраванні.

выяўлены, то пры ўзнікненні спрыяльных абставін зноў пачнуць актыўна дзейнічаць, г. зн. рыхтаваць новае паўстанне[20]. Гэта было ўжо не першае прадпісанне падобнага кшталту віленскага генерал-губернатара. На іх падставе мясцовыя ўлады распрацоўвалі ўласныя мерапрыемствы. Так крыху раней, 14 снежня 1863 г., было загадана валасным і сельскім управам пільна сачыць за дзейнасцю абшарнікаў, арандароў маёнткаў і мясцовай шляхты, каб у іх дамах не праводзіліся ніякія сходы, асабліва з удзелам асоб, якія прыбылі ў дадзеную мясцовасць, папярэджваць аб недапушчальнасці прыёму ў сваіх дамах такіх людзей і аб неабходнасці паведамляць мясцовым уладам аб усіх наведвальніках[21].

Расійская адміністрацыя ўзмацніла нагляд над мясцовымі навучальнымі ўстановамі, паколькі шмат хто з вучнёўскай моладзі папоўніў шэрагі паўстанцаў. Яшчэ 31 ліпеня 1863 г. папячыцель Віленскай навучальнай акругі князь А. П. Шырынскі-Шыхматаў накіраваў спецыяльнае прадпісанне кіраўнікам вучэльняў і гімназій. Настаўнікам прапаноўвалася ўзяць пад уласны нагляд кватэры, дзе пражывалі навучэнцы і гімназісты. Апошнім было ўскладзена ў абавязак мець пры сабе, пакідаючы свае кватэры, спецыяльныя вучнёўскія білеты. Кіраўніцтва навучальных устаноў несла персанальную адказнасць у тых выпадках, калі гаспадары вучнёўскіх кватэраў аказваліся палітычна нядобранадзейнымі[22].

11 снежня 1863 г. мінскі вайсковы губернатар загадаў начальніку Пінскага павета асабіста наглядаць за станам спраў у мясцовай гімназіі. Прыблізна праз месяц, 15 студзеня 1864 г., кіраўнік павета атрымаў загад ад цывільнага губернатара Мінскай губерні аб выяўленні месцаў знаходжання вучняў, што не вярнуліся ў свае навучальныя ўстановы пасля вакацый. З бацькоў і апекуноў тых навучэнцаў, якія далучаліся да паўстанцаў, спаганяўся грашовы штраф. Так, 24 лютага 1864 г. адпаведна рашэнню мінскага цывільнага губернатара на арандара маёнтка Сенчыцы Пінскага павета Антона Лявіцкага, сыны якога Нікадзім і Уладзіслаў у свой час уступілі ў атрад Людвіка Нарбута, быў накладзены штраф памерам 200 руб.[23]

Па-ранейшаму прымаўся шэраг мер паліцэйскага характару каб канчаткова ліквідаваць тайныя рэвалюцыйныя арганізацыі. 25 кастрычніка 1863 г., выконваючы абавязкі мінскага цывільнага губернатара, віцэ-губернатар Лучынскі аддаў загад мясцовым вайсковым і паліцэйскім уладам прымаць адпаведныя захады з мэтаю раскрыцця паралельных структур улады, створаных паўстанцамі: грамадзянскіх і вайсковых начальнікаў, камісараў, зборшчыкаў падаткаў і інш. У якасці прыкладу праводзіўся нядаўні арышт у Лідскім павеце пад-

польных камісара і некалькіх парафіяльных кіраўнікоў. Дзеля дасягнення гэтага загадвалася весці пільнае назіранне за паводзінамі ўплывовых мясцовых жыхароў: ксяндзоў, службоўцаў, дактароў і інш., асабліва тых, чыя дзейнасць звязана з пастаяннымі раз'ездамі[24].

Нягледзячы на тое што да канца таго ж году ўзброены рух быў падаўлены, улады тым не менш дапускалі магчымасць ягонага рэцыдыву вясной 1864 г. Таму 24 кастрычніка 1863 г. была зроблена спецыяльная аб'ява мінскага грамадзянскага губернатара А. Л. Кажэўнікава наконт адказнасці рамеснікаў-габрэяў за выраб цёплага адзення, абутку і іншага рыштунку для паўстанцаў. Адказнасці падлягалі не толькі самі майстры, што выконвалі падобныя заказы, але і тыя габрэйскія грамады і рамесныя цэхі, да якіх яны прыпісаны. На іх накладваўся ў такіх выпадках грашовы штраф. Калі заказы выконваліся ў абшарніцкіх маёнтках, то іх ўладальнікі таксама павінны былі, акрамя асабістай адказнасці, сплачваць грашовы штраф[25].

Каб прадухіліць магчымыя кантакты паміж прадстаўнікамі падполля і іх аднадумцамі за мяжою, у кастрычніку таго ж года вайскова-павятовым начальнікам былі аддадзены загады аб правядзенні вобыскаў у прадстаўнікоў абшарніцтва і шляхты, якія адпаведна царскаму ўказу вярнуліся з-за мяжы, дзеля вышуку рэвалюцыйнай літаратуры, перапіскі з удзельнікамі паўстання і інш.[26]

У сакавіку і красавіку 1864 г. мінскім вайсковым губернатарам зноў быў паўтораны яго ранейшы загад пра кантроль за судаходствам на рэках і каналах з дапамогаю паліцыі, сельскай варты і вайсковых камандаў[27]. 30 красавіка 1864 г. мінскі віцэ-губернатар, які выконваў абавязкі цывільнага губернатара, накіраваў мясцовым уладам ліст аб узмацненні кантролю за продажам купцамі з Рыгі кос[28].

20 кастрычніка 1863 г. часовы ваенны губернатар і камандуючы войскамі ў Мінскай губерні выдаў цыркуляр аб замене польскамоўных шыльдаў у крамах, аптэках і корчмах на рускамоўныя. Аналагічны загад выдаў у красавіку 1864 г. і мінскі цывільны губернатар А. Л. Кажэўнікаў. Пры гэтым рускамоўнымі павінны былі быць не толькі шыльды, але таксама ўсялякія аб'явы і рахункі[29]. 15 красавіка 1864 г. генерал-губернатар М. М. Мураўёў сваім лістом нагадаў мінскаму рыма-каталіцкаму біскупу Аляксандру Вайткевічу аб неабходнасці пад пагрозаю грашовага штрафу перавесці справаводства ў яго епархіі з польскай мовы на рускую[30].

З чэрвеня таго ж года ў адпаведнасці з прадпісаннем выконваючага абавязкі цывільнага губернатара Мінскай губерні Шалгунова са школ,

бібліятэк, кніжных крамаў і прыватных збораў сталі выдзяляць і знішчаць усе экземпляры польскамоўнага гістарычнага дапаможніка Аляксандра Здановіча. Уладальнікі прыватных бібліятэк і крамаў павінны былі даць падпіску наконт гэтага. Наступным месяцам кіраўнік губерні забараніў распаўсюджванне тых кніг, што завозіліся сюды з Варшавы. 16 верасня 1864 г. цыркулярам мінскага губернатара было абвешчана аб закрыцці «польскіх» бібліятэк, створаных шляхціцамі і службоўцамі «польскага паходжання». У лістападзе таго ж года стала дзейнічаць забарона на продаж каляндароў варшаўскага, бярдзічаўскага і іншых польскамоўных выданняў. Яшчэ раней, у кастрычніку 1864 г., Аляксандр II на падставе хадайніцтва М. М. Мураўёва забараніў выкарыстанне польскай мовы ў навучальных і выхаваўчых установах Беларусі і Літвы. 12 лістапада 1864 г. начальнік Мінскай губерні звярнуўся да мясцовых уладаў з патрабаваннем прадставіць яму свае меркаванні наконт перайменавання вуліц з «польскімі» назвамі, г. зн. звязаных з гісторыяй Рэчы Паспалітай, у населеных пунктах Міншчыны[31].

Адначасова прымаліся, як ужо вышэй згадвалася, меры па абмежаванні ўплыву рыма-каталіцкага святарства на праваслаўнае насельніцтва, асабліва сялянства. 24 ліпеня 1864 г. мінскі губернатар загадаў павятовым начальнікам правесці канфіскацыю ў праваслаўных сялян польскамоўных малітоўнікаў. У выпадку, калі мясцовыя ксяндзы альбо абшарнікі працягвалі іх распаўсюджванне, на іх накладаўся штраф. Каб зменшыць колькасць наведвальнікаў касцёлаў, адпаведна цыркуляру кіраўніка губерні ад 28 ліпеня1864 г. аднаўляліся нядзельныя і святочныя кірмашы, раней адмененыя па хадайніцтву рыма-каталіцкай царквы. Таксама ўводзілася папярэдняя цэнзура казанняў для ксяндзоў. Яны абавязваліся выкарыстоўваць загадзя падрыхтаваныя і завераныя сваімі біскупамі тэксты. Калі ж справа тычылася ўласных твораў, то іх трэба было перадаваць на прагляд спецыяльна прызначаным у кожным павеце цэнзарам, за добранадзейнасцю якіх сачылі мясцовыя ўлады[32].

З мэтаю заахвочвання лаяльнасці сялянства і пакарання мясцовай шляхты за падтрымку паўстання было вырашана не ўзнаўляць кантракты на арэнду казённых маёнткаў з ранейшымі арандарамі. Пры гэтым тыя зямельныя плацы, што адрэзаны ад сялянскіх гаспадарак і далучаны да арандаваных фермаў, павінны быць вернуты іх ранейшым карыстальнікам. Адпаведны цыркуляр з канцылярыі мінскага губернатара ад 31 жніўня 1864 г. накіроўваўся вайсковым начальнікам паветаў[33].

Абагульняючы вышэйсказанае, можна прыйсці да высновы, што расійскія ўлады змаглі дасягнуць поспеху ў барацьбе з паўстаннем

дзякуючы аб'яднанню ваеннай і грамадзянскай улады ў адных руках як у цэнтры (наданне М. М. Мураўёву надзвычайных паўнамоцтваў), так і на месцах (стварэнне інстытута вайскова-павятовых начальнікаў). Менавіта апошнія непасрэдна ажыццяўлялі ў сваіх паветах каардынацыю, гаворачы сучаснаю моваю, контрпартызанскай барацьбы з выкарыстаннем усіх сілавых структураў: вайсковых злучэнняў, мясцовай паліцыі і дапаможных фарміраванняў (сельская і лясная варты).

Узброеная барацьба з паўстанцкімі атрадамі спалучалася з усталяваннем жорсткага паліцэйскага кантролю над тымі сацыяльнымі слаямі мясцовага грамадства, якія аказвалі альбо маглі аказваць ім падтрымку: абшарнікі, шляхта і аднадворцы, рыма-каталіцкае святарства. Яго мэтаю было пазбавіць паўстанцаў усялякай падтрымкі з боку іх патэнцыяльных прыхільнікаў.

Каб забяспечыць патрымку сялянства ў барацьбе з паўстанцкім рухам, расійскімі ўладамі быў праведзены шэраг мер (стварэнне сельскай варты, перадача сялянам маёмасці і зямельных надзелаў удзельнікаў паўстання і інш.).

Дадатак № 1[14]

Дырэктыва аб вяртанні дзяржаўным сялянам тых зямельных надзелаў, што былі адабраны да 1861 г.

Министерство внутренних дел
Начальника Минской губернии
Августа 31 дня 1864 г.
№ 2593
г. Минск

Военному начальнику
Пинского уезда

При образовании в 1858 г. в казенных имениях западных губерний ферм чиновники поверочной люстрации, которым поручено было это дело, состоя почти исключительно из лиц польского происхождения и действуя в ущерб интересов крестьян, умышленно отрезывали во многих имениях лучшие земли и необходимые угодия от крестьянских участков и располагали фермерные земли так, что границы владения фермы проходили по самым задворкам селений, а земли крестьянские отстояли за несколько верст от их жилья. Вследствие такой неправильной и неудобной отрезки во многих имениях крестьяне поставлены в невозможность вести надлежащим образом свое хозяйство, которое с отнятием у них лучших участков земли лишило их необходимых выгод. Такие неправильные, противозаконные и противные видам правительства действия чиновников бывшей поверочной люстрации, имевшие отчасти в основании своем цель подготовить крестьян к содействию образовавшихся уже тогда революционных комитетов, необходимо должны быть отменены и ныне при устройстве быта государственных крестьян следует возвратить те земли и участки, которые неправильно отрезаны от них люстрацией и отданы под фермы.

Главный начальник края, имея это в виду, признает справедливым ныне же приступить к исполнению сего.

Для приведения в исполнение распоряжения Его Высокопревосходительства я покорнейше прошу Вас, Милостивый Государь:

1. Собрать возможно верные сведения, в каких именно местах отрезаны от крестьянских участков лучшие земли и необходимые угодия и в каком размере.
2. Согласно циркулярному распоряжению предместника моего от 18 ноября прошедшего года за № 3336 вновь составить именной список всех без исключения арендаторов казенных ферм, находящихся во вверенном Вам уезде, и представить мне с подробными сведениями, благонадежны ли эти арендаторы в политическом отношении, а также не были ли замечены они, их семейства, управители или прислуга в участии в мятеже или содействии оному.
3. Если в числе арендаторов найдутся такие, которые не подходят под означенную категорию и не нарушили ни в чем заключенных с ними контрактов, поручаю Вам войти с ними в соглашение о возвращении крестьянам неправильно прирезанных к фермам земель от крестьянских участков или о возврате самих ферм казне.

Причем как из общего хода дел по бывшему мятежу оказывается, что большая часть арендаторов содействовала оному снабжением мятежников припасами, беспрепятственным предоставлением пристанища шайкам и другими средствами, то по сему следует внушить арендаторам, что ныне мера соглашения, указанная в 3-м пункте сего предложения, есть мера снисхождения и милости со стороны правительства, которою они должны воспользоваться ввиду соблюдения своих выгод.

О действиях и вообще распоряжениях Ваших по всему изложенному выше предлагаю Вам, Милостивый Государь, мне донести с представлением по каждой ферме особо результатов соглашения с арендаторами оных.

Генерал-майор (подпись)*

Заведующий секретным отделением (подпись)

Дадатак 2[35]

Аб'ява мінскага грамадзянскага губернатара Кажэўнікавя рамеснікам і майстрам аб мерах пакарання за дапамогу мяцежнікам

Дошло до сведения генерал-губернатора здешнего края, что в некоторых пограничных с Царством Польским местностях, несмотря на сделанные распоряжения строго наблюдать, чтобы ремесленники и мастеровые не производили никаких работ для мятежников, — оказывается, что евреи-ремесленники, проживающие в местечках и деревнях, а иногда и городские мастера, вызываемые куда-либо на мызы, где полиция не может иметь над ними должного наблюдения, продолжают производить таковые работы и шьют для инсургентов полушубки, теплую одежду, обувь и другие предметы обмундировки.

Г. генерал от инфантерии Муравьев, признавая необходимым положить конец подобного рода промыслам, предложил мне независимо от производства обысков в открытых мастерских и складах одежды, где таковые имеются, объявить цеховым управам в городах и депутатам еврейских обществ в местечках, что в случае обнаружения мастеровых и промышленников, заготовляющих для мятежников одежду, кроме конфискации таковой и взысканий с хозяина штрафа в тройном размере стоимости найденного товара, общество или цех, к которому принадлежит виновный, будет в свою очередь обложено штрафом от 100 до 500 рублей серебром по ближайшему моему усмотрению; в таковом же размере будет наложен штраф и на помещиков и владельцев мыз, в имении которых производились эти работы независимо от личной каждого из них ответственности.

---

* Подпісы неразборлівыя.

Объявляю об этом для всеобщего сведения, что я со своей стороны приму самые строгие меры к точному исполнению означенного распоряжения и к поступлению с виновными по всей строгости законов. Октября 24 дня, 1863 года.

Минский гражданский губернатор Кожевников

---

[1] НГАБ. Ф. 1525. Воп. 2. Спр. 1. Арк. 4—5адв.
[2] Там жа. Арк. 4.
[3] Там жа. Арк. 4, 4адв., 5адв.
[4] Там жа.
[5] Там жа. Арк. 4—5адв.
[6] Там жа. Арк. 27адв, 28адв.—30адв.
[7] Там жа, Арк. 27адв.—28.
[8] Там жа, Арк. 27адв.—28, 29—29адв.
[9] Там жа. Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 231—231адв.
[10] Там жа. Арк. 231адв.
[11] Там жа.
[12] Там жа.Ф. 1525. Воп. 2. Спр. 2. Арк. 9.
[13] Там жа.
[14] Чарэвін П. А. Паўночна-Заходні край // Спадчына. 1993. № 3. С. 70—71.
[15] НГАБ. Ф. 1525. Воп. 2. Спр. 2, арк. 8—9.
[16] Там жа. Арк. 33—33адв.
[17] Там жа. Спр. 1. Арк. 2адв—3.
[18] Там жа. Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 50.
[19] Там жа. Арк. 34—34адв, 35адв., 37—37адв.
[20] Там жа. Арк. 3—4.
[21] Там жа. Ф. 1525. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 15—16.
[22] Там жа. Ф. 1527. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 83—83адв.
[23] Там жа. Ф. 1525. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 1—1адв., 11, 23.
[24] Там жа. Ф. 1527. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 86—87.
[25] Там жа. Арк. 98. Гл. дадатак № 2.
[26] Там жа. Спр. 2. Арк. 18—18адв.
[27] Там жа. Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 7—9адв, 15—16.
[28] Там жа. Спр. 6. Арк. 44.
[29] Там жа. Ф. 1525. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 9—10; Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 59—59адв.
[30] Там жа. Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 41—43.
[31] Там жа, Арк. 71, 108, 142, 144, 159—159адв., 163—164.
[32] Там жа. Арк. 92—93, 99, 148—149.
[33] Там жа. Спр. 4. Арк. 44—45. Гл. дадатак № 1.
[34] Там жа. Ф. 1521. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 44—45.
[35] Там жа. Ф. 1527. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 98.

С. А. Рыбчонак

Насельнікі Нясвіжскага замка ў сярэдзіне XIX ст.

Пачуўшы словы Нясвіж, Нясвіжскі замак — першае, што прыходзіць на памяць — Радзівілы. Сапраўды, гісторыя гэтага славутага роду вельмі цесна звязана як з замкам, так і з горадам. Таму па-за ўвагай

даследчыкаў застаюцца іншыя асобы, менш знакамітыя, але не менш цікавыя. Мы паспрабуем паказаць, што з Нясвіжам былі звязаны лёсы і звычайнай шляхты, мяшчан (гараджан), рамеснікаў ды іншага насельніцтва. Сёння яны стануць тэмай нашага доследу, прычым канкрэтна мы спынімся на разглядзе асоб, што працавалі і служылі ў Нясвіжскім замку ў 2-й трэці XIX ст. Матэрыялам для артыкула паслужылі звесткі, узятыя з рэвізій насельніцтва замка, датаваныя 1834, 1850 і 1868 гг.

Такую велізарную маёмасць, як замак, павінна была абслугоўваць значная колькасць людзей, у першую чаргу прыгонныя сяляне. Нашыя ўражанні, аднак, змяркаюць, калі даведацца, што абслугоўвалі замак не тысячы і нават не сотні чалавек, як ў канцы XVIII ст.

У 1834 г. да Нясвіжскага замка былі прыпісаны не менш як 93 рэвізскія душы, у тым ліку 45 мужчын і 48 жанчын. Згодна з рэвізскай сказкай яны налічвалі 55 асобных сем'яў. Пераважная большасць мужчын, аднак, былі нежанатыя. Сапраўдныя сем'і — з жонкамі і дзецьмі — былі ў меншасці. Вялікая колькасць сялян (каля 33 мужчын) збегла, галоўным чынам, у 1811—1814 гг. З улікам беглых і памерлых агульная колькасць належных да замка прыгонных дасягала 150 чалавек. Каб папоўніць шэрагі служкаў, адміністрацыя ў 1833—1834 гг. перавяла ў замак некалькі сем'яў з іншых маёнткаў. Усяго было пераведзена 38 чалавек, у тым ліку сяляне з вёсак Галавенчыцы, Сямёнчыцы і Свержань Мінскага, Сейлавічы і Кудзіновічы Слуцкага і Ластоўшчына Ігуменскага паветаў[1].

У 1850 г. у замку налічвалася 54 асобныя сям'і. Дакладней, сем'яў з іх было менш дзесяці, астатнія — нежанатыя мужчыны. Увогуле ў 1850 г. прыгонных сялян было ў наяўнасці няшмат: усяго 53 чалавекі — 28 мужчын і 25 жанчын[2]. Не змяніліся абставіны і пазней. На 1858 г. «в бегах», як менавалі ўцекачоў афіцыйныя расійскія крыніцы, знаходзілася 33 чалавекі. Агулам у 1858 г. прыпісаных да замка прыгонных сялян было ў наяўнасці 34 чалавекі, у тым ліку 20 мужчын (з іх толькі 16 дасягнулі дарослага ўзросту) і 14 жанчын (11 дарослых). Магчыма, такое становішча з прыгоннымі тлумачыцца тым, што ўладальнікі замка князі Вільгельм і Багуслаў Радзівілы стала пражывалі ў сярэдзіне XIX ст. за мяжой, а ў адміністрацыі не даходзілі рукі навесці патрэбны парадак.

Цяпер спынімся на адміністрацыі Нясвіжскай ардынацыі і замка. У замку размяшчалася так званае галоўнае кіраванне справамі і маёнткамі князёў Радзівілаў. Кіраўніком з мая 1857 г. быў калежскі асэсар Валерыян, сын Вінцэнта, Маліноўскі, 1829 г. нар., ураджэнец Віленскай губ., дзе валодаў маёнткам Віляны. Яго жонка Ванда, дачка Ста-

ніслава, з Сідаровічаў. З імі пражывалі шасцёра сыноў і дзве дачкі. Гувернанткай дзяцей была Міхаліна Якубоўская з Вільны, а нянькай — Аўгуста Рэкліс (ці Рэкліш), напэўна, нямецкага паходжання. За хатнюю гаспадыню ці ключніцу ў Маліноўскага служыла ўраджэнка Слуцка Ганна Беранка. Сакратаром управўлення быў дваранін Сенненскага павета Антон, сын Андрэя, Пржыбылоўскі, 1831 г. нар., што займаў указаную пасаду з мая 1868 г. Касірам або па сучаснаму бухгалтарам у Нясвіжскай ардынацыі працаваў карэнны жыхар Нясвіжа дваранін Ян, сын Яна, Камінскі, 1812 г. нар. Яго жонка Юзэфа, дачка Вінцэнта, Рагоўская, з якой меў аднаго сына і дзвюх дачок. Дарэчы, сын Камінскага Банавентура-Генрых вучыўся ў 1868 г. у Казанскім універсітэце. Ардынатарскую касу вартаваў Пётр, сын Ануфрыя, Шумоўскі, што паходзіў з дваран засц. Качановічы Ланскай воласці. Пры ўпраўленні мелася пасада каморніка ці землямера, якую займаў з сакавіка 1867 г. Юзаф, сын Міхаіла, Ждановіч, 1834 г. нар., што паходзіў з мінскіх мяшчан. Яго жонкай была Марыя, дачка Эрнэста, Брэўнгард, відавочна, нямецкага паходжання і таксама з Мінска.

Карэнным жыхаром Нясвіжа быў і Рамуальд, сын Баніфацыя, Сымановіч, асоба добра вядомая гісторыкам і аматарам нясвіжскае даўніны. Ён займаў пасаду архіварыуса Нясвіжскага замкавага архіва. Сымановіч нарадзіўся каля 1793 г. і паходзіў са шляхецкага роду. Яго жонкай была Тэафіля, дачка Марціна, Варытка, з якой меў двух сыноў і дзвюх дачок. Разам з Сымановічам працаваў Міхаіл, сын Рычарда, Богуш-Шышка, 1811 г. нар., што паходзіў з дваран Мінскай губерні. Ён займаў пасаду другога архіварыуса ў архіве з мая 1861 г. і прыбыў у замак з Санкт-Пецярбурга. Дапамагаў ім у гэтай карпатлівай справе Леанард, сын Адама, Калупайла, 1845 г. нар., што паходзіў з дваран горада Навагрудка. Калупайла займаў пасаду памочніка архіварыуса са жніўня 1861 г.

Калі ў войску галоўным начальнікам ёсць сяржант, то ў замку — яго дазорца. З былых дазорцаў найбольш вядомы Альберт Бургельскі, які пад час вайны 1812 г. адкрыў расіянам таямніцу радзівілаўскіх скарбаў[3]. Дазорцам Нясвіжскага замка з красавіка 1854 г. быў Мацвей, сын Антона, Маеўскі, 1824 г. нар. Ён паходзіў з мяшчан г. Бабруйска, а перад тым служыў у Слуцку. Маеўскі меў у горадзе ўласны дом, дзе пражываў з жонкай Тэафіляй, дачкой Пятра, Мацееўскай і дзецьмі: трыма сынамі, з якіх старэйшы вучыўся ў Слуцкай гімназіі, і адной дачкой.

З прыслугі адзначым найперш людзей шаноўных. Кавалём у замку рабіў Стэфан Руды, што паходзіў з сялян мястэчка Сваятычы

Навагрудскага пав. Яму дапамагаў падмайстра Бенядзікт Тараевіч, з сялян вёскі Грэскаўшчына Гавезнянскай вол. Слуцкага пав. Вартавалі замак ажно чатыры чалавекі: Аляксандр Чыжэўскі, з сялян в. Ліпа Сноўскай вол., Мартын Янцэвіч, з в. Юшавічы Гавезнянскай вол., Антон Міцкевіч, з мяст. Мікалаева Свержанскай вол. Мінскага пав., і Адам Невяроўскі, з аднадворцаў засц. Качановічы Ланскай вол. Замкавы парк вартаваў мясцовы жыхар мешчанін Фёдар Іллюкевіч.

Напэўна, калі б у замку знаходзілася княжацкая сям'я, кухараў было б значна больш. Тым не менш іх мелася як мінімум два: адзін для Маліноўскага — Іван Паяскаў, з сялян в. Паланечка, другі для Сымановіча — Рыгор Дзёмух, з сялян мяст. Сноў. Відавочна іх стравамі харчаваліся і астатнія насельнікі. Найбольш прыслугі меў Маліноўскі — чатырох чалавек, у тым ліку асобнага лакея Ануфрыя Сыльвановіча, са Слуцка, кучара Мартына Лапіцкага, з сялян в. Вайніловічы Ланскай вол., садоўніка Якуба Раманоўскага і памянутага ўжо кухара. З іншых: Ждановіч меў у сваім распараджэнні трох чалавек, Камінскі і Сымановіч — па два, а Маеўскі — толькі аднаго, якія былі ў большасці мясцовымі сялянкамі[4].

Вось такім разнастайным быў склад жыхароў Нясвіжскага замка у сяр. XIX ст.

---

[1] НГАБ. Ф. 333. Воп. 9. Спр. 575. Арк. 1293—1300.
[2] Там жа. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 5381. Арк. 1—7.
[3] Рыбчонак С. Дванаццаць апосталаў // Наша Ніва. 1994. № 7. С. 12.
[4] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 5506. Арк. 1—4.

Т. И. Седляревич

С именем женщины-ученой связано

Среди имен всемирно признаных ученых прошлого столетия особое место занимает женщина-математик Софья Васильевна Ковалевская (урожденная Корвин-Круковская). Известность Ковалевской, уже в XIX столетии далеко перешагнула за пределы Российской империи благодаря выдающемуся математическому таланту, а также и незаурядным литературным дарованиям. Один из старейших германских университетов — Геттингенский, рассмотрев и строго обсудив написанную Софьей Васильевной диссертацию, удостоил ее единогласно высшей ученой степени. Со времени основания этого университета (1737) Софья Ковалевская была только второй женщиной, получившей такую степень.

В 1888 г. Парижская академия присудила Ковалевской высшую премию за решение вопроса, на котором остановились знаменитые в

ученом мире Эйлер и Лангранж — об исследовании вращения твердого тела около неподвижной точки. О торжественном приеме Ковалевской в Парижской академии наук и речи президента академии, воздавшей хвалу учености женщины-математика, много говорили в газетах и обществе. Ковалевская преподавала математику в Стокгольмском университете, и шведы гордились своим профессором, писали в газетах о серьезных лекциях Ковалевской, которые первый год она читала на немецком, а потом на шведском языке, изучивши последний в течение одного года. Ученые занятия женщины-профессора, семейная жизнь, привычки, развлечения в свободное от трудов время — все это необычайно интересовало как заграничную, так и отечественную публику, а потому передавалось газетами. Решение же вопроса, за который Софья Васильевна получила высшую премию в Париже, дало возможность занять одно из первых мест в ученом мире и приобрести всемирную известность.

Софье Ковалевской, начиная с юных лет, было очень нелегко прокладывать себе путь в науку. Женщинам в России нельзя было учиться, а тем более проявлять гениальные способности. Огромную роль в развитии необыкновенного дарования Ковалевской сыграли воспитание и образование, которые она получила в семье. Детские годы прошли в родовом имении отца Палибино Невельского уезда Витебской губернии. Впоследствии, в течение всей своей жизни, Софья Васильевна постоянно приезжала сюда, согреваясь душой у родного очага. В Палибине будущий известный математик получила блестящее домашнее образование под руководством талантливого педагога И. И. Малевича, рано выявившего у юной ученицы замечательные способности к наукам и всячески развивавшего их по своей высокоэффективной педагогической методике.

Дед Софьи Ковалевской — генерал от инфантерии Ф. Ф. Шуберт был талантливым математиком, а прадед Шуберт — известным астрономом.

В Национальном историческом архиве Беларуси хранятся документальные материалы, связанные с именами родителей Софьи Ковалевской — Василия Васильевича Корвин-Круковского и Елизаветы Федоровны (урожденной Шуберт[1]). Родители Ковалевской были высокообразованными людьми с добрым сердцем и нежным внимательным отношением к своим детям. Мать Софьи Васильевны была знакома с классической и новой литературой, знала четыре иностранных языка. Из формулярного списка о службе отца Ковалевской — В. В. Корвин-Круковского видно, что на время составления этого списка — 1864 год у него

было четверо детей: Анна, родившаяся 6 ноября 1847 г., Софья — 5 января 1850 г., Федор — 11 марта 1855 г. и Василий — 23 июня 1856 г.[2]

В. В. Корвин-Круковский происходил из дворян Псковской губернии, службу начал юнкером лейб-гвардии 1-й артиллерийской бригады в 1817 г., обучался «артиллерийской и фортификационным наукам», немецкому и французскому языкам, участвовал в походах во время русско-турецкой войны. В 1829 г. принимал участие в осаде крепости Силистрии с 14 по 19 июня. За боевую отвагу и мужество, проявленные в боях, где он командовал батареей из двух орудий, стрелявшей без промаха по неприятельским укреплениям, был награжден орденом св. Анны 3-й степени с бантом.

В. В. Корвин-Круковский показал также отличное военное искусство ведения боя при взятии крепости Адрианополь. За участие в русско-турецкой войне 1828—1829 гг. был награжден серебряной медалью, а в память крымской войны — бронзовой медалью на Владимирской ленте.

В 1838 г. его назначают правителем дел Комитета для изыскания способов к улучшению выделки стали и железа, а в 1845 г. — командиром Московского артиллерийского гарнизона и Московского арсенала.

В 1861 г. Корвин-Круковский уходит в отставку в чине генерал-лейтенанта и поселяется в своем родовом имении Палибино Невельского уезда Витебской губернии. В том же году он был утвержден указом Сената в должности мирового посредника третьего участка Невельского уезда.

Во второй половине июля 1863 г. по распоряжению начальника края — генерала от инфантерии М. Н. Муравьева В. В. Корвин-Круковский назначается исполняющим обязанности Витебского губернского предводителя дворянства. Это произошло в неспокойное время, когда началось восстание 1863—1864 гг. Власти думали, что Корвин-Круковский встанет на их сторону, представит верноподданнический адрес от дворянства Витебской губернии, но он не стал относиться с боязливой покорностью к действиям правительства против восставших и защищал интересы своих выборщиков. В одном из документов за сентябрь 1863 г. говорилось: «От генерала Корвин-Круковского… надо было ожидать деятельности, распорядительности и вообще благих последствий, но он и до настоящего времени не переехал в Витебск и не вступил в должность», так как усилия царского правительства были направлены на подавление восстания. Власти, видя что Корвин-Круковский не стал помощником в их планах, поспешили 28 января 1864 г. освободить его от

исполнения обязанностей Витебского губернского предводителя дворянства.

В. В. Корвин-Круковский прожил в Палибино с семьей с 1861 г. до самой смерти.

Софья Васильевна Ковалевская, как и ее отец, была всей своей душой с теми, кто боролся против всяческого проявления тирании, а вся ее жизнь — самоотверженная борьба за право служения науке.

---

[1] НИАБ. Ф. 1430. Оп. 1. Д. 35870. Л. 36—37, 47, 57—65;
[2] Там же. Л. 57—65

Зм. Л. Яцкевіч

Радавод Адама Ганорыя Кіркора ў святле новых архіўных дакументаў

Вядомы беларускі гісторык, археолаг, этнограф, літаратуразнавец і выдавец Адам Ганоры Карлавіч Кіркор добра ведаў гісторыю свайго роду. Старажытныя каралеўскія прывілеі і іншыя дакументы захоўваліся ў іх ажно з XVI ст. Дакументальныя крыніцы, а таксама родавыя паданні даследчык неаднаразова выкарыстоўваў у сваёй навуковай дзейнасці.

Магчыма, глыбокае веданне свайго радаводу вельмі моцна паўплывала на лёс і творчасць Адама Кіркора. Пра славутага вучонага як пры жыцці, так і пасля смерці было напісана багата прац, у тым ліку і біяграфічнага характару, Але, як ні парадаксальна, нягледзячы на вялікую цікавасць даследчыкаў да яго асобы, да сённяшняга дня няма пэўнасці нават з датай ягонага нараджэння. Тое самае можна сказаць і аб генеалогіі роду, якая мае не менш белых плям, і нават асобныя, здавалася б, вядомыя факты малазнаёмы шырокаму колу чытачоў. Наогул, прозвішча Кіркор, пэўна, мае цюркамоўнае паходжанне. *Кір*, *кыр* або *кырк* па-турэцку ці па-татарску азначае *сорак*. Кіркор — сорак мячоў. Не выключана, што падобная вайсковая адзінка была ў татарскай ардзе. Найстарэйшы даследчык татараў А. Мухлінскі згадвае, што ў Крыме, каля Бахчысарая, быў замак Кіркір ці Кіркор, у якім, маўляў, знаходзілася рэзідэнцыя хана Менглі-Гірэя (1480 — 1516), дзе апошні прымаў паслоў з Вялікага княства Літоўскага[1]. Падобных сугучных назваў вельмі шмат не толькі ў цюркамоўных краінах, але і на тэрыторыі ВКЛ. Слова *кірка* азначае *матыка*, прозвішчы Кіркін, Кіркіла сустракаюцца ў летувісаў, вёска Кірклішкі ёсць пад Ашмянамі. У нямецкай мове слова *кірхе* азначае *храм*, яно, дарэчы, вельмі падобна гучыць на

дацкай, шведскай, фінскай і эстонскай мовах. *Кіркапіс* у перакладзе з літоўскай мовы — *могілкі*.

На карысць татарскага паходжання Кіркораў сведчаць у першую чаргу даследчыкі гісторыі і генеалогіі татараў А. Мухлінскі і Ст. Дзядулевіч[2]. Іхні тэзіс грунтуецца ў асноўным на тым, што талмачамі (перакладчыкамі) у розных пасольствах і дыпламатычных місіях ВКЛ на ўсходзе і поўдні звычайна былі літоўскія татары. Па-другое, Міхал Кіркор у 1790 г. быў палкоўнікам першага палка літоўскай лёгкай кавалерыі ВКЛ, які, заўважым, складаўся пераважна з літоўскіх татараў. Па-трэцяе, Дзмітры Кіркор у сваёй палітычнай дзейнасці ўжываў псеўданім Татар (1897). Апошняе магло быць проста пад уплывам паданняў, якія друкаваў у сваіх працах Адам Кіркор. Наконт першага, і асноўнага, тэзіса аб татарскім паходжанні роду мусім зазначыць, што яшчэ пры каралі Жыгімонце Старым спецыяльна адбіралі і рыхтавалі маладых прадстаўнікоў шляхты, якія валодалі замежнымі мовамі, для ўдзелу ў дыпламатычных місіях. Пры гэтым не абавязкова трэба было быць татарынам. Таму сёння можна паставіць пад сумненне татарскія карані Кіркораў. Засяродзім увагу, што ніводны дакумент XVI ст. не называе Кіркораў татарамі. З вышэйсказанага вынікае, што ўжо тады яны былі хрысціянскага веравызнання.

Нягледзячы на тое што род Кіркораў быў вельмі разгалінаваны, усе прадстаўнікі карысталіся ўласным гербам «Кіркор». Як сцвярджае В. Каяловіч, ужо Павел Кіркор у XVI ст. меў пячатку з названым гербам. Апошні ўяўляе харугву кшталту герба «Радван», якая трымаецца на апоры ў выглядзе друкаванай кірылічнай літары «П»[3]. Звычайна гэтая выява размяшчаецца на чырвоным шчыце, наверсе шчыта — рыцарскі шлем са шляхецкай каронай, пад якой тры страусавыя пёры. Адзначым, што герб вельмі рэдкі, і, акрамя Кіркораў, ім карыстаўся яшчэ адзін род — Кісарэўскіх. Кісарэўскія, паводле Т. Урускага, з'яўляюцца адгалінаваннем роду Кіркораў, і сваё прозвішча атрымалі ад родавага маёнтка Кісарэва на Полаччыне[4].

Прататыпам роду і старэйшага адгалінавання Кіркораў лічыцца баярын Павел Кіркор, які служыў талмачом у каралеўскіх пасольствах да крымскага хана. Згаданы Павел атрымаў 28 красавіка 1568 г. у Гародні ад вялікага гетмана і дзяржаўцы магілёўскага Рыгора Хадкевіча дванаццаць службаў пустых у Сухарах ці Сухарэвічах, як часам гаворыцца ў дакументах, у Магілёўскай эканоміі (цяпер Магілёўскі раён), да якіх надаваліся 22 падданыя. За гэта ён адпаведна быў абавязаны пад час вайны выставіць трох узброеных вершнікаў. 30 лістапада 1569 г. Павел

Кіркор атрымаў падцвярджальны каралеўскі прывілей на дараванае Р. Хадкевічам уладанне ад Жыгімонта Аўгуста. У прывілеі адзначаецца, што ён доўгі час быў на каралеўскай службе, наведаў шмат якія замежныя краіны і ведаў розныя мовы, у прыватнасці турэцкую, татарскую, балгарскую, сербскую і італьянскую. Акрамя гэтага, прыгадваецца, што П. Кіркор браў удзел у вайне з Масквой, у бітве за Смаленск у 1568 г. пад кіраўніцтвам Філона Кміты-Чарнабыльскага, затым у гэтым жа годзе пад кіраўніцтвам пана Шалухі, старосты крычаўскага, удзельнічаў у паходзе ў Смаленскую зямлю, дзе вельмі добра сябе праявіў і прывёў шмат палону, у тым ліку дзяцей баярскіх, якіх падараваў каралю. У 1580 г. Павел атрымаў прывілей на тры азёры Рудкава за Астрскім замкам у Чарняхоўскай воласці. П. Кіркор памёр перад 1592 г.

Сын Паўла Ян, зямянін Аршанскага павета, упамінаецца ў актах Магілёўскага магістрата за 1579 г. у якасці сведкі. Ян і Зміцер Кіркоры зафіксаваны сярод шляхты магілёўскага замкавага прысуду ў інвентары за 1604 г. 17 кастрычніка Ян Кіркор атрымаў падцвярджальны каралеўскі прывілей ад Жыгімонта III на маёнтак Сухары, у 1620 г. набыў вёску Канюхова над ракой Аслянкай у Мсціслаўскім ваяводстве ў Яна Максімавіча Еўпатовіча. У 1635 г. ён стаў уладальнікам ліберацыі на вызваленне ад падаткаў на дом у Магілёве (мабыць, на яго імя атрымала ягоная жонка). Разам з жонкай Магдаленай Пашкоўскай меў чатырох сыноў — Яўстафія, Аляксандра, Яраша і Паўла.

Павел, зямянін Аршанскага павета і Мсціслаўскага ваяводства, атрымаў частку бацькоўскіх уладанняў у Аршанскім павеце (Сухары) і маёнтак Канюхова, якія пакінуў свайму сыну Стэфану і пляменніку Яну, сыну Яўстафія. Пад кіраўніцтвам Януша Скуміна-Тышкевіча, ваяводы мсціслаўскага, удзельнічаў у вайне са шведамі ў Інфлянтах у 1625 г. У 1633 г. пад камандаваннем Аляксандра Гансеўскага, ваяводы Аляксандра Смаленскага, абараняў Смаленск ад маскоўскіх войск Шэйна, у 1654 г. пры абароне Мсціслаўля ад маскоўскіх войск трапіў у палон, адкуль толькі ў 1665 г. вярнуўся на бацькаўшчыну, дзе і памёр праз год.

Ягоны сын Стэфан меў справу ў 1667 г. з Галынскім у сувязі з нападам на маёнтак Канюхова. У 1671 г. ён сумесна са сваім родным братам Самуілам Кіркорам прадаў шляхціцам Чарэйскім часткі маёнткаў у Белай Дуброве, Асаўцы і Ліпаўніцы ў Аршанскім павеце. Разам з жонкай Хрысцінай Асецімскай пакінуў дзяцей: дачку Палонію і сына Мацея. Апошні быў уладальнікам спадчыннага маёнтка Канюхова. У 1700 г. Мацей падпісаў лаўдум (ухвалу) шляхты Мсціслаўскага ваяводства. Пад час Паўночнай вайны ў 1707 г. даставіў правіянт у Полацк для

войскаў расійскага цара Пятра I. Другі раз Мацей быў жанаты на Канстанцыі Гінбут, з якой меў сыноў Яна і Караля, у апошняга было шэраг судовых спраў наконт маёнтка Канюхова (1752, 1758, 1759). Дадзены маёнтак Караль пакінуў сваім сынам ад жонкі Марцыяны Асецімскай Францу, Юзафу і Мікалаю, якія падзялілі спадчыннае ўладанне 21 лютага 1801 г. Прычым Мікалай адрокся ад сваёй часткі бацькоўскага маёнтка Канюхова на карысць брата Франца, быў жанаты на Вінцэнце Фабрыцыуш і пакінуў дачку Юзафату і сына Караля. У 1832 г. ён ужо не жыў[5].

Караль, сын Мікалая, нарадзіўся ў 1784 г., быў жанаты на Тэклі, дачцы Марка і Анэлі Валадковічаў. Ад сваёй жонкі Караль атрымаў у пасаг двух сялян. У 1842 г. ён, будучы ўдаўцом, валодаў маёнткам Грынеўшчына ў Клімавіцкім павеце, які папярэдне належаў ягонаму стрыечнаму брату Базылю Францавічу Кіркору з 10 сялянамі і 13 сялянкамі. У 1845 г. колькасць падданых павялічылася да 35, але ў 1864 г. застаўся без вышэйназванага маёнтка. Караль пакінуў дзяцей: дачку Тэклю, якая нарадзілася ў 1824 г., сыноў Аляксандра, які быў ахрышчаны 5 красавіка 1813 г., і знакамітага Адама Ганорыя. Аляксандр, калежскі сакратар, у 1842 г. працаваў у Маскоўскім праўленні IV акругі шляхоў зносін і казённых будынкаў, памёр у Маскве ў 1877 г. Заўважым, што менавіта пры Карале дадзенае адгалінаванне роду Кіркораў было прызнана ў дваранстве Расійскай імперыі з аднясеннем да 6-й часткі (18.02.1832 г. Адам Ганоры Кіркор быў далучаны да свайго роду) пастановай Магілёўскага дваранскага дэпутацкага сходу 30 ліпеня 1814 г., а затым зацверджана Сенатам 16 верасня 1835 г.[6]

Пэўна, самай вялікай, да сённяшняга дня, загадкай з'яўляюцца даты нараджэння і хросту сына Караля Адама Ганорыя. І гэта пры тым, што ягоная хросная метрыка ў XX стагоддзі друкавалася ўжо тры разы. У энцыклапедычных выданнях, у тым ліку «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і «Беларускіх пісьменніках», даюцца наступныя даты нараджэння даследчыка — 21 студзеня 1818 г. або 1819 г.[7] Літаратуразнаўца Я. Янушкевіч у артыкуле ў ЛіМе піша, што Станіслаў Кіркор у кнізе «Мінулае памірае двойчы: Праўдзівая аповесць» (Кракаў, 1978), прысвечанай Адаму Кіркору, дае дату хросту Адама Ганорыя 14 студзеня 1819 г.[8] У сваёй кнізе С. Кіркор выказвае падзяку шэрагу даследчыкаў, у тым ліку і доктару Малгажаце Стальзман, якая ў 1973 г. надрукавала хросную метрыку Адама Кіркора. Заўважым, што гэты ж аўтар у кнізе «Кіркоры літоўцы», якая выйшла ў 1974 г. у Лондане, дае іншую дату хросту Адама Ганорыя — 18 студзеня 1819 г[9]. Пры гэтым Я. Янушкевіч згадвае, што гэтую хросную метрыку ў 1930 г. надрукаваў даследчык

М. Бранштэйн і што там таксама значыцца дата 14 студзеня 1819 г.[10] У 1996 г. гісторыкам і археолагам Л. Аляксеевым упершыню была надрукавана хросная метрыка Адама Кіркора ў перакладзе на рускую мову паводле публікацыі М. Стальзман. Нам падаецца вартым цалкам прывесці гэты дакумент. «Двор Сливин (былы Мсціслаўскі павет Магілёўскай губерні Манастыршчынская воласць, цяпер Манастыршчынскі раён Смаленскай вобл. — *Зм. Я.*) 1819 года, генваря 1-го дня, я, иеромонах Кармелитского ордена, настоятель Мазыкского* (былы Мсціслаўскі пав. Асляпская вол. Магілёўскай губ., цяпер Хілавіцкі р-н Смаленскай вобл.) костела Лука Барщевский, окрестил младенца именем Адам, сына благородных супругов Карла Киркора и матери Тэкли, урожденной Волковичевой (правільна — Валадковічавай. — *Зм. Я.*). Воспреемниками при крещении были г. Адам Голынский с госпожою Фаустиною Статкевичевой… Подписи (ксендза, секретаря, столоначальника)»[11]. Нельга выключыць магчымасць элементарнай памылкі, але ў выніку мы маем аж тры даты хросту Адама — 1, 14, 18 студзеня 1819 г.

Выклікае пэўныя пытанні і дата нараджэння Адама Ганорыя, прыведзеная ў ягоным тэстаменце, фрагментарна надрукаваным у матэрыяле Я. Янушкевіча: «1818. Нарадзіўся я 24 снежня 1818 г. у Слівіне Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ. з айца Караля і маткі Тэклі з Валадковічаў…» Спава ў тым, што дата 24 снежня 1818 г. павінна была быць пададзена па старым стылі (дарэчы, гэта не адзначае аўтар публікацыі), як было прынята ў Расійскай імперыі. І, дадаўшы да яе 12 дзён, атрымліваем дату 5 студзеня 1819 г. І яшчэ адна заўвага да перакладу маючага дакумента. У беларускай мове слова «айцец» азначае святара, таму ў дадзеным кантэксце належыць перакладаць гэтае слова як «бацька».

Аўтару гэтага артыкула пашанцавала знайсці экстракт (копію) хроснай метрыкі А. Кіркора (гл. яе пераклад). Яна захоўвалася ў фондзе Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі, які налічвае больш за 55 тыс. спраў, пад назвай «Копіі і выпіскі з метрычных кніг па дэканатах Магілёўскай губерні»[12]. Звычайна ў падобных справах захоўваецца некалькі асобных выпісаў альбо экстракты метрык з некаторых касцёлаў. Таму, зразумела, што яна, як і многія іншыя дакументы з няпэўнымі і недакладнымі назвамі, не прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Варта адзначыць яшчэ адзін вельмі істотны момант, які адштурхоўваў ад дадзенай крыніцы, гэта яе мова — лаціна. Апошнюю невыпадкова называюць «мёртвай». Вось яе пераклад:

---

* Так у дакументе, ад назвы паселішча Мазыкі

Год ад Нараджэння Хрыстова 1819
Студзень

Двор Слівін — Год ад Нараджэння Хрыстова тысяча васемсот дзевятнаццаты дня чатырнаццатага студзеня. Я, айцец Лукаш Баршчэўскі, кармеліт, куратар касцёльнай парафіі Мазыкінскай ахрысціў дзіця і даў імя Адам сыну бацькоў шляхетнага роду Карла Кіркора і жонкі яго Тэклі з роду Валатковічаў*. Кумамі былі шляхетны Адам Гальінскі і шляхетная Фаустына Галкевічава[13]. — Адам Кіркор

Мяркуючы па тэксту дакумента, відавочна, што гэта тая самая копія хроснай метрыкі, якую друкавалі Бранштэйн, Стальзман і Аляксееў. Такім чынам, цяпер мы з упэўненасцю можам лічыць дату 14 студзеня 1819 г. па старым стылі датай хросту Адама Ганорыя. Адпаведна па новым стылі — 26 студзеня. Тут нельга не заўважыць яшчэ адну памылку і недакладнасць ў перакладзе, зробленым Аляксеевым: няправільна расчытанае прозвішча хроснай Адама Кіркора — Фаустыны Галкевічавай і адсутнасць у арыгінале слова «іераманах» у дачыненні да святара Лукаша Баршчэўскага. Адзінае, што можа выклікаць сумненне ў нашым перакладзе, — гэта адценні ў зваротах да бацькоў і хросных, напрыклад, «шляхетны», «ганаровы», «уроджаны», «пан», «пані», «паненка», што звязана з лацінскімі скарачэннямі ў тэксце — MD, GD і інш.

Вось такім чынам выглядае кароткі радавод Адама Ганорыя Кіркора — прадстаўніка старажытнабеларускага шляхецкага роду, складзены на падставе апошніх архіўных пошукаў.

---

[1] Muchlinski A. Zdanie sprawy o tatarach litewskich // Teka Wileńska. Wilno, 1858. № 4. S. 18.
[2] Там жа; Dziadulewicz St. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce. Wilno, 1929. S. 409.
[3] Boniecki A. Herbarz Polski. Warszawa, 1909. T. 10. S. 72; Kojałowicz W. Herbarz rycerstwa WX Litewskiego tak zwany Compendium. Kraków, 1857. S. 87; яго ж. Herbarz szlachty WXL zwany Nomenclator. Kraków, 1905. S. 295.
[4] Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty Polskiej. T. 6. Warszawa, 1910. S. 346.
[5] НГАБ. Ф. 3162. Воп. 1. Спр. 2.
[6] Там жа. Арк. 22—24.
[7] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1997. Т. 4. С. 180; Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. Т. 3. С. 226, 227.
[8] Янушкевіч Я. Тастамент Адама Кіркора // ЛіМ. 1998. 26 снеж.
[9] Kirkor St., Konarski Sz. Kirkorowie litewscy. Londyn, 1974. S. 32, 33.
[10] Янушкевіч Я. Тастамент Адама Кіркора // ЛіМ. 1998. 26 снеж.
[11] Алексеев Л. Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е гг. XX в. Мн., 1996. С. 67, 68.
[12] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 36. Спр. 165.
[13] Там жа. Арк. 237.

---

* Так у дакументе. Павінна быць Валадковічаў.

II. ПУБЛІКАЦЫІ АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

В. У. Бабкова

Тры дакументы пра Зафею Слуцкую

Зорачка! Ты захавалася ў сузор'і Слуцкім адзіная
Першая паміж літоўскімі славай ярчэйшая дачка...
Хіба ты меней рыцар, чым ганарлівы муж твой магутны?

(Эпітафія С. Рысінскага на смерць Зафеі Слуцкай[1])

Падзеі, пра якія пойдзе гаворка ў пададзеных ніжэй дакументах, сучаснікі ў мемуарах, пазней і даследчыкі ў сваіх працах назвалі сенсацыйнымі[2]. Сапраўды, дзень 6 лютага 1600 г. ледзь не стаўся пачаткам вайны паміж сямействамі Радзівілаў і Хадкевічаў за слуцкую спадчыну, якая складалася са Слуцкага і Капыльскага княстваў, сямі мястэчак і 32 фальваркаў.

Менавіта ў гэты дзень у Вільне мусіў быў адбыцца шлюб апошняй прадстаўніцы княжацкага роду Алелькавічаў, багатай нявесты Зафеі Слуцкай з падчашым ВКЛ Янушам Радзівілам. Вакол гэтай, здавалася б, натуральнай падзеі ўзнік канфлікт, які ўцягнуў у сябе безліч людзей, маючых уплыў на ўнутрана-палітычную сітуацыю ў ВКЛ.

Пачалася гэтая гісторыя яшчэ ў 1594 г., калі віленскі ваявода і гетман ВКЛ Крыштаф Радзівіл Пярун заключыў дамову са жмудскім старостам Ежы Хадкевічам аб шлюбе ягонай апякункі, адзінай спадчанкі роду князёў Слуцкіх Зафеяй са старэйшым сынам Янушам. Дзяўчыне было на той час 9 гадоў, хлопцу — 15. Справа ў тым, што Зафея на пачатку жыцця згубіла бацькоў, а неўзабаве і родных дзядзькаў, застаўшыся з 1592 г. пад апекай найбліжэйшага сваяка Ежы Хадкевіча, а пасля ягонай смерці — віленскага кашталяна Гераніма Хадкевіча.

Уся далейшая хада падзей сведчыць пра тое, што маючы адбыцца шлюб быў надзвычай выгодны як для аднаго, так і для другога боку. Перыядычна касавалася і заключалася наноў шлюбная дамова, справа даходзіла да суда Галоўнага Трыбунала. У дадатак да сутыкнення палітычных і эканамічных амбіцый Радзівілаў і Хадкевічаў востра паўстала тэма крэўнага сваяцтва, а таксама рознага веравызнання кальвініста Януша і каталічкі Зафеі. Асабліва на фоне канфрантацыі паміж партыямі пратэстантаў і праваслаўных, з аднаго боку, і каталікоў, якіх падтрымліваў кароль Жыгімонт III Ваза, з другога, што абвастрылася на-

прыканцы XVI ст. Усё гэта прывяло да напружання напярэдадні абумоўленага дамовай дня шлюбу — 6 лютага.

Па сведчаннях відавочцы падзеяў берасцейскага ваяводы Крыштафа Зяновіча, Вільня і яе ваколіцы былі занятыя гатовымі пачаць рашучыя дзеянні ўзброенымі атрадамі віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла. Вялікую дапамогу яму аказалі дзед і дзядзька Януша — князі Астрожскія. На баку Радзівілаў стаяў таксама канцлер ВКЛ Леў Сапега ды шмат іншых.

З другога боку камяніца Хадкевічаў на вуліцы Савіч, дзе мусіў адбыцца шлюб, ператварылася ў непрыступную крэпасць. «... На ўсіх гмахах і на версе камяніцы і па дамах, стайнях, паўсюль люд, падрыхтаваны да бою, і аддзелы насупраць брамы падрыхтаваныя...» — запісаў Крыштаф Зяновіч[3].

На выбуховую сітуацыю мусіў рэагаваць кароль Жыгімонт III Ваза. Да галоўных дзеячаў канфлікту быў пасланы ліст з намерам прадухіліць вайсковыя дзеі. Хатняя вайна не пачалася, але напружанне было відавочным. Хадкевічы спадзяваліся, што, калі не ўдасца пазбегнуць шлюбу, Зафея сама адмовіць Янушу перад алтаром (яе згода была адным з пунктаў той пачатковай шлюбнай дамовы).

Хітрамудрыя гульні хцівых апекуноў і прагных да чужога дабра сватоў скончыліся тым, што Януш Радзівіл з нейкіх прычынаў не з'явіўся ў камяніцы на вуліцы Савіч. Шлюб у той дзень так і не адбыўся.

Аб гэтым сведчаць тры дакументы, запісаныя ў актавых кнігах Менскага гродскага суда, якія якраз і апавядаюць пра падзеі 6 лютага 1600 г. ў Вільні, пакідаючы, праўда, шэраг пытанняў:

«Квіт енерала Аршанскага пав. Анікея Сямёнавіча пра непрыбыццё віленскага ваяводзіча Януша Радзівіла ў прызначаны дзень 6 лютага 1600 г. у камяніцу пана віленскага Гераніма Хадкевіча для ўзяцця шлюбу з кн. Слуцкай»[4];

«Квіт енерала Аршанскага пав. Анікея Сямёнавіча пра падзеі, што адбываліся ў камяніцы пана віленскага Хадкевіча пад час чакання падчашага ВКЛ Януша Радзівіла ў прызначаны дзень шлюбу з кн. Слуцкай»[5];

«Аповед пана віленскага Гераніма Хадкевіча пра выкананне свайго запісу-дамовы з віленскім ваяводам Крыштафам Радзівілам на «ставене» кн. Зафеі Юр'еўны Алелькавічаўны ў прызначаны дзень»[6].

У дакументах, прыкладам, не адчувальная тая напруга, якая, мусіць, ліхаманіла ўсіх удзельнікаў, дах над галовамі якіх павінен быў бы грукатаць пад цяжарам гарматаў ды гакаўніцаў.

Найцікавейшай падаецца прамова самой Зафеі Слуцкай перад апекунамі, вознымі ды прыяцелямі, у якой яна нарэшце выходзіць з

ценю ў гульні, дзе ёй адводзілася самая няўдзячная роля. Ці быў гэта яе ўласны парыў, ці то былі словы, укладзеныя ёй у вусны Хадкевічамі, — невядома, хаця калі ўявіць сабе, што катэгарычная адмова ад шлюбу была яе шчырай пазіцыяй, то драма Зафеі выглядае яшчэ больш трагічнай. Таму што шлюб з Янушам Радзівілам усё ж такі адбыўся 1 кастрычніка 1600 г. у рэзідэнцыі Гераніма Хадкевіча ў Бярэсці. Праз 12 год Зафея памерла пры народзінах першага дзіцяці.

Тры дакументы не даюць адказ на многія пытанні пра лёс апошняй з роду Алелькавічаў. Найперш, на пытанне яе дакладнага веравызнання. У выніку царкоўнай уніі 1596 г. непарушныя раней межы між рымскай і грэцкай верамі ў ВКЛ зніклі. Магчыма, тут і хаваецца адказ.

Адно, што засталося вядомым з адносінаў паміж Зафеяй і Янушам, — ягоныя развітальныя словы на надгробку:

«...Не без слёзаў паставіў (гэты надгробак) Януш Радзівіл, князь Біржаў і Дубінак, а таксама Слуцкі і Капыльскі, найвышэйшы падчашнік ды інш... найжурботнейшы сужанец найжаданейшай сужонцы, жанчыне, найвыдатнейшай для свайго часу і родам і прыгажосцю і цнотаю. Пражыла 25 год»*.

Квіт енерала Аршанскага пав. Анікея Сямёнавіча
пра непрыбыццё віленскага ваяводзіча Януша Радзівіла
ў прызначаны дзень 6 лютага 1600 г.
у камяніцу пана віленскага Гераніма Хадкевіча
для ўзяцця шлюбу з кн. Слуцкай[7]

Року 1600, м(еся)ца февраля 18 дня**

На враде г(о)с(по)д(а)р(с)ком кгродском в замку Менском передомною Яном Курошом, подстаростим Менским, ставшы очевисто енерал г(о)с(по)д(а)рский повету ...шанского Оникей Семенович, очевисто сознал и квит того сознаня своего под печатю своею и подписом руки своее и под печатми сторонными и с подписами рук их, которые з них писат умели, ку записаню до книг кгродских менских подал. Писаны тыми словы: я, Оникей Семенович, енерал его королевской м(и)л(ос)ти повету Оршанского, я, Якуб Бучынский енерал его королевское м(и)л(ос)ти дворный, я, Ян Кожуховский, енерал его королевское м(и)л(ос)ти воеводства и повету Берестейского, а я, Лукашъ Колотов, енерал его королевское м(и)л(ос)ти земли Жомойтское, сознаваем сим нашым квитом, ижъ за възятьем нас на справу и

---

* Пераклад з лацінскай мовы А. Жлуткі.

** У адаптаваным тэксце курсівам пазначаюцца вынасныя літары, у дужках — скароты, шматкроп'е ставіцца на месцы пашкоджанага тэксту.

Зафея Радзівіл.
Гравюра з альбома «Выявы роду князёў Радзівілаў»
(Нясвіж, 1758)

потребу ясне велможного пана его м(и)л(ос/ти пана Геронима Ходкевича пана виленского, старосты берестейского, нижей в сем квите менованую. А маючы на тотъ час пры собе стороною шляхту пана Яна Котлинского, пана Миколая Пашковского, пана Андрея, а пана Станислава Савицкого, пана Яна Кгнатовского, пана Даниеля Ивановича, пана Миколая Даровского, а пана Михайла Дмитровича, были есмо в месте Виленском в каменицы ясне велможного пана его м(и)л(ос/ти пана Яна Кароля Ходкевича, кграби, старосты жомойтского, на Савичой улицы лежачого, в року теперешнем тисеча шестсотном, м(есе)ца февраля шостого дня, где пречоный его м(и)л(ос/ть пан виленский, староста берестейский становил се в той каменицы, маючы пры собе ясне освецоную кнежну Зофею Юревну Олелковичовну Слуцкую, менуючы, иж рокъ водлуг запису его м(и)л(ос/ти пана виленского его кнежацкое м(и)л(ос/ти ясне освецоному кнежати пану Крыштофу Радивилу, воеводе виленскому даного ... кнежны ее м(и)л(ос/ти Слуцкое в камени... старосты жомойтского до прыня... ...броволного, а не прымушон ... его м(и)л(ос)тью паномъ Янушом... ...дичом виленским на сес час под... ...ства Литовского, где пры ... м(и)л(ос)ти пана виленского его м(ило)сть... яко господар дому ... милость пан виленский с кнежи... становил. То нами, возным...то я оповедалъ и осветч... пану Янушови Радивилови пр... потребы в каменицы своей не толко заборонят, але и овшем зо всякою хутью и доброю волею его м(и)л(ос/ти пана Януша Радивила и с прыятелы его м(и)л(ос/ти ожыдал и прыняти их м(и)л(ос/ти на тую потребу в дому своем ест готовъ. Якож маючы дом незамкненый, а хотечы всякую добрую волю его кнежацкое м(и)л(ос/ти оказать, через цалый день на прыехане его м(и)л(ос/ти пана Януша Радивила к воли его м(и)л(ос/ти пану виленскому ожыдал и в дом свой прыняти его м(и)л(ос/ти был готов, нижли его м(и)л(ос/ть пан Янушъ Радивил до тое потребы своее не прыбыл, што его м(и)л(ос/ть пан староста жомойтский нами возными и стороною шляхтою осветчывшы, просил, абы тое осветчене его м(и)л(ос/ти до враду донесено было. Якож мы, возные з стороною шляхтою, што есмо видели и слышели дали есмо его м(и)л(ос/ти сес нашъ квит ку записаню до книг кгродских менских под печатми и с подписом рукъ нашых, так тежъ под печатми и с подписами рукъ, которые писати умели стороны шляхты пры мне на тот час былое. Писан в Вилни, року, м(есе)ца и дня вышей писаного. У того квиту печатей прытисненых двандцат а подпис рук писмом руским и полским Оникей Семенович,

енерал повету Оршанского ... рукою Jakub Buczyński gener...Колотов енерал земли ... Jan Kotlinski... Paszoowski ręką swą, Andrz... ręką swą, Станислав Савицкий, ... Daniel Ywanowicz. ... Которое очевистое сознане енералово... менских ест записано.

Квіт енерала Аршанскага пав. Анікея Сямёнавіча пра падзеі, што адбываліся ў камяніцы пана віленскага Хадкевіча пад час чакання падчашага ВКЛ Януша Радзівіла ў прызначаны дзень шлюбу з кн. Слуцкай[8]

Року 1600, м(еся)ца февраля 18 дня

На враде его королевское м(ило)сти кгродском в замку г(о)с(по)д(а)рском Менском передомною Яном Курошом подстаростим менскимъ постановившы се очевисто енерал г(о)с(по)д(а)рский повету Оршанского Оникей Семенович пры квите своем очевисто сознал и того сознаня своего квит свой под печатю своею и с подписом руки своее, такъ тежъ и под печатми сторонными и с подписами рукъ, которые з них писат умели ку записаню до книг кгродских менских подал. Писаны в тые словы: Я, Оникей Семенович, енерал его королевское м(и)л(ос/ти повету Оршанского, я, Якубъ Бучынский, енерал его королевское м(и)л(ос/ти дворный, а, Ян Кожуховский, енерал его королевское м(и)л(ос/ти воеводства и повету Берестейского, ... Лукашъ Колотов, енерал его королевское м(и)л(ос/ти земли Жомойтское, сознаваем сим нашым квитом, иж за взятем нас на справу и потребу ясне велможного пана его м(и)л(ос/ти пана Геронима Ходкевича, пана виленского, староты берестейского ... в сем квите менованую, а маючы на ...собе стороною шляхту пана Яна ..., пана Микалая Пашовского, пана ... , пана Станислава Саквицкого, па...товского, пана Даниеля Ивано... Миколая Даровского, а п(а)на Михала ... было есмо пры его м(и)л(ос/ти в месте ... столечном Виленском, в каменицы в... м(и)л(ос/ти ... Яна Кароля старосты ...Ходкевичовъ грабе ... на Савичой улицы леж... в року теперешнем тисеча шестсотном, м(есе)ца февраля шостого дня. В которой каменицы року, м(есе)ца и дня вышей помененого вперед речоный его м(и)л(ос/ть пан виленский, маючы на тот час пры собе некоторых пановъ прыятел своих, людей зацных и нас, возных, з стороною шляхтою, дня вышей менованого м(есе)ца февраля шостого дня у неделю за тыден передъ Запустами рымскими в року теперешнем тисеча шестсотном прыпадаючыми, оповедал и осветчалъ то нам, возным и перед стороною шляхтою вышей менованою, што жъ дей его м(и)л(ос/ть водлуг опису своего даного ясне освецоному кнежати его

м(и)л(ос/ти Крыштафу Радивилу воеводе виленскому на ставене дня сегоднешнего тут у Вилни в каменицы их м(и)л(ос/ти панов Ходкевичов ясне освецоное кнежны её м(и)л(ос/ти Зофеи Юревны Олелкевича Слуцкое до прынятя шлюбу малженского доброволного, а не прымушоного з ясне освецоным княжатем его м(и)л(ос/ьтю паном Янушом Радивилом, воеводичом виленским, старостою борысовским, з сыном перед речоного его м(и)л(ос/ти пана воеводы виленского тут се дей и з кнежною ее м(и)л(ос/ьтю Слуцкою становит. Яко ж року, м(есе)ца и дня вышей помененого февраля шостого дня в неделю за тыден перод Запустами рымскими, его м(и)л(ос/ть пан виленский, маючы нас возных и сторону шляхту вышей помененых до камен... помененое их м(и)л(ос/ти пановъ кграбов ... В месте Виленском на Савичой улицы ... каменицы кнежну её м(и)л(ос/ть Слуцкую ... порану ...и через увес п... с поранку ажъ година в ноч его м(и)л(ос/ть Януша Радивила ждалъ и кнежну ... Юревну Олелковича ... ставил. А княжна её м(и)л(ос/ть ... перед их м(и)л(ос/тями паны прыятелы своими и перед нами возными и шляхтою пры нас будучою мовила: "**Иж дей его м(и)л(ос/ть пан виленский если чынил постановене з его м(и)л(ос/тю паном воеводою виленским в недоросльх летех моих, не будучы ведом воли моее, а снат и тое близкое кровности, которая межы мною и его м(и)л(ос/тью паном Янушом Радивилом ест, так тежъ и того, ижъ его м(и)л(ос/ть пан Янушъ Радивил не ест набожеиства костела кателицкого, которогом я ест, о чом всем я тепер, маючы лета зуполные, а взявшы певную ведомост и постерегаючы того, абым таким непорадким и с тем моим за его м(и)л(ос/ть пана Януша Радивила вперед Пана Бога не ображала, а потом абых теж учстивост и маетностей моих до жадных небеспечностей не прыводила. На тое постановлене через... м(и)л(ос/ть пана виленьского з его м(и)л(ос/тью паном воеводою виленским учыненое, не позволяю и в малженство з его м(и)л(ос/тью паном Янушом Радивилом вступовати не хочу и прошу, абы ми се в том от его м(и)л(ос/ти пана виленского жадное безправе не делало**". *Однак* же его м(и)л(ос/ть пан виленский, маючы взгляд на лист опис свой, через тот увес ден яко то се вышей поменило на его м(и)л(ос/ть пана Януша Радивила воеводича виленского ждал, ниж ли его м(и)л(ос/ть пан воеводич виленский ку той справе через тот увес ден ажъ и ... прыбыти не хотел и не прыбыл, а его м(и)л(ос/ть ... пилност свою а непрыбыте и нестано... м(и)л(ос/ти пана подчашого нами, возными и

сторон… пры нас будучою осветчыл, а его м(и)л(ос/ть пан староста жомойтский теж, яко господар дому своего, в котором се тая справа отправовать мела через увес тот день неделный шосты, м(есе)ца февраля яко его м(и)л(ос/ти пана падчашого с прыстойности прыятелское ожыдал, так тежъ прыятелом и слугам его м(и)л(ос/ти волного прыездженя и отездженя не заборонял и овшем всих прыходячых с хутью прыятелскою прыймуючы и отпущаючы нами, возными енералными, абы потом хто таковое вини на него его м(и)л(ос/ть в чом не вкладал осветчал и оказывал, чого всего мы, вышей помененые енералове, будучы ведоми и сами на то через увес тот ден смотречы, дали есмо их м(и)л(ос/тям сей наш квит ку записаню до книг под печатми и с подписами рук нашых. Так тежъ под печатьми и сподписами рукъ, которые писать умели, стороны шляхты пры нас на тот час будучое. Писан въ Вилне, року, м(есе)ца и дня вышъ помененого. У того квиту печатей прытисненых дванадцать, а подпис рукъ писмом полским и руским подписаны сут тыми словы: Оникей Семенович, енерал повету Оршанского, власною рукою, Jakub Buczyński… enerzał… krolewskiey m(iło)ści ręką swą, Ян Кожуховский, енерал рукою власною, Лукаш Колотов, енерал земли Жомойтское, рукою подписал, Jan Kotlinski ręką swą, MikołayPaszowski ręką, Andrzey Karczowski ręką, Станислав Сакевицкий рукою, Daniely Wanowicz ręką, Jan Gnatowski ręką swą. Которое очевичтое сознане енералово и тот квит ест до книг гродских менских…

Аповед пана віленскага Гераніма Хадкевіча
пра выкананне свайго запісу-дамовы
з віленскім ваяводам Крыштафам Радзівілам
на «ставене» кн. Зафеі Юр'еўны Алелькавічаўны ў прызначаны дзень[9]

Року 1600, м(еся)ца февраля 18 дня

На враде г(о)с(по)д(а)рском кгродском в замку менском передомною Яном Курошом, подстаростим Менским оповедал через служебъника своего пана Крыштофа Городиского ясне велможный пан, его м(и)л(ос/ть пан Героним Ходкевич, панъ виленский, староста берестейский, иж дей чынечы его м(и)л(ос/ть досыть запису своему, который дал его м(и)л(ос/тъ ясне освецоному кнежати его м(и)л(ос/ти пану Крыштофу Радивилу воеводе виленскому на ставене ясно освецоное кнежны ее м(и)л(ос/ти Зофеи Юревны Олелковичовны Слуцкое в … Виленском, в каменицы их м(и)л(ос/ти па… грабев на Сави чой улицы лежачой в ро… тисеча шестсотном, м(есе)ца февраля … прынятью шлюбу доброволного … з сыномъ его кнежацкое

Януш Радзівіл.
Гравюра з альбома «Выявы роду князёў Радзівілаў»
(Нясвіж, 1758)

м(и)л(ос/ти паном... Радивиломъ, воеводичом виленским тепер ... подчашым Великого князства Литовского, старостою борысовским, державцою девеницким, чому дей его м(и)л(ос/ть панъ виленский чынечы досыт на ден, в записе помененый, самъ до места Виленского прыбывшы, кнежну ее м(и)л(ос/ть в дому их м(и)л(ос/ти панов кграбев на улицы Савичой лежачом, року, м(есе)ца и дня вышей помененого, ставил через вес ден, почавшы с поранку, ажъ година в ноч, самого его м(и)л(ос/ти и с прыятолмы его м(и)л(ос/ти ждалъ, готов будучы за добровольным прызволенем кнежны ее м(и)л(ос/ти Слуцкое всего, што бы одно колвек кром нар...шеня прав учстивого и прыстойности выконати, ниж ли дей его м(и)л(ос/ть пан Янушъ Радивил, воеводич виленский через тот увес ден неделный, м(есе)ца февреля шостого дня водлуг опису не прыбыл и прычыны ниякое неприбытя своего его м(и)л(ос/ти пану виленскому не ознаймил и просилъ, абы тое оповедане его м(и)л(ос/ти до книг кгродских менских было записано, што ест записано.

---

[1] Спадчына. 1991. № 6.
[2] Miscellanea Historico-archivistica. T. III. W.—L., 1989. Lulewicz H. Walka Radziwiłłów z Chodkiewiczami o dziedzictwo słuckie. S. 201—215
[3] Там жа.
[4] НГАБ. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 107адв.—108адв.
[5] Там жа. Арк. 108адв.—110адв.
[6] Там жа. Арк. 110адв.—111.
[7] Там жа. Арк. 107адв.—108адв.
[8] Там жа. Арк. 108адв.—110адв.
[9] Там жа. Арк. 110адв.—111

В. У. Бабкова

Новы факт да біяграфіі Паўлюка Багрыма

Новы архіўны дакумент — новы факт да жыццяпісу славутага Паўлюка (Паўла) Багрыма. У фондзе «Мінскі губернскі распарадчы камітэт» у дакуменце «Ведомости о числе и ценности недвижимых имуществ, подлежащих налогу в Минской губернии на 1891 год», складзеным 21 верасня 1890 г. насупраць запісу пра драўляны дом з прыбудовамі, у якім жыў Багрым у м. Крошын, пазначана, што «по смерти Багрима перешло в собственность Ивана Марцинковского»[1]. У ведамасці, складзенай праз год, у верасні 1891 г., пад нумарам 10 запісана ўжо толькі Багрымава ўдава — Карнэлія[2]. Гэткім чынам, можна меркаваць, што Паўлюк Багрым памёр напрыканцы лета 1890 года ва ўзросце 78 год...

«Зайграй, зайграй, хлопча малы...» — вядомы радок з верша крошынскага падлетка Паўлюка і сціплая згадка пра смерць сталага местачкоўца Паўла Багрыма ў 1890 г. А паміж гэтым — цэлае жыццё, поўнае неверагодных здарэнняў, сведкам і ўдзельнікам якіх яму давялося быць: вучоба ў парафіяльнай школцы ў высакароднага настаўніка ксёндза Войцаха Магнушэўскага, сяброўства з арганістам Георгіем Арлоўскім, набыццё ведаў і спроба пісаць вершы, крошынскае сялянскае паўстанне 1828 года, калі Паўлюку было 16 год, чытанне сваіх вершаў перад прыезджымі чыноўнікамі з Віленскай навучальнай акругі, і як вынік таго — паліцыя, пагроза рэкруцтва, смерць маці (Паўлюку — 20 год), клопаты шматдзетнай сям'і, вучоба кавальскаму рамяству, самота, смерць бацькі (Паўлу — 43 гады), шлюб са шляхцянкай Карнэліяй Шышлоўскай ва ўзросце 52 гадоў, а ў 69 — выраблення жырандолі для Крошынскага касцёла...

Мы маем адзіны геніяльны верш паэта Паўлюка, напісаны ім напачатку жыцця, і цудоўную жырандоль з выявамі птушак каваля Паўла, выраблену ім напрыканцы жыцця. Таму з такім хваляваннем і ўдзячнасцю збіраем па драбніцах дакументальныя фрагменты яго-най біяграфіі.

---

[1] НГАБ. Ф. 314. Воп. 1. Спр. 270. Арк. 93—94.
[2] Там жа. Спр. 284. Арк. 26—27.

А. К. Голубович

Рукописные документы Национального исторического архива Беларуси

Архивные документы — это национальный фонд «исторической памяти». Центральная часть этого фонда хранится в НИАБ. О ней и пойдет речь, т. е. о древнейших рукописях, «свидетелях» развития истории Отечества — пергаментных рукописях (грамотах).

«И пыль веков от хартий отряхнув, правдивое сказанье перепишет», — писал А. С. Пушкин в трагедии «Борис Годунов». Что же это за «хартии», о которых говорит поэт устами монаха Пимена, переписывавшего их в келье Чудова монастыря. Дело в том, что в Византии «хартионом» называли пергамент, употреблявшийся для письма до появления бумаги. От этого греческого слова и произошло русское «харатья», обозначающее особый материал для письма, выделывающийся чаще всего из телячьей кожи. На Русь выражение «пергамент» пришло значительно позже. Харатья или пергамент стоили очень дорого, и на них

обычно писались самые важные документы. В быту же использовался более дешевый материал, изготовленный из бересты, позднее бумага.

В мире количество пергаментных рукописей, дошедших до нашего времени с XI—XVII вв., невелико. Беларусь могла бы существенно пополнить этот промежуток мировой истории древними документами, но иноземные нашествия, внутренние междоусобицы, войны и другие катаклизмы, происходившие на нашей земле, к великому сожалению, не способствовали сохранению письменных памятников. Поэтому и представляют огромную общечеловеческую ценность хранящиеся в Национальном историческом архиве Беларуси пергаментные грамоты и грамоты на бумаге с XIV—XVIII вв., составленные на старобелорусском, старопольском и латинском языках. На них сохранились печати и даже позолота букв. Королевские печати — красного воска, вложенные в железные футляры. Самая ранняя пергаментная рукопись-оригинал датируется 20 июня 1391 г.

Это «Подтвердительный привилей кн. Подольской земли Федора Кориатовича привилеев Константина и Федора Корнятовичей верному слуге Гринько на Гор-Соколец и Збынов поток с сс.* Глянянцем, Вороновицей, Прилуком, Иллинцеми с правом «садить людей на р. Русаве в трех местах и дарственной тещи Гринько кн. Андрияновой Вейницкой (Веиницкой) на сс. Микулинцы, Летыню, Ванячин, Дешкавцы, Стражевки «у деднину и в вотнину». Рукопись размером 36х22 см, желтого цвета, нижний край согнут и через него проходит шнур из шелковых нитей красно-зеленого цвета. Грамота открывает еще одну страничку истории Подольской земли Украины и пополняет коллекцию грамот князей Кориатовичей, хранящихся в историческом архиве г. Львова.

Начинается привилей словами: «Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь. Мы, княз Федор Корьатович, Божьею милостью дедичь и господарь Подольской земли, чинимы сведочно сим листом всякому доброму, кто ж на сесь лист посмотрит или услышит его чтучы…»

Среди грамот XV—XVII вв. можно выделить следующие: «Дарственный лист Дашки Яцковича Хребтовича церкви Пресвятой Божьей Матери Лавришевского монастыря Новогрудского воеводства 5 сентября 1488 г. на двух подданных в Щорсах», «Купчую грамоту дворянина Василия Никифоровича Бранца Ануфрию Васильевичу Костюшкевичу на часть земель в им.** Мочуль, Рамель, Переходичи Пинского уезда от 6 мая 1544 г.» Художественное оформление грамоты выполнено в крас-

---

* сс. (села).

** им. (имение).

но-зеленой гамме на пергаменте, сохранились и вислые печати; «Подтвердительную грамоту от 1 декабря 1551 г. короля Сигизмунда Августа о продаже стольником Великого княжества Литовского Станиславом Кезгалом (Кезигайлом) земянину Юрию Вербицкому двух служб бояр путных, двух служб людей тяглых в им. Деревно за 200 коп грошей литовских». Пергаментная рукопись хорошей сохранности. Под текстом подпись короля Сигизмунда Августа. Печати нет и, судя по отсутствию проколов для шнура, не было; «Привилей от 3 февраля 1581 г. короля Стефана Батория Габриелю Бенешу на им. Ованты за участие в битвах под Полоцком и Великими Луками». Под текстом подпись короля Стефана Батория. Грамота составлена в г. Варшаве; «Привилей от 18 июля 1586 г. кн. Николая Крыштофа Радзивилла Сиротки Несвижу на Магдебургское право»; «Купчая крепость от 4 июня 1626 г. на им. Глуск, проданное кн. Николаем Чарторыйским слонимскому маршалку Александру Полубинскому за 50 тысяч польских злотых». Под текстом среди многочисленных подписей стоит подпись Петра Достоевского, судьи пинского гродского (одного из предков Ф. М. Достоевского); «Акт от 11 апреля 1654 г. о назначении Станислава Радзивилла опекуном им. Крынки, Чернавчицы и др., принадлежавших кн. Людовике-Марии, вдове кн. Александра Радзивилла согласно его завещания»; Грамота заверена печатью кардинала Ломеллино, папского легата. Для истории представляет интерес «Привилей 1680 г. о предоставлении Мозырю Магдебургского права»; «Грамота от 12 февраля 1691 г. короля Яна III кн. Доменику Радзивиллу на право проведения двух ярмарок в им. Глуск». Грамота составлена в г. Варшаве. Начиная с XIV в. у нас хранятся генеалогические таблицы кн. Радзивиллов, личные фонды кн. Друцких-Любецких, графов Плятер-Зибергов и др. Мы располагаем материалами о графах Огинских, в частности об авторе всемирно известного полонеза М. К. Огинском.

Хранящиеся в архиве грамоты — это дарственные жалованные литовских князей, польских королей, грамоты дипломатического и внутригосударственного значения. Уникальным является «Универсал Богдана Хмельницкого от 7 мая 1656 г. о предоставлении купцам г. Слуцка права свободной торговли на территории Украины». Грамота заверена подписью Б. Хмельницкого и печатью.

Поэтому для нас представляют интерес не только документы, хранящиеся у нас, но и находящиеся за пределами Беларуси. В России хранится пергаментная рукопись «Евангелия», написанного в Беларуси в конце XIV в., на 180 листах. На каждом листе текст расположен в два

столбца. Эта рукопись была обнаружена академиком М. Н. Тихомировым, который считал, что «Евангелие» имеет большое значение для истории белорусского языка. Оно также значительно и для всеобщей истории, неся в себе разгадку ряда неизвестных событий, подтверждая их фактами. К примеру — Соборная площадь в городе Друцке была построена в 1001 г. (6509 г. по древнерусскому летоисчислению). Следовательно, можно предположить, что христианство в Беларуси утвердилось уже через 13 лет после так называемого «Крещения Руси (988)». «Евангелие» дает прямое указание на то, что Друцк существовал уже в X веке. «Запись друцкого князя Василия Михайловича, писал Тихомиров, представляет собою жалованную грамоту, данную церкви Богородицы в Друцке на село Моравьиничи, которое князь отдает церкви вместе с людьми и со всеми доходами, с полями и лугами...» Друцкое «Евангелие» переходило из рук в руки. Первоначально оно принадлежало собору Богородицы в Друцке, затем рукопись находилась у виленского горожанина, позже оно попало к новгородскому архиепископу Феодосию Яновскому... По праву «Евангелие» должно вернуться к истокам, в Беларусь.

Как видим, все эти рукописные документы хранят исключительно ценные сведения по истории Беларуси и не только. А мы в свою очередь обязаны делать все, чтобы сохранить и донести их потомкам.

У. М. Дзянісаў

Новыя дакументы да біяграфіі і радаводу Марка Шагала

Нягледзячы на тое што творчасці Марка Шагала прысвечана вялікая колькасць публікацый, яго жыццёвая біяграфія даследавана далёка не поўнасцю. У першую чаргу гэта тычыцца Віцебскага перыяду жыцця і творчасці мастака. Таксама вельмі мала звестак і пра яго продкаў.

Спроба абагульніць апублікаваныя матэрыялы па гісторыі сям'і бацькоў Марка Шагала была зроблена Юліяй Сцяпанец, якая ўпершыню ўвяла ў навуковы ўжытак цэлы шэраг невядомых архіўных крыніц[1].

У апошні час пры апрацоўцы дакументаў з фондаў розных устаноў былой Віцебской губерні і г. Віцебска, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, быў выяўлены цэлы шэраг цікавых дакументаў, звязаных з радаводам М. Шагала і яго жыццём у Віцебску. Найбольш ранні з дакументаў датуецца 1874 г. Гэта «Общий список евреям мужеского пола, живущим в 1-й части г. Витебска», дзе пад № 374 быў запісаны дзед мастака Сагал Давыд Іоселевіч, бабінавіцкі мешчанін Магілёўскай губерні, домаўладальнік. Узрост яго быў

вызначаны «па пашпарту» і складаў 50 год. У гэтым жа спісе былі і яго сыны: Хацкель, які меў узрост 12 гадоў, Зіська — 8 гадоў і Абрам — 1 год. Прычым узрост першых двух вызначаны «па вонкаваму выгляду», а апошняга — паводле метрыкі[2].

Акрамя таго, сыны Давыда Сагала Хацкель і Зіська былі дадаткова ўключаны ў «Особый список евреям мужеского пола, которым определен возраст по наружному виду, живущим в Витебской губернии...»[3] Пад асобным нумарам у спіс жыхароў першай часткі г. Віцебска быў унесены старэйшы сын Давыда Сегала Гірша Давыдов, таксама бабінавіцкі мешчанін. Але ён запісаны пад прозвішчам не Сегал, а Шагал. Яго ўзрост вызначаны «па пашпарту» — 26 гадоў. У яго быў сын Моўша, які меў «па вонкаваму выгляду» — 5 гадоў[4].

Гэтыя дакументы сведчаць, што продкі Марка Шагала пераехалі ў Віцебск з Бабінічаў, якія знаходзіліся ў Магілёўскай губерні. Дарэчы, у Магілёўскай губерні ў XIX ст. было некалькі населеных пунктаў з назвай Бабінавічы альбо Бабінічы. Захаваліся звесткі пра тое, што адна сям'я Шагалаў у XIX ст. жыла ў аколіцы Бабінічы Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні, але яны былі прыпісаны да Мсціслаўскай яўрэйскай грамады. Ёсць архіўныя дадзеныя, што асобы з прозвішчам Шагал жылі і ў горадзе Бабінавічы Аршанскага павета, які ў другой палове XVIII — першай палове XIX ст. быў цэнтрам павета ў Магілёўскай губерні, а пасля 1840 г. трапіў у склад Аршанскага павета. Зараз гэта вёска ў Лёзненскім раёне. Найбольш верагодна, што продкі Марка Шагала паходзілі менавіта адтуль. На жаль, да нашых дзён дайшло вельмі мала архіўных крыніц па гісторыі яўрэйскіх абшчын Магілёўскай губерні, каб пацвердзіць гэтую гіпотэзу, неабходны скрупулёзныя архіўныя пошукі.

Асобную групу дакументаў уяўляюць матэрыялы, звязаныя з маёмасцю, якая належала бацьку будучага мастака Хацкелю Шагалу ў г. Віцебску. Захаваліся дакументы канца XIX — пачатку XX ст. пра домаўладанне Х. Шагала ў г. Віцебску па Вялікай Пакроўскай вуліцы. Найбольш падрабязныя звесткі ёсць у адным з дакументаў за 1904 г. Гэта «Сведения о городских недвижимых имуществах в 3-й части г. Витебска по Большой Покровской улице», дзе ўказана: домаўладальнік — Шагал Хацкель Мардухавіч (дарэчы, біёграфы М. Шагала лічаць, што яго дзед меў падвойнае імя Давід-Мардух), мешчанін.

Ёсць і кароткае апісанне маёмасці. Гэта аднапавярховы жылы драўляны дом, аднапавярховы мураваны жылы дом, аднапавярховы жылы драўляны дом у двары, яшчэ аднапавярховы жылы драўляны

дом у двары. Акрамя таго, Х. Шагалу належала 130 квадратных сажаняў уласнай зямлі[5].

На жаль, нам не ўдалося знайсці графічных матэрыялаў з выявай плана зямельнага пляца, які належаў Шагалам, а таксама чарцяжоў будынкаў. Вядома, што гэтыя матэрыялы ў свой час знаходзіліся ў архіве Віцебскай гарадской управы. Напрыклад, у «Алфавіце спраў будаўнічага стала Віцебскай гарадской управы за 1894—1898 гг.» ёсць звесткі, што 1 студзеня 1897 г. пад № 1 была зарэгістравана справа аб пабудове драўлянага дома ў 3-й частцы г. Віцебска па Пакроўскай вуліцы Хацкелем Мардухавым Шагалам і яго жонкай Фейгай Мендэлевай[6]. Але гэтыя дакументы ў сучасным архіўным фондзе Віцебскай управы не захаваліся.

Асобную цікавасць уяўляюць дакументы пра вучобу Марка Шагала ў 1-м Віцебскім чатырохкласным гарадскім вучылішчы з 1898 па 1905 г.

14 ліпеня 1898 г. Х. Шагал звярнуўся да інспектара Віцебскага гарадскога вучылішча з прашэннем, дзе пісаў: «Желая определить сына моего Мовши в Витебское городское училище, 1-ое отделение, честь имею покорнейше просить, Ваше Высокородие, допустить сына моего к приемным испытаниям в сем 1898 г. При сем представляю свидетельства: метрическое за № 1403 и об оспопрививании...»[7] У архіўным фондзе «Першае Віцебскае 4-класнае гарадское вучылішча» захаваліся вельмі цікавыя дакументы пра вычобу М. Шагала. Напрыклад, у «Спісе асоб, якія жадалі паступіць у Віцебскае гарадское вучылішча ў 1898 годзе» пад № 62 быў указаны Шагал Мовша Хацкелеў, мешчанін, веравызнання іудзейскага, нарадзіўся 24 чэрвеня 1887 г.[8] У класных і балавых журналах вучылішча за 1900—1905 гг. ёсць звесткі аб поспехах у вучобе М. Шагала. Захаваліся экзаменацыйныя спісы з адзнакамі М. Шагала. Удалося выявіць і аўтэнтычныя аўтографы вучня 2-га класа 2-га аддзялення М. Шагала. Гэта экзаменацыйная работа па рускай мове — дыктоўка, а таксама экзаменацыйная работа — пераказ на тэму «Кароткая гісторыя Айчыннай вайны 1812 г.», якія датуюцца 7 мая 1902 г. За дыктоўку М. Шагал атрымаў «5», а за гістарычны пераказ — «4» з мінусам і «4»[9]. На жаль, не захаваліся атэстаты вучняў аб заканчэнні вучылішча ў 1905 г. (за другія гады яны ёсць). Не захавалася і асабовая справа вучня Шагала. Ёсць спісы вучняў, дзе маюцца адзнакі аб унясенні платы за навучанне М. Шагала.

Такім чынам, перагорнута яшчэ адна старонка з жыцця славутага мастака. Выяўленыя дакументы дазволілі ўдакладніць некаторыя моманты біяграфіі М. Шагала і яго радаводу. Хочацца спадзявацца,

што далейшыя руплівыя архіўныя пошукі прывядуць да новых цікавых знаходак.

---

[1] Сцепанец Ю. Из истории семьи Шагала: Новые архивные документы // Бюллетень музея Марка Шагала. 2000. № 12.
[2] НГАБ. Ф. 1416. Воп. 1. Спр. 2680. Арк. 60.
[3] Там жа. Арк. 96.
[4] Там жа. Арк. 113адв.
[5] Там жа. Ф. 2618. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 26.
[6] Там жа. Ф. 2496. Воп. 1. Спр. 2546. Арк. 249.
[7] Там жа. Ф. 2670. Воп. 1. Спр. 44. Арк. 41.
[8] Там жа. Спр. 24. Арк. 4.
[9] Там жа. Спр. 266. Арк. 79—81.

А. А. Радаман

Элекцыйныя лісты як крыніца вывучэння дзейнасці соймікаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага другой паловы XVI — пачатку XVII ст.

У некалькіх нашых ранейшых працах мы звярталіся да дзейнасці элекцыйных з'ездаў (соймікаў) у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім[1]. Нагадаем, што дзяржаўна-прававая сістэма ВКЛ у другой палове XVI — пачатку XVII ст. адрознівалася ад Кароны Польскай правам шляхты на прадстаўленне вялікаму князю чатырох электаў (кандыдатаў) не толькі на пасады членаў земскага павятовага суда (суддзі, падсудка і пісара) і падкаморыя, але таксама і павятовага харужага. Кандыдаты на гэтыя пасады абіраліся шляхтай на павятовых элекцыйных з'ездах (соймiках), і вялікі князь абавязаны быў выдаць намінацыйны прывілей на вакантную пасаду аднаму з абраных шляхтай электаў[2]. Прадугледжвалася і магчымасць невядомага ў Кароне авансавання (прасоўвання на вышэйшую пасаду) на сойміку земскага пісара або падсудка на судзейства земскае і земскага пісара на падсудства.

Пасля ўтварэння і пачатку дзейнасці земскіх судоў элекцыйныя з'езды збіраліся толькі ў выпадку адмаўлення ад пасады, смерці або прызначэння на вышэйшую пасаду ўрадніка, які займаў пасаду земскага суддзі, падсудка або земскага пісара. Магчымым было і адхіленне ўрадніка ад пасады па судоваму выраку. У выпадку, калі адзін з павятовых судовых ураднікаў памірaў, яго таварышы абавязаны былі паведаміць пра гэтае здарэнне вялікаму князю, а ў яго адсутнасць у ВКЛ — ваяводзе. Калі ваявода, у сваю чаргу, быў за межамі дзяржавы, пра смерць судовага ўрадніка апавяшчаўся кашталян. Вялікі князь, ваявода або кашталян павінны былі прызначыць дату

склікання элекцыйнага з'езда і даслаць лісты з паведамленнем пра сваё рашэнне за чатыры тыдні да вызначанага тэрміну.

1-ы артыкул IV раздзела Статута ВКЛ 1588 г.* прадугледжваў наступны парадак правядзення элекцыйнага сойміка: «...зъехавшисе вси wбыватели wного повету w вышъшого до низшого стану до замку, албо дворѣ нашого, и тамъ тыє, которие се до того wбранья на день зложоны[г] зъєдѣть, колько ихъ бѣдеть, вжо инъших неприбылых не ждучи, мають на местъцо того змеръзлого врядника спосродку себе чотырох wсобъ шляхътичовъ, люде[г] добрыхъ, побожныхъ, цнотливых, годныхъ, в праве вмеєтныхъ, писати вмеючых, родичовъ того паньства, великого князства, и в томъ повете не ново, не змышлене wселых wбрати и намъ, г(о)с(по)д(а)рѣ, имена тыхъ wсобъ wбраных на писме за печатьми своими wзна[г]мити. А мы с тыхъ чотырохъ wдного, которы[г] се намъ видети и подобати будеть, выбравши, на местъцо того змеръзлого врядника нєwтволочне вставити и привильємъ нашимъ на тотъ врад до живота єго альбо до вывышенья з ласки нашоє на инши[г] яки[г] вышъшы[г] врад або достоєньство твердити єго маємъ»[3]. Такім чынам, закон вызначаў, што пасля элекцыйнага сойміка вялікаму князю дасылаўся ліст з паведамленнем пра тое, што на ім адбылося. Такія лісты можна назваць лістамі элекцыі, або элекцыйнымі лістамі.

У актавай кнізе Берасцейскага гродскага суда за 1589 г. захавалася копія элекцыйнага ліста мясцовай шляхты да караля і вялікага князя Жыгімонта III Вазы, тэкст якога падрыхтаваны намі да друку. У пэўнай ступені гэты дакумент з'яўляецца унікальным. Справа ў тым, што элекцыйныя лісты, якія дасылаліся да вялікага князя, павінны былі захоўвацца ў дзяржаўным архіве. Мы, аднак, не ведаем ніводнага арыгінала падобных лістоў за другую палову XVI — пачатак XVII ст. Актыкацыя элекцыйнага ліста на імя караля і вялікага князя Жыгімонта III Вазы, якая захавалася ў Берасцейскіх гродскіх кнігах, з'яўляецца адзіным вядомым нам дакументам такога тыпу[4].

1589 г. лютага 3. Берасце / Брэст. — Актыкацыя ў берасцейскія гродскія кнігі элекцыйнага ліста шляхты Берасцейскага павета да караля польскага і вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага

---

* Прынцыпы перадачы тэксту.

Літары, якія выйшлі з ужытку, — у рукапісе гэта є, ѡ, ѣ, ѣ, ѧ — захоўваюцца. Дыграф «кг», які выкарыстоўваўся для абазначэння выбухнога «г», захоўваецца. «Ер» («ъ») перадаецца як у сярэдзіне, так і ў канцы слова. Вынасныя надрадковыя і падрадковыя літары і склады ўносяцца ў радок і перадаюцца курсівам. Прапушчаныя літары ў скарочаных пад цітлай словах аднаўляюцца і заключаюцца ў круглыя дужкі. Паерык перадаецца знакамі «[г]».

Жыгімонта III Вазы, у якім паведамляецца аб выбранні на элекцыйным сойміку электаў (кандыдатаў) на пасаду земскага пісара.

[Арк. 68][5]

| Лѣта Бож(его) нарож(еня) ,а҃ф҃пѳ *[1589]*, м(е)с(е)ц(а) февраля ·г҃· *[3]* д[ня] | в рочьки кгродские.

| Вельможные их м(и)л(о)сть панове рады Его Королевское | м(и)л(о)сти, врадники земские и дворные и рыцерство | шляхта, wбователи воеводства Берес|те'ского, которые зъехали се де до Берестя | на ден вчорашны', wт велможного пана | Его м(ило)сти пана Крыштофа Зеновича, | воеводы бересте'ского, старосты | чечеръского и пропо'ского час, элекъцеи | зложоны', на wбиране електовъ пи|сара земского бересте'ского,[6] на враде | Его Королевское м(ило)сти замку бересте'ского | передъ нами, врадъниками кгрод|скими бересте'скими: Малхером | Ра'ским, подъстаростим, Адамомъ | Крычевским, судьсю, том ниже меноваиы' лист элекцыи своее, за печатми | и с подъписы рукъ своих, для | ўписаня до книгъ врадовых | подати рачыли. Которы' же | в слове до слова так ся в собе мает: |

«Наясне'шы' а милостивы' г(о)с(по)д(а)рў ко|ролю. Пане, а пане, панъ нашъ | м(и)л(о)стивы'. Wзна'муем Ваше' Королевско' | м(и)л(ос)ти, г(о)с(по)д(а)рў нашому милостивому, | ижъ зъехавшысе нам до Берестя | на ден и час, wт велможного пана Его м(и)л(ос)ти | пана Крыштофа Зеновича, воеводы || [арк. 68адв.] | бересте'ского, старосты чечерского и про|по'ского, элекъцыи зложоны', на wбиране | wлекътовъ писара земского бересте'ского, | то ест на ден сегодънешни вторы' м(е)с(е)ца | февраля в року нинешнем тисеча пят|сотъ wсмъдесят подевятом. На кото|ром то дню згодне wбърали есмо | и wдноста'не с посродъку себе | на том врад писаръства земского бере|сте'ского братю нашў: Мальхера Ра'|ского, подъстаростего[7], пана | Адама Крычевского, судю[8], а пана | Павла Заранка, писара[9], врадников | кгродских бересте'ских, которые бу|дўчы на том ўраде кгродском присто'не | а ўчътиве тыми врады | своими, через час не малы' справую|чыся, намъ и Речы Посполито' | верў и статочност заховывали, | а четвертого элекъта — пана Лва | Патея, земенина Ваше' Королевско'е | м(и)л(о)сти, ижъ добре в Речы Посполито' | заслужоно(го).[10]

Што мы доносечы | до ведомости Ваше' Королевское м(и)л(о)сти, | пана нашого милостивого, покорне | а ўнижене просим, албы Ваша | Королевская м(и)л(ос)т с тых чотырох | элекътовъ нашых на том врад | писарски' wдного з них намъ дати | и конфирмовати рачыл водле | воли и бачення Ваше' Кор(олевской) м(и)л(ости), || [арк.69] |

пана нашого м(и)л(ос)тивого, и подле заслуг ѡсо[б], | звышъ помененых, ꙗко сꙗ Ваше' Кор(олевской) | м(и)л(ости) и тежъ продковъ Ваш(ей) Кор(олевской) м(и)л(ости), | такъ и Речы Посполито', заслужыли. | А с тым себе и верное подданство нашое | до м(и)л(ос)тивое ласки Ваше' Кор(олевской) м(и)л(о)сти, г(о)с(по)д(а)ра | нашого милостивого покорне и ꙋ|ниженьє ѡтдаем.

Писан ꙋ Берестю. | Лета Божого нароженьꙗ тисеча | пꙗтсот ѡсмъдесꙗть девꙗтого, | м(е)с(е)ца фєвралꙗ третего днꙗ. |

Наꙗсне'шого маестату Ваше' | К(о)ролевское м(и)л(ости) вернаꙗ рада | и ꙋниженые потданые: сена|торове и врадники земские и всꙗ | шлꙗхта ѡбыватели повету | Бересте'ского.»

Которого жъ | листꙋ елекцыи помененого | за жеданемъ их м(и)л(остей) до книг вра|довых записано.

---

[1] Радаман Андрэй. *Элекцыйныя соймікі Новагародскага павета ў другой палове XVI ст.* // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 27 сакавіка 1999 г.: У 2 ч. / БДПУ імя М. Танка. Мн., 1999. Ч. 2. С. 109—115; яго ж. *Шляхецкія соймікі і з'езды як структурная адзінка сістэмы ўлады ў Менскім павеце ў другой палове XVI ст.* // Магдэбургскае права на Беларусі: Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю выдачы гораду Мінску граматы на магдэбургскае права (Мінск, 26 сакавіка 1999 г.). БДУ; Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь; БНІП / Рэдкал.: У. М. Хоміч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо. Мн.: Право и экономика, 1999. С. 79—87; яго ж. *Элекцыйныя соймікі Браслаўскага павета ў другой палове XVI ст.* // *Браслаўскія чытанні.* Матырыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах, 27—28 красавіка 2000 г. / Браслаўскае музейнае аб'яднанне, Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Гедэмана. Браслаў, 2001. С. 75—83.

[2] Zakrzewski Andrzej B. *Ograniczenie przez sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego monarszego prawa mianowania urzędników sądowych, XVII—XVIII w.* // *Lietuvos valstybė XII—XVIII a.: mokslinis leidinys: straipsnių rinkinys* / Lietuvos istorijos inst.; red. kol.: Z. Kiaupa, A. Mickievičius, J. Sarcevičienė. Vilnius, 1997. P. 173—186.

[3] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / БСЭ імя П. Броўкі.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелСЭ, 1989. С. 139.

Перевод / подписанный скрепил Минскаго главнаго / суда 1-го департамента председатель Людвик / Каменский.

---

* Літара «м» напісана над радком.

Пасведчанне генерал-маёра Тучкова
А. Бургельскаму за 2 лістапада 1812 г.

[7] Копия /
Свидетельство /

По воле г[осподина] главнокомандующаго Западной ар / мии адмирала и кавалера Чичагова дано сие / управителю князя Радзивила шляхтичу Ал / берту Бургельскому, что он вынужден был / показать главному начальству / некоторых мест, где хранились вещы помянутаго / князя Радзивила.

Ноября 2 дня 1812 года в / Несвиже.

На подлинном подписано дежур / ный генерал майор Тучков /
/М:П:/

Копию скрепил Минскаго главнаго / суда 1 департамента председатель Л. / Каминский. //

Цэдула канцылярыі мінскага ваеннага губернатара
да мінскага грамадзянскага губернатара
аб дастаўленні па запатрабаванні галоўнакамандуючага
кн. Галянішчава-Кутузава арыгінальных папераў
аб разрабаванні Нясвіжскага замка за 28 сакавіка 1813 г.

[8] Копия /

Главнокомандующий всеми армиями / г[осподи]н генерал фельдмаршал и кавалер князь / Голенищев Кутузов Смоленский, прислан / ным повелением к г[осподину] Минскому воен / ному губернатору артилерии генерал / майору и кавалеру Игнатьеву, требует доста / вления к нему с нарочным оригиналь / ных бумаг, взошедших к г[осподи]ну Минскому / гражданскому губернатору и кавалеру / о забранных из Несвижскаго замка при / надлежащих к князю Радзивилу тай / ных сокровищах. /

Вследствие чего канцелярия г[осподина] Мин / скаго гражданского губернатора и благо / волит доставить оные в канцелярию г[осподи]на / Минскаго военнаго губернатора. /

Подписал правитель канцелярии Межен / цов. /

28 марта / 1813 года / [М]инск //

Цэдула канцылярыі мінскага грамадзянскага губернатара да мінскага ваеннага губернатара з суправаджэннем арыгінальных папераў аб разрабаванні Нясвіжскага замка за 29 сакавіка 1813 г.

[9] № 3390 Копия

По требованию канцелярии Минскаго / военнаго губернатора от артилерии г[осподина] / генерал-майора и кавалера Гаврылы / Александровича Игнатьева от 28 сего / марта канцелярия Минскаго г[осподина] граждан / скаго губернатора Павла Михаиловича / Добринскаго имеет честь за позволением / г[осподина] губернатора препроводить при сем в / оную канцелярию оригинальное предста / вление главноуправляющаго всеми име / ниями князя Радзивила Минскаго / главнаго суда 1 департамента предсе / дателя Каминскаго от 30 прошедшаго / генваря и приложенные при нем:

пер / вое перевод с донесения управляющаго Нес / вижским князя Радзивила замком / дворянина Альберта Бургельскаго писан / наго на польском языке от 5 генваря / помянутому г[осподину] Каменскому о забран / ных из Несвижскаго замка, принадле / [жа]щых князю Радзивилу тайных / [сокро]вищах, на 4-х листах.

Второе. Копия / [свиде]тельства даннаго ноября во 2-й день под // [9 v.] № 4863-м от дежурнаго генерал май[ора] / Тучкова управителю князя Радзивила / шляхтичу Бургельскому в том, что / Бургельский вынужден был показать гл[ав] / ному начальству некоторыя места, где / хранились вещы князя Радзивила. /

При сем сия канцелярия уведомляет, / что означенная копия свидетельства и пере / вод с польскаго засвидетельствованы им / г[осподином] Каминским, а оригинальных бумаг / представляемо не было.

Марта 29 дня / 1813 года.

Принял и расписался / правитель канцелярии Иван Меженцов. //

Цэдула канцылярыі мінскага грамадзянскага губернатара да мінскага ваеннага губернатара з суправаджэннем копій папераў аб разрабаванні Нясвіжскага замка за 9 лютага 1813 г.

[10] [№] 1684 9 февраля /

Господину Военному губернатору / и кавалеру Игнатьеву. /

Главные поверенные князя Доминика / Радзивила здешняго главнаго суда* 1 депар / тамента председатель Каменский / при донесении своем от 30 прошедшаго генваря / представил ко мне перевод с донесения / по польски писаннаго к нему от заве / дывающаго Несвижским замком / князя Радзивила Альберта Бургельскаго / о забрании во время переходу Молдавской / армии и корпуса** генерала Тучкова чрез / местечко Несвиж имущества речен / наго князя, составляющаго украшение / замка, хозяйственныя запасы совмест / но с архивом книг и разных докумен / тов и особо состоящаго в разных драго / ценностях, которые сохранялись в пота / емном месте помянутаго замка с / давных времен или веков и о кото / рых нынешней владелец того замка / князь Доминик Радзивил не был сведущ // [10 v.] с представлением при том коп[ии сви] / детельства дежурнаго генерала Тучк[ова, в том] / что помянутой Бургельский принуж[ден] / был показать все те сокровища. Ва[ше] / Превосходительство изволите усмо[т] / реть подробно таковое произшеств[ие] / из означеннаго донесения Альберта Бур / гельскаго, с коего равно с свидетельст[ва] / и с писма г[осподина] Каменскаго имею чест[ь] / представить у сего точные копии, пре[д] / ставляя действие по сему, так как / жалоба происходит на военное начальст[во] / по уважению Вашего Превосходительств[а.] //.

---

[1] Taurogiński B. Z dziejów Nieświeża. Warszawa, 1937. S. 154—158.

[2] НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 5230. Арк. 1—10адв.

---

* Літары «да» заплямлены.

** Літара «а» напісана па папраўленаму.

III. КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

Р. С. Жаўняркевіч

Сфрагістыка рыма-каталіцкіх парафій былога Ігуменскага павета (XVIII—пачатак XX ст.)

Сфрагістыка рыма-каталіцкіх (далей — р.-к.) парафій уяўляе сабой адзін з найцікавейшых накірункаў у гісторыі каталіцызму ў Беларусі. На сёння гэты матэрыял ледзь-ледзь крануты даследчыкамі. З публікацый, часткова прысвечаных згаданай тэме, мы можам прыпомніць даклад А. К. Цітова на VI Міжнароднай генеолага-геральдычнай канферэнцыі пад назвай «Конфессиональная символика Беларуси», дзе даследчык робіць невялікі агляд асаблівасцяў р.-к. сфрагістыкі і публікуе выявы пячатак некаторых беларускіх касцёлаў[1].

У сфрагістыцы р.-к. касцёлаў Беларусі ў XVIII — пачатку XX ст. адсутнічае юрыдычная уніфікацыя, у адрозненне таго, што мы назіраем у сфрагістыцы праваслаўных цэркваў. Пячаткі касцёлаў былі рознымі па памерах, форме (круглыя ці авальныя), па лінгвістычных характарыстыках (лацінская, польская, руская мовы), па зместу легенды (поўныя ці скарочаныя).

Вялікую цікавасць у р.-к. сфрагістыцы ўяўляе яе іканаграфія*. У сваёй большасці іканаграфічныя сюжэты размяшчаліся ў полі пячаткі і адпавядалі тытулу касцёла. Усе гэтыя сюжэты ў большай ці меншай ступені былі запазычаны з заходнееўрапейскай сфрагістычнай іканаграфіі.

У былым Ігуменскім павеце Мінскай губерні ў розныя часы на працягу XVIII — пачатку XX ст. існавала дзевяць р.-к. парафій і адпаведна дзевяць парафіяльных р.-к. касцёлаў: Багушэвіцкі, Блонскі, Бярэзінскі, Дукорскі, Ігуменскі, Каралішчавіцкі, Серафінскі, Смілавіцкі і Уздзенскі. Усе яны ад 1798 г. уваходзілі ў склад Ігуменскага дэканата, апрача Уздзенскага касцёла, які падпарадкоўваўся Наднёманскаму дэкану. Ігуменскі дэканат да 1869 г. уваходзіў у склад Мінскай, затым да 1883 г. у склад Віленскай р.-к. дыяцэзіі і ад 1883 г. у склад Магілёўскай р.-к. арцыдыяцэзіі. Да 1867 г. цэнтрам Ігуменскага дэканата былі Смілавічы, пасля 1867 г. — Ігумен.

---

* Іканаграфія (ад грэч. eikon — абраз, выява, grapho — пішу, малюю), кананічная сістэма выяўлення персанажаў і сюжэтных схем.

Пад час працы над сфрагістычнымі крыніцамі р.-к. парафій Ігуменскага павета былі выяўлены ўсе касцёльныя пячаткі, за выключэннем пячаткі Багушэвіцкага касцёла. У Бярэзінскага, Серафінскага і Уздзенскага касцёлаў былі выяўлены па дзве пячаткі: раннія і познія. На позніх пячатках легенда падаецца на рускай мове і іканаграфічныя выявы больш стылізаваныя, без пэўных адметных рысаў. Матрыцы больш ранніх пячатак былі металічныя і большасць адбіткаў ціснулася імі метадам курадыму: матрыца награвалася агнём з адначасовым напальваннем на яе прадуктаў гарэння, а потым прыціскалася да паперы на якой заставаўся чорна-белы адбітак. Гэтыя адбіткі з'яўляюцца вельмі даўгавечнымі і цудоўна захаваліся дагэтуль.

Матрыцы пячатак асобных касцёлаў канца XIX—пачатку XX ст. былі каўчукавымі ці гумовымі і ціснуліся з дапамогай масцікі тым жа метадам, якім прыкладаюць пячаткі ў наш час.

Усяго на пячатках касцёлаў Ігуменскага павета было выяўлена восем іканаграфічных сюжэтаў: Св. Ян Францішак Рэгіс, Унебаўзнясце Панны Марыі, Св. Францішак, Узвышэнне Св. Крыжа, Апека Панны Марыі, Св. Антоні Падуанскі, Св. Троіца, Здабыча Св. Крыжа.

1. Багушэвічы. Касцёл пад тытулам Святой Троіцы*

Фундуш на пляц і пробашча нададзены кн. Грыгорыем Юрыем Друцкім Горскім, старостам аршанскім у 1644 г.[2] Зямля на касцёл была набыта ад Яна Пашкоўскага, земяніна ЯКМ[3]. Па стане на 1798 г. драўляны касцёл не дзейнічаў, не меў пробашча, парафіяне былі прыпісаны да Бярэзінскага касцёла[4].

Мал. 1

Мал. 2

Мал. 3

2. Блонь. Касцёл Святога Яна Францішка Рэгіса.

Пячатка авальная па форме. Легенда па авале на польскай мове наступнага зместу: «PIECZĘĆ KOSCIOLA PARAF. BLON POD TIT.

* Пячатка не выяўлена.

S. IANA REGISA» («ПЯЧАТКА БЛОНСКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА ПАД ТЫТУЛАМ СВЯТОГА ЯНА РЭГІСА»).

У полі постаць Святога Яна Францішка Рэгіса, які ў адной руцэ трымае галінку пальмы, у другой крыж (мал. 1. Усе малюнкі да артыкула зроблены мастаком А. Леўчыкам).

Ян Францішак Рэгіс (31.01.1597—31.12.1640) — дзеяч Ордэна езуітаў, які прысвяціў сваё жыццё душапастырскай працы з хворымі, нямоглымі і вязнямі ў правінцыі Лангедок (Францыя). Кананізаваны папам Клеменсам XII у 1737 г.[5]

Фундуш на пляц для Блонскага касцёла быў нададзены панамі Ілічамі, войскімі ваўкавыскімі для айцоў езуітаў[6]. Касцёл пабудаваны прыкладна ў 1742 г. самімі езуітамі. З 1772 г. па скасаванні Ордэна езуітаў ён быў ператвораны ў парафіяльны[7]. У 1806 г. з-за неасцярожнага абыходжання са зброяй жаўнерам драгунскага Казанскага палка касцёл быў пашкоджаны пажарам[8]. У тым жа годзе Ружа Пулкамерон надала новы фундуш на яго адбудову. У 1901 г. касцёл перабудаваў кс. Мацей Вайцекунас і ў тым жа годзе сам яго кансекраваў[9]. На працягу ўсяго свайго існавання касцёл быў драўляны.

3. Бярэзіна. Касцёл пад тытулам Унебаўзняцця Панны Марыі і Маці Божай Шкаплернай ці Кармельскай.

Першая пячатка авальнай формы. Па вонкавым авале легенда на польскай мове наступнага зместу: «PIECZĘC KOSCIOLA RZYMSKO KATOLICKIEGO PAROCH BEREZINSKIEGO» («ПЯЧАТКА БЯРЭЗІНСКАГА РЫМА-КАТАЛІЦКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА»).

Па ўнутраным авале легенда на лацінскай мове наступнага зместу: «SUB TITULO ASSUMETIONIS SANTA MARIA VIRGINIS» («ПАД ТЫТУЛАМ УНЕБАЎЗНЯЦЦЯ СВЯТОЙ ПАННЫ МАРЫІ»).

У полі пячаткі выяўлена постаць Панны Марыі сярод аблокаў (мал. 2).

Другая больш позняя пячатка (1912) круглай формы. Легенда па коле на рускай мове наступнага зместу: «ПЕЧАТЬ БЕРЕЗИНСКАГО Р. К. ПРИХОД. КОСТЕЛА» («ПЯЧАТКА БЯРЭЗІНСКАГА РЫМА-КАТАЛІЦКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА»).

У полі пячаткі выяўлена постаць Панны Марыі на аблоках у атачэнні двух анёлаў (мал. 3).

Касцёл закладзены за граматай караля польскага і вялікага князя літоўскага Уладзіслава IV ад 24 верасня 1641 г. Казіміру Льву Сапегу, канцлеру літоўскаму і маршалку надворнаму ВКЛ і пану Навасельскаму, старосту любашанскаму[10]. Кансекраваны пад тытулам «Унебаўзняц-

ця Панны Марыі». У 1803 г. адбылася грунтоўная перабудова касцёла коштам графіні Вансовіч. У тым жа годзе касцёл быў кансекраваны за дазволам кс. Якуба-Ігнацыя Дэдэркі, біскупа Мінскага, кс. Міхалам Гродскім, дэканам Ігуменскім, суперыорам Смілавіцкага дома айцоў місіянераў пад тытулам Маці Божай Шкаплернай ці Кармельскай[11]. У 1844 г. касцёл зноў грунтоўна перабудаваны коштам той жа фундатаркі. У снежні 1844 г. храм рэкансекраваны пад тым жа тытулам кс. Паўлам Равам, упраўляючым Мінскай р.-к. дыяцэзіі[12].

Мал. 4

Мал. 5

Мал. 6

4. Дукора. Касцёл пад тытулам Святога Францішка.

Пячатка авальнай формы. Легенда на польскай мове наступнага зместу: «PIECZ: RZYM: KATOL: KOSCIOŁA. DUKORSKIEGO:» («ПЯЧАТКА ДУКОРСКАГА РЫМА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА»).

У полі пячаткі выява Св. Францішка Асізскага ва ўбогай вопратцы з кіем і маленькім крыжыкам у руках (мал. 4).

Святы Францішак з Асіза (1182 — 04.10.1226) (сапр. Ян Бернардоне) — святы каталіцкага касцёла, заснавальнік Ордэна францысканцаў. Выказваў беднасць, пакуты, адрачэнне ад зямных радасцяў. З 1207 г. і да смерці хадзіў апранутым у самую ўбогую вопратку. 15 ліпеня 1229 г. папа Грыгорый IX кананізаваў Францішка, што было першай урачыстай кананізацыяй[13].

Фундуш на пляц для касцёла быў нададзены палкоўнікам Францішкам Ашторпам, дзедзічам маёнтка Дукора ў 1794 г.[14] У тым жа годзе па распараджэнні уніяцкага біскупа Адрыяна Бутрымовіча айцом Тадэушам Лебядзінскім, прыорам Лядзенскага кляштара айцоў базыльянаў быў асвячоны вуглавы камень з наданнем будучаму храму тытула Св. Пятра і Св. Паўла[15]. У 1800 г. будоўля касцёла была скончана[16]. У 1804 г. ён быў кансекраваны кс. Міхалам Гродскім, дэканам Ігуменскім, суперыорам Смілавіцкага дома айцоў місіянераў пад тытулам Св. Францішка[17]. З гэтага часу касцёл з'яўляўся філіялам Смілавіцкага касцёла Св. Троіцы, але выкарыстоўваўся і грэка-каталіцкім духавенствам (з

1839 г. выкарыстоўваўся толькі ў якасці касцёла). У 1850 г. яго ператварылі ў парафіяльны[18]. Пад час паўстання 1863—1864 гг. парафіяне пелі ў касцёле паўстанчыя гімны[19]. У 1864 г. касцёл ліквідаваны, а ў 1865 г. перададзены ў праваслаўнае ведамства[20]. Далей вядомы як Успенская царква. На працягу ўсяго існавання касцёл быў мураваным.

5. Ігумен. Касцёл Узвышэння Святога Крыжа.

Пячатка авальнай формы. Легенда па авале на лацінскай мове наступнага зместу: «SIGILLUM ECCLESIÆ IHUMENENSIS» («ПЯЧАТКА ІГУМЕНСКАЙ ПАРАФІІ»).

У полі пячаткі выява Святога Крыжа, у які ўплецена літара «S» (мал. 5).

Касцёл у Ігумене закладзены 23 красавіка 1799 г. часткай коштам мясцовых каталікаў, часткай са сродкаў смілавіцкіх айцоў місіянераў у якасці філіяла Смілавіцкага касцёла Св. Троіцы. Кансекраваны 15 лістапада 1800 г. за дазволам кс. Якуба-Ігнація Дэдэркі, біскупа Мінскага[21], кс. Міхалам Гродскім, дэканам Ігуменскім, суперыорам Смілавіцкага дома айцоў місіянераў пад тытулам Узвышэння Святога Крыжа[22]. Дата пераўтварэння касцёла ў парафіяльны не высветлена. З 1867 г. — цэнтр Ігуменскага дэканата. На працягу свайго існавання касцёл быў мураваным.

6. Каралішчавічы. Касцёл Апекі Панны Марыі.

Пячатка круглай формы. Легенда па коле на лацінскай мове наступнага зместу: «ECCL PAR KOR» («КАСЦЁЛ ПАРАФІЯЛЬНЫ КАРАЛІШЧАВІЦКІ»).

Храналагічны элемент: «17». Гэтыя лічбы служылі для напісання года, у якім была прыціснута пячатка.

У полі пячаткі выяўлена папская карона, два скрыжаваныя ключы бародкамі дагары, а з долу манаграма з лацінскіх літар «M», «A», «R», «I», «A», што з'яўляецца адным з сімвалаў у іканаграфіі Панны Марыі. У данным выпадку апека Св. Марыі трактуецца яшчэ і як апека каталіцкага касцёла, таму ў полі пячаткі маюцца сімвалы папскай улады: карона і ключы (мал. 6).

Фундуш на пляц касцёла надаў Станіслаў Прушынскі, генерал-лейтэнант войск Літоўскіх, кавалер ордэна Св. Станіслава, суддзя гродскі мінскі, падстароста мінскі, маршалак ігуменскі. Фундуш зацверджаны ў Трыбунале Літоўскім на кадэнцыі Віленскай у 1785 г.[23] Касцёл пабудаваны ў тым жа годзе самім фундатарам. Беатыфікаваны 20 ліпеня 1786 г. кс. Ваньковічам, арцыдыяканам Беларускім[24]. У 1859—1863 гг. касцёл перабудаваны кс. Вішнеўскім, мясцовым про-

башчам і візітатарам кляштараў[25]. Касцёл меў філіял у Лошыцы. На працягу ўсяго існавання касцёл быў драўляны.

Мал. 7

Мал. 8

Мал. 9

7. Серафін. Касцёл Святога Антонія Падуанскага.

Першая, ранейшая, пячатка авальнай формы. Легенда па вонкавым авале на лацінскай мове наступнага зместу: «SIGILLUM MISSIONIS MACIEVIECENSIS ORD. MIN. CONV. S. F.» («ПЯЧАТКА МАЦЕЕВІЦКАЙ МІСІІ МІНСКАГА КАНВЕНТА СВЯТОГА ФРАНЦІШКА»)

Вёска Мацеевічы знаходзілася непадалёк ад в. Серафін і таму цалкам магчыма, што місія айцоў францысканцаў размяшчалася ў Мацеевічах, а касцёл у Серафіне. У полі пячаткі выявы постацей Св. Антонія Падуанскага і немаўляці, побач надпіс «S. ANTONIUS» («СВЯТЫ АНТОНІ») (мал. 7).

Другая, пазнейшая, пячатка таксама авальнай формы. Легенда па авале на лацінскай мове наступнага зместу: «SIG: ECCL: ROM: CATH: PAROCHIALIS: SERAPHINENSIS: TIT: ANTONII DE PADUA» («ПЯЧАТКА СЕРАФІНСКАГА РЫМА-КАТАЛІЦКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА ПАД ТЫТУЛАМ АНТОНІЯ З ПАДУІ»)

У полі пячаткі выява таго ж зместу, што і на ранейшай пячатцы Серафінскага касцёла (мал. 8).

Св. Антоні з Падуі (1195, Лісабон — 13.06.1231, Падуя), дзеяч Ордэна Святога Францішка, імя Падуанскі атрымаў ад г. Падуя ў Італіі, дзе знаходзяцца яго рэліквіі. Паплечнік Францішка Асізскага. Казаў Евангелле ў Афрыцы, затым у Італіі, Францыі, Іспаніі. Быў настаўнікам тэалогіі ў Балонні, Тулузе, Монпел'е і Падуі. Кананізаваны папам Грыгорыем IX у 1232 г.[26]

Фундуш на пляц для Серафінскага касцёла нададзены Казімірам-Міхалам-Елізарыем і Бенедыктай з Віндарскіх Янішэўскімі, падстоліямі аўруцкімі. Касцёл пабудаваны ў 1762 г. самімі фундатарамі

для айцоў францысканцаў. 11 лютага 1762 г. касцёл быў кансекраваны кс. Феліксам Тавянскім, біскупам Картузіянскім, суфраганам і афіцыялам Беларускім[27]. З 11 кастрычніка 1832 г., па ліквідаванні францысканскага кляштара, касцёл ператвараецца ў парафіяльны. На працягу свайго існавання касцёл быў драўляным.

8. Смілавічы. Касцел пад тытулам Святой Троіцы.

Пячатка авальнай формы. Легенда па авале на лацінскай мове наступнага зместу: «SIGILLUM: ECCLESIÆ: PAROCHIALIS: SMILOWICENSIS:» («ПЯЧАТКА СМІЛАВІЦКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА»).

У полі пячаткі выява Св. Троіцы: на аблоках Бог-Айцец з бэрлам і яблыкам, Бог-Сын (Ісус Хрыстос) з крыжам і над імі Св. Дух у выглядзе голуба (мал. 9).

Фундуш на пляц для Смілавіцкага касцёла надала Марцыбеля з Агінскіх Завіша, маршалкоўна надворная ВКЛ, старасціна мінская, чачэрская і бабруйская, 10 лістапада 1744 г.[28] У 1747 г. быў узведзены драўляны касцёл для айцоў місіянераў. У 1757 г. тая ж фундатарка надала фундуш на пляц і будаўніцтва мураванага касцёла[29]. У 1784 г. новы касцёл быў вымураваны часткай коштам самой фундатаркі, часткай коштам айцоў місіянераў пад кіраўніцтвам кс. Міхала Гродскага, пробашча Смілавіцкага і суперпрыора Смілавіцкага дома айцоў місіянераў[30]. 13 верасня 1785 г. касцёл быў кансекраваны кс. Францішкам Гзоўскім, біскупам Тэспенскім, суфраганам Троцкім, канонікам Віленскім і пробашчам Барысаўскім пад тытулам Св. Троіцы[31]. Ад утварэння Мінскага біскупства ў 1798 г. і да 1867 г. Смілавіцкі касцёл з'яўляўся рэзідэнцыяй Ігуменскіх дэканаў. 12 жніўня 1832 г. па ліквідацыі місіянерскага дома касцёл ператвараецца ў парафіяльны. У 1853—1854 гг. у касцёле адбыўся значны рамонт[32]. 10 студзеня 1867 г. ў выніку кампаніі па зачыненні некаторых касцёлаў па задушэнні паўстання 1863—1864 гг. Смілавіцкая р.-к. парафія была ліквідавана[33]. Будынак касцёла перададзены ў праваслаўнае ведамства і ў далейшым выкарыстоўваўся ў якасці праваслаўнай Троіцкай царквы.

9. Узда. Касцёл пад тытулам Здабычы Святога Крыжа.

Першая пячатка круглай формы. Легенда па коле на лацінскай мове наступнага зместу: «SIGILLUM ECCLESIÆ: PAROCHIALIS: UZDENSIS» («ПЯЧАТКА УЗДЗЕНСКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА»).

У полі легенда на лацінскай мове наступнага зместу: «CURAVILANT MARCINKIEWICZ», азначае, што пячатка належала мясцова-

му курату Марцынкевічу. У полі пячаткі размешчана выява постаці Св. Алены з крыжам у руцэ (мал. 10).

Мал. 10

Мал. 11

Святая Алена (244 ці 248 — 326 ці 327, ці 328) — маці рымскага імператара Канстанціна Вялікага. Мела вялікі ўплыў на сына і шмат садзейнічала распаўсюджванню хрысціянства. У 325 г. здейсніла пілігрымку ў Палесціну, дзе адшукала Гроб Панскі і рэшткі крыжа, на якім быў распяты Збаўца. Над Гробам Панскім Алена пабудавала храм і ўзнесла Крыж[34]. На абразах Св. Алена выяўляецца ў выглядзе кабеты паважнага ўзросту з каронай на галаве і крыжам у руках[35].

Другая пячатка круглай формы. Легенда па коле на рускай мове наступнага зместу: «ПЕЧАТЬ УЗДЕНСКАГО Р. К. ПРИХОД: КОСТЕЛА» («ПЯЧАТКА УЗДЗЕНСКАГА РЫМА-КАТАЛІЦКАГА ПАРАФІЯЛЬНАГА КАСЦЁЛА»)

У полі пячаткі размешчана выява Унебаўзняцця Панны Марыі ў атачэнні двух анёлаў (мал. 11). Розніцу ў сфрагістычнай іканаграфіі Уздзенскага касцёла можна патлумачыць тым, што Унебаўзняцце Панны Марыі магло быць другім тытулам касцёла і такім чынам гэты сюжэт і трапіў на пячатку.

Фундуш на плянц і пабудову Уздзенскага касцёла надаў Крыштаф Кавячынскі, падкаморы мінскі, ўладальнік маёнтка Кухцічы, 16 студзеня 1648 г.[36] Касцёл быў кансекраваны пад тытулам Перамянення Панскага. Прыкладна ў 90-х гг. XVIII ст. касцёл згарэў ад маланкі. У 1798 г. новы ўладальнік маёнтка Кухцічы Казімір Завіша, генерал войск расійскіх, фундаваў новы касцёл. У тым жа годзе касцёл быў узведзены. 12 верасня 1798 г. за дазволам кс. Якуба-Ігнацыя Дэдэркі, біскупа Мінскага, кс. Казімір Камінскі кансекраваў касцёл пад тытулам Здабычы Св. Крыжа[37]. У далейшым храм рамантаваў мясцовы пробашч і плябан кс. Гліндзіч[38]. На працягу ўсяго свайго існавання касцёл быў драўляны.

---

[1] Гербовед. 1997, сентябрь. № 21. С. 118—130.

[2] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 259. Арк. 72.
[3] Там жа. Спр. 253. Арк. 17ад.
[4] Там жа. Спр. 259. Арк. 72—73.
[5] Encyklopedya kościelna. T. VIII.Warszawa, 1876. S. 473—474.
[6] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 220. Арк. 1.
[7] Там жа. Воп. 26. Спр. 1494. Арк. 22.
[8] Там жа. Воп. 27. Спр. 328. Арк. 28.
[9] Там жа. Воп. 26. Спр. 1504. Арк. 22.
[10] Там жа. Воп. 27. Спр. 218. Арк. 1; Спр. 376. Арк. 2; Спр. 461. Арк. 1.
[11] Там жа. Спр. 376. Арк. 1.
[12] Там жа. Спр. 461. Арк. 1.
[13] Encyklopedya kościelna. T. V. Warszawa, 1874. S. 535—543.
[14] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 461. Арк. 37.
[15] Там жа. Ф. 43. Воп. 1. Спр. 82. Арк. 45ад.—46ад.
[16] Там жа. Спр. 167. Арк. 41ад.
[17] Там жа. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 461. Арк. 37.
[18] Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1052. Арк. 17.
[19] Там жа. Ф. 43. Воп. 1. Спр. 82. Арк. 47.
[20] Там жа. Спр. 167. Арк. 41.
[21] Там жа. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 448. Арк. 1.
[22] Там жа. Спр. 363. Арк. 21—21ад.
[23] Там жа. Спр. 220. Арк. 108.
[24] Там жа. Спр. 461. Арк. 62.
[25] Там жа. Воп. 26. Спр. 1495. Арк. 26.
[26] Encyklopedya kościelna. T. I. Warszawa, 1873. S. 270—271.
[27] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 461. Арк. 52.
[28] Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 20. Арк. 502—502ад.
[29] Nasze kościoły. Archidjecezja Mińska. T. 2. Warszawa, Petersburg, 1913. S. 237—238.
[30] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 363.
[31] Там жа.
[32] Там жа. Воп. 24. Спр. 3296.
[33] Там жа. Спр. 13754. Арк. 4—4ад.
[34] Христианство. Энциклопедический словарь. Т. 1. М., 1993. С. 528.
[35] Encyklopedya kościelna. T. VII. Warszawa, 1875. S. 85—86.
[36] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1495. Арк. 108.
[37] Там жа. Воп. 27. Спр. 425. Арк. 1.
[38] Там жа. Спр. 220. Арк. 168.

А. А. Лашкевіч

Актавыя кнігі гродскіх і магістрацкіх судоў як гістарычная крыніца

Актавымі (ад лацін. слова acta — здзелка, пастанова, вызначэнне) кнігамі называліся судовыя кнігі Вялікага княства Літоўскага XVI—XVIII стст. Яны былі ўведзены Статутам ВКЛ 1529 г. У іх запісвалі ўсе дакументы, што мелі дачыненне да спраў, якія разглядаліся адпаведнымі судамі: судовыя пастановы, запісы аб правядзенні некаторых працэсу-

альных дзеянняў. Акрамя таго, у актавыя кнігі заносіліся дакументы натарыяльнага і афіцыйнага характару — прывілеі і граматы каралёў і вялікіх князёў, пастановы соймаў, ваяводскіх і павятовых соймікаў і інш. За тры дні да пачатку судовай сесіі зацікаўленыя асобы маглі ўнесці ў актавыя кнігі дадатковыя запісы або атрымаць копіі неабходных дакументаў. У сувязі з гэтым усе актавыя кнігі незалежна ад іх статуса з'яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння гісторыі Беларусі.

Гродскі або замкавы суд — гэта павятовы суд у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Яго назва ішла ад горада (грода) ці замка, дзе звычайна галоўнымі суддзямі былі мясцовыя ваявода, староста або дзяржаўца (часовы карыстальнік дзяржаўнага маёнтка). Гродскія суды разглядалі справы аб найбольш цяжкіх крымінальных злачынствах, грамадзянскія справы аб выпатрабаванні збеглых: нявольнай чэлядзі і залежных сялян, сведчылі таксама здзелкі, копіі дакументаў, забяспечвалі выкананне прыгавораў і рашэнняў іншых судоў. Акрамя таго, у рэальным жыцці гродскія суды займаліся і тымі справамі, якія адпаведна тагачаснаму заканадаўству адносіліся да кампетэнцыі земскіх судоў (павятовых шляхецкіх судоў) — асабліва па спрэчках аб праве валодання зямельнымі ўгоддзямі, па пытаннях аб вызначэнні дакладных межаў паміж рознымі землеўладальнікамі і г. д.

Актавыя кнігі гродскіх судоў даюць магчымасць выкарыстоўваць іх у якасці крыніцы для вывучэння сацыяльнага становішча і паўсядзённага жыцця шляхты і сялян Беларусі ў XVI—XVIII стст. У асноўным гэта адносіцца да шляхты і толькі ў пэўнай ступені да сялянства, паколькі апошняе з'яўлялася ў той час юрыдычна непаўнапраўным. Сялянс знаходзіліся не толькі ў эканамічнай, але і асабістай залежнасці ад сваіх паноў, г. зн. падпадалі пад іх юрысдыкцыю, былі «падданымі» свайго пана. Таму ў судах іх інтарэсы часта прадстаўлялі тыя шляхціцы, чыімі падданымі яны з'яўляліся. Але гэта не было агульным правілам. Па судовых кнігах можна бачыць, што і самі сяляне непасрэдна звярталіся ў суд са сваімі скаргамі, прэтэнзіямі на дзеянні іншых сялян, шляхціцаў, мяшчан. Напрыклад, падданы аднаго пана мог сам скардзіцца ў суд на падданых другога пана за збіццё і рабаўніцтва. У іншым выпадку па падобнай справе ў суд мог звярнуцца яго пан. Так, у актавай кнізе Берасцейскага гродскага суда за 1589 г. маецца скарга шляхціца Афанаса Лазуцкага на «каралеўскіх падданых» (гэта значыць сялян з каралеўскага маёнтка) з вёскі Міхалкава за тое, што яны збілі і абрабавалі яго «падданых», якія вярталіся дадому з кірмашу[1].

Актавыя кнігі гродскіх судоў могуць служыць каштоўнай крыніцай у справе даследавання генеалогіі шляхецкіх родаў. Па матэрыялах судовых спраў можна даведацца аб тым, прадстаўнікі якіх сямей пражывалі ў тым ці іншым павеце, старостве або ваяводстве, іх месца ў шляхецкім саслоўі. Матэрыялы спраў па пытаннях куплі-продажу «заставы» (закладу) маёнткаў, вызначэння права валодання спрэчнымі зямельнымі пляцамі, межаў зямельных уладанняў дазваляюць прасачыць змяненні ў маёмасным становішчы мясцовай шляхты, іх руху ўверх або ўніз па сацыяльнай лесвіцы тагачаснага грамадства.

Па распаўсюджанасці тых або іншых імёнаў сярод шляхты і сялян можна ў пэўнай ступені меркаваць аб тым, якога веравызнання прытрымліваліся іх уладальнікі. Калі адна форма напісання аднаго і таго ж імені замянялася другой (да прыкладу Іван на Яна, Сцяпан на Стэфана і г. д.), то такая з'ява дае падставу зрабіць выснову аб перамене канфесійнай прыналежнасці. У дадзеным выпадку праваслаўя на рымакаталіцтва. Ужыванне такіх імён, як Гарнастай (жонка аднаго з берасцейскіх ваявод Галена Гарнастаеўна), Воўк (шляхцянка Духна Воўкаўна), яскрава сведчыць аб жывучасці язычніцкіх звычаяў у свядомасці беларусаў у разглядаемы намі перыяд.

Матэрыялы актавых кніг гродскіх судоў XVI ст. сведчаць аб пачатку распаўсюджвання з'явы шляхецкага свавольства, якое прывядзе дзяржаву да заняпаду праз дзвесце гадоў. Вельмі частай справай стала імкненне вырашыць спрэчныя пытанні з суседзямі сілавым спосабам, так званым «наездам». Гэта калі той ці іншы шляхціц збіраў сваіх сяброў, слуг і падданых ва ўзброены атрад і такім чынам урываўся ва ўладанні свайго суседа з мэтай самавольна зняць ураджай збожжа, пакасіць сена або палавіць рыбу ў яго вадаёмах. Напрыклад, ужо згаданая кніга Берасцейскага гродскага суда за 1589 г. пачынаецца з апавядання зямяніна (шляхціца) Станіслава Магільніцкага аб тым, як ён застаў свайго суседа шляхціца Канстанціна Лыпчынскага, які разам са сваімі падданымі лавіў рыбу ў возеры на тэрыторыі маёнтка Лазавіцкі, што належаў Магільніцкаму. Пры гэтым сам Магільніцкі стаў ахвярай нападу і ледзь змог уратавацца[2]. Вельмі часта «наезды» заканчваліся звычайным рабаўніцтвам і разбурэннем маёнткаў, збіццём гаспадароў, іх падданых.

Судовым органам у гарадах Вялікага княства Літоўскага, што мелі магдэбургскае права (права на самакіраванне, дадзенае каралём і вялікім князем), з'яўляўся магістрат. Ён быў адначасова выбарным адміністрацыйным органам гарадскога самакіравання і складаўся з рады і лавы. У раду выбіраліся бурмістры і радцы (райцы), у лаву —

лаўнікі. У Магілёве, у адрозненне ад іншых гарадоў Вялікага княства Літоўскага, пэўны час рада і лава дзейнічалі як адзіны судовы орган. У ім разам засядалі бурмістры, радцы і лаўнікі. Гэты суд узначальваў войт (кіраўнік гарадской адміністрацыі, прызначаны вялікім князем). Вельмі часта абавязкі войта, у тым ліку і па судовых справах, выконваў яго намеснік — лентвойт. Гарадскі суд разглядаў крымінальныя, грамадзянскія справы паміж мяшчанамі (гараджанамі), іх прэтэнзіі да шляхты і яе падданых. У сваёй дзейнасці кіраваўся магдэбургскім правам і статутамі Вялікага княства Літоўскага.

Матэрыялы магістрацкіх актавых кніг, у тым ліку і Магілёўскага магістрата, сведчаць аб тым, што ўнутры мяшчанскага саслоўя існавала пэўная сацыяльная іерархія. Гэта пацвярджаецца і тым, як у дакументах называлі таго або іншага жыхара горада. Звычайны жыхар называўся проста «мешчанін магілёўскі». Часам да гэтага дабаўлялася назва яго прафесійнага занятку — каваль, кравец, фурман і г. д. Да членаў гарадской адміністрацыі — бурмістраў, радцаў, лаўнікаў звярталіся са словамі «пан» або «ўчцівы» ці «шляхетны пан». Так жа велічалі найбольш заможных людзей горада — буйных гандляроў, дома- і землеўладальнікаў. Вельмі часта яны знаходзіліся ў сваяцкіх сувязях з членамі магістрата. Напрыклад, у канцы XVI ст. брат магілёўскага купца і ліхвяра Кандрата Максімавіча Гарасім Максімавіч з'яўляўся бурмістрам. На наш погляд, вярхушка мяшчанскага саслоўя (гарадскі патрыцыят) імкнулася да таго, каб наблізіць свой сацыяльны статус да ўзроўню шляхецкага калі не дэ-юрэ, то дэ-факта. Аб гэтым сведчыць і вышэйзгаданая форма — форма звароту, а таксама адзначаныя ў магілёўскіх актавых кнігах факты шлюбаў паміж прадстаўнікамі вярхушкі мясцовага мяшчанства і навакольнай шляхты.

Але асноўную масу гарадского насельніцтва складалі дробныя рамеснікі і гандляры. Іх сацыяльна-маёмасны стан не быў аднародным. Частка па ўзроўню жыцця набліжалася да прадстаўнікоў гарадскога патрыцыяту, іншыя — у любы момант маглі страціць свой невялікі дастатак і апынуцца сярод гарадскіх нізоў — парабкаў, жабракоў, што не мелі пэўнага месца жыхарства («лёзныя людзі»). Але ўсё ж пераважалі людзі сярэдняга дастатку. Шмат хто з іх знаходзіўся ў фінансава-эканамічнай залежнасці ад гарадской вярхушкі. Адным з самых распаўсюджаных дакументаў актавых кніг магілёўскага магістрата з'яўляюцца так званыя «сазнанні» — абавязацельствы мяшчан горада выплаціць у тэрмін грашовую пазыку. Вельмі часта крэдытору ў мэтах гарантыі своечасовасці вяртання доўгу перадаваліся ў заклад («заста-

ву») дом і зямельны пляц, што належалі атрымальніку пазык. Звычайна крэдыторамі выступалі члены магістрата, купцы, старосты рамесных цэхаў і іншыя прадстаўнікі гарадской вярхушкі.

Натуральна, што асноўная маса мяшчанства ўсяляк імкнулася абмежаваць уладу і ўплыў патрыцыята. Часам, гэтая барацьба выліваласа ў адкрытыя сутычкі і хваляванні, непадпарадкаванне гарадскім уладам, напады на іх прадстаўнікоў. Так, у адным з дакументаў актавай кнігі Магілёўскага магістрата змешчаны аповед мясцовага бурмістра Ігната Собаля аб тым, як ён ледзь выратаваўся ў памяшканні ратушы ад раз'юшанага натоўпу, што хацеў утапіць яго ў Дняпры. У рэшце рэшт барацьба гараджан супраць злоўжыванняў магістрата, што выбіраўся выключна з заможных гарадскіх вярхоў, прывяла да ўзнікнення з канца XVI ст. пастаяннага органа гарадскога самакіравання для кантролю за выдаткамі магістрата з гарадскога бюджэту, так званых «прысяглых паспалітых» (у Магілёве іх колькасць складала 12 чалавек), які кантраляваў падаткаабкладанне, заслухоўваў справаздачы магістрата па гэтых пытаннях.

Матэрыялы актавых магістрацкіх кніг, у нашым выпадку Магілёўскага магістрата, могуць дапамагчы пры складанні гістарычных карт горада і прылягаючай да яго мясцовасці.

Як мы бачым, судовыя і магістрацкія актавыя кнігі могуць служыць даволі разнастайнай крыніцай пры вывучэнні жыцця шляхты, сялянства і мяшчан Беларусі ў часы Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

---

[1] НГАБ. Ф. 1705. Воп. 2. Спр. 2. Арк 349адв.
[2] Там жа. Арк. 307

У. М. Свяжынскі

Лацінскія і грэчаскія элементы ў старабеларускім кірыліцкім пісьме

Пачатак функцыяніравання лацінскага пісьма на Беларусі быў пакладзены пранікненнем польскай і лацінскай моў разам з польскай культурай і каталіцкай рэлігіяй на тэрыторыю ВКЛ у выніку заключэння уній ВКЛ з Польшчай — спачатку Крэўскай, затым Люблінскай. Лацінская і грэчаская мовы пашыраліся пад уплывам гуманістычнага зацікаўлення антычнасцю і першакрыніцамі хрысціянства.

Ад пачатку з'яўлення першых лацінапісьмовых тэкстаў на Беларусі да поўнага выцяснення беларускай мовы польскай і адпаведна

кірылічнага пісьма пісьмом лацінскім мела месца даволі працяглая прамежкавая фаза ўкаранення на беларускіх землях польска-лацінскага пісьма — фаза суіснавання дзвюх сістэм пісьма — кірылічнай і лацінскай. Менавіта ў гэтай фазе ў выніку цеснага суіснавання дзвюх сістэм пісьма і здараліся выпадкі іх змешвання.

Яшчэ задоўга да Люблінскай дзяржаўнай уніі, якая адкрыла шырокую дарогу для польскага культурнага ўплыву на нашых землях, на Беларусі вывучалася польская мова. У сваіх успамінах навагрудскі падсудак Фёдар Еўлашоўскі піша, што на пятым годзе жыцця (г. зн. у 1551 г. — *У. С.*) «почато ме бавить наукою русскою» (вучыць беларускай грамаце — *У. С.*). А паколькі, піша ён далей, «в тых часех в тэй нашей строне не было еще инших науку», то ў выніку «пришло ми зостать з рускою и *полскою* наукою»[1].

Латынь была абавязковым элементам праграм перш за ўсё каталіцкіх школ. З пашырэннем і ўмацаваннем пазіцый каталіцызму на беларускіх землях у часы Контррэфармацыі для патрэб палемікі па рэлігійных пытаннях латынь пачынае вывучацца і ў праваслаўных школах. Выхадзец з праваслаўнай сям'і М. Сматрыцкі ў вядомым аплоце праваслаўнай культуры — Астрожскай школе князя Канстанціна Астрожскага быў «обучен славянски, гречески и латински», дзе яго настаўнікам быў яго бацька Герасім Сматрыцкі[2]. Вядомы беларускі і ўкраінскі праваслаўны дзеяч і пісьменнік Даніла Савіч Туптала (Дзмітрый Растоўскі) вучыўся ў Кіева-Магілянскай калегіі (1662—1665). У 1668 г. прыняў манаства. У 1677—1679 гг. — прапаведнік у Вільні і Слуцку. З 1702 г. — мітрапаліт у Растове, дзе адкрыў школу для дзяцей розных саслоўяў, у якой выкладаў *лацінскую* і грэчаскую мовы. Сярод яго маральна-павучальных, багаслоўскіх, драматычных твораў найбольш значны шматтомны збор жыцій святых «Чэцці-Мінеі»(выд. у 1689, 1695, 1700, 1705 гг., 10 выданняў у XVIII ст.), складзены на аснове рускіх, грэчаскіх і *лацінскіх* матэрыялаў[3]. З гэтымі ж мэтамі лацінская і польская мовы вывучаліся і ў школах пратэстанцкіх[4].

У другой палове XVI ст. з пачаткам Контррэфармацыі езуіты адчынілі шмат новых каталіцкіх школ. У 1579 г. ў Вільні была адчынена езуіцкая акадэмія, якая дала пачатак Віленскаму універсітэту. Гэтая акадэмія стала буйнейшым цэнтрам лацінапісьмовай культуры ў Вялікім княстве Літоўскім. Пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі да каталіцкіх школ дабавіліся уніяцкія, у якіх таксама вялікая ўвага ўдзялялася вывучэнню лацінскай і польскай моў[5].

Моцным штуршком пашырэнню лацінапісьмовай культуры ў адукаваных слаях беларускага грамадства сталася выкліканая Контррэфармацыяй рэлігійная канверсія. Менавіта ў гэты перыяд пад націскам езуітаў адбыўся масавы пераход айчыннай праваслаўнай арыстакратыі ў каталіцызм і уніяцтва, што цягнула за сабой у рэшце рэшт разрыў з кірылічнай айчыннай пісьмовай культурай. Напрыклад, з несумненнага пачатковага праваслаўя Кміты ў XVI—XVII стст. паступова, пад уплывам абставін, перайшлі ў каталіцтва і, відавочна, моцна палянізаваліся. Прынамсі, тыя, што дапялі XIX ст., лічылі сябе ўжо палякамі[6]. Тое ж самае можна сказаць і пра Замойскіх. Менавіта пра гэтыя наступствы канверсіі сведчыць сучаснік гэтых падзей — прадстаўнік радыкальнага крыла айчыннай Рэфармацыі В. Цяпінскі — ў сваёй славутай прадмове да Евангелля: «вжо некоторие и *писмом се своим* а злаща в слове бжемъ встыдают. А наостаток што может быти жалоснейшая, што шкарадша, иж и тые, што се межи ними зовут дховными и учители, смеле мовлю, намней его не вмеют, намней его вырозуменя не знают, ани се в нем цвичат, але и ани школы коу науце его нигде не мают, зачим в полские, або в *иные писма*, за таковою неволею, немало и оу себе и дети, не без встыдоу своего, бы се одно почули, немалого заправоуют»[7].

З наступленнем Контррэфармацыі ўзнікае новы жанр літаратуры — палемічны. Для дасягнення большай эфектыўнасці свайго ідэйнага змагання з ідэолагамі уніі праваслаўныя пісьменнікі-палемісты пераходзілі на польскую мову. На польскай мове пісаў свае антыуніяцкія, а ў далейшым тым больш прауніяцкія творы М. Сматрыцкі («Антыграфі», «Апалогія», «Фрынас» і інш.), які больш за трыццаць год свайго жыцця аддаў абароне веры бацькоў — праваслаўя. Яго творы — яркія ўзоры літаратуры перыяду Контррэфармацыі. Ужо першы яго твор — «Антыграфі» — носіць на сабе яркія прыкметы стылю барока, пачынальнікам якога ў айчыннай літаратуры і лічыцца Сматрыцкі. На польскай мове напісаў свой антыуніяцкі твор «Апакрысіс» сучаснік і паплечнік Сматрыцкага па антыуніяцкай дзейнасці Хрыстафор Філалет (Марцін Бранеўскі)[8].

Яркім сведчаннем пашырэння польскага пісьма на Беларусі ў часы Вялікага княства Літоўскага з'яўляецца мемуарыстыка. Як вядома, першым і апошнім вядомым творам мемуарнага жанру на беларускай мове былі «Успаміны» навагрудскага падсудка Ф. Еўлашоўскага (1546—1619?). Аднак якраз і ў іх адзначаны выпадкі ўжывання лацінскіх літар замест кірылічных. Хоць гэты твор напісаны па-беларуску і кірыліцай, аднак мова яго насычана палянізмамі розных узроўняў у такой ступені, што дае падставу кваліфікаваць яе як беларуска-польскі жаргон беларус-

кіх службовых асоб эпохі польска-беларуска-літоўскай інтэграцыі і рэлігійнай канверсіі[9]. Макаранізм мовы яго «Успамінаў» і выпадкі змешвання ў іх тэксце кірыліцкіх і лацінскіх літар з'яўляюцца, такім чынам, вынікам папераменнага карыстання аўтарам у паслялюблінскі перыяд беларускай і польскай мовамі і адпаведна кірыліцкай і лацінскай сістэмамі пісьма (захаваліся дакументы, напісаныя ім як па-беларуску кірыліцай, так і па-польску лацінкай).

У значнай ступені фармаванню такога дыялекту ў Еўлашоўскага садзейнічалі спецыфічныя абставіны яго жыцця і дзейнасці. Так, пад уздзеяннем рэфармацыйных ідэй ён вельмі рана, ва ўзросце 20 год, парывае з праваслаўем і пераходзіць у кальвінізм. Як чалавеку невысокага сацыяльнага становішча — дробнапамесніку шляхціцу — яму ўсё жыццё даводзілася служыць знатным панам, якія ў новых палітычных і ідэалагічных абставінах, што склаліся ў выніку заключэння Люблінскай дзяржаўнай уніі і наступлення Контррэфармацыі, усё больш захапляліся паланафільскімі сімпатыямі. Служачы такім панам, Еўлашоўскі міжволі ўспрымаў характэрныя ім манеры, у тым ліку і маўленчую.

Пасля Ф. Еўлашоўскага мемуарысты Вялікага княства Літоўскага ўжо ніколі не звярталіся ў сваёй творчасці да беларускай мовы. Вырашальную ролю ў гэтым адыграла сама гэтая, пераломная ў гісторыі нашага краю эпоха, у якую, уласна, і ўзнік гэты жанр літаратуры на нашых землях, — эпоха інтэграцыі і канверсіі. Знамянальна ў гэтых адносінах, што пад уплывам згаданых ужо працэсаў па-польску напісаў дзённік свайго падарожжа да Святой Зямлі («Перэгрынацыю») Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, патрон Ф. Еўлашоўскага, і ўзор для пераймання шляхецкіх годнасцей. На думку М. Сякерскага, якраз «Перэгрынацыя да Святой Зямлі» М. К. Радзівіла Сіроткі і паслужыла Ф. Еўлашоўскаму прыкладам і ўзорам для напісання ўласных успамінаў[10]. Пасля Ф. Еўлашоўскага, такім чынам, мемуарысты трывала пераходзяць на польскую і лацінскую мовы. Менавіта на гэтых мовах шырокую панараму свайго часу стварылі ў сваіх дыярыушах Я. Цадроўскі, П. К. Абуховіч, І. Будзіла, Л. Дзялынскі, Я. Маскажоўскі, С. Маскевіч, Я. Міхалоўскі, Я. Х. Пасак, Я. У. Пачобут-Адляніцкі, А. С. Радзівіл, Я. Сабескі і інш.[11]

З пачаткам інтэграцыі Польшчы і ВКЛ польская і лацінская мовы і адпаведна лацінскае пісьмо пачынаюць усё шырэй пранікаць у сферу афіцыйнага справаводства. Ужо ва ўмовах Крэўскай уніі ў ВКЛ пачынаюць з'яўляцца дакументы на польскай мове. Не выключана, што найвышэйшыя пісары велікакняжацкай канцылярыі не валодалі лацінскай мовай і таму для лацінскага аддзела канцылярыі

быў уведзены свой найвышэйшы пісар. У такой ролі, напрыклад, у 1501 г. фігуруе Эразм Цёлак[12].

У новых палітычных умовах, што склаліся пасля заключэння Люблінскай дзяржаўнай уніі, польская шляхта, з якой шляхта ВКЛ, зрабіўшыся буйной палітычнай сілай, пачала дамагацца аднолькавых правоў, стала для апошняй узорам для пераймання не толькі гэтых шляхецкіх вольнасцей, але і манераў паводзін, у тым ліку і маўленчай[13]. Гэта і замежныя імёны і прозвішчы, якія прысвойвалі сабе ў вывучаемую эпоху прадстаўнікі шляхецкай праслойкі, моднае адзенне заходнееўрапейскага ўзору, якое прыйшло на змену даўнім мясцовым строям, інтэр'еры, напрыклад Нясвіжскага замка Радзівілаў і г. д., значную частку (калі не большасць) прадметаў афармлення якіх складалі рэчы, завезеныя з-за мяжы[14].

Даследчыкі зрабілі цікавыя назіранні над першымі крокамі пранікнення польскай мовы ў дзелавую пісьменнасць на тэрыторыі Беларусі і Украіны. Ужо К. Харламповіч заўважыў, што раннім паказчыкам польскага моўнага ўплыву была мода беларускіх арыстакратаў ставіць свае прозвішчы польскімі літарамі пад дакументамі на беларускай мове (экстравагантнасць манер, у тым ліку і маўленчай, заўсёды была характэрнай прыкметай арыстакратызму)[15]. Французскі славіст А. Мартэль, вывучаючы актавы матэрыял XVI і XVII стст., адзначыў, што за дзесяцігоддзе паміж 1585—1595 гг. сярод мясцовых арыстакратаў пачала пашырацца мода пісаць свае прозвішчы пад афіцыйнымі дакументамі з дабаўленнем польскіх формул ręką własną або ręką swą. У адзначаны перыяд у многіх дакументах подпісы на беларускай і польскай мовах яшчэ чаргуюцца. У паасобных выпадках нават члены адной сям'і падпісваюцца па-рознаму, прычым ёсць дакументы, пад якімі жаночыя подпісы ўжо афармлены па-польску, а мужчынскія — яшчэ традыцыйна, па-беларуску (жанчыны больш чуйна рэагуюць на моду). У пачатку XVII ст. ужо амаль уся вышэйшая знаць падпісваецца па-польску. Такім жа чынам афармляе дакументы і вышэйшае духавенства, як уніяцкае, так і праваслаўнае.

Далейшым крокам у напрамку паступовага пераходу ў сферы справаводства на польскую мову было пранікненне польскай мовы ўжо непасрэдна ў тэкст саміх дакументаў. Захаванне літары закона дасягалася тым, што ў пачатку і ў канцы актаў пісаліся традыцыйныя формулы на афіцыйнай беларускай мове, тады як асноўны тэкст дакумента пішацца ўжо на польскай мове. Такія дакументы, па назіраннях А. Мартэля, пачалі з'яўляцца ўжо ў пачатку XVII ст. і працягваюць ствацца ў такой

жа форме аж да самага яго канца. На гэтым фоне трохі выдзяляецца кн. МВКЛ 332 (Кніга канцлера Альбрыхта Радзівіла 1646—1648 гг.), у якой тэксты дакументаў усё яшчэ цалкам напісаны па-беларуску, тады як на польскай мове — толькі рэестр і загалоўкі дакументаў. З другога боку, з сярэдзіны XVII ст. акты, цалкам напісаныя на беларускай мове, становяцца зусім рэдкімі. У сярэдзіне гэтага стагоддзя некаторы час бытавалі дакументы, напісаныя на беларускай мове, але забяспечаныя кароткім выкладам іх зместу на польскай мове[16].

Акрамя таго, у гэты час многія юрыдычныя дакументы пісаліся і на лацінскай мове, што таксама аўтаматычна звужала сферу ўжывання беларускай мовы і беларускага кірылічнага пісьма. У некаторых кнігах Метрыкі ВКЛ сустракаюцца дакументы з сусцэптамі на беларускай мове і асноўным тэкстам на лацінскай мове. Аднак у гэтых кнігах значна больш дакументаў, напісаных або цалкам на лацінскай, або на макаранічнай лацінска-польскай мове. Па падліках гісторыка беларускай мовы А. І. Жураўскага, у Кнізе канцлера Льва Сапегі (1596—1598) змяшчаецца 129 беларускіх, 20 польскіх і 8 лацінскіх дакументаў[17].

Цікавыя назіранні былі зроблены таксама літоўскім беларусазнаўцам і арабістам А. К. Антановічам над мовай дакументаў ВКЛ з тэрыторыі этнічнай Літвы. Так, напрыклад, у актавых кнігах Ковенскага земскага суда за 1566—1570 гг. на польскай мове няма ніводнага радка. У актавай кнізе за 1581—1583 гг. з агульнай колькасці 440 актаў 9 напісаны на польскай мове; некалькі актаў на польскай мове змяшчаецца і ў 4-й актавай кнізе за 1584 г., як, напрыклад, № 25, 79, 86, 96, 153, 192 (усяго ў кнізе 2266 запісаў актаў). Не вельмі ў гэтых адносінах адрозніваюцца і кнігі 5—9 за 1588—1600 гг. У XVII ст. (прыкладна з другога дзесяцігоддзя) колькасць запісаў актаў на польскай мове павялічваецца з кожным годам. Так, напрыклад, у актавай кнізе таго ж суда за 1617 г. ужо маецца 20—25% актаў на польскай мове, за 1620 г. — каля палавіны, а ў 1643 г. — толькі не больш 10% запісаў на беларускай мове, усе астатнія — на польскай[18]. Гэтую тэндэнцыю пацвярджае ў сваіх працах і нарвежскі беларусазнавец Х. Станг[19].

У выніку незахавання польскім бокам у асобе каралеўскай канцылярыі ўмоў Люблінскай уніі ў частцы дзяржаўных моў суб'ектаў федэрацыі пачалося актыўнае выцясненне беларускай мовы польскай з адной з функцыянальных сфер, якімі ў найбольшай меры была абумоўлена прэстыжнасць беларускай,— функцыі афіцыйнай мовы ВКЛ, аж пакуль пастановай усеагульнай канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай 1696 г. яна зусім не была заменена ў дзяржаўным ужытку польскай

мовай. Пасля гэтага, натуральна, лацінскае пісьмо ў дзелавым ужытку на тэрыторыі ВКЛ стала адзіным, і гэта азначала канец фазы суіснавання ў афіцыйным ужытку на тэрыторыі ВКЛ абедзвюх сістэм пісьма, а значыць, і іх змешвання паміж сабой.

Такім чынам, замацаваны II і III Статутамі ВКЛ абавязак захоўваць мясцовую мову ў ролі афіцыйнай быў неаднаразова парушаны самімі польскімі каралямі, канцылярыя якіх, не жадаючы перакладаць на беларускую мову каралеўскія дэкрэты, часам пасылала ў Вялікае княства Літоўскае дакументы на польскай мове. Спачатку пранікненне польскай афіцыйнай мовы на беларускія і ўкраінскія землі сустракала супрацьдзеянне з боку часткі мясцовай шляхты[20]. Аднак, нягледзячы на гэта, польская мова распаўсюджвалася ўсё шырэй. Ужо той самы III Статут ВКЛ, у якім яшчэ раз пасля II Статута 1566 г. падкрэсліваўся абавязак захоўваць у якасці афіцыйнай на тэрыторыі княства старабеларускую мову, разам з тым дазваляў каталіцкай царкве ўжываць як афіцыйную польскую мову (раздзел III, артыкул 32)[21].

Змешванню лацінскага і кірылічнага пісьма садзейнічаў і стыль барока, які прыйшоў разам з Контррэфармацыяй. Яго праяўленні: ускладненне стылю, макаранізацыя як у межах адной мовы, так і з выхадам за яе межы, у межы суіснуючай, кантактуючай мовы. Стыль барока шырока выкарыстоўваўся для прапаганды ідэй Контррэфармацыі. Яркія ўзоры літаратуры перыяду Контррэфармацыі — творы М. Сматрыцкага. Ужо першы яго твор — «Антыграфі» — носіць на сабе яркія прыкметы стылю барока, пачынальнікам якога ў айчыннай літаратуры і лічыцца Сматрыцкі[22].

Адной з характэрных рыс культуры барока з'яўляецца, па словах Л. Гінейціса, макаранічнасць мовы[23]. Своеасаблівая мода на перасыпанне мовы дзелавых дакументаў лацінскімі выразамі ўзнікла ў XVII ст. у Польшчы, дзе макаранічнае лацінска-польскае маўленне набыло ў гэты час характар эпідэміі[24]. Па польскаму ўзору такія акты на макаранізаванай польска-лацінскай мове пачынаюць пісацца і ў ВКЛ. Па ўзору такіх польска-лацінскіх дакументаў пачалі стварацца і беларуска-лацінскія, у якіх, праўда, лацінскія фрагменты звычайна транслітараваліся кірыліцай, напрыклад: «...уподобанья своего *инъ акціоне мортисъ* небощика не на Яна Софроновича сфабриковалъ, вынуривпсисе, не только же *нуллитеръ модо віоленто етъ субдоле* тую маетность Зуковъ въ апрегенсію свою загорнувши, презъ колько лѣтъ выдеркафу и квиты не платечи... и того *евидентиссиме документисъ етъ инструментисъ автентицисъ* доведши и на оно указавши...»; «панъ Левъ Самуель Богдановичъ Ок-

гинскій — тивунъ Троцкій, и пани малжонка егомилости пани Зофія Яновна Бѣлевичовна Огинска — тивунова Троцка, *субъ фиде, гоноре етъ косцыенцыа Деумъ тестандо*, же таковую фундацію чинячи *де нова радице* зъ добръ своихъ власныхъ жадныхъ грошей ни одъ кого за оное не взявши, *сине улло кондиктамине*, але *ексъ пуро* зело *етъ пропріа мере либералитате*, не чинечи *инъ фравдемъ* теперешней конституціи и права посполитого, листъ свой добровольный вѣчистый фундацыйный на добра… признали и ку записанью до книгъ головныхъ трибунальныхъ подали, просечи, абы тотъ листъ фундацыйный записъ принятъ и до книгъ уписанъ былъ»[25]. Тэксты такога роду адпавядалі канонам высокага барока. У адрозненне ад гэтага канонам сярэдняга барока адпавядала макаранізацыя мовы паэзіі, якая мела на мэце стварэнне камічнага эфекту. У якасці прыкладу можна прывесці беларускі аналаг «Калядкі» паэта XVII ст. Яна Жабчыца. У ёй у адрозненне ад прыведзеных вышэй дзелавых дакументаў лацінскія фрагменты не транслітэруюцца, напрыклад: «С калядою *omnes ad vos* ідзём к вам / Есці *gratis* вельмі міла будзе нам. / *Gloria laus* Богу ўсе заспяваем, / Гаспадарам *largum vesper* ураз прызнаем. / Пачынайце ж усе *fratres* каляду, / Почым я вас усіх на *premium* завяду. / Мольце Бога *donat nobis Fortunam* / *Cum salutum* мы Вам жычы / І хай *Deus* благаславіць пры споры / Даму, людзям, гумне, клеці, аборы. /А во Новы Год *mittat tibi gaudia* / *Et prosperat* усе памысльна *omnia* / Днесі молім *salvatorem Mariae* / Дабрадзей наш *longum vitam* хай жыве. / Пасля смерці *super Coelos* хай быгуе, / *Copiosum i mercendem* хай пачуе»[26]. Такое цеснае папераменнае ўжыванне кірылічнага і лацінскага пісьма спачатку ў межах жанру, тэксту і асобнай фразы і прыводзіла ў рэшце рэшт да змешвання гэтых дзвюх сістэм пісьма і ў межах асобнага слова. І гэтая апошняя фаза фукцыянальнага ўзаемадзеяння кірылічнага і лацінскага пісьма была апошняй перад канчатковым пераходам на лацінскае пісьмо.

Польска-лацінскі ўплыў на старабеларускае кірылічнае пісьмо адбываўся двума шляхамі: прамое (часта нематываванае) ужыванне ў кірылічным тэксце лацінскіх літар, ужыванне кірылічных літар у ролі лацінскіх, як гэта мае месца і на іншых узроўнях мовы (фанетыкі, граматыкі, лексікі). Абагульненне гэтых выпадкаў пашырыць магчымасці больш паспяхова чытаць старабеларускія рукапісныя кірылічныя тэксты.

Нематываванае, выпадковае выкарыстанне ў кірылічных тэкстах лацінскіх літар якраз і рэалізавалася ў фазе суіснавання дзвюх сістэм пісьма на адной тэрыторыі, а часта і ў пісьмовай практыцы адной і той жа асобы. Адной з такіх асоб быў навагрудскі падсудак Фёдар Міхайла-

віч Еўлашоўскі (1546—1619). Як відаць з прыведзеных дат, самы свядомы і актыўны перыяд яго жыцця прыпаў на фазу суіснавання на Беларусі дзвюх сістэм пісьма. Час непасрэдна перад заключэннем Люблінскай дзяржаўнай уніі і асабліва пасля яе — гэта час актыўнага пранікнення на беларускія землі польскай культуры і мовы з яе лацінскім пісьмом. На хвалі Рэфармацыі Еўлашоўскі, як і многія іншыя прадстаўнікі беларускай шляхты і магнатэрыі, прымае пратэстантызм. Тым самым ён парывае з кірылічна-пісьмовай праваслаўнай культурай. Ва ўмовах збліжэння з Польшчай у асяроддзі беларускай шляхты і магнатаў непасрэдна перад і асабліва пасля Люблінскай уніі расла папулярнасць польскай культуры і мовы, аўтару даводзілася жыць і працаваць у асяроддзі апалячанай шляхты і магнатаў, знатныя прадстаўнікі якіх былі да таго ж яго апекунамі. Натуральна, Еўлашоўскаму, які ўвесь час знаходзіўся на службе ў патронаў-паланафілаў, даводзілася пераймаць іх звычкі і густы, у тым ліку і гутарковую і пісьмовую польскую мову. Акрамя таго, пасля уніі ён, як павятовы дэпутат сейма і асоба, набліжаная да каралёў, што было вельмі прэстыжным у шляхецка-магнацкім асяроддзі, часта ездзіў і падоўгу бываў па службовых справах у польскіх гарадах, дзе, зразумела, вымушаны быў пераходзіць на польскую мову. Пастаяннае пераключэнне кода з беларускай мовы на польскую прывяло да ператварэння яго беларускага маўлення ў беларуска-польскі макаранічны жаргон, якім і напісаны «Успаміны», а на ўзроўні пісьма — да выпадкаў змешвання ў тэксце гэтага твора кірылічных і лацінскіх літар.

Як сведчанне польска-беларускай фанетычнай інтэрферэнцыі ў маўленні аўтара ў рукапісе «Успамінаў» з прыкметнай ступенню рэгулярнасці ўжываюцца польскія насавыя галосныя **ą** і **ę**. Для больш кваліфікаванага падыходу да расшыфроўкі такіх месц у дадзеным і іншых падобных рукапісах зазначым, што апошнія часцей за ўсё адзначаюцца ў канчатках назоўнікаў, прыметнікаў і парадкавых лічэбнікаў вінавальнага і творнага склону адзіночнага ліку жаночага роду, у суфіксах дзеепрыслоўяў, а таксама ў каранях слоў, пры гэтым часта насавы рэзананс дубліруецца насавымі зычнымі: **ста*м*тąідъ** (14); **ведзą*нц*** (25); **десę*н*ты*м*** (15); **зналисмы велкą милос*т*** (38); **на велкą но*ц*** (31); **за бронą завэле'скą** (24); **чапкą рутилэ*м*** (4); **по*д* правą пе*р*сь** (26); **з віадомостę** (27); **тą смертę** (15); **з радостę** (47); **шарą мастę** (41); **тą ꙋчинностę** (49); **зтą*н*дъ** (49); **вшехмокгąнцэкго** (17); **зазрощą*н*цых** (17); **вą*нт*пить** (37) і інш. Акрамя таго, па аднаму разу дапушчана ўжыванне лацінскіх літар **g** і **w**: **лютэgo** (50); **кроліowa** (21)[27].

У некаторых іншых кірылічных тэкстах назіраюцца пэўныя традыцыі ўжывання асобных лацінскіх літар. У некаторых рукапісах XVII ст. побач з кірылічнай літарай з у той жа функцыі сустракаецца і лацінская літара **z**: **zаложили мѣсто** (Рым лет.); **zнову** (Хр. Польск.); **zатрѹбѣте**, **zнаки**, **zмордованы'** (Пс. XVII). На думку А. М. Булыкі, старабеларускія кніжнікі пісалі гэтую літару пад уплывам польскай графікі[28].

Акрамя прыведзенага вышэй прыкладу выпадковага ўжывання лацінскай літары **g** ва ўспамінах Ф. Еўлашоўскага, гэтая літара з пэўнай долей рэгулярнасці выкарыстоўваецца ў рукапісным зборніку жыцій святых 2-й паловы XVII ст. № 752, што сведчыць аб уплыве польскай фанетыкі на маўленне перакладчыка гэтага, а заадно і аб тым, што пераклад быў зроблены якраз з польскай крыніцы. Літара **g** сустракаецца амаль выключна ў характэрным для польскай мовы канчатку роднага і вінавальнага склону займеннікаў і прыметнікаў: **сеgо**, **си'скоgо**, **пон*т*скоgо**, **нечыстоgо**, **на коgо**, **кади*л*ноgо**, **ѡдноgо**, **хрестиа*н*скоgо**, **gорu**, **бѣсноватоgо**, **тихоgо и покорноgо**, **неuжытаgо**, **крес*т*наgо**, **нашеgо**, **своеgо**, **сеgо**, **тоgо**, **до неgо**, **си'скоgо**, **еgо**…[29]

У шэрагу кірылічных дзелавых дакументаў другой паловы XVI—XVII ст. побач са спрадвечнай літарай ***м*** у той жа функцыі абазначэння гука [**м**] часам ужываецца лацінская літара **m**. Гэтая літара звычайна нічым не адрозніваецца ад скарапіснай кірылічнай літары ***т*** [**т**], у выніку чаго пры чытанні іх можна лёгка змешваць: **детеmъ**, **горлоmъ**, **мужоmъ**, **правоmъ**, **судоmъ**, **чужоземъцоmъ** (Ст. 1566); **заmысль**, **ведоmости**, **нашыmи**, **саmа**, **тыmи**, **таmъ**, **потоmъ**, **mоцъ**, **mовити**, **mаетность**, **писароmъ** (Кн. Ков. зем. суда) і інш. Гэтую з'яву А. М. Булыка таксама лічыць вынікам уздзеяння польскага пісьма[30].

Аднак уплыў польска-лацінскага пісьма не абмяжоўваўся папаўненнем кірылічнай графічнай сістэмы лацінскімі літарамі. Ён праяўляўся яшчэ і ў скрытай форме — шляхам ужывання пэўных кірылічных літар у адпаведнасці з правіламі выкарыстання адпаведных лацінскіх літар у польскай мове. Гэта можна назваць праяўленнем польска-беларускай моўнай інтэрферэнцыі на ўзроўні пісьма.

У канцы XV ст. у старабеларускім кірылічным пісьме з'явілася літара э, якая потым атрымала даволі шырокае распаўсюджванне ў пісьмовай практыцы. Першыя выпадкі ўжывання гэтай літары адзначаюцца выключна ў аказіяналізмах іншамоўнага, пераважна лацінскага паходжання: **экгрисевле**, **эксъцельсисъ**, **эморроиса** (Зб. 391); **эидотоу** (Гр. 1498)[31]. Гэтая акалічнасць дазваляе меркаваць, што яна была выпрацавана беларускімі кніжнікамі спачатку менавіта для дыферэнцыяцыі

абазначэння гукаў [е]—[э] — апазіцыі, якая ўзнікла ў выніку пранікнення ў старабеларускую мову іншамоўных (лацінскіх праз польскую ці незалежна) слоў (спрадвечнай літарай **е** пачатковае э ў лацінізмах перадаць было немагчыма). У рукапісах XVI ст. ужыванне гэтай літары пашыраецца і на спрадвечную лексіку: **перэдъ, чэрэз, вышэ', такжэ, рэчь, на рэкахъ, на грэбліахъ, смотрэти, стерэчы, рэмесло, чэсть, потрэба** (Ст. 1566); **секрэтары** (Ст. 1588) і інш. У рукапісных перакладных тэкстах канца XVI ст. «Аповесць аб Трыстане», «Аповесць аб Баве», «Гісторыя аб Атыле, каралі угорскім», а таксама «Летапісе па спісе Рачынскага» абазначэнне гука [э] дасягае ўзроўню другараднай нормы, прычым гэтая літара тут таксама ўжываецца пераважна ў іншамоўных словах, што пацвярджае выказанае вышэй меркаванне адносна знешняга фактару ў яе ўзнікненні: **везэне, рыцэр, витэз, мистэрне, в стрэмени** («Ап. аб Трыстане»); **серцэ, сарацэны, крэщение** («Ап. аб Баве»); **комэта, фэсть** («Ап. аб Атыле»). Надзвычай шырока выкарыстоўваецца гэтая літара ў судовых і актавых дакументах канца XVI—XVII ст. — «Кнізе Ковенскага земскага суда 1592—1593 гг.», «Кнізе Гродзенскага земскага суда» і іншых рукапісах гэтага жанру. Пашырэнне яе ў гэтых дакументах у значна большай ступені на спрадвечную лексіку сведчыць аб трывалым уваходзе яе ў старабеларускае кірылічнае пісьмо: **в цэлости, грэчиха, потрэба, чэсть, жэнски', трэти', шэсть, смотрэти, при рецэ, в рѣцэ, матцэ, жонцэ, бабцэ, дочцэ, вышэ', нижэ', ширэ', вжэ, ешэ, имене'цэ** і інш.[32] Такім чынам, дзякуючы выпрацоўцы беларускімі пісцамі літары э ў беларускім кірыліцным пісьме з'явілася магчымасць больш шырокага адлюстравання асаблівасцей беларускай жывой мовы. У старабеларускай кірыліцы была літара **є** як адзін з варыянтаў графічнага абазначэння гука [е], напрыклад: **мєчникъ, нєбо, словєнинъ**, старабеларускім пісцам для атрымання новай літары давялося толькі павярнуць яе вакол вертыкальнай восі.

У ліку пісьмовых сродкаў для перадачы гука [е] у старабеларускіх кірыліцных тэкстах адзначана яшчэ і спалучэнне спрадвечных літар **іе**. Прыклады яго ўжывання прыпадаюць на XVII ст., калі польска-лацінскае пісьмо шырока выкарыстоўвалася на Беларусі побач з кірыліцным: **піенкньи, піенкность** («Гіст. аб Варлааме і Іясафе»); **людіе** («Храналаф»). Да таго ж, як паказваюць прыклады, ужыванне названага спалучэння характэрна для лексічных паланізмаў або агульнаславянскіх слоў, якія ў такім напісанні характэрны для польскай мовы. Грунтуючыся на гэтых двух меркаваннях, А. М. Булыка і лічыць, што крыніцай названай арфаграмы з'яўляецца польская мова[33].

Прыблізна тое ж самае можна сказаць і аб спосабе перадачы ў старабеларускім кірылічным пісьме гука [ё]. Напісанні з **е** або **о** пасля мяккіх зычных пад націскам у словах тыпу **медъ, ленъ, песъ, слозы** скажалі фанетычны бок слоў і часам зацямнялі іх значэнні. У некаторых рукапісах XVII ст. у гэтай функцыі паяўляецца спалучэнне **іо**. Абодва элементы гэтага спалучэння не з'яўляліся ў старабеларускім пісьме запазычанымі: літара **і** перадавала гук [і] перад галоснымі, літара **о** (побач з **ѡ**) служыла для перадачы гука [о]. Старабеларускім пісцам наўрад ці трэба было нанова вынаходзіць гэтую графему, паколькі яна ўжо мелася ў польскім і лацінскім пісьме ў аналагічнай функцыі, параўн. польск. **fiołki, pierścionek**, лац. **odiosa**. Верагоднасць названых крыніц разглядаемага графічнага сродку пацвярджаецца і тым, што і першыя прыклады яго выкарыстання адзначаны пераважна ў перакладах з польскай мовы і якраз у запазычаннях з польскай і лацінскай моў, якія ў беларускай версіі былі пакінуты без перакладу: **ліосы, феоліогіі, в каталіогѣ** (Хр. Стрыйк.); **зіоламі, астроліокгі** (Хр. Бельск.); **весіоль** (Зб. 107); **дііліомы, філіозофамі** (Дыяр. Філіп.). У друкаваным тэксце пачатку XVIII ст. «Собрание припадковъ краткое...» выкарыстанне дыграфа **іо** пашыраецца ўжо на спрадвечную лексіку: **аппеліовати, ліодомъ, маліовалъ, незнаіомый, покоіовый, спаліоного, фліорентскій, ціотку, шаліоный** і інш., што азначала ўключэнне яго ў сістэму пісьма беларускай мовы[34].

Для перадачы гука [я] ў старабеларускай пісьменнасці служылі дзве літары класічнай кірыліцы **ѧ** (юс малы) і **ꙗ** (а ётаванае), першая з якіх па традыцыі ўжывалася пасля зычных, другая — пасля галосных. Акрамя таго, зрэдку ў старабеларускіх кірылічных тэкстах у гэтай функцыі трапляецца трэцяя графема — спалучэнне **іа**: **лаіалъ, іасли, іасперь, котораіа, камніа** (Зб. 391); **іакова** (Псалт. XVI). І хаця М. М. Карынскі насуперак Я. Ф. Карскаму, які лічыў гэта ўплывам польскага пісьма[35], тлумачыў гэтыя напісанні паўднёваславянскім уплывам[36], усё ж частку такіх прыкладаў А. М. Булыка схільны лічыць вынікам уплыву польскага пісьма[37].

Класічнае кірылічнае пісьмо адрознівалася ад лацінскага наяўнасцю асобных літар **ъ, ь** для абазначэння спачатку галосных няпоўнага ўтварэння, потым раздзяляльнага знака (**ъ**) і для абазначэння мяккасці (**ь**). У польскім пісьме, як вядома, функцыю абазначэння мяккасці выконвае дыякрытычны знак (´), або асобны варыянт літары (**ł** побач з **l**). Прыкметай уплыву польскай сістэмы пісьма на старабеларускае з'яўляецца адзначанае ў небывалым па ступені польскага ўплыву на мову тэксце «Успамінаў» Ф. Еўлашоўскага напісанне *кролѡв* (л. 40). Харак-

тэрнай асаблівасцю старабеларускага кірылічнага пісьма была частая адсутнасць абазначэння мяккасці зычных **л**, **с**, **з**, **д**, **т**, **н** у становішчы перад зычнымі. Гэтая асаблівасць, як піша А. М. Булыка, у пэўнай ступені была характэрна раннім усходнеславянскім рукапісам. Сапраўды, у пэўнай ступені гэтая з'ява характэрная для названых рукапісаў, і тлумачыцца яна імкненнем да эканоміі месца пры высокім кошце матэрыялаў для пісьма і абмежаванасці рэсурсаў у той час, аднак там яна прадстаўлена ў цэлым нязначна і абмежавана лексічна (напрыклад, у слове **писмо**). У ранніх старабеларускіх рукапісах пропуск **ь** звычайна дапускаецца пры напісанні папярэдніх зычных ускладненых, напрыклад ва Укладной грамаце княгіні Юльяніі царкве ў Азярышчах (каля 1377 г.): **брат**, **имет**, **отдаливат**, **амин**, адпаведна прыклады без пропуску **ь** маюць месца пры напісанні папярэдніх зычных у радку: **закладывать**. Напісанні без заканамернага **ь** фактычна становяцца нормай якраз у другой палове XVI—XVII ст. Пры гэтым **ь** у пэўных пазіцыях прапускаецца ўжо незалежна ад таго, над радком ці ў радку пішацца папярэдні зычны. Напрыклад, у кнізе канцлера Альбрыхта Радзівіла (1646—1648) напісанні без пропуску **ь** перад зычнымі і ў канцы слова адзінкавыя: **прыходить**, **Ильчыцкими**. Норму ж складаюць стаўшыя традыцыйнымі ў старабеларускіх кірылічных тэкстах пазнейшага часу прыклады з пропускам **ь**, у тым ліку і пры напісанні папярэдняга зычнага ў радку: **трыбу/налны**, **ведомост**, **волност**, **корол**, **Албрыхтъ**, **далны** і інш.[38]

У XVII ст. пры ўвогуле высокай ступені захавання правілаў напісання ўскладненых літар спалучэнняў зычных і канцавых зычных слова назіраюцца і выпадкі адступлення ад гэтых правіл у выглядзе напісання ў радку літар, падлягаючых ускладненню, напрыклад у кн. 332 МВКЛ: **въ непоступеню**, **шляхетному**, **Станислав**, **противною** і інш., у чым, відаць, варта бачыць уплыў польскага правапісу, для якога напісанне ўскладненых літар характэрна ў вельмі абмежаванай ступені. Паколькі польска-лацінскае пісьмо ў гэты час шырока ўжывалася на Беларусі побач з кірылічным, то згаданая мадэрнізацыя старабеларускага кірылічнага скорапісу ў названай крыніцы можа тлумачыцца ўплывам выкарыстоўваемага паралельна ў межах як аднаго тэксту кнігі ў цэлым, так і любога асобнага дакумента лацінскага пісьма.

Грэчаская азбука, як паказваюць факты, служыла для беларускіх пісцоў крыніцай неабходных графічных сродкаў для ўдасканалення беларускага пісьма шляхам яго папаўнення і пасля распрацоўкі Кірылам і Мяфодзіем на яе аснове славянскай азбукі. Так, для перадачы неўласцівага жывому беларускаму маўленню выбухнога **g** спачатку перад звонкі-

мі зычнымі ўжывалася графема **к** (*квалтъ*), пазней — дыграф **кт**. У меўшай пэўнае пашырэнне і на Беларусі навагрэчаскай пісьменнасці (дзе было такое ж становішча — спрадвечнае **γ** было, як і ў беларускай мове, фрыкатыўным, і для перадачы **g** выбухнога ў іншамоўных словах патрэбен быў іншы знак — для гэтай мэты быў выпрацаваны дыграф **γк**). Гэты гатовы прыём і быў, на нашу думку, выкарыстаны беларускімі кніжнікамі, якія, відаць, у адпаведнасці з артыкуляцыяй памянялі ў ім месцамі літары, — так атрымаўся дыграф **кг** (**кганокъ**, **кгвалтъ**, **кгмахъ**).

Яшчэ ў старажытнарускім пісьме для абазначэння гука [у] ўжывалася літара **и** (ук). У беларускіх кірылічных тэкстах XIV ст. устанавіліся правілы яе ўжывання адносна іншых сродкаў у той жа ролі — дыграфа **оу** і літары **у** — разам з апошняй — у сярэдзіне і канцы слова. Літары **и** не было ў класічнай кірыліцы. Пры параўнанні з рознымі функцыянальнымі разнавіднасцямі грэчаскага пісьма як патэнцыяльнай крыніцы гэтай графемы выявілася, што менавіта так — з пятлёй унізе —пісалася літара **Υ** (іпсілон), якая ў грэчаскай мове таксама абазначала гук [у], у некаторых почыркавых разнавіднасцях унцыялу і курсіву, прынамсі ва унцыяльных загалоўках візантыйскіх рукапісных кніг XI ст. Фактычна амаль так жа пішацца і адпаведная скарапісная лацінская літара **y** (ігрэк), у якой хвост таксама мае форму пятлі.

Польска-лацінскі ўплыў на старабеларускае кірылічнае пісьмо аказаўся, як сведчаць прыведзеныя вышэй прыклады, увогуле нязначным. Паколькі, як піша А. М. Булыка, у канцылярыях і судах часта адны і тыя ж пісары пісалі дакументы па-беларуску і па-польску, то ў гэтых умовах можна было б чакаць значнага пераймання польскіх правапісных прыёмаў, аднак гэтага не назіраецца, што з'яўляецца сведчаннем трываласці і ўстойлівасці беларускай сістэмы пісьма старажытнага перыяду.

Разгледжаны матэрыял паказвае, што ўплыву польскай і лацінскай мовы не пазбег практычна ніводзін з узроўняў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы, не стала выключэннем тут і старабеларускае кірылічнае пісьмо, узаемадзеянне якога з лацінскім адбывалася фактычна па тых жа законах, што і іншых узроўняў. Вынікі гэтага ўзаемадзеяння мелі ў цэлым станоўчае значэнне для развіцця старабеларускага кірылічнага пісьма. Дзякуючы ўздзеянню іншамоўных сістэм пісьма старабеларускае кірылічнае пісьмо значна ўдасканалілася, дапаўненне дадатковымі элементамі, узятымі непасрэдна з лацінскага і грэчаскага або распрацаванымі пад іх уплывам, зрабіла яго больш зручным, у большай ступені прыстасавала да адлюстравання жывога беларускага маўлення.

[1] Еўлашоўскі Ф. Успаміны // Свяжынскі У. М. «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага. Мн., 1990. С. 90.
[2] Киевские епархиальные ведомости. 1875. № 5. С. 564.
[3] История русской литературы. Т. 1. Л., 1980. С. 410.
[4] Kosman M. Szkolnictwo reformacyjne i kontrreformacyjne na ziemiach białoruskich Wielkiego Księstwa Litewskiego // Studia polsko-litewsko-białoruskie. Warszawa, 1988. S. 58.
[5] У 1613 г. Жыгімонт III дазволіў Віленскаму Траецкаму уніяцкаму манастыру заснаваць школы ў Навагрудку, Мінску і іншых самых зручных для яго месцах «и в тых школах учыти всих наук ... языком кгрецким, латинским, словенским, польским и руским» (РДГА (Санкт-Пецярбург). Ф. 823. Воп. 21. Спр 384. Арк. 1). У: Марозава С. Моўная палітыка і практыка уніяцкай царквы ў Беларусі // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі). Мн., 1996. С. 108.
[6] Рыбчонак С., Свяжынскі У. Кміты герба «Харугвы» (Heroes Albarutheniae) // Спадчына. 2000. № 5—6. С. 137.
[7] Евангелле В. Цяпінскага (Прадмова). Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Мн., 1991. С. 34.
[8] Apokrisis... // Памятники полемической литературы. СПб, 1882. Кн. 2.
[9] Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Т. І. Мн., 1967. С. 336.
[10] Siekierski M. Pamiętnikarz Fedor Jewłaszewski (154 po 1614) w światle nowych źródeł Studia źródłoznawcze. Warszawa, 1979. T. 24. S. 179.
[11] Свяжынскі У. Мемуары XVII ст.: Праблема супольнай культурнай прыналежнасці // Беларусіка Albaruthenica. Кн. 6. Ч. 2. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялога і сінтэзу. Мн., 1997. С. 32.
[12] Груша А. Службовы склад і структура канцылярыі Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV—першай паловы XVIст. // METRICIANA. Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. Т. І. Мн.: ATENÆUM, 2001. С. 14.
[13] Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. С. 350.
[14] Рыбчонак Сяргей, Свяжынскі Уладзімір. Рэестр рухомых рэчаў Нясвіжскага замка // Спадчына. 1996. № 6. С. 261—280.
[15] Харлампович К. Западнорусские православные школы XVI и начала XVII века, отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуга в деле защиты православной веры и церкви. Казань, 1898. С. 206.
[16] Martel A. La langue polonaise dans les pays ruthènes... Lile, 1938. P. 61—65.
[17] Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. С. 354.
[18] Ліст А. К. Антановіча ад 19 сакавіка 1978 г.(асабісты архіў аўтара).
[19] Chr. S. Stang. Die altrussische urkundensprache der Stadt Polozk. Oslo, 1939. S. 147; *яго ж.* Die westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen. Oslo, 1935. S. 163.
[20] Martel A. La langue polonaise dans les pays ruthènes... P. 61—65.
[21] Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. С. 351.
[22] Короткий В. Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого. Мн., 1987. С. 34.
[23] Gineitis Leonas. Klasicizmo problema lietuvių literatūroje. Vilnius, 1972. P. 102.
[24] Свежинский В. М., Шевченко Г. И. Латинский язык в Белоруссии XIV—XVIII стст. // Плановые языки: итоги и перспективы. Тезисы докладов конференции по интерлингвистике (Тарту, 22—24 октября 1987). Тарту, 1988. С. 82—85.
[25] Пособие по латинскому языку. Мн., 1989. С. 43—44.
[26] Зямкевіч Р. Гутаркі аб беларускай літаратуры // Новае жыццё. 1923. № 1. С. 23.
[27] Свяжынскі У. М. «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага. С. 34.
[28] Булыка А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. Мн., 1970. С. 48.

[29] Зборнік жыцій святых другой палавіны XVII ст. Рукапіс Расійскага дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Зб. Сінад. № 752.
[30] Булыка А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. С. 56.
[31] Там жа. С. 41.
[32] Там жа. С. 41—43.
[33] Там жа. С. 14.
[34] Там жа. С. 44.
[35] Карский Е. Ф. Белорусы. Вып. 1. М., 1955. С. 70.
[36] Каринский Н. М. Образцы письма древнейшего периода истории русской книги. Л., 1925. С. 7.
[37] Булыка А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. С. 33.
[38] Там жа. С. 38.

IV. АРХІВАЗНАЎСТВА

А. І. Дзярновіч

Кёнігсбергскі таемны архіў: Фармаванне калекцый, публікацыі дакументаў і важнасць архіва для вывучэння гісторыі Беларусі

Гісторыя архіва

Найбагацейшай калекцыяй дакументаў па гісторыі рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы з'яўляюцца фонды Кёнігсбергскага таемнага архіва (КТА)[1]. Архіў Нямецкага ордэна ў Прусіі пачаў фарміравацца ў 1309 г. — ад моманту перанясення рэзідэнцыі вялікага магістра Нямецкага ордэна з Венецыі ў Марыенбург (Мальбарк). Пад час 13-гадовай вайны 1454—1466 гг. паміж Польшчай і Ордэнам у Прусіі вялікі магістр перасяліўся ў Кёнігсберг і заснаваў тут новую канцылярыю. У Кёнігсбергу збіраліся арыгіналы дакументаў, якія паступалі ў Прусію, і вяліся рэгістры дакументаў, што сыходзілі з Прусіі. Акрамя таго, Кёнігсбергскі архіў быў агульнаордэнскім архівам — туды паступалі копіі дакументаў, у тым ліку і лівонскіх, а ў некаторых выпадках і арыгіналы дакументаў. Старыя дакументы ў канцы вайны ў 1466 г. былі сабраны пераважна ў замку Тапеў (які знаходзіўся ў руках лівонскага магістра), а таксама ў іншых ордэнскіх замках. У 1525 г. пры секулярызацыі Ордэна частка дакументаў з архіва вялікага магістра перадаецца Польшчы[2]. У 1722 г. усе архіўныя калекцыі з Тапева пераносяцца ў Кёнігсберг і далучаюцца да дакументаў, якія збіраліся тут ад 1466 г. Як самастойная ўстанова КТА быў утвораны ў 1804 г.

Да XIX ст. старымі актамі КТА цікавіліся не столькі гісторыкі, колькі юрысты. Дакументы трактаваліся паводле іх перашапачатковага значэння — як юрыдычныя акты. Старажытныя дакументы Нямецкага ордэна захоўвалі юрыдычны моц, бо Пруская дзяржава працягвала яго прававую традыцыю. Гэтыя дакументы былі ў абмежаваным карыстанні, таму Кёнігсбергскі архіў і заставаўся «таемным». Для азнаямлення з архівам гісторыкам прыходзілася прадпрымаць спецыяльныя захады.

У 1808 г. пад кіраўніцтвам ландрата — краёвага радцы В. Ф. Унгерн-Штэрнберга на сродкі прыбалтыйскага дваранства была арганізавана археаграфічная экспедыцыя ў Кёнігсбергскі архіў. У экспедыцыі ўдзельнічаў доктар філасофіі Э. Генінг, а таксама прускі архіварыус Фабэр (ён да-

лучыўся да яе пасля смерці Генінга). У 1811 г. перад экспедыцыяй паўсталі сур'ёзныя фінансавыя праблемы. Пры хадайніцтве М. М. Карамзіна і міністра ўнутраніх спраў О. П. Казадаўлева ў 1812 г. расійскі ўрад выдаткоўваў на працяг прац штогадова 1 000 руб.[3] Працы па капіраванні дакументаў працягваліся да 1816 г. і за гэты час было скапіравана звыш 3 000 дакументаў. Адзін экземпляр копій накіроўваўся міністру Казадаўлеву, а ад яго паступаў ужо Мікалаю Карамзіну[4], які, пасля вывучэння зместу дакументаў, перадаваў іх у Маскоўскі архіў Калегіі замежных спраў[5]. Але расійскі гісторык стварыў і ўласны збор копій дакументаў Кёнігсбергскага архіва (відавочна — копіі з копій МУС) і неаднаразова на яго спасылаўся, да прыкладу: «... см. между моими кенигсбергскими бумагами №...»[6]

Выдатны мецэнат і палітычны дзеяч Расіі граф Мікалай Румянцаў яшчэ да свайго ўходу ў адстаўку з пасад міністра ўнутраніх спраў і старшыні Дзяржаўнага савета спрабаваў атрымаць копіі матэрыялаў КТА і выказваў жаданне ўзяць удзел у фінансаванні археаграфічнай экспедыцыі. Праз Фабэра і Генінга яму ўдалося атрымаць копіі, у тым ліку і факсімільныя, асобных дакументаў. Адначасова граф Румянцаў пачаў весці перамовы пра капіраванне матэрыялаў з велізарнай калекцыі Унгерн-Штэрнберга, складзенай на працягу 40 гадоў пошуку дакументаў у архівах Рыгі, Дэрпта, іншых лівонскіх гарадоў, а таксама Кёнігсберга. М. Румянцаў праз Генінга прапаноўваў таксама выдаткаваць свае сродкі на выданне гэтых матэрыялаў. У сакавіку 1814 г. Румянцаву ўдалося атрымаць толькі «росписи уже списанных и отчасти примечаниями снабженных» матэрыялаў Кёнігсбергскага архіва.

Удзельнікі Румянцаўскага гістарычнага гуртка шукалі таксама іншыя магчымасці атрымання матэрыялаў з КТА. Паводле рэкамендацыі І. Ф. Крузенштэрна, у пачатку 1814 г. у Кёнігсберг дзеля капіравання дакументаў на сродкі Румянцава прыехаў доктар філасофіі Дэрпцкага універсітэта К. І. Шульц[7]. Агульнае кіраўніцтва працы было ўскладзена на вядомага раманіста Аўгуста фон Кацэбу, які займаў пасаду расійскага генеральнага консула ў Прусіі і наладзіў да таго часу добрыя кантакты з кіраўніцтвам КТА. На працягу сакавіка—ліпеня 1814 г. Шульцу ўдалося скапіраваць каля 85 дакументаў.

Пасля смерці А. Кацэбу М. Румянцаў у 1819 г. стаў уладальнікам асабістага архіва літаратара (у тым ліку рукапісу «Жыццеапісанне Свідрыгайлавае»). У сваёй працы Кацэбу выкарыстаў звыш ста дакументаў КТА, якія не ўвайшлі ў корпус матэрыялаў, скапіраваных экспедыцыяй прыбалтыйскага дваранства. А ў 1823 г. Маскоўскі архіў Калегіі замежных спраў атрымаў на нямецкай і рускай мовах копіі тых матэрыялаў

КТА, якія ў свой час былі накіраваны А. Казадаўлеву і Н. Карамзіну. М. Румянцаў уважліва вывучыў рэестр гэтых дакументаў і паводле яго метак Фінкельман падрыхтаваў нямецкамоўныя копіі. Меркавалася апублікаваць іх асобным томам ці ў працяглым выданні «Собрание государственных грамот и договоров».

Працэсы, якія адбыліся ў Еўропе пад час напалеонаўскай эпохі, прывялі да змены прававой сістэмы. Многія дакументы страцілі актуальнае юрыдычнае значэнне і засталіся крыніцамі ўжо толькі для гісторыкаў. У 1822 г. Кёнігсбергскі таемны архіў (тады ўжо Таемны дзяржаўны архіў Прусіі) зрабіў даступнымі дакументы да 1500 г., а ў 1823 г. — дакументы да 1525 г.[8] Да гэтага моманту гісторыкі маглі працаваць з матэрыяламі Кёнігсбергскага таемнага архіва толькі ў выключных выпадках. З 1839 г. архівам дазволена было карыстацца ўжо і прыватным асобам — за пэўную плату (даследчыкі маглі ад яе вызваляцца).

Лібералізацыя рэжыму карыстання архіўнымі фондамі адразу ж адбілася на сістэматычным выданні археаграфічных і гістарычных прац. Прыклад таму — публікацыя «Monumenta Germaniae Historica», а таксама працы Ёганэса Фойгта (Johannes Voigt, 1786—1863) «Geschichte Pruessens, von den altesten Zeiten bis zum Untergange der Herrschaft Deutschen Ordens». Апроч таго, Ё. Фойгт, які ў 1817—1863 гг. быў дырэктарам КТА і меў непасрэднае дачыненне да адкрыцця фондаў архіва, зрабіў рэестры некаторых дакументаў. Гартмут Бокман так піша пра дзейнасць архіварыуса: «Раз за разам чалавек трапляе на папяровыя вокладкі, якія пакрываюць асобныя дакументы і акты, а на вокладках крыху кастлявы, хуткі почырк Фойгта інфармуе ў форме рэестраў пра змест гэтых дакументаў»[9].

Гістарычна склалася наступная структура фондаў *КТА*:

1) Das Ordens-Briefarchiv (OBA) / Архіў ордэнскага ліставання — тут пераважна захоўваліся атрыманыя Ордэнам лісты (больш за 30 000 дакументаў)[10]. Названыя лісты ў большасці напісаны на паперы. Таксама ў гэтым зборы знаходзіліся некаторыя копіі атрыманых (адпраўленых) дакументаў і часткова пергаментныя граматы.

2) Die Pergament-Urkunden (Privilegien) / Пергаментныя граматы (прывілеі) — зыходзячы з архіўна-тэхнічных прынцыпаў, у гэтым фондзе былі сабраны пергаментныя прывілеі і лісты Нямецкага ордэна і яго інстытуцый — нашчадкаў у Прусіі ў перыяд да XIX ст.

3) Papst- und Konzils-Urkunden / Граматы папаў і царкоўных сабораў (шуфляды пад нумарамі ад I да XVIII); тут таксама захоўваліся трансумпты і натарыяльныя дакументы (Notariatsinstrumente).

4) Die Ordens-Folianten (OF) / Ордэнскія фаліянты — уключаюць у сябе рэестр дакументаў вялікіх магістраў (Hochmeister-Registranten; 50 фаліянтаў), дакументы ведамстваў (Ämterbücher) і падатковыя кнігі (Zinsbücher), а таксама так званыя «Кнігі моцы» (Handfestenbücher), запіс у якія надаваў юрыдычную сілу актам. Існаванне гэтага тыпу дакументацыі звязана са справаводчай традыцыяй фіксацыі не толькі зместу дакумента, але і тых, хто яго выдаваў і атрымліваў; тут мы знаходзім паралелі з функцыянальнасцю «кніг» Метрыкі ВКЛ.

У гады другой сусветнай вайны пачынаючы ад 1941 г. архіўныя зборы КТА пачалі перавозіцца нямецкімі ўладамі ў розныя замкі і маёнткі Усходняй Прусіі. Увосень 1943 г. калекцыі былі эвакуіраваны ў шахты Грослебен недалёка ад Браўншвейга, які апынуўся ў англійскай акупацыйнай зоне. Брытанскія ўлады перавезлі архіў у імператарскі палац Гослар (Goslar). У канцы 1945 г. — пачатку 1946 г. спецыяльная літоўская экспедыцыя вяла пошукі дакументаў з фондаў КТА ў самім замку Кёнігсберга ды яго наваколлях. Толькі некаторыя матэрыялы былі знойдзены ў замку Лёкштэт[11].

Вясною 1952 г. англійская адміністрацыя перадала фонды КТА ўраду Заходняй Германіі. На наступны год архіў быў перавезены ў Гётынген, дзе захоўваўся больш за 20 гадоў. Göttingen Staatliches Archivlager Pruessischer Kulturbesitz (Гётынгенскія дзяржаўныя архіўныя сховішчы прускай культурнай спадчыны) уключалі ў сябе фонды Staatsarchiv Königsberg (Дзяржаўнага архіва Кёнігсберга)[12]. У 1980-х гадах распачалося паэтапнае перамяшчэнне архіўных фондаў КТА ў Берлін (Заходні). Сёння большасць калекцый КТА захоўваюцца ў Geheimes Staatsarchiv Preussischer Kulturbesitz, Berlin—Dahlem (GSPK, Дзяржаўным таемным архіве прускай культурнай спадчыны, Берлін—Далем).

Сам GSPK мае таксама даўнюю гісторыю і вядзе свой аддік ад 1598 г., калі курфюрст Ёахім Фрыдрых Брандэнбургскі (Joachim Friedrich von Brandenburg) даручыў свайму сакратару Эразмусу Лангенгайму (Erasmus Langenhaim) прывесці ў парадак і «registrature archivorum» дакументы на зямельныя ўладанні. Больш чым за 400-гадовую гісторыю Архіў прускай культурнай спадчыны меў свае рэзідэнцыі ў розных мясцінах Германіі: Штэндаль, Франкфурт-на-Одэры, Тангермюндэ, Берлінскі замак. 26 сакавіка 1924 г. архіў быў перавезены ў асобны будынак у Далеме — раёне Берліна[13]. Увядзенне ў GSPK на працягу 1881—1907 гг. «прынцыпу паходжання» (Provenienzprinzip) у сістэматызацыі дакументаў расцэньваецца як пруская архіўная рэвалюцыя[14]. Панаванне гэтага фондаўтваральнага прынцыпу дазваляе захоўваць калекцыі КТА ў фон-

дах GSPK як адзіную калекцыю. Як адзначалі даследчыкі, з фондаў КТА былі апублікаваны галоўным чынам тыя дакументы, якія непасрэдна не адносіліся да канцылярыі вялікага магістра[15].

Арыгіналы дакументаў, што захоўваліся ў КТА, пры іх апісанні пазначаліся словам Schublade, Schieblade (шуфляда). Калі гэта былі скарочаныя копіі, то прысутнічала вызначэнне Regesten (рэестры) і адпаведны нумар, літара ці тытул. Вывучэнню фондаў КТА доўгі час перашкаджала адсутнасць вопісу змешчаных у ім дакументаў. Толькі на пачатку XX ст. Э. Ёахімам, а пазней В. Губачам (другая палова стагоддзя) была праведзена інвентарызацыя фондаў, а потым і апублікавана іх апісанне[16].

У XX ст. дакументы КТА (Архіў ордэнскага ліставання — OBA) былі пранумараваны паводле храналагічнага прынцыпу (агульная ці валавая нумарацыя). Але за старым падзелам па шуфлядах стаіць багатая архіўная і гістарыяграфічная традыцыя, таму трэба зважаць і на яе. Даўнейшая сігнатура складаецца з рымскіх і арабскіх лічбаў: першая лічба (рымская) пазначае шуфляду, другая (арабская) — нумар дакумента. Але ранейшая сігнатура фаліянтаў, якія пазначаліся літарамі ад «A» да «Z», была зменена ў 1876 г. Філіпі (Philippi), дарадцам архіва. Пры гэтым частка фаліянтаў была перамешчана ў фонд «Архіў ордэнскага ліставання». Пад час змены сігнатуры рэестр дакументаў вялікіх магістраў быў размешчаны на пачатку фонда, так што пазначэнне «OF 1» набыў найстаражытнейшы рэестр, створаны за часамі Вінрыха фон Кніпродэ (Winnrich von Kniprode). Вось як выглядае старая і новая сігнатура фаліянтаў[17]:

Старая сігнатура	Новая сігнатура	Старая сігнатура	Новая сігнатура
A	OF 17a u. OBA	N	OF 48
B	OF 18c u. OBA	O	OF 12
C	OF 14	P	OF 49
D	OBA u. Reg. (OF) 5	Q	OF 54
E	OBA	R	OF 53
F	Fol. 1b, OF 89a, OBA	S	Знікла пасля сярэдзіны XIX ст.
G	OF 11b, 11c	T	OF 18b
H	OF 89a	V	OF 24 u. 30
I	OF 18a	X	OF 29a
K	OF 136	Y	OF 20, 21, 22
L	Засталася не пазначанай	Z	OF 24a
M	OF 52		

Публікацыі матэрыялаў КТА[18]

У першай палове XIX ст. распачалося актыўнае вывучэнне і выкарыстанне фондаў Кёнігсбергскага таемнага архіва. Матэрыялы КТА паступова гублялі палітыка-прававую актуальнасць, але навуковая значнасць іх увесь час узрастала. Першую вялікую публікацыю пра фонды КТА ажыццявіў Карл Эдуард Наперскі[19] (C. E. Napiersky, 1793—1864), які сам паходзіў з Рыгі і цікавіўся лівонскімі архіваліямі. К. Наперскі быў пастарам, потым шмат гадоў займаў пасаду дырэктара ліфляндскіх губернскіх школ, а таксама працаваў цэнзарам у Рызе. Увесь свой вольны час ён аддаваў збіранню і вывучэнню гістарычных крыніц.

Першым комплексным апісаннем фодаў КТА стаў «Index corporis Historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae»[20] («Паказальнік гісторыка-дыпламатычнага збору Лівоніі, Эстоніі, Курляндыі») К. Наперскага, які выходзіў у Рызе і Тарту. Выданне мела і нямецкі падзагаловак — «Kurze-Auszug aus derjenigen Urkunden-Sammlung, welche für die Geschichte und das alte Staatsrecht Liv- Estn- und Kurlands» («Кароткая выпіска з той калекцыі грамат, што [датычацца] гісторыі і старажытнага дзяржаўнага права Лівоніі, Эстоніі і Курляндыі»). К. Наперскі карыстаўся пераважна наступнымі калекцыямі дакументаў: Рыжскага гарадскога архіва (так званых калекцый Унутранага і Знешняга архіваў) і фаліянтамі мясцовага Рыцарскага архіва, дзе знаходзіліся копіі дакументаў КТА, зробленыя ў пачатку XIX ст.[21] Гэтыя копіі пачалі рабіцца паводле ініцыятывы і на сродкі тагачаснай лівонскай эліты. Паводле хадайніцтва расійскага гісторыка М. Карамзіна праца па вырабу копій была завершана на сродкі, выдаткаваныя імператарам Аляксандрам I. Карл Наперскі апрацаваў значную колькасць дакументаў па гісторыі ўзаемных адносін Лівоніі, Ганзы, ВКЛ і Расіі на працягу XIII—XVII стст. Калекцыя складалася з 21 тома вялікага фармату ў аркуш. Двухтомны «Index corporis Historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae» і быў апісаннем гэтай калекцыі, дзе пададзеныя рэестры 3 713 дакументаў. Перыяд канца XV — першай паловы XVI ст. асвятляе другая частка выдання — «Zweiter Theil: vom Jahre 1450 bis zum Jahre 1631», якая выйшла ў 1835 г. Продкі археографа паходзілі з Рэчы Паспалітай, у тым ліку і таму ён цікавіўся стагоддзямі, калі лівонскія землі належалі Рэчы Паспалітай, пра што сведчыць і выданне названых рэестраў. К. Наперскі даў кароткія анатацыі дакументам і, што вельмі важна, назваў фондасховішчы, ў якіх яны знаходзіліся. Гэтая акалічнасць дазваляе праводзіць ідэнтыфікацыю актаў, якім рознымі аўтары часам давалі розныя назвы. Указанне архівасховішча, паводле К. Наперскага, дазваляе таксама размяжоўваць

арыгіналы дакументаў і іх копіі — праз вызначэнне Schieladen (для арыгіналаў) і Regesten (для скарочаных копій).

Як вельмі значнаю ў публікацыі лівонскіх архіваліяў трэба ацаніць дзейнасць Фрыдрыха Георга фон Бунге (F. G. von Bunge, 1802—1897), які нарадзіўся ў Кіеве ў нямецкай сям'і, але, захапіўшыся гісторыяй Лівоніі, пераехаў у Прыбалтыку. Ф. Бунге быў прафесарам Дэрпцкага універсітэта, з 1843 г. займаў розныя вядучыя пасты ў гарадскім самакіраванні Рэвеля, у 1856 г. браў актыўны ўдзел у кадыфікацыі грамадзянскага права балтыйскіх губерній, але ў 1856 г. пераехаў у Германію. Доўгія гады Фрыдрых Бунге адыгрываў вядучую ролю ў прыбалтыйска-нямецкай гістарыяграфіі і абароне прывелеяў нямецкай меншасці ва Усходняй Прыбалтыцы.

Працу па складанні рэестра лівонскіх дакументаў Ф. Бунге распачаў у 1828 г. — у Дэрпце і Рэвелі ён працаваў з архівамі Эстляндскага рыцарства і Рэвельскага магістрата. А цэлы шэраг даследчыкаў дапамагалі яму ў вырабе копій дакументаў з іншых архіваў: К. Наперскі — у архіве Рыжскага магістрата; Е. Генінг і Ё. Фойгт — у Кёнігсбергскім архіве; К. Паўлі — у Любекскім архіве; І. Брэверн — з матэрыялаў Метрыкі ВКЛ у Пецярбургскім архіве, а таксама ў каралеўскіх архівах у Капенгагене і Стакгольме. З 1842 г. Ф. Бунге распачаў публікацыю архіўных матэрыялаў у выданні пад назваю «Archiv für die Geschichte Liv-, Esth- und Curlands»[22] («Архіў гісторыі Лівоніі, Эстоніі і Курляндыі») — гэта было першае перыядычнае крыніцазнаўчае выданне, якое датычылася гісторыі Усходняй Прыбалтыкі.

Але галоўнай працай Ф. Бунге стала шматтомнае выданне пад назваю «Кніга актаў Лівоніі, Эстоніі і Курляндыі разам з рэестрамі» — «Liv-, Est- und Curländisches Urkundenbuch nebst Regesten»[23] (LECU). Сам Ф. Бунге паспеў выдаць шэсць тамоў[24], якія ахоплівалі перыяд з канца XI да пачатку XV ст., затым працу «паводле даручэння рыцарства і гарадоў» працягвалі ў пачатаку XX ст., ужо пасля смерці пачынальніка, іншыя, пераважна рыжскія, археографы: Герман Гільдэбранд (Hermann Hildebrand) (т. VII—IX)[25], Філіп Шварц (Philipp Schwartz) у супрацоўніцтве з Аўгустам фон Бульмерынгам (August von Bulmerincq) (т. X—XII)[26] і Леанід Арбузаў (Leonid Arbusow) (другі раздзел выдання)[27]. Працяг працы па выданні LECU быў звязаны з дзейнасцю семінара ў Гётынгенскім універсітэце. Гэты семінар заснаваў і доўгія гады кіраваў ім (1849—1875) прафесар Георг Вайц, які быў шматгадовым супрацоўнікам, а з 1875 г. — кіраўніком выдання серыі «Monumenta Germaniae Historica». Герман Гільдэбранд (1843—1890) быў вучнем Георга Вайца і ў 1882 г. стаў архіварыусам горада Рыгі. Латышскі гісторык Т. Зэйд

сцвярджае, што пад кіраўніцтвам Г. Гільдэбранда LECU дасягнула ўзроўню найлепшых выданняў гістарычных крыніц Заходняй Еўропы[28]. Распрацаваныя Вайцам і Гільдэбрандам прынцыпы эдыцыйнай тэхнікі непасрэдна ці ўскосна паўплывалі на ўсе наступныя выданні крыніц, што здзейснілі прыбалтыйска-нямецкія гісторыкі. Для нас досвед працы Германа Гільдэбранда цікавы яшчэ тым, што ён быў, бадай, першым археографам, які для датавання актаў з лівонскіх архіўных збораў выкарыстоўваў матэрыялы Метрыкі ВКЛ[29], найбольш старажытныя кнігі якой тады яшчэ не былі апублікаваны. Пасля смерці ў 1890 г. Г. Гільдэбранда яго пераемнікам на пасадзе рыжскага архіварыуса стаў Філіп Шварц, ён працягнуў працу па выданні LECU. Аўгуст Бульмерынг, які таксама займаўся падрыхтоўкай актаў і рэцэсаў лівонскіх (пратаколаў рашэнняў) ландтагаў, сумесна са Шварцам апублікаваў т. XII выдання[30]. Але апошнія тамы першага раздзела, якія б ахоплівалі перыяд 1473 — май 1494 г., так і не выйшлі з друку. Леанід Арбузаў-старэйшы займаўся выданнем ужо ўласна ім падрыхтаваных тамоў, якія склалі другі раздзел серыі.

LECU сярод іншых выданняў вылучаецца добра прадуманай сістэмай размяшчэння і падачы інфармацыі. Многія з прынцыпаў публікацыі дакументаў, закладзеныя Ф. Бунге, сталі ў XX ст. класічнымі для археаграфіі. Кожны том складаецца з трох частак — спачатку размешчаны самі дакументы; далей знаходзяцца імянны, геаграфічны і прадметны паказальнікі; у апошняй частцы тома (з асобнай пагінацыяй) друкуюцца рэестры дакументаў з пазначэннем неабходных звестак пра іх — месца захоўвання арыгінала, датаванне, аўтэнтычнасць публікацыі. Ф. Бунге імкнуўся друкаваць дакументы паводле арыгіналаў, у выпадку іх адсутнасці — з трансумптаў ці бліжэйшых да арыгіналаў па часу копій. Але часам Ф. Бунге мусіў перадрукоўваць дакументы з іншых публікацый — у такім выпадку недакладнасці ў выданнях М. Догеля[31] ці памылкі А. Тургенева патрапілі ў LECU.

У выпадку, калі дакумент быў згублены, але пра яго захаваліся рукапісныя ці друкаваныя звесткі, укладальнік абавязкова падаваў такія дакументы ў рэестрах. Пры публікацыі дакументаў вытрымліваўся дакладны храналагічны прынцып, а ўсе сумненні ў правільнасці датавання абгаворваліся ў рэестрах.

Увесь велізарны масіў LECU ахоплівае перыяд з 1093 па 1510 г. Ужо пад час выдання першых тамоў стала відавочным, што ў збор не ўвайшлі важныя гістарычныя дакументы, таму ў III і VI тамах былі змешчаны дадаткі да раней выдадзеных тамоў. А ў 1881 г. Ф. Бунге апублікаваў выпраўленыя і дапоўненыя рэестры дакументаў да 1300 г.

уключна[32]. Перыяду канца XV — пачатку XVI ст. прысвечаны другі раздзел выдання, які выходзіў у Рызе і Маскве ў 1900—1910 гг.: Zweite Abteilung, Band 1: 1494 Ende Mai — 1500 (канец мая 1494—1500 г.); Zweite Abteilung, Band 2: 1501—1505; Zweite Abteilung, Band 3: 1506—1510. Другі раздзел да выдання рыхтаваў Леанід Арбузаў. У LECU падрабязна асветленая гісторыя ўзаемаадносін ВКЛ і Лівоніі. Дзякуючы добрай сістэматызаванасці дакументаў, LECU застаецца папулярным выданнем сярод даследчыкаў і цяпер, ім часта карыстаюцца і на яго часта робяць спасылкі.

Расійская археаграфія таксама надавала сур'ёзную ўвагу архівам Нямецкага ордэна. А. І. Тургеневу падрыхтаваў і пры падтрымцы Археаграфічнай камісіі ў 1841—1842 гг. выдаў «Акты исторические, относящиеся к России, извлеченные из иностранных архивов и библиотек А. И. Тургеневым»[33]. Дакументы «Актов...» ілюструюць гісторыю розных краін Еўропы нашага рэгіёна на працягу 1075—1719 гг. У першым томе былі змешчаны матэрыялы, выяўленыя ў Ватыканскім тайным архіве ды іншых рымскіх бібліятэках; у другім томе — матэрыялы з архіваў і бібліятэк Італіі, Англіі, Францыі. Падобная пошукавая праца па ініцыятыве міністра народнай асветы С. Уварава была працягнута надалей і да 1848 г. Археаграфічная камісія набыла «значную колькасць дакументаў з архіваў Торунскага, Вісмарскага, Брэменскага, Гамбургскага і Кёнігсбергскага». Сёння гэтыя дакументы з архіва Археаграфічнай камісіі знаходзяцца ў фондзе № 473 Аддзела рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (АР РДБ). Новыя дакументы былі надрукаваныя ў 1848 г. у зборніку «Дополнения к Актам историческим, относящимся к России»[34]. Да актаў далучылі палеаграфічныя апісанні арыгіналаў, адзначылі архівы і бібліятэкі, дзе захоўваліся дакументы альбо адкуль яны паступілі ў Археаграфічную камісію. Дакументы з Кёнігсбергскага тайнага архіва складаюць раздзел VII (№ 106—159, с. 283—384). Загалоўкі да актаў напісаны на лацінскай і расійскай мовах, за выняткам дакументаў, напісаных па-нямецку, «при которых сочтено нужным оставить без изменений все старинные архивные заглавия и отметки и ограничиться присовокуплением к ним необходимых объяснений по-русски»[35]. «Акты...» і «Дополнения...» ў значнай ступені складаюцца з дыпламатычных дакументаў. Даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што выдадзеныя А. Тургеневым дакументы «стракацяць ад шматлікіх і грубых памылак»[36]. Але, тым не менш, гэтыя дакументы актыўна выкарыстоўваліся, у тым ліку і Ф. Бунге.

Адзін з відаў выдання крыніц — гэта публікацыя тэматычна адабраных дакументаў у тэматычных манаграфіях. У 1892—1895 гг. нямецкі

гісторык Эрых Ёахім (E. Joachim) апублікаваў сваю працу «Die Politik des letzen Hochmeister in Preußen Albrecht von Brandenburg» («Палітыка апошняга вялікага магістра Прусіі Альбрыхта Брандэнбургскага»)[37]. У дадатку працы змешчалася 575 дакументаў з фондаў КТА ды іншых архіваў Германіі, Лівоніі, Прусіі, Скандынавіі. Сярод апублікаваных матэрыялаў былі дакументы, упершыню ўведзеныя ў навуковы ўжытак. Ужо ў другой палове XX ст. напрацоўкі Э. Ёахіма па калекцыях КТА выкарыстаў Вальтэр Губач.

У другой палове XX ст. (1948—1973) у ФРГ рэалізоўваўся праект выдання «Гісторыка-дыпламатычныя рэестры Тэўтонскага ордэна Св. Марыі» («Regesta historico-diplomatica Ordinis Sanctae Mariae Theutonicorum»)[38], у выніку чаго былі апісаны дакументы за перыяд 1198—1525 гг. Выданне ажыццявіў тагачасны дацэнт Гётынгенскага універсітэта, а пазней прафесар Бонскага універсітэта Вальтэр Губач (Walter Hubatsch). Трэба нагадаць, што ў выніку другой сусветнай вайны фонды КТА былі вывезены з Кёнігсберга, архіўныя матэрыялы з 1953 г. захоўваліся менавіта ў Гётынгене. Усе дакументы КТА размеркаваныя па 4 фондах: «Ordensbriefarchiv» («Архіў ордэнскага ліставання»); «Pergament-Urkunden» («Пергаментныя граматы»); «Ordensfolianten» («Ордэнскія фаліянты») — рахунковыя, падатковыя і адміністрацыйныя кнігі); «Hochmeisterbriefarchiv» («Карэспандэнцыя вялікіх магістраў»). В. Губач апублікаваў рэестры Архіва ордэнскага ліставання і рэестры пергаментных грамат. Выданне В. Губача дае магчымасць сёння адшукаць дакумент паводле пададзеных індэксаў, даведацца пра сігнатуру, пад якой захоўваліся гэтыя дакументы непасрэдна ў Кёнігсбергу, а таксама азнаёміцца са зместам дакумента з дапамогаю рэестраў. Нямецкі архівіст інфармуе таксама пра публікацыі асобных дакументаў. Частка 1 (Pars 1: Index Tabularii Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten zum Ordensbriefarchiv / Рэестры Архіва ордэнскага ліставання) (1198—1454) выйшла ў трох тамах, пры гэтым першы том быў выдадзены ў двух кнігах: Vol. 1, Erster Haldband (1198—1432); Zweiter Haldband (1433—1454), 1948; Vol. 2: 1455—1510, 1950; Vol. 3: 1511—1525, 1973. Частка 2 (Pars 2: Regesta Privilegiorum Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten der Pergament-Urkunden aus der Zeit des Deutschen Ordens / Рэестры пергаментных грамат з часоў Нямецкага ордэна) выйшла адным томам у 1948 г. Асобна ў 1965 г. быў выдадзены «Рэестр да часткі 1 і часткі 2» («Register zu Pars 1 und Pars 2»). Таксама Вальтэр Губач у першай палове 1950-х гадоў апублікаваў у 5 тамах зборнік «Quellen zur Geschichte des Deutschen Ordens»[39] («Крыніцы па гісторыі Нямецкага ордэна»), дзе

змясціў дакументы ў перакладзе на нямецкую мову. Як адзначаў Гартмут Бокман, гэты пераклад быў «не заўжды дакладным»[40].

У сваёй публікацыі «Гісторыка-дыпламатычных рэгестаў» Вальтэр Губач грунтаваўся на папярэдніх даследаваннях фондаў КТА Эрыха Ёахіма (1851—1923), які ў 1887—1921 гг. быў дырэктарам Дзяржаўнага архіва ў Кёнігсбергу. Э. Ёахім падрыхтаваў рукапісны паказальнік (Repertorium) архіва, праз некторы час дапоўнены наступным дырэктарам Максам Хайнцам (Max Heinz) і тагачасным дарадцам архіва Куртам Фарстройтэрам (пазней — таксама дырэктар архіва). У паказальніку № 5 (Repertorium 5) асобна былі адзначаныя кнігі з лівонскімі дакументамі. Гэтае пазначэнне «LS» (Livländische Sachen / Лівонскія справы) В. Губач захаваў у сваёй публікацыі.

Арыгінал паказальніка знік без слядоў пасля 1945 г.[41] Паказальнік Архіва ордэнскага ліставання (17 тамоў у чвэрць аркуша) цалкам захаваўся ў фотакопіях. Таксама захаваліся матэрыялы да паказальніка пергаментных грамат, у той час як паказальнік да грамат папаў і царкоўных сабораў (Papst- und Konzilsurkunden) увогуле не быў фотакапіраваны. Толькі да некаторых іншых груп былі яшчэ падрыхтаваны рэестры альбо кароткія апісанні, з іх таксама захавалася толькі частка, бо і яны не былі фотакапіраваны. Фактычна Вальтэру Губачу шмат у чым прыйшлося рэканструяваць даўнюю структуру архіва і рабіць яго апісанне наноў.

Вальтэр Губач належаў да заснаванага ў 1946 г. Гётынгенскага рабочага гуртка («Arbeitskreis»)[42], які ацэньваўся ў савецкай гістарыяграфіі як рэваншысцкі[43]. Гісторыкі гэтага кола вылучаліся цікавасцю да гісторыі Нямецкага ордэна і Прусіі, да гісторыі зносін Германіі з краінамі ва Усходняй Еўропе, а таксама асаблівай увагай да крыніц па гэтых тэмах. Сам В. Губач апублікаваў манаграфію, прысвечаную Альбрыхту Брандэнбургскаму[44]. Таксама ў Гётынгенскі рабочы гурток уваходзіў Курт Фарстройтэр (Kurt Forstreuter), які шмат займаўся вывучэннем пруска-расійскіх палітычных адносін, — гэтай праблеме прысвечана яго праца «Preußen und Rußland von den Anfängen des Deutschen Ordens bis zu Peter dem Großen»[45] («Прусія і Расія ад пачаткаў Нямецкага ордэна да Пятра Вялікага»), апублікаваная К. Фарстройтэрам ў 1955 г. на базе сваёй ранейшай кнігі «Preußen und Rußland im Mittelalter»[46] («Прусія і Расія ў сярэднявеччы»), — часам гэтыя дзве кнігі блытаюць у бібліяграфічных спісах. Гэты ж аўтар вядомы як гісторык зносін Германіі і ВКЛ у сярэднявеччы — «Deutschland und Litauen im Mittelalter»[47]. Як і В. Губач, К. Фарстройтэр таксама займаўся гісторыяй Кёнігсбергскага архіва — у

1955 г. ён апублікаваў даследаванне «Das Preußische Staatsarchiv in Königsberg. Ein geschichtlicher Rückblick mit einer Übersicht über seine Bestände»[48] («Прускі дзяржаўны архіў у Кёнігсбергу. Гісторыка-рэтраспектыўны погляд з аглядам яго складу»), дзе, апроч усяго іншага, была зроблена рэканструкцыя даўняй структуры архіва.

Дакументы аб Францыску Скарыне ў фондах КТА

Важнасць фондаў КТА для вывучэння гісторыі Беларусі можна праілюстраваць на прыкладзе дакументаў аб Францыску Скарыне. Мова ідзе пра каларытны эпізод з жыцця беларускага першадрукара, а менавіта пра яго выправу ўвесну 1530 г. у Кёнігсберг да двара прускага герцага Альбрыхта Брандэнбургскага.

Недзе з 1520 г. Ф. Скарына жыў у Вільні, вярнуўшыся ў Вялікае княства Літоўскае з Прагі. Існуюць розныя версіі прычын, па якіх доктар Скарына накіраваўся ў Прусію[49]. Верагоднай з'яўляецца версія медыцынскіх матываў паездкі. У 1529 г. Прусію дасягнула невядомая дагэтуль хвароба «der englische Schweiß» (літаральна — англійскі пот, гарачка), і герцаг, звярнуўшыся па дапамогу да кракаўскіх лекараў, мог таксама запрасіць і Скарыну — сакратара і асабістага медыка віленскага біскупа Яна[50]. Яшчэ адна вартая ўвагі версія таксама звязана з прафесійнай дзейнасцю Скарыны — гэтым разам як друкара. Герцаг Альбрыхт, які праводзіў актыўную рэлігійную (рэфармацыйную) палітыку, ахвотна выкарыстоўваў кнігадрукаванне. Кёнігсбергскі выдавецкі асяродак мог прыцягнуць увагу друкара Скарыны.

Ужо ў маі 1530 г. Скарына пакінуў Кёнігсберг і накіраваўся ў Вільню. З яго ад'ездам і звязаны дакументы з фондаў КТА. 16 мая прускі герцаг накіраваў віленскаму ваяводзе і канцлеру ВКЛ Альбрыхту Гаштаўту, у якім усяляк усхваляе вартасці «выдатнага і шматдасведчанага» доктара прыгожых мастацтваў і медыцыны Скарыну ды просіць паспрыяць яму ў маёмасных спрэчках, звязаных са спадчынай жонкі Маргарыты. Таксама 16 мая датавана падарожная грамата на праезд Скарыне з Кёнігсберга ў Вільню. Просьбу пра спрыянне Скарыне герцаг Альбрыхт паўтарыў у лісце да Віленскага магістрата, датаваным 18 мая. Але ўжо 26 мая прускі герцаг накіроўвае канцлеру Гаштаўту ліст зусім іншай танальнасці, бо высветлілася, што авантурны і слынны палачанін тайна звёз з Кёнігсберга двух важных спецыялістаў — лекара і друкара. Герцаг Альбрыхт прасіў канцлера Гаштаўта, каб той «...гэтага доктара Францыска Скарыну павучыў аб недарэчнасці тайнага вываду нашых людзей і асудзіў і зазначыў, што мы адносімся да яго з незадавальненнем і непрыхільнасцю і што мы ад яго не чакалі такога незаслужанага

ўчынку, як гэты». Асобна адзначым, што канцлер Гаштаўт быў прыхільнікам збліжэння ВКЛ з Прусіяй. Падобна, што захады герцага мелі эфекты, бо Скарына так і не аднавіў сваёй выдавецкай дзейнасці.

Вышэйназваныя дакументы былі выяўлены ў Кёнігсбергскім таемным архіве ў 1914 г. невядомай асобай, якая перадала іх копіі археографу і бібліёграфу, супрацоўніку Віленскай публічнай бібліятэкі Аляксандру Мілавідаву. Менавіта Мілавідаў апублікаваў гэтыя дакументы ў арыгінале — на лаціне, без перакладу[51]. У сваёй кароткай прадмове, датаванай 5.X.1914 г., публікатар адзначаў — асоба, якая знайшла дакументы, была пэўная ў тым, «что они (дакументы. — *А. Дз.*) не напечатаны даже в Германии, а в России, несомненно, они появятся в печати впервые». Безумоўна, першапублікацыя дакументаў стала сенсацыяй у Скарыніяне, хоць некаторыя хібы ў гэтай публікацыі меліся. Праз дваццаць гадоў Курт Фарстройтэр пісаў, што ў публікацыі Мілавідава прапушчана «et»[52] (у рукапісе «ас») і лекар-габрэй і друкар, якіх Скарына вывез у Вільню, сталі адной асобай. Апроч таго, Мілавідаў даў некаторыя няправільныя інтэрпрэтацыі дакументаў[53].

Цікавасць да кёнігсбергскіх дакументаў аб Скарыне не знікала не толькі ў гісторыкаў, але і ў археографаў. У 1953 г. у нью-йоркскіх «Запісах» быў апублікаваны беларускі пераклад дакументаў[54]. Новую папраўленую публікацыю дакументаў у арыгінале ажыццявіла ў 1981 г. у Рыме К. Ланкароньска[55]. Рэалізацыя ў другой палове 1980 — пачатку 1990-х гадоў у Беларусі даследчай і выдавецкай праграмы, прымеркаванай да 500-годдзя з дня нараджэння беларускага першадрукара, дазволіла зрабіць новыя публікацыі кёнігсбергскіх дакументаў. Менавіта тады ўдалося атрымаць з берлінскага GSPK[56] фотакопіі дакументаў, публікацыю якіх у арыгінале, а таксама ў перакладзе па-беларуску і па-руску здзейсніў Віктар Дарашкевіч[57]. Гэтыя пераклады, з некаторымі скарачэннямі Пачатковага пратакола, былі таксама апублікаваны адпаведна ў беларускамоўнай і рускамоўнай версіях энцыклапедычнага даведніка «Францыск Скарына і яго час»[58].

Зусім верагодна, што калекцыі Кёнігсбергскага архіва захоўваюць і іншыя невядомыя дакументы пра паездку Ф. Скарыны ў Прусію.

Падсумаванне

Калекцыі Кёнігсбергскага таемнага архіва акумулююць, калі казаць пра іх важнасць для вывучэння гісторыі Вялікага княства Літоўскага і Беларусі, дакументы найперш па гісторыі дыпламатычных зносін ВКЛ з Прусіяй і Лівоніяй пачынаючы з XIII ст. (у тым ліку і акты дэлімітацыі і дэмаркацыі межаў). Гэта як арыгіналы, так і

трансумпты (тагачасныя копіі), бо лівонская адміністрацыя дасылала ў Кёнігсберг (у агульнаордэнскі архіў) копіі ўсіх атрыманых з Вялікага княства лістоў і актаў. Копіі многіх дакументаў маюцца і ў Метрыцы ВКЛ, што стварае выдатныя магчымасці праводзіць іх кампаратыўны аналіз, удакладняць тэкст і датаванне.

Натуральна, дакументы гэтага тыпу маюць свае храналагічныя межы — у 1525 г. вялікі магістр ордэна Альбрыхт Брандэнбургскі правёў секулярызацыю, і Прусія з ордэнскай тэрыторыі пераўтварылася ў герцагства. З таго часу ў Кёнігсбергскі архіў траплялі дакументы па зносінах ВКЛ з Прускім герцагствам. Але паступова Вільня губляла ініцыятыву ў знешняй палітыцы, і, урэшце рэшт, гэтая галіна дзейнасці апынулася ў кампетэнцыі ўладаў ужо аб'яднанай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Паводле ўсталяванай традыцыі зносіны Рэчы Паспалітай з Прусіяй курыраваліся польскімі дыпламатамі, таму з другой паловы XVI ст. колькасць дакументаў па дыпламатычных адносінах з ВКЛ у Кёнігсбергскім архіве рэзка скарачаецца. Але Прусія заставалася суседам Вялікага княства. Заўжды існавалі гандлёвыя ды прыватныя кантакты, і дакументы пра іх і надалей траплялі ў Кёнігсбергскі таемны архіў. З 1598 г. галоўным архівам Прусіі паступова становіцца Таемны архіў прускай культурнай спадчыны, які знаходзіўся на карэннай нямецкай тэрыторыі (у Брандэнбургскім курфюрстве). Такім чынам, Кёнігсбергскі архіў усё больш набывае гісторыка-юрыдычнае значэнне, застаецца галоўным архівам па гісторыі зносін ВКЛ з Прусіяй і Лівоніяй ордэнскага перыяду.

Археаграфічнае засваенне фондаў Кёнігсбергскага таемнага архіва, якое распачалося ў 30-х гг. XIX ст., зрабіла даступнымі дакументы, найперш, па знешнепалітычнай дзейнасці (тут маюцца на ўвазе зносіны з ВКЛ). Між тым зусім недаацэнена важнасць фондаў КТА для асвятлення дзейнасці выдатных асобаў Вялікага княства. Гісторыя кёнігсбергскай авантуры Скарыны — толькі адзін сюжэт, які стаў вядомы дзякуючы значнасці асобы першадрукара для беларускай культуры. Новыя магчымасці для пошуку дакументаў з'явіліся пасля таго, як у 1948 г. распачалася публікацыя «Гісторыка-дыпламатычных рэестраў Тэўтонскага ордэна Св. Марыі» («Regesta historico-diplomatica Ordinis Sanctae Mariae Theutonicorum»). Гэтая фундаментальная праца ахоплівае перыяд з 1198 па 1525 г., г. зн. перыяд існавання Ордэна ў Прусіі.

Можна выказаць меркаванне, што фонды Кёнігсбергскага таемнага архіва прыхоўваюць яшчэ многа сюрпрызаў для даследчыкаў гісторыі Вялікага княства. Рэальнае знаёмства беларускіх даследчыкаў з гэтымі багатымі калекцыямі гістарычных дакументаў толькі распачынаецца.

Спіс скарачэнняў

GSPK — Geheimes Staatsarchiv Preussischer Kulturbesitz, Berlin-Dahlem / Дзяржаўны таемны архіў прускай культурнай спадчыны, Берлін—Далем (ням.).

КТА — Кёнігсбергскі таемны архіў (сёння калекцыя ў GSPK).

ОВА — Ordens-Briefarchiv / Архіў ордэнскага ліставання (КТА—GSPK).

OF — Ordens-Folianten / Ордэнскія фаліянты (КТА—GSPK).

Regesta — Regesta historico-diplomatica Ordinis Sanctae Mariae Theutonicorum 1198—1525 / Bearbeiten unter Mitwirkung zahlreicher anderer von Erich Joachim, ehem. Geh. Staatsarchivrat in Königsberg (Pr.), herausgegeben von Walther Hubatsch. Pars I—II. Göttingen, 1948—1973.

Regesta I-1-1 — Pars I: Index Tabularii Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten zum Ordensbriefarchiv. Vol. 1: 1198—1454, Erster Haldband [1198—1432] / Herausgegeben von Walther Hubatsch, Dozent an der Universität Göttingen. 1948;

Regesta I-1-2 — Pars I: Index Tabularii Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten zum Ordensbriefarchiv. Vol. 1: 1198—1454, Zweiter Haldband (1433—1454) / Herausgegeben von Walther Hubatsch, Dozent an der Universität Göttingen. 1948;

Regesta I-2 — Pars I: Index Tabularii Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten zum Ordensbriefarchiv. Vol. 2: 1455—1510 / Herausgegeben von Walther Hubatsch, apl. Professor an der Universität Göttingen. 1950;

Regesta I-3 — Pars I: Index Tabularii Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten zum Ordensbriefarchiv. Vol. 3: 1511—1525. Mit Registern zu Band I-3 / Herausgegeben von Walther Hubatsch, o. Professor an der Universität Bonn. 1973;

Regesta II — Pars II: Regesta Privilegiorum Ordinis S. Mariae Theutonicorum. Regesten der Pergamen- Urkunden aus der Zeit des Deutsches Ordens mit einem Anhang: Papst- und Konzilsurkunden / Herausgegeben von Walther Hubatsch, Dozent an der Universität Göttingen. 1948.

Regesta—Register — Register zu Pars I und Pars II. 1965.

---

[1] Koeppen H. Das Archiv der Deutschen Ordens in Preussen, seine Bestände und seine wissenschaftliche Bedeutung // *Jahrbuch der Stiftung Preussischer Kulturbesitz.* 4 (1966). S. 172—187.

[2] Юргинис Ю. Судьба архива Тевтонского ордена // *Материалы межреспубликанской научной конференции по источниковедению и историографии народов Прибалтийских республик Союза ССР. Источниковедение.* Вильнюс, 1978. С. 22—23.

[3] Козлов В. П. *Российская археография в конце XVIII — первой четверти XIX века.* М., 1999. С. 195.

[4] Козлов В. П. «Примечания» Н. М. Карамзина к «Истории государства Российского» // Карамзин Н. М. *История государства Российского: В 12 т.* Т. I. М., 1989. С. 562.

[5] Козлов В. П. *Колумбы российских древностей.* М., 1985. С. 53—54.

[6] Карамзин Н. М. *История государства Российского.* Т. VII. СПб., 1817. С. 81, спас. 162.

[7] Козлов В. П. *Российская археография в конце XVIII — первой четверти XIX века.* С. 196.

[8] Boockman H. *Zakon Krzyżacki. Dwanaście rozdziałów jego historii.* Warszawa, 1998. S. 281.

[9] Boockman H. *Zakon Krzyżacki.* S. 282.

[10] *Regesta I-1-1*, S. VII.

[11] Юргинис Ю. Судьба архива Тевтонского ордена. С. 25.

[12] Ekdahl S. *Jono Dlugošo «Prusu veliavos» — Žalgirio mušio šaltinis.* Vilnius, 1992. P. 271.

[13] Strecke R. Der lange Weg nach Dahlem // *Archivarbeit für Preußen.* Symposium der Preußischen Historischen Kommission des Geheimes Staatsarchivs Pruebischer Kulturbeitz aus Anlaß der 400. Wiederkehr der Begründung seiner archivischen Tradition. Berlin, 2000. S. 27—47.

[14] Krajewska H. [Rezensionen] Archivarbeit für Preußen. Symposium der Preußischen Historischen Kommission des Geheimes Staatsarchivs Pruebischer Kulturbeitz aus Anlaß der 400. Wiederkehr der Begründung seiner archivischen Tradition // *Nordost–Archiv.* 2000. Band IX, Heft 2. S. 522.

[15] Юргинис Ю. Судьба архива Тевтонского ордена. С. 22.

[16] *Regesta historico-diplomatica Ordinis S. Mariae Theutonicorum 1198–1525* / Bearbeiten unter Mitwirkung zahlreicher anderer von Erich Joachim, ehem. Geh. Staatsarchivrat in Königsberg, herausgegeben von Walther Hubatsch. Pars I—II. Göttingen, 1948—1973.

[17] *Regesta I-1-1*, S. VIII.

[18] Тут будуць апісвацца тыя выданні, публікацыі дакументаў якія непасрэдна тычацца гісторыі ВКЛ і Беларусі.

[19] Трэба адзначыць, што ў расійскіх публікацыях XIX і XX стст. прозвішча археографа пішацца з «ь» — «Напьерский». Але нам падаецца, што арыгінальнае напісанне прозвішча — «Napiersky», — не дае падставаў для выкарыстання «ь» пры перадачы гэтага прозвішча беларускай кірыліцай.

[20] *Index corporis Historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae; oder: Kurze-Auszug aus derjenigen Urkunden-Sammlung, welche für die Geschichte und das alte Staatsrecht Liv- Estn- und Kurlands.* Theil 1 (1190—1449). Riga—Dorpat, 1833; Theil 2 (1450—1631 mit einigen Anhängen). Riga—Dorpat, 1835.

[21] *Русско-ливонские акты.* СПб., 1868. С. VIII.

[22] *Archiv für die Geschichte Liv-, Esth- und Curlands* / Hrsgb. F. G. Bunge. Bd. I—VII. Dorpat—Reval, 1842—1861 (I—V, Dorpat, 1842—1847; VI—VIII, Reval, 1851—1861; I—II — другое выданне з дадаткамі, Reval, 1857—1861).

[23] *Liv-, Esth- und Curländisches Urkundenbuch nebst Regesten* / Hrsgb *von F. G. v. Bunge.* [Abt. 1] Bd. 1—11. Abt. 2. Bd. 1—3. Reval—Riga—Moskau, 1853—1914.

[24] I (1093—1300), Reval, 1853; II (1301—1367), Reval, 1855; III (1368—1393, mit Nachträgen zu den zwei ersten Bänden), Reval, 1857; IV (1394—1413), Reval, 1859; V (1414—1423), Riga, 1867; VI (Nachträge zu den fünf ersten Bänden des Urkundenbuchs), Riga, 1873.

[25] *LECU* / Fortgesetzt von Hermann Hildebrand. Riga—Moskau: VII (1426 Mai — 1429 Mai), 1881; VIII (1429 Mai — 1435), 1884; IX (1436 — 1443), 1889.

[26] *LECU* / Hrsg. von Philipp Schwartz. Riga — Moskau: X (1444—1449), 1896; Erste Abteilung, Band XI (1450—1459), 1905; XII (1460—1472) / Hrsg. von Philipp Schwartz und August von Bulmerincq, 1910.

[27] *LECU*. Zweite Abteilung / Hrsg. von Leonid Arbusow. Riga—Moskau: I (1494 Ende Mai — 1500), 1900; II (1501—1505), 1905; III (1506—1510), 1914.

[28] Зейд Т. Я. Характеристика изданий письменных источников по истории феодализма в Латвии // *Источниковедческие проблемы истории народов Прибалтики*. Рига, 1970. С. 352.

[29] Hildebrand H. *Die Arbeiten für das Liv-, Est- und Kurländische Urkundenbuch im Jahre 1874—1875*. Riga, 1876.

[30] Bulmerincq A. von. *Der Bericht über die Arbeiten für das Liv-, Est- und Kurländische Urkundenbuch, sowie die Akten und Recesse der livländischen Ständetage*. Riga, 1909.

[31] Dogel M. *Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae, in quo pacta, feodera, tractatus pacis etc.* T. 1. Vilnae, 1758; T. 4: In quo totius Prussiae res continentur. Vilnae, 1764; T. 5: In quo ut universae Livoniae, ita speciamtim Curlandiae et Semigalliae Ducatuum res continentur. Vilnae, 1759.

[32] Bunge F. G. *Liv-, Est- und Curländische Urkunden-Regesten bis zum Jahre 1300*. Leipzig, 1881.

[33] *Акты исторические, относящиеся к России, извлеченные из иностранных архивов и библиотек А. И. Тургеневым* (Historica Russiae monumenta ex antiquis exterarum gentium archivis et bibliothecis deprompta ab A. I. Turgenevio). Т. 1—2. СПб., 1841—1842.

[34] *Дополнения к Актам историческим, относящимся к России. Собраны в иностранных архивах и библиотеках и изданные Археографическою комиссиею* (Supplementum ad historica Russiae monumenta, ex archivis ac bibliothecis extrancis depromta, et a Collegio archäeographico edita). СПб., 1848.

[35] *Дополнения к АИ*. С. VII.

[36] Жлутка А. *Лацінскія дакументы як крыніца па гісторыі Беларусі і Вялікага княства Літоўскага*. Раздзел 1. Лівонскія дакументы. (Рукапіс, *Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі*). С. 9.

[37] Joachim E. *Die Politik des letzen Hochmeister in Preußen Albrecht von Brandenburg*. Bd. 1—3. Leipzig, 1892—1895.

[38] *Regesta historico-diplomatica Ordinis S. Mariae Theutonicorum 1198—1525* / Gearbietet unter Mitwirkung zahlreicher Anderer von Erich Joachim, ehem. Geh. Staatsarchivrat in Königsberg, herausgegeben von Waltehr Hubatsch, Dozent an der Universität Göttingen. Pars 1—2. Göttingen, 1948—1973.

[39] *Quellen zur Geschichte des Deutschen Ordens* / Hrsgb. W. Hubatsch. Bd. I—V. Göttingen—Frankfurt—Berlin, 1950—1954.

[40] Boockmann H. *Zakon Krzyżacki*. S. 305.

[41] *Regesta I-1-1*, S. VII.

[42] Падрабязней пра «Arbeitskreis» гл.: Kamiński A. Słowo Göttinger Arbeitskreis // *Przegląd Zachodni*. 1954, № 5—6; Biskup M. Najnowsze prace zachodnioniemieckie nad historią Zakonu Krzyżackiego // *Kwartalnik Historyczny*. 1956, LXIX. № 6; *Mensch und Staat in Recht und Geschichte*. Festschrift für Herbst Kraus. Kützingen / Main, 1954.

[43] Балязин В. Н. Россия и Тевтонский орден // *Вопросы истории*. 1963, № 6. С. 61—62.

[44] Hubatsch W. *Albrecht von Brandenburg-Ansbach, Deutschordens Hochmeister und Herzog in Preussen 1490—1568*. Köln—Berlin, 1960.

[45] Forstreuter K. *Preußen und Rußland von den Anfängen des Deutschen Ordens bis zu Peter dem Großen*. Göttingen; Berlin; Frankfurt, 1955.

[46] Forstreuter K. *Preußen und Rußland im Mittelalter*. Die Entwicklung ihrer Beziehungen von 13. Bis 17. Jahrhundert // *Osteuropäische Forschungen*. Bd. 25. Königsberg, Berlin, 1938.

[47] Forstreuter K. *Deutschland und Litauen im Mittelalter*. Köln; Graz, 1962.

[48] Forstreuter K. *Das Preußische Staatsarchiv in Königsberg. Ein geschichtlicher Rückblick mit einer Übersicht über seine Bestände*. Göttingen, 1955.

[49] Агляд версій гл.: Галенчанка Г. Я. *Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар*. Мн., 1993. С. 100—101; Немировский Е. Л. *Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя*. Мн., 1990. С. 492—498.

[50] Forstreuter K. *Preußen und Rußland im Mittelalter*. S. 222. Адносна гэтай версіі Валянцін Грыцкевіч заўважае, што яна не падмацавана спасылкамі на крыніцы: Грыцкевіч В. Доктар медыцыны Францыск Скарына // *Спадчына Скарыны:* Зборнік матэрыялаў Першых Скарынаўскіх чытанняў (1986). Мн., 1989. С. 91.

[51] Миловидов А. И. Новые документы, относящиеся к биографии Франциска Скорины // *Известия Отделения русского языка и словесности*. 1918. Т. 22. Кн. 2. С. 221—226.

[52] Forstreuter K. *Preußen und Rußland im Mittelalter*. S. 222. Сам Фарстройтэр звяртаўся да тэмы паездкі Скарыны ў Кёнігсберг і пазней: Forstreuter K. *Preußen und Rußland von den Anfängen des Deutschen Ordens bis zu Peter dem Großen*. S. 216—217.

[53] Гэтыя памылкі Мілавідава, а таксама разыходжанні ў інтэрпрэтацыях іншых даследчыкаў (К. Фарстройтэра, М. Гембаровіча, Я. Ісаевіча) прааналізаваў Віктар Дарашкевіч (гл.: *Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў*. Мн., 1988. С. 36, 326), а таксама Георгі Галенчанка (гл.: Галенчанка Г. Я. *Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар*. С. 163).

[54] *Запісы Беларускага Інсытуту навукі і мастацтва*. 1953, № 2 (4). С. 108—113.

[55] *Elementa ad fontium editiones*. Vol. 52 / Ed. C. Lankorońska. Romae, 1981. № 399, 401, 406, 408.

[56] GSPK. OF 48. S. 528—531, 535—537.

[57] *Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў*. С. 95—106.

[58] *Францыск Скарына і яго час*: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1988. № 20—23. С. 570—571.

V. КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

А. І. Дзярновіч

«METRICIANA» — спецыялізаванае выданне, прысвечанае Метрыцы ВКЛ

Апошняе пяцігоддзе стала ў Беларусі перыядам актывізацыі прац па даследаванні і выданні Метрыкі ВКЛ. Апублікаваны кнігі Метрыкі 28 (2000), 43 (2003), 44 (2001), 523 — Попіс войска ВКЛ 1528 г. (2003). Таксама ў Беларусі заснавана новае выданне *«METRICIANA: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага»*. Гэтае выданне стала плёнам супрацоўніцтва альманаха «ATHENÆUM: Commentarii Historiæ et Culturæ» і Аддзела спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Ёсць некалькі матываций, каб распачаць новы праект пад назваю *«Metriciana»*. Матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага настолькі неабсяжныя, што вартыя асобнага выдання, дзе б распавядалася пра Метрыку і пра тое, што адбываецца вакол яе. Апроч таго, у рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы апошняя чвэрць XX ст. адзначана ажыўленнем цікавасці да Метрыкі ВКЛ і працамі над ёю. Гэта азначае, што існуюць інтэлектуальныя магчымасці для рэгулярнага выхаду такога перыёдыка.

Цяпер у Беларусі выходзіць ужо даволі шмат гістарычных выданняў, якія ў той ці іншай ступені прэтэндуюць на універсальнасць. Стваральнікі альманаха *«Metriciana»* сыходзяць з таго, што існуе патрэба ў спецыялізаваным выданні па Метрыцы — гэтага вартая сама Метрыка з яе гістарычнымі, моўнымі і культурнымі багаццямі. Але рэдакцыя спрабуе таксама стварыць і пэўны фокус погляду на Метрыку, шырэй заявіць пра яе ў нашым грамадстве, дзе ўсё ж недаацэнена гэтая з'ява цэнтральнаеўрапейскай цывілізацыі.

Стваральнікі альманаха адразу бачылі яго як міжнароднае выданне, якое заклікана абслугоўваць інтарэсы метрыкантаў і дзе могуць публікавацца аўтары з розных краін. Адпаведна фармулюецца і «моўная палітыка» выдання — матэрыялы могуць друкавацца на любой мове. Тут аўтар павінен зыходзіць з традыцыйнага культурнага кола Метрыкі ВКЛ і самастойна вызначыць мову для друку (апроч моў краінаў—спадчыннікаў культурнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і моў нашага рэгіёна

Цэнтральна-Усходняй Еўропы лагічным будзе ўжыванне асноўных моў Еўропы). У выніку у альманасе *«Metriciana»* тэксты (з улікам пашыраных рэзюме) ужо былі апублікаваны на беларускай, украінскай, расійскай, літоўскай, англійскай, польскай мовах.

Першы том альманаха выйшаў у свет у 2001 г. Сярод асноўных матэрыялаў гэтага тома варта назваць працу Алеся Грушы «Службовы склад і структура канцылярыі Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV — першай паловы XVI ст.», артыкул Уладзіміра Свяжынскага «Праблема ідэнтыфікацыі афіцыйнай мовы Вялікага Княства Літоўскага», публікацыю Валерыя Мянжынскага і Алега Дзярновіча «Шляхта і яе земельныя ўладанні ў Ашмянскім (Ошменским) павеце ў першай палове XVI ст. (паводле кн. 12—31 Метрыкі ВКЛ)», прапановы па стварэнні электроннага архіва Метрыкі ВКЛ (дзеля гэтага была ўведзена адмысловая рубрыка). Апроч таго, у першым томе апублікаваны матэрыялы самой Метрыкі, рэцэнзіі і бібліяграфічныя агляды.

Чарговы другі том альманаха з'явіўся ў 2003 г. Час, які прайшоў з моманту выхаду ў свет першага тома, стаў перыядам развіцця выдання. Трэба адзначыць, што навуковая грамадскасць у розных краінах вельмі прыхільна сустрэла з'яўленне новага навуковага перыёдыка. Асобныя тэксты (найперш, У. Свяжынскага) выклікалі палкую палеміку на старонках украінскіх і літоўскіх навуковых выданняў. Увага да альманаха і рэакцыя на яго не проста павялічыла інфармацыйнае поле гэтага праекта, але і дазволілі яму набыць новыя арганізацыйныя формы ды ўзбагаціць рубрыкацыю.

Спецыяльна для разгляду пытанняў гістарычнай геаграфіі і картаграфіі ўведзены раздзел «Geometricus» — паводле лацінскай назвы землямера, каморніка (у гэтым томе публікуюцца матэрыялы Міхаіла Спірыдонава паводле Попісу войска ВКЛ 1528 г.). З другога тома *«Metriciana»* распачала новы праект пад агульным тытулам «Галерэя метрыкантаў». Публікуецца тэкст літоўскай даследчыцы Ліны Анужыце «Канстанцінас Яблонскіс і Літоўская Метрыка». У перспектыве бачыцца стварэнне даведачнага выдання па ўсіх постацях, якія спрычыніліся да стварэння, даследавання і выдання Метрыкі ВКЛ, — ад старажытнасці да сучаснасці. Погляды сучаснай літоўскай гістарыяграфіі прадстаўляе Арутрас Дубоніс у артыкуле «Праблемы Літоўскай Метрыкі: погляд з Вільнюса». Пад рубрыкай «Публікацыя крыніцаў» змешчаны матэрыялы Алега Дзярновіча «Плач па Вялікім княстве (да гісторыі транслітэрацыі Метрыкі ВКЛ у 1777—1780-х гадах)» і Германа Брэгера «Выпадак ужывання ненарматыўнай лексікі ў Метрыцы ВКЛ (Дакумент урада

віленскага ваяводы за 1560 г.)». Дыскусія па пытаннях актавай дыпламатыкі прадстаўлена тэкстамі Ганны Харашкевіч «К изучению дипломатики Великого княжества Литовского и внутренней и внешней политики Сигизмунда II Августа в первые годы Ливонской войны («увяжчие листы» книги записей 44 Литовской Метрики)» і Алеся Грушы «Лісты» і «ўвяжчыя» кнігі Метрыкі Вялікага княства Літоўскага 44 (1559—1566)». Як заўжды палемічным з'яўляецца тэкст Уладзіміра Свяжынскага «Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага», які стаў у пэўным сэнсе адказам на ацэнкі ўкраінскага рэцэнзента. Ужо традыцыйна вялікую ўвагу альманах надае бібліяграфіі, сведчаннем чаго ёсць публікацыя матэрыялаў Валерыя Мянжынскага «Асноўныя публікацыі і даследчыя працы па Метрыцы ВКЛ у Беларусі за 1990—2001 гг.» і «Дакументы з Метрыкі ВКЛ у серыі кніг «Памяць» — гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі канца 80 — 90-х гг. XX ст.» Пад рубрыкай «Электронны архіў Метрыкі ВКЛ» змешчаны артыкул Алега Ліцкевіча «Метрыка Вялікага княства Літоўскага ў Інтэрнэце». *«Metriciana»* прадастаўляе таксама магчымасці «навуковага сервісу» — публікуюцца поўны спіс кніг Метрыкі ВКЛ, выдадзеных ў 1987—2003 гг., а таксама звесткі аб актуальных працах па падрыхтоўцы кніг Метрыкі ВКЛ да друку.

У пэўным сэнсе з другога тома змяніўся статус выдання. Сфармавана Міжнародная рэдакцыйная калегія, куды ўвайшлі вядомыя спецыялісты ў галіне метрыстыкі, даследчыкі, якія шмат зрабілі і робяць дзеля даследавання і публікацыі Метрыкі ВКЛ. Такім чынам, прадстаўлены ўсе краіны, дзе сёння вядуцца метрычныя працы. Можам казаць, што *«Metriciana»* стала міжнародным выданнем, цэнтральная сядзіба якога знаходзіцца ў Беларусі.

У. М. Свяжынскі

Radvanas Jonas. Radviliada. Parengė, įvadą, komentarus ir asmenų žodinėlį parašė, vertė iš lotinų į lietuvių kalbą Sigitas Narbutas. Bibliotheca Baltica. Vilnius, «Vaga», 1997 (Радванас Ёнас. Радзівіліяда. Падрыхтаваў, уводзіны, каментары і імянны слоўнічак напісаў, пераклаў з лацінскай на літоўскую мову Сігітас Нарбутас. Бібліятэка «Балтыка». Вільнюс, «Вага», 1997).

«Радзівіліяда» Яна Радвана — каштоўная крыніца па айчыннай гісторыі адной з самых трагічных і велічных эпох, калі ў чарговы раз на землях Бацькаўшчыны не на жыццё, а на смерць сутыкнуліся варварства і цывілізацыя, — эпохі Лівонскай вайны. Гэта разам з тым неацэнны

помнік нашай даўняй духоўнай культуры, сведчанне надзвычай высокага інтэлектуальнага і эстэтычнага патэнцыялу продкаў. Вось ужо амаль паўтысячагоддзя адзінай крыніцай зместу паэмы з'яўлялася яе прыжыццёвае віленскае выданне Яна Карцана 1592 г. Захавалася ўсяго сем асобнікаў гэтага выдання, з якіх адзін — у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу, пяць — у Польшчы (у Бібліятэцы Польскай акадэміі навук у Курніку, Нацыянальным музеі (Бібліятэцы Чартарыйскіх) у Кракаве, Бібліятэцы Асалінскіх у Вроцлаве) і толькі адзін — у былой сталіцы Вялікага княства Літоўскага Вільні, у Бібліятэцы АН Літвы. Нядзіўна таму, што выдадзенае ў 1993 г. даследаванне гераіка-эпічнай паэзіі Беларусі і Літвы канца XVI ст. С. В. Кавалёва ў апошні час было адзінай крыніцай звестак пра паэму і некаторых фактаў яе зместу для літаратуразнаўцаў і гісторыкаў[1]. І вось нарэшце пабачыла свет навуковае выданне паэмы, падрыхтаванае літоўскім літаратуразнаўцам Сігітасам Нарбутасам[2].

Першым кола эпічных паэтаў Беларусі і Літвы канца XVI ст., цесна звязаных з Радзівіламі біржайскай лініі (А. Рымша, Я. Радван, Ф. Градоўскі, Г. Пельгрымоўскі, М. Стрыйкоўскі, Я. Казаковіч), акрэсліў польскі даследчык А. Сайкоўскі, які, аднак, апекунамі гуртка лічыў Радзівілаў нясвіжскай, каталіцкай лініі[3], што ў прынцыпе немагчыма, бо ўсе вышэйазначаныя паэты былі пратэстантамі. Ад яго гэтая памылка перайшла ў працы беларускіх літаратуразнаўцаў[4]. Пра аўтара гэтага эпасу Яна Радвана звестак дагэтуль маем так мала, што меркаванні пра жыццё паэта абапіраюцца на дадзеныя самога яго твора. Як лічыць С. Нарбутас, моўныя асаблівасці літоўскіх слоў, згаданых у «Радзівіліядзе», сведчаць, што паэт або нарадзіўся дзе-небудзь ва Усходняй Аўкштайціі (магчыма ў Вільні), або доўга тут жыў. Тым не менш нельга адкінуць перадумовы, што паэт або нараджэннем, або літаратурнай і канфесійнай дзейнасцю быў звязаны з Коўнам. Такое меркаванне можа абапірацца на сляды кнігі Паўлюса Одэрборна[5] у «Радзівіліядзе» (с. іх). Напісаны па-латыні гераічны эпас выяўляе цудоўнае веданне класічнай рымскай літаратуры, старажытнагрэчаскай мовы. Да адкрыцця езуіцкай калегіі ў 1570 г. у Літве не было вышэйшай школы. Наўрад ці паэт вучыўся ў дзеючай у Вільні ў 1539—1542 гг. гімназіі Абраомаса Кульвеціса. Можна меркаваць, што Радван атрымаў адукацыю за мяжой, выехаўшы разам з якімнебудзь студэнтам з вышэйшых слаёў ва універсітэты Заходняй Еўропы. Некаторыя даследчыкі шукаюць месца паэту паміж праваднікамі Янам ці Рыгорам Хадкевічамі, аднак дагэтуль няма надзейных дадзеных, якія б пацвярджалі такія дапушчэнні (с. іх—х).

Як і іншыя пачынальнікі літаратуры ВКЛ: Аўгусцін Ратундус (да набілітацыі ў 1568 г.), Андрэй Волан (да пацвярджэння шляхецтва ў 1569 г.) ці Мацей Стрыйкоўскі, Радван хутчэй за ўсё не быў шляхціцам. Радван быў звязаны з евангеліцка-рэфармацыйным рухам у Літве. Пра гэта сведчаць звесткі ў кнігах Анджэя Вентерскага, таксама яго вершы, надрукаваныя ў «Абароне евангеліцкай пастылі» Гжэгажа з Зярноўца, скіраваны супраць віленскіх евангелікаў ананімны сатырычны твор «Тэалагічныя тэзы». У «Радзівіліядзе» таксама маюцца ацэнкі, натуральныя ў вуснах не каталіка, а евангеліка. Зусім няма дадзеных, якія б шырэй асвятлялі месца Радвана ў абшчыне евангелікаў ВКЛ (с. xii).

Творчасць аўтара, як піша ўкладальнік літоўскага гераічнага эпасу, дасюль яшчэ дастаткова не даследавана. З-за гэтага і тыя яго творы, якія раней патрапілі ў поле зроку гісторыкаў літаратуры, дазваляюць лічыць Радвана вельмі патрабавальным да сваіх твораў, пішучым няшмат. Цяпер мы ведаем чатырнаццаць яго вершаў, паэму, прысвечаную шлюбу Крыштафа Манвіда Дарагастайскага і Сафіі Хадкевіч, і «Радзівіліяду». Паводле С. Нарбутаса, «Радзівіліяда», якая апявае жыццё і паходы Мікалая Радзівіла Рудога, была выдадзена ў 1592 г. Гэты год выдання ўказваецца пачынаючы з пачатку XIX ст. у польскай гістарыяграфіі. У літоўскай і беларускай гістарыяграфіі і гісторыі літаратуры прытрымліваюцца думкі, што «Радзівіліяда» была выдадзена ў 1588 г. Гэтая дата, падтрыманая такім аўтарытэтам, як Эстрайхер, раскрывае няправільна зразуметую надрукаваную на тытульным лісце выдання хранаграму (I) I) IIXC. Такое абазначэнне года было характэрным для выданняў толькі гэтага перыяду — апошняй чвэрці XVI ст. — пачатку XVII ст. Напрыклад, у выдадзенай у 1588 г. у Базелі кнізе Рэйнгольда Гейдэнштэйна «De bello Moscouitico, quod Stephanus rex Poloniae, gessit commentariorum libri VI»[6] год выдання пазначаны хранаграмай (I) I) XXCVIII. Выдадзеная ў гэты самы год у Торуні педагагічная праца «Institutionis literatae, sive De discendi atque docendi ratione, tomus tertius»[7] мае хранаграму (I) I). XXCIIX... У выйшаўшай у Познані ў 1592 г кнізе Пятра Скаргі «Upominanie do ewangelików i do wszystkich społem nie katolików» год выдання пазначаны лацінскімі лічбамі M. D. XCII. Як відаць з прыведзеных прыкладаў, лацінскія лічбы, якія абазначаюць дзесяткі і адзінкі, у гэты перыяд бываюць запісаны і перад, і пасля літары C, якая абазначае сотню. Зрэдку восем пазначана IIX (як у вышэй памянёнай педагагічнай працы, звыклае пазначэнне — VIII). Усё ж з-за гэтага ні ў воднай выдадзенай у гэты год кнізе не ўдаецца знайсці восемдзесят восем, пазначаных IIXC. Перад гэтым правілам аўтары і выдаўцы аддаюць перавагу лічбе LXXXVIII або XXCVIII.

Ужо разгледжаны верш Радвана «Ad Gregorium Zarnouecium, authorem Apologiae»[8], апублікаваны ў «Абароне евангеліцкай пастылі» Гжэгажа з Зярноўца, таксама пазначаны хранаграмай (I) I) IXC. 3. Non Martij. На тытульным лісце «Абароны...» пазначаны год выдання 1591, і ў гэтай хранаграме ўказаны той самы.

Як бачна з тытульнага ліста кнігі Скаргі, год выдання 92-і бывае часам пазначаны XCII. У кнігах таго перыяду гэтая хранаграма — меўшы месца часцей звычай напісання года. На тытульнай старонцы «Радзівіліяды» Радвана маецца лічба IIXC — трохі радзейшая, аднак і яна пазначае той самы — 92-і — год: яна атрымліваецца, адняўшы ад сотні (C) васьмёрку, якая пазначана IIX. Пры гэтым падзеі, згаданыя ў тэксце «Радзівіліяды», адбыліся каля 1588 г. і пазней. З іх бадай самая красамоўная — згадка пра смерць сына Радзівіла Рудога Мікалая (Radiv. IV, 518—520 і ў падрадковай заўвазе). Радван піша аб гэтым, як аб няшчасці, ад якога паспеў прайсці нейкі час, і гэта было б зразумела, калі б мы сказалі, што «Радзівіліяда» закончана ў канцы 1591 г. ці ў пачатку 1592 г.: наваградскі ваявода Мікалай Радзівіл, сын Рудога, памёр 18 снежня 1589 г.; у пачатку іншага года яго пахавалі ў сямейным склепе ў Дубінках (с. xvii—xviii).

1592 г. — значная дата для культуры ВКЛ не толькі з-за «Радзівіліяды». Прыблізна ў той час памёр Мацей Стрыйкоўскі — аўтар, на творы якога Радван несумненна абапіраўся, ствараючы гераічны эпас. «Радзівіліяду» і працы Стрыйкоўскага па гісторыі Літвы звязвае шмат што. Важнейшая ў іх патрыятычная тэндэнцыя паказу Літвы. Справа ў тым што Радван і Стрыйкоўскі шырэй, чым іншыя аўтары, іх сучаснікі, апісалі Публія Лібона, або Палямона, і яго прыбыццё ў Літву, паказалі караля Міндоўга і Гядзіміна, апелі Вітаўта Вялікага, Радзівіла Рудога і большасць іншых палкаводцаў старажытнасці. Разумеючы значэнне асобы ў гісторыі, абодва пісьменнікі паказвалі тых міфічных і рэальна існаваўшых герояў, якія стварылі княства і вызначыліся, абараняючы і ўзмацняючы незалежнасць Літвы, г. зн. ВКЛ (с. xix—xxii).

Другой крыніцай «Радзівіліяды», на думку С. Нарбутаса, мог быць тагачасны біяграфічны нарыс «Жыццё вялікага князя маскоўскага Івана Васілевіча» Паўля Одэрборна. Жыццё Івана Васілевіча Одэрборн напісаў у Каўнасе, кіруючыся сваімі ўласнымі ўражаннямі, таксама расказамі іншых удзельнікаў Лівонскай вайны і пасольства ў Маскву[9]. Ураўвальная сіла зместу, аўтэнтычнасць апісваемых падзей, чыстая лацінская мова прыцягваюць увагу чытача ўжо з самых першых старонак кнігі. Аўтар паказвае не толькі скандальныя асобы бацькоў Івана IV, інтрыгі

маскоўскага княжацкага замка, трагічнае і жахлівае жыццё самога Івана IV. У гэтым аўтабіяграфічным нарысе знаходзім звесткі пра суседзяў Маскоўскага княства, пра складаную і цікавую гісторыю гэтай дзяржавы, рэлігію і прыроду, паўсядзённае казённае жыццё і звычаі маскавітаў. Нямала месца ў кнізе ўдзелена Лівонскай вайне, асабліва яе пачатку (спусташэнне Тартускага біскупства, захоп Полацка) і падзеям канца (бітве пры Цэсісе ў 1578 г, ваенным кампаніям Стэфана Баторыя 1579—1581 гг.). Аўтар паказвае вядомейшых палкаводцаў ВКЛ: Андрэя Сапегу, Юхана Бюрынга, Мікалая Радзівіла Рудога і Крыштафа Радзівіла Перуна, якія вызначыліся ў гэтай вайне паходамі і перамогамі.

Трэцяй крыніцай, якая стварыла аснову сюжэта «Радзівіліядыі», стала жыццё Мікалая Радзівіла Рудога. Асоба Радзівіла Рудога, жыццё і паходы — як быццам прыкметная веха, паводле якой чытач «Радзівіліядыі» з сівой антычнасці падарожнічае ў эпоху Лівонскай вайны, узбярэцца разам з Мусаем на святы Гелікон і спускаецца ў падземны край. Зразумела, не кожны факт біяграфіі князя на Біржах і Дубінках падыходзіў для гераічнага эпасу: напрыклад, у «Радзівіліядзе» ні словам не згаданыя шлюб сястры Мікалая Барбары з Жыгімонтам Аўгустам, намаганні Рудога каранаваць сястру польскай каралевай, маўчаннем абыдзены трагічныя дні Люблінскага сейма і меры біржанскага князя па абароне дзяржаўнасці ВКЛ пасля падпісання акта уніі. Абраны жанр прымусіў Радвана апець толькі тыя крокі вялікага гетмана, якімі ён на палях бітвы абараняў Літву (г. зн. ВКЛ. — *У. С.*) ад ворагаў (гэтага патрабаваў канон гераічнага эпасу).

Прыступаючы да разгляду ўплыву антычнай паэзіі на творчасць Радвана, С. Нарбутас піша, што са старажытным Рымам, яго гісторыяй, міфамі, літаратурай і выпешчанай лацінскай мовай Радвана і іншых літоўскіх пісьменнікаў другой паловы XVI ст. звязвае асаблівая сувязь. У Еўропе ў той час лацінская мова лічылася самай прыгожай, багатай на словы і гучнейшай з усіх, якімі культурныя людзі могуць выражаць думкі і пачуцці (с. xxxiv). Для напісання гераіка-эпічных твораў паэты Ф. Градоўскі, Я. Радван карысталіся лацінскай мовай таму, што гэта была традыцыйная мова эпасу з часоў антычнасці. Ф. Градоўскі быў несумненна добрым знаўцам антычнага гераічнага эпасу, уважлівым чытачом «Іліяды» Гамера і «Энеіды» Вергілія, наследаванне якім плённа паўплывала на працу над уласным эпічным творам. Традыцыі «Песні пра зубра» М. Гусоўскага, «Прускай вайны» Я. Вісліцкага — у перайманні «Энеіды» Вергілія. Па словах С. Нарбутаса, спадчына антычнай паэзіі ў «Радзівіліядзе» вялікая і разнастайная (с. xxxv). Значную частку

гэтай спадчыны складае творчасць Вергілія, што характэрна для ўсёй пераймаючай антычнасць паэзіі Еўропы XVI ст. У мове «Радзівіліяды» таксама пакінула сляды творчасць Цыцэрона, Энія, Ювеналія, Гарацыя, Катула, Клаўдзіяна, Лукана, Лукрэцыя, Макробія, Марцыяла, Невія, Авідыя, Пакувія. Персія, Плаўта, Праперцыя, Прудэнцыя, Сенекі, Сілія, Стацыя, Тыбула, Валерыя Флака і інш., а таксама Гамера, Гесіёда. Сувязь мовы «Радзівіліяды» з паэзіяй Старажытнага Рыма двайкая: Радван цытуе рымскіх аўтараў, ужывае іх эпітэты і іншыя стылёвыя ўпрыгажэнні, пры гэтым цытуе правільна і ў меру, таму настаўнікі Радвана нікалькі не пашкодзілі своеасаблівага гучання гэтага гераічнага эпасу. Значную частку спадчыны антычнай паэзіі ў Радвана складаюць парафразы, імітуемыя матывы і тэмы рымскіх і грэчаскіх аўтараў. Часам Радван імітуе Вергілія. Мяняюцца ў фразе адно ці два словы (с. xxxvi), іншыя парафразы адрозніваюцца ад імітуемых арыгіналаў у большай ступені, у некаторых вобразах паэмы Радвана пераймаецца антычная паэзія ў большых аб'ёмах (у р. 31—96 ч. 1) даецца велічная карціна Літвы, на якую паэта хутчэй за ўсё натхніла аляванне Італіі ў «Георгіках» Вергілія. Пераймаючы Вергілія, Радван дагаджаў літаратурнаму густу эпохі, імітацыя ў тыя часы была для ўсіх паэтаў абавязковым творчым метадам, імітацыя характэрна і для настаўніка Радвана Вергілія, які пераймаў старажытнагрэчаскіх паэтаў (на думку даследчыкаў, у сваёй «Энеідзе» ён пераймае «Ілліяду» Гамера). Яшчэ ў канцы 60-х гг. мінулага стагоддзя польскі вучоны Ю. Новак-Длужэўскі ацаніў мастацкія вартасці паэм Ф. Градоўскага, Г. Пельгрымоўскага, А. Рымшы, Я. Радвана[10]. Межы, пераступіўшы якія паэт барока лічыцца плагіятарам, наступныя: паэтычны свет твора, сюжэт і кампазіцыя, г. зн. найважнейшыя элементы паэтыкі. Ацэньваючы «Радзівіліяду» ў гэтых аспектах, параўноўваючы яго з прыкладамі, якія Радван найбольш пераймае, менавіта з «Энеідай» Вергілія, С. Нарбутас заўважае «шмат самастойных рыс нашага эпасу» (с. xxxviii). Па словах польскай даследчыцы Л. Шчарбіцкай-Сленк, «дамінуючым тыпам паэтычнай тэмы ў старапольскай гераічнай паэзіі (да яе даследчыца залічвае і паэтаў Беларусі і Літвы. — *У. С*) былі здарэнні нашых часоў»[11]. Увесь арсенал мастацкіх сродкаў паэт скіроўвае на паказ падзей Лівонскай вайны і выдатнай ролі ў іх яго куміра і апекуна Радзівіла Рудога. У канцы «Радзівіліяды» (IV, 215—327) паэт пералічвае заслугі вялікага гетмана ВКЛ перад Богам, айчынай і каралём, падкрэсліваючы, што Мікалай Радзівіл Руды жыве, ставячы дабрачыннасць вышэй за сваё паходжанне (IV, 223), прагнучы не выглядаць, а быць добрым чалавекам: верным слугою караля, адданым абаронцам

айчыны і добрым сем'янінам (IV, 257—260), выхоўваючы родных людзей, якія з цягам часу зрабілі яго голас важкім на сейме, а яго руку — цяжкай на полі бітвы (IV, 261—262 і далей).

Каб надаць больш саліднасці і аўтарытэтнасці свайму выданню, укладальнік абраў класічную сістэму пагінацыі, якая была пашырана ў XIX ст. У адпаведнасці з ёй прадмова пагінуецца рымскімі лічбамі, уласна тэкст кнігі — арабскімі. Нязручнасць яе як у грувасткасці, так і ў тым, што пераважная большасць сучасных чытачоў ужо не валодае рымскай сістэмай пазначэння лікаў, асобна ж пагінаваць тэкст паэмы няма патрэбы, бо цытаты з паэмы ў прадмове пашпартызуюцца нумарамі яе частак і радкоў. Стварае нязручнасць для чытача канцэнтрацыя спасылак у канцы прадмовы, бо з-за кожнай спасылкі трэба звяртацца ў яе канец, што запавольвае чытанне і перашкаджае засяродзіцца. Хаця зразумела, што спасылкі пад радкамі не займаюць больш месца, чым у канцы тэксту. У адпаведнасці з той жа класічнай сістэмай спасылак укладальнік дае поўную назву тэксту, на які спасылаецца, толькі першы раз, у далейшым замяняючы яе для кароткасці лацінскім скарачэннем op. cit., таму каб нагадаць назву, трэба кожны раз звяртацца да першай спасылкі, у выніку, захапіўшыся эканоміяй такім чынам месца, укладальнік так і не даў поўную назву працы С. Незнаноўскага (павінна быць у спасылцы 74).

Самая каштоўная частка кнігі — тэкст паэмы, факсіміле лацінскага арыгінала якой вяртае чытача ў сівую даўніну. Паралельна даецца зроблены самім укладальнікам вершаваны пераклад твора на літоўскую мову, у адпаведнасці з патрабаваннем навуковага выдання з нумарацыяй радкоў. Зразумела, з думкай перакладчыка, што ў выніку «літоўскі гераічны эпас праз чатырыста год загаварыў на роднай мове паэта» (с. xliv), мы безагаворачна пагадзіцца не можам (гл. аб гэтым ніжэй).

Вынік тытанічнай працы ўкладальніка — каментарыі. Ім была праведзена дэталёвая зверка тэксту паэмы з корпусам усіх вызначаных яе крыніц — творамі антычных паэтаў і філосафаў Гамера, Вергілія, Цыцэрона, айчынных паэтаў пачатку XVI ст. М. Гусоўскага і Я. Вісліцкага, працамі замежных і айчынных гісторыкаў і мысліцеляў П. Одэрборна, Т. Брэдэнбаха, А. Каяловіча-Віюка, М. Стрыйкоўскага, Р. Гейдэнштэйна, С. Гербершгэйна, М. Мяхоўскага, А. Волана і інш., поўны спіс якіх змешчаны ў пачатку каментарыяў. У выніку крыніцавая база паэмы і эрудыцыя яе аўтара прадстаўлены поўна і наглядна.

Апошні раздзел выдання — «Слоўнічак імён» («Asmenų žodinėlis»). Як указана ва ўступе, у яго «ўключаны ўсе асобы, якія згадваюцца ў «Радзівіліядзе», як легендарныя, так і рэальныя, звязаныя з гісторыяй

Літвы» (с. 339). Убаку пакінуты героі старажытнай Грэцыі і Рыма, каралі, карыфеі дзяржаўнай дзейнасці, навукі і мастацтва, паколькі звесткі пра іх ёсць у лёгкадаступных даведніках і энцыклапедыях. Пасля кожнай літоўскай версіі імя даецца лацінская, якую прапаноўвае Радван. Цікава, што лацінскія версіі гэтых імён утвораны, як сведчыць параўнанне, на аснове не літоўскіх, а старабеларускіх прататыпаў. Прычым узятых іншы раз не з пісьмовай, а з жывой мовы (аб чым сведчыць фрыкатыўнае h на месцы выбухнога g, цеканне), напрыклад: Algirdas, лац. Olgerdus, старабел. Ольгерд; Astikas, лац. Hosticus, старабел. Остик; Chodkevičius (e=я) Grigas, лац. Gregorius Chodchevicius, старабел. Ходкевич; Davaina, лац. Dovoyna, старабел. Довойна; Glebavičius Jonas, лац. Ioannes Hlebovicius, старабел. Ян Глебович; Golubickis Grigas, лац. Holibicius, старабел. Голубицкий; Lešekas Juodasis, лац. Lesco, старабел. Лешко; Mindaugas, лац. Mendogus або Mindocus, старабел. Мендокг; Narimantas, лац. Narimuntius, старабел. Нарымунт; Olga, лац. Holha, старабел. Ольга; Radvila, лац. Radiuilius, старабел. Радивил; Sapiega, лац. Sapieha, старабел. Canera; Skirmantas, лац. Scirmontus, Scirmuntus, старабел. Скирмунт; Timofejus, лац. Cimophaea, бел. Цімафей; Tiškevičius, лац. Tischevicius, старабел. Тышкевич; Traidenis, лац. Troydenes, старабел. Тройдень. Гэтыя факты сведчаць, што сцвярджэнне ўкладальніка выдання аб літоўскай як роднай мове Я. Радвана небясспрэчнае. Хаця аўтар і даводзіць, што моўныя асаблівасці літоўскіх слоў, згаданых у «Радзівіліядзе», сведчаць, што паэт або нарадзіўся дзе-небудзь ва Усходняй Аўкштайціі (магчыма, у Вільні), або доўга тут жыў (с. іх).

Канцэпцыя выдання вытрымана ў папулярным зараз у Літве дзяржаўніцкім духу. У дачыненні да паэта, яго твора, падзей, у ім апісаных, у прадмове ўжываюцца выключна тэрміны літоўскі, літоўцы (Lietuvos, lietuviai). Стварэецца ўражанне, што ні Радван, ні яго паэма ніякай сувязі з другой складальнай этнічнай часткай агульнай балцка-славянскай дзяржавы ВКЛ не маюць. Гэта дэманструе ўжо загаловак прадмовы «Пясняр велічы Літвы». Толькі ў адным выпадку ў прадмове, якая займае амаль 44 старонкі, ужыты тапонім Вялікае княства Літоўскае, які, аднак, з-за яго скарочанасці якраз на азначэнні «Літоўскае» таксама не супярэчыць названай канцэпцыі. Вядома, дзяржаўніцкая канцэпцыя сучаснай літоўскай гістарычнай навукі грунтуецца на тым, што заснавальнікамі ВКЛ былі літоўскія князі і само княства называлася Літоўскім. Гэта дае як быццам падставу лічыць усю яго тэрыторыю Літвой, што часткова правільна, калі мець на ўвазе Літву летапісную, гістарычную вобласць, Літву ВКЛ, з прычыны чаго і ў адносінах да беларусаў ужы-

ваўся этнонім «ліцвіны» (польск. litwin «літовец»), сваю ролю адыграла і позняе ўзнікненне ў беларусаў іх сучаснага этноніма. Каб усё ж дыферэнцыраваць ліцвінаў-балтаў ад ліцвінаў-славян ва ўмовах, калі этнічныя літоўцы ў XIX ст. пачалі барацьбу за сваё нацыянальнае самавызначэнне, у расійскай афіцыйнай гістарыяграфіі замест «беларускі» ўжывалася азначэнне «литовско-русский» (напраклад, у загалоўку працы М. К. Любаўскага «Литовско-русский повет и его сеймик»). Як вядома, прозвішча Радван не этымалагізуецца паводле літоўскай мовы, чаго нельга сказаць пра Радзівілаў (літ. radvilà «падкідыш»), у той жа час Радзівілаў можна лічыць этнічна літоўскім родам ужо толькі па паходжанні, улічваючы іх рассяленне, геаграфію ўладанняў, асіміляцыю, палітычную, ваенную і культурную ролю ў гісторыі ўсіх этнасаў ВКЛ і нават Рэчы Паспалітай. Таму беларусы маюць такое ж права на Радзівілаў і іх спадчыну, як і літоўцы. Тое самае датычыць і Радвана. У школьных падручніках па літоўскай літаратуры вывучаецца, напрыклад, творчасць Адама Міцкевіча (Adomo Mickevičiaus kūryba), відаць, на той падставе, што сваю паэму «Дзяды» ён пачынае словамі «O Litwo, ojczyzna moja», маючы на ўвазе, зразумела, не этнічную Літву. Аднак ні Радван, ні Міцкевіч не пісалі, як вядома, па-літоўску, як не пісалі па-беларуску Мікола Гусоўскі і Ян Вісліцкі. Лацінская мова ў часы Вялікага княства Літоўскага — гэта не ёсць літоўская мова, як і літоўская мова не ёсць лацінская мова насуперак вядомай легендзе аб рымскім паходжанні літоўскай арыстакратыі[12]. Таму цалкам літуанізаваць Радвана і яго творчасць як быццам няма важкіх падстаў. Натуральна, літоўцы ў духу часу не абавязаны дзяліць Яна Радвана, як і іншых дзеячаў і культурныя каштоўнасці эпохі ВКЛ з беларусамі і ўкраінцамі, паколькі гэта не працуе на дзяржаўніцкую канцэпцыю. Аднак чаму ж тады беларусы гэтыя каштоўнасці з літоўцамі дзеляць? Напрыклад, аўтар першай манаграфіі, прысвечанай творчасці Ф. Градоўскага, А. Рымшы і Я. Радвана С. В. Кавалёў называе іх паэзію не беларускай па прыкладу С. Нарбутаса, а паэзіяй Беларусі і Літвы[13]. Таксама аўтар артыкула пра Я. Радвана ў т. 6. Энцыклапедыі гісторыі Беларусі Н. Скеп'ян называе яго «паэтам-лаціністам, адным з заснавальнікаў жанру гераіка-эпічнай паэзіі ВКЛ»[14]. Беларускі літаратуразнавец І. В. Саверчанка ў сваёй манаграфіі, прысвечанай старажытнай паэзіі Беларусі, разглядае ў асноўным творчасць паэтаў, якія пісалі па-беларуску[15]. І пры гэтым мы, беларусы, не лічым сваю культуру ў нечым абдзеленай. Так, Ф. Градоўскі, Я. Радван лічылі сябе ліцвінамі, аднак гэта, як вядома, не толькі этнонім, але і палітонім. Відаць, усведамляючы этнічную неаднолькавасць сваіх суайчыннікаў, гэтыя паэты аб-

ралі ў якасці мовы сваёй творчасці лацінскую, даступную ўсім адукаваным жыхарам дзяржавы, незалежна ад этнічнай прыналежнасці. Такім чынам, яны пісалі і для літоўцаў, і для беларусаў, і для ўкраінцаў, значыць, іх творчасць у аднолькавай ступені належыць усім народам — спадкаемцам ВКЛ. Лічыць Я. Радвана выключна літоўскім паэтам — азначае замоўчваць той факт, што яго паэма прысвечана ў асноўным падзеям, якія мелі месца на тэрыторыі цяперашняй Беларусі — бітвам на р. Уле, пад Полацкам, Оршай, ролі ў іх Радзівіла Рудога і заснавальніка Брэсцкай і Нясвіжскай друкарань Радзівіла Чорнага.

Называць літоўцамі (lietuviais) дзеючых асоб твораў Я. Радвана як быццам гістарычна адэкватна: усе жыхары Вялікага княства Літоўскага (якраз па першым з яго палітычных азначэнняў) называлі сябе ліцвінамі (у тым ліку і самі паэты Беларусі і Літвы XVI ст.), аднак частка ліцвінаў пазней стала называць сябе беларусамі. Таму каб было зразумела сучаснаму чытачу (тым больш, калі ён не выхадзец з былой тэрыторыі ВКЛ і не арыентуецца ў этнічным ландшафце гэтай дзяржавы), трэба паняцці «жыхары ВКЛ — выхадцы з тэрыторыі этнічнай Беларусі» і «жыхары ВКЛ — выхадцы з тэрыторыі этнічнай Літвы» дыферэнцыраваць. Справа ў тым, што літоўская гістарычная літаратура мае чытачоў па абодва бакі літоўска-беларускай мяжы, і недыферэнцыраванасць палітонімаў у гэтай літаратуры кідаецца беларусам у вочы. Зараз, калі частка аб'ядноўваемых у мінулым пад палітонімам «Літва» жыхароў ВКЛ мае іншую назву, тэрміны «Lietuva, lietuviai» ўжо не могуць успрымацца беларусамі як палітонім, бо дзяржавы «Літва» ў яе ранейшым разуменні (ВКЛ) не існуе, таму гэтыя тэрміны непазбежна асацыруюцца з цяперашняй дзяржавай з такой назвай і яе жыхарамі. Ужыванне тэрмінаў «Lietuva», «lietuviai» ў адносінах да рэалій славянскай часткі ВКЛ без агаворак дае падставу для папрокаў у аднаасобнай прэтэнзіі Літвы на спадчыну ВКЛ, відавочнай камфортнасці выкарыстання гэтых тэрмінаў для літоўскай гістарычнай навукі.

Тэндэнцыі да аб'яднання літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў у адзін народ Вялікага княства Літоўскага (ліцвінаў) — «літоўская» («ліцвінская») этнічная і палітычная самасвядомасць беларусаў, салідарнасць беларускай і літоўскай шляхты ў адстойванні сваіх правоў, славянізацыя літоўцаў (пачынаючы з заснавальнікаў княства — вялікіх князёў літоўскіх) у балта-славянскай дзяржаве са шматкратнай перавагай славянскага насельніцтва. Патрыёты ВКЛ, у тым ліку і тагачасныя паэты Беларусі і Літвы, настойліва называлі сябе ліцвінамі насуперак цэнтралісцкай тэндэнцыі польскіх ідэолагаў, якія прыпрымліваліся традыі-

цыйных азначэнняў «сарматы» (уся шляхта Рэчы Паспалітай), Сарматыя (уся Рэч Паспалітая)[16]. Называць жа зараз ВКЛ Літвой, Літоўскай дзяржавай азначае ігнараваць факт вышэйзгаданай перавагі славянскага насельніцтва княства над балцкім і падводзіць такім чынам базу пад выснову, што беларусы былі нацыянальнай меншасцю. З літуанізацыі ВКЛ мы, беларусы, можам мець таксама свае дывідэнды: калі ВКЛ — Літва, а ўсе мы — ліцвіны, значыць, як ліцвіны з Каўнаса, Паневяжыса, Клайпеды, Шаўляя могуць лічыць Я. Радвана і А. Міцкевіча сваімі, так і мы, ліцвіны з Менска, Барысава, Віцебска, Магілёва, можам лічыць сваімі М. Мажвідаса, М. Даўкшу. Такія вось атрымліваюцца сур'ёзныя вынікі з несур'ёзнага палітыканства.

---

[1] Кавалёў С. В. Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. Мн., 1993.

[2] Radvanas Jonas. Radviliada. Parengė, įvadą, komentarus ir asmenų žodinėlį parašė, vertė iš lotinų į lietuvių kalbą Sigitas Narbutas. Bibliotheca Baltica. Vilnius, «Vaga», 1997.

[3] Sajkowski A. Od Sierotki do Rybeńki: W kręgu radziwiłłowskiego mecenatu. Poynań, 1965. S. 5—24.

[4] История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 21; Саверчанка І. В. Старажытная паэзія Беларусі: XVI — першая палова XVII ст. Мн., 1992. С. 40.

[5] Жыццё гэтага пісьменніка і пастара апісана, абапіраючыся на: Narzyński J. Oderborn Paweł // Polski Słownik Biograficzny. T. 23. Wrocław[i in.], 1979. S. 533—535. (Нарадзіўся каля 1555 г. у Прусіі, вучыўся ў Растокскім універсітэце, у 1578 г. лютэранскі прапаведнік у Вільнюсе, магчыма, прымаў удзел у Літоўскім рэфармацкім сінодзе 20 чэрвеня 1578 г. (якім апекаваўся Радзівіл Руды), пазней вайсковы капелан, у 1579 г. удзельнік вайсковай кампаніі Стэфана Баторыя, калі кароль адваяваў Полацк, каля 1579—1580 гг. лютэранскі пастар у Каўнасе, у 1587 г. першы пастар рыжскай царквы св. Яна, у 1593 г. у замку куршскага князя Фрыдрыха ў Елгаве, у 1597 г. нямецкі прапаведнік елгаўскай царквы св. Тройцы, памёр у Елгаве 1604 г.)... Жыццё Івана Васілевіча Одэрборн напісаў у Каўнасе, кіруючыся сваімі ўласнымі ўражаннямі, таксама расказамі іншых удзельнікаў Лівонскай вайны і пасольства ў Маскву.

[6] Гейдэнштэйн Рэйнгольд. (Нататак) аб Маскоўскай вайне, якія Стэфан, кароль Польшчы, забяспечыў каментарыямі, кніга VI.

[7] Выклад правіла, або Пра разумную вучобу і навучанне, том чацвёрты.

[8] Да Гжэгажа з Зярноўца, аўтара «Апалогіі».

[9] Пра гэта сведчыць прадмова да кнігі, датаваная 1 снежня 1584 г., і вышэй цытаваны Януш Нажыньскі ў згаданай біяграфіі Одэрборна.

[10] Nowak-Dłużewski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce: Perwszi krolowie elekcyjni. Warszawa, 1969. S. 134—152.

[11] Szczerbicka-Ślęk L. W kręgu Klio i Kalliope: Staropolska epika historyczna // Studia staropolskie. 1973. T. 36. S. 61.

[12] Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985. С. 130.

[13] Кавалёў С. В. Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. Мн., 1993.

[14] Скеп'ян Настасся. Радван Ян // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 1. Мн., 2001. С. 51.

[15] Саверчанка І. В. Старажытная паэзія Беларусі: XVI — першая палова XVII ст.

[16] Cynarski S. Sarmatyzm — ideologia i styl życia // Polska XVII wieku. Warszawa, 1977. S. 247—271; Ulewicz T. Sarmacja: Studium z problematyki słowiańskiej XVI i XVII w. Kraków, 1950.

У. В. Фядосаў

Да пытання аб практычным значэнні сацыяльных функцый гістарычнай навукі

Шырокавядома сувязь архіваў і гістарычнай навукі, якая праяўляецца ў забеспячэнні архіўнымі дакументамі даследчыкаў і ў выданні зборнікаў архіўных дакументаў і матэрыялаў, што ствараюць археаграфічны фонд гістарычнай навукі. Паколькі тэма паведамлення — супрацоўніцтва архіўнай установы Рэспублікі Беларусь (БелНДІДАС) і гістфака БДУ, якое спецыфічна адлюстроўвае сувязь архіваў з гістарычнай навукай, спынімся на аналізе некаторых распрацовак і дысертацый супрацоўнікаў БДУ, паступаючых у БелНДІДАС для навуковай экспертызы, і паспрабуем развіць тэму шырэй — у аспекце практычнай значнасці тэарэтычных даследаванняў гісторыкаў і спецыялістаў сумежных з гістарычнымі галін.

Прагрэс навукі ў XX ст. прывёў да таго, што хуткі рост аб'ёму ведаў, якія накопліваліся прыродазнаўчымі і тэхнічнымі навукамі, развіццё тэхналагічных магчымасцей чалавецтва адначасова суправаджаліся зніжэннем ролі сацыяльна-гуманітарных ведаў у грамадскіх працэсах, ведаў, якія фарміруюць нормы паводзін, каштоўнасці індывідуума, яго сацыяльную сутнасць, а таксама светапоглядныя і маральна-вартасныя ўстаноўкі соцыуму ў цэлым. У сувязі з гэтым пытанне аб павышэнні ролі сацыяльна-гуманітарных навук у вырашэнні агульначалавечых праблем застаецца вельмі актуальным. Сёння некаторымі вучонымі нават выказваецца думка, што ў XXI ст. сацыяльна-гуманітарныя навукі адыграюць вызначальную ролю ў развіцці навук і грамадства.

Рэалізацыя гуманітарызацыйнага працэсу ў сферы навукі і адукацыі ў пачатку XXI ст. прадугледжвае, на нашу думку, цесную інтэграцыю прыродазнаўчых і тэхнічных навук з сацыяльна-гуманітарнымі не толькі ў плане запазычання метадаў і інструментарыю, але і ў накірунку дасягнення сінтэзу ўсіх наяўных навуковых ведаў, і як вынік — вырашэнне ўзнікаючых сацыяльна-глабалізацыйных праблем. Беларускія вучоныя адзначаюць, што сёння «... без узмацнення ўзаемадзеяння прадстаўнікоў прыродазнаўчай, тэхнічнай і гуманітарнай думкі немагчыма вырашэнне ... любой комплекснай ... праблемы, якая адносіцца да разраду глабальных цывілізацыйных праблем»[1].

На жаль, такой інтэграцыі, у дачыненні да межаў айчыннай навукі, не садзейнічаюць «тэхнакратызм» мыслення найбольш актыўнай часткі грамадства, пэўныя абставіны эканамічнага характару, сучасны стан метадалагічнай перабудовы сацыяльна-гуманітарных даследаванняў, які дапушчальна ахарактарызаваць як неўпарадкаванасць, а таксама і адсутнасць у ВНУ краіны фундаментальных навучальных курсаў па междысцыплінарных галінах ведаў. Ды і ў рамках саміх асобных сацыяльна-гуманітарных навук такая інтэграцыя на сённяшні дзень застаецца праблематычнай, а ўсведамленне яе актуальнасці непаспелым, што пацвердзіла і міжнародная навуковая канферэнцыя «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання», якая адбылася 1—2 лютага 2001 г. на гістарычным факультэце Белдзяржуніверсітэта[2]. Нягледзячы на тое што ў дакладах і паведамленнях яе ўдзельнікаў — гісторыкаў, філосафаў, сацыёлагаў, псіхолагаў, філолагаў і вучоных іншых спецыяльнасцей — абмяркоўваліся праблемы гістарычнага пазнання, гаварыць пра ўсведамленне ўдзельнікамі канферэнцыі значэння вышэйпамянёнай інтэграцыі, пра значны зрух у накірунку стварэння сінтэтычных ведаў (гісторыкамі і грамадазнаўцамі разам) не даводзіцца. У прыватнасці, на канферэнцыі ішла гаворка пра неабходнасць метадалагічнай апоры гісторыкаў на глыбокія філасофскія абгрунтаванні, а філосафаў на вывучэнне праблем гістарычнага пазнання. Акрамя адсутнасці важкіх распрацовак у вышэйпамянёным накірунку, неабходна канстатаваць і факт недастатковага практычнага ўзаемадзеяння гісторыкаў з эканамістамі, этнографамі, этнолагамі, сацыёлагамі, псіхолагамі, дэмографамі, прадстаўнікамі іншых сацыяльна-гуманітарных навук.

Але было б няправільным сцвярджаць, што айчынныя вучоныя, асабліва ў апошнія гады, не ўсвядомілі важнасць інтэграцыі гісторыі з іншымі навукамі. Так, напрыклад, працы вышэйназванай канферэнцыі папярэднічала выданне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце кнігі У. Н. Сідарцова «Методология исторического исследования (механизм творчества историка)»[3]. Сярод акалічнасцей, што абумовілі яе з'яўленне (адносна невысокі тэарэтыка-метадалагічны ўзровень дысертацыйных прац па гістарычных спецыяльнасцях, у якіх факталагічны аспект даследавання дамінуе над аналітычным, затуханне тэндэнцыі да аб'яднання гісторыкаў і архівазнаўцаў у апошні час), аўтар называе і актуальнасць узмацнення междысцыплінарных сувязяў у гістарычнай навуцы. Гэтыя ж акалічнасці паслужылі падставай для правядзення ў РІВШ БДУ двухтыднёвых курсаў «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага

пазнання: навуковы пошук і інавацыйныя тэхналогіі» ў студзені—лютым 2002 г.

Адзначаючы бясспрэчную навуковую і навучальную вартасць вышэйназванай кнігі, хацелася б завастрыць увагу на адным накірунку, які выклікае, на нашу думку, неабходнасць дапаўнення. Гаворка ідзе пра эпістэмалагічны і метадалагічны аналіз практычных аспектаў гістарычнага даследавання. Тым больш, што ў сучасных працах па метадалогіі гістарычнага даследавання асвятленню і распрацоўцы практычных праблем даследаванняў адводзіцца, і зусім апраўдана, ледзь не асноўнае месца. Зазірнём хаця б у матэрыялы нагаданай вышэй канферэнцыі.

З пункту гледжання філасофскага асэнсавання навуковага пазнання (у тым ліку і гістарычнага) яго неад'емнай рысай з'яўляецца прагнастычнасць — накіраванасць на прадказанне будучых падзей, стану і ўласцівасцей аб'ектаў, а нярэдка і існавання новых аб'ектаў. Аднясём яе да атрыбутыўнай характарыстыкі навуковага пазнання. Заўважым, што прадказанне ў навуцы з'яўляецца не толькі каналам яе сувязі з прадметна-практычнай і іншымі сферамі чалавечай дзейнасці, але і спосабам ацэнкі дасягнутага ўзроўню развіцця ведаў. Важнасць канчатковых вынікаў даследаванняў, значнасць выстаўленых ідэй і гіпотэз у вялікай ступені апасродкавана і абумоўлена прагнастычнай функцыяй навуковага пазнання. У выпадку ненакіраванасці на прадказанне ў навуковым пазнанні ўзнікае небяспека схілення да абстрактных канструкцый.

Аўтар прытрымліваецца пункту гледжання, згодна з якім гістарычнае даследаванне не адрозніваецца прынцыпова ад даследаванняў у іншых сферах навуковага пазнання, мяркуючы, што і для гістарычнай навукі ўласціва прагнастычная функцыя, калі, натуральна, разумець яе (гістарычную навуку) шырока — як полідысцыплінарную галіну даследаванняў, не толькі канкрэтна-гістарычных, але і сумежных — у галіне эканаметрычнай эканамічнай гісторыі, гістарычнай дэмаграфіі, этнапсіхалогіі і г. д.

Як справядліва адзначае вядомы брытанскі вучоны Джон Тош, гісторыкі, якія адхіляюць сувязь з сучаснасцю пад выглядам аб'ектыўных ведаў, не проста ганяюцца за хімерай, яны яшчэ ўхіляюцца і ад адказнасці за справу ў самым шырокім сэнсе. Грамадства чакае ад вучонага (у дадзеным выпадку — гісторыка) такой інтэрпрэтацыі мінулага, якая звязвала б яго з сучаснасцю і з'явілася б асновай для выпрацоўкі рашэнняў адносна будучыні. Толькі гісторыкі валодаюць неабходнай кваліфікацыяй, каб даць грамадству неабходную гістарычную перспектыву і зберагчы яго ад шкоднага ўздзеяння гістарычных міфаў[4]. Разам з тым

беларускія даследчыкі гісторыі канстатуюць, што «... гістарычная навука не аналізуе грамадства мінулых часоў з пункту гледжання патрэбаў сучаснага грамадства ... у дастатковай меры»[5].

І хаця прагнастычная функцыя гістарычнай навукі абмежавана накіраванасцю на мінулае, тым не менш і гісторыкі могуць выдаваць прагноз развіцця (абрысоўку тэндэнцый) грамадскіх з'яў у пэўнай краіне на аснове аналізу тэндэнцый развіцця гэтых з'яў у мінулым. Прадбачанне гісторыка абапіраецца на заканамернасці, якія ўстанаўліваюцца ў сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах. Сацыяльна-гуманітарныя даследаванні павінны ўключаць, нярэдка для дасягнення больш эфектыўных высноў, гістарычную тэматыку. У пэўных выпадках грані паміж гістарычным і грамадазнаўчым даследаваннем размываюцца. Такую акалічнасць падкрэсліваюць і сучасныя заходнія гісторыкі. «Некаторыя буйныя сацыёлагі ... пісалі тыпова гістарычныя працы, а большасць спецыяльных прац у галіне грамадскіх навук змяшчае пэўны матэрыял гістарычнага характару»[6]. І хаця гісторыкі могуць выдаваць прагноз, але як правіла, практычныя высновы гістарычнага даследавання тады носяць характар не прагнозу, а рэкамендацый. У якасці даследавання, даведзенага да канкрэтных рэкамендацый, якія могуць быць ужыты пры распрацоўцы нарматыўных актаў, прывядзём дысертацыйную працу А. С. Саковіча «Фермерскія гаспадаркі Беларусі (1990—1995)», якая абаронена ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ў 1998 г. Зробленыя ў ёй рэкамендацыі зыходзяць з вывучэння сацыяльна-эканамічных тэндэнцый станаўлення фермерства ў РБ, а таксама і са знаёмства з асновамі арганізацыйна-эканамічнага ўпарадкавання сялянскіх гаспадарак на беларускіх землях.

Пэўная частка заходніх гісторыкаў лічыць, што будучыня грамадства непрадказальная[7]. З гэтага вынікае, што прагнозы гістарычных з'яў марныя. Мы ж лічым, што такія прагнозы карысныя; пры адваротным меркаванні мы абмяжоўваем практычнае значэнне пазнавальнай функцыі гістарычнай навукі. Прадбачанне тэндэнцый развіцця пэўных грамадстваў у пэўнай галіне грамадскай дзейнасці — задача, якая дасягаецца намаганнямі ўсіх сацыяльна-гуманітарных навук у іх цеснай інтэграцыі.

Узмацненне інтэграцыйных і міждысцыплінарных працэсаў у сферы навукі мае на ўвазе пастаяннае і больш цеснае, чым раней, супрацоўніцтва гісторыкаў з прадстаўнікамі сумежных сацыяльна-гуманітарных (у пэўнай меры і прыродазнаўчых) навук. Праблеме міждысцыплінарных сувязей, вырашэнню пытання аб тым, што можа даць гісторыя сумежным з ёю грамадскім навукам, што яны ў свою чаргу даюць гісто-

рыі, адводзіцца сёння значнае месца ў даследаваннях вучоных розных краін. Як адзначае цяперашні кіраўнік французскай школы «Аналаў» Ф. Брадэль, вучоныя-грамадазнаўцы павінны адкласці часова свае спрэчкі адносна межаў, якія аддзяляюць адну навуку ад другой, адносна таго, чым з'яўляецца або не з'яўляецца грамадская навука, што ўваходзіць і што не ўваходзіць у паняцце структуры навукі. Лепш шукаць тэарэтычныя арыенціры, што паказваюць шлях да сумесных даследаванняў і праблемаў, якія маглі зблізіць іх[8]. У гэтай сувязі трэба падкрэсліць спецыфіку гістарычнай навукі як самай сінтэтычнай навукі (разглядаючы сучасную стадыю яе развіцця), з шырокім выкарыстаннем у даследаваннях, што праводзяцца ў яе рамках, метадаў і паняційнага апарату іншых навук. Сёння неабходна адмовіцца ад стэрэатыпаў у разуменні гістарычнай навукі, такіх, што: гісторыя — мононавука, гісторыя — не навука, гісторыя — апісальная навука, гісторыя — найменш дыферэнцыраваная навука, у рамках гісторыі праводзяцца толькі канкрэтна-гістарычныя даследаванні.

У якасці прыкладу сінтэтычных ведаў, для атрымання якіх праведзена даследаванне ў шырокай сацыяльна-гуманітарнай галіне, прывядзём тэорыю сусветна-гістарычнага працэсу, а канкрэтней — варыянт яе, прапанаваны Л. Я. Грыніным[9]. Састаўная частка любой тэорыі — законы. І як сёння лічыць большасць гісторыкаў, і зусім правільна, вынікам гістарычнага даследавання не могуць быць законы. Але паміж гэтымі двума выказваннямі нямя супярэчнасці. Тэорыя сусветна-гістарычнага працэсу — сінтэтычныя веды, гістарычныя факты — толькі аснова для яе пабудовы.

Магчымасці для прагнастычных высноў у гістарычных даследаваннях павышаюцца сёння, калі ў іх гістарычных даследаваннях пачаў укараняцца паняційны апарат сінергетыкі. У якасці прыкладу гістарычнага даследавання, у якім шырока выкарыстаны такі аппарат і дзе дадзены практычныя рэкамендацыі, прывядзём дысертацыю супрацоўніка гістфака БДУ С. А. Кізімы «Сістэмны падыход у гістарычным даследаванні: сутнасць, методыка, рэалізацыя (на прыкладзе вывучэння рэформаў і этнічных працэсаў)», якая была абаронена ў БелНДІДАС у 2000 г. Нягледзячы на асобныя няўдалыя фармулёўкі, устаноўленыя ў дысертацыі заканамернасці ўзнікнення ўмоў праяўлення насілля ў грамадстве маюць практычную значнасць. Яны прымянімы для аналізу канкрэтных этнічных працэсаў і сацыяльных рэформаў. Гэтая дысертацыя з'явілася адной з першых спроб у Рэспубліцы Беларусь выкарыстання паняційнага апарату сінергетыкі для тлумачэння гістарычных з'яў.

Выкананне гістарычнай навукай сваёй сацыяльнай ролі патрабуе ад яе пастаўнікоў, каб яны клапаціліся аб задачы зрабіць вынікі сваёй працы і практычныя высновы, што зыходзяць з яе, даступнымі максімальна шырокаму колу навуковай грамадскасці. Гістарычныя даследаванні, якую ролю не адыгрывала б для гісторыка ацэнка яго працы вузкім колам вучоных-спецыялістаў, павінны быць даведзены да шырокай аўдыторыі, да ўсіх тых, хто імкнецца атрымаць інфармацыйную аснову для разважанняў пра сучаснасць. Але не заўсёды гэта атрымліваецца. Абароненыя ў БелНДІДАС кандыдацкія дысертацыі супрацоўнікаў БДУ гістфака В. М. Шутавай «Амерыканская псіхагісторыя (1960—1990-я гг.)», Д. С. Самахвалава «Даследаванне групавых працэсаў у псіхагісторыі»[10] маюць практычнае значэнне для ўсведамлення праблемы асобы і яе матывацыйнай дзейнасці ў гісторыі. Але пазнаёміцца з практычнымі вынікамі гэтых прац шырокай навуковай грамадскасці не атрымліваецца, і ў тым ліку, з-за адсутнасці цесных міждысцыплінарных кантактаў гісторыкаў з прадстаўнікамі іншых навуковых спецыяльнасцяў нашай рэспублікі.

Мала месца ў сучаснай навуковай літаратуры аб міждысцыплінарных сувязях у навуковым пазнанні адводзіцца ўзаемасувязям гісторыі з эканамічнай тэорыяй, з іншымі эканамічнымі дысцыплінамі, і гэта адпавядае факту недастатковай інтэграцыі дадзеных галін ведаў. Бадай толькі эканаметрычная эканамічная гісторыя ўяўляе сабой прадукт узаемаўплыву і ўзаемадзеяння гісторыі і эканамічных дысцыплін. І хоць гэты накірунак колькаснай гісторыі часам крытыкуецца гісторыкамі за страту пэўнасці ў выніку атрымання дакладнасці, не падлягае сумненню, што даследаванні ў яго рамках дазваляюць атрымаць грунтоўныя веды пра гістарычныя з'явы, якія нельга атрымаць у традыцыйных гістарычных даследаваннях. Дарэчы, мы не бачым цяжкасцяў у класіфікацыі эканаметрычнай эканамічнай гісторыі, якія адзначаны ў літаратуры па метадалогіі гісторыі[11]. Яна — сумежная галіна даследаванняў.

Папрок у недастатковай інтэграцыі гісторыі з эканамічнымі дысцыплінамі (зразумела па той праблематыцы, па якой адпаведная інтэграцыя магчыма і мэтазгодна) у першую чаргу можа быць зроблены эканамістам, якія ў выніку існуючых традыцый, адсутнасці кааперацыі, інерцыі мыслення вучоных, што працавалі ў час адсутнасці тэндэнцый інтэнсіфікацыі інтэграцыі навукі, звычайна пазбягаюць гістарычнага аналізу. Удзяляючы недастатковую ўвагу аналізу мінулага, ігнаруючы даўтачасную гісторыю грамадства, эканамісты становяцца закладнікамі кароткачасовай гістарычнай перспектывы, абмяжоўваюць свае эўры-

стычныя магчымасці, і гэта іншы раз не спрыяе грунтоўным высновам. У якасці прыкладу эканамічных прац, у якіх вучоныя спасылаюцца толькі на сусветны вопыт і не ўлічваюць факты айчыннай гісторыі, што дапамаглі б усебаковаму разгляду навуковых пытанняў, прывядзём навуковы артыкул Е. Н. Кавейшы «Землеўладанне і землекарыстанне»[12]. Разглядаючы пытанне — які варыянт аграрнай будучыні выбраць беларусам, аўтар артыкула зусім не выкарыстоўвае гістарычныя дазеныя пра зямельныя рэформы, пра менталітэт беларусаў і г. д.

На нашую думку, не варта недаацэньваць практычную значнасць сацыяльнай функцыі гістарычнай навукі ў новым тысячагоддзі. Інтэграцыя гісторыі з іншымі навукамі будзе садзейнічаць іх узаемаўзбагачэнню, з'явіцца адным з фактараў пашырэння прыкладнога значэння гістарычных даследаванняў.

---

[1] Давыдов А. Н. Современные глобальные и региональные проблемы трансформаций и интеграций национальных научных и образовательных систем // Гуманитаризация науки и образования в переходный период. Монография. Мн., 2000. С. 27.

[2] Теоретико-методологические проблемы исторического познания. Материалы Международной научной конференции: В 2 т. / Под ред. В. Н. Сидорцова, В. С. Кошелева, Я. С. Яскевич. Мн., 2000. Т. 1, 2.

[3] Сидорцов В. Н. Методология исторического исследования (механизм творчества историка). Мн., 2000.

[4] Тош Д. Стремленне к истине. Как овладеть мастерством историка: Пер. с англ. М., 2000. С. 53—54.

[5] Сідарцоў У. Сучасныя метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 3.

[6] Ласлетт П. История и общественные науки // Философия и методология истории. Благовещенск. 2000. С. 203.

[7] Гл., напр.: Мизес Л. Теория и история: Интерпретация социально-экономической эволюции. М. 2001. С. 247—275.

[8] Гл.: Бродель Фернан. История и общественные науки. Историческая длительность // Философия и методология истории. Благовещенск. 2000. С. 141.

[9] Гринин Л. Е. Философия, социология и теория истории (опыт философско-социологического анализа некоторых общественных законов и построения теории всемирно-исторического процесса). Волгоград, 2000.

[10] Шутова О. М. Американская психоистория (1960—1990-е гг.). Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1997; Самохвалов Д. С. Исследование групповых процессов в психоистории. Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2000

[11] Ласлетт П. История и общественные науки // Философия и методология истории. С. 210—211.

[12] Кавейша Е. Н. Землевладение и землепользование // Белорусский экономический журнал. 2001. № 2.

VI. ХРОНІКА І ІНФАРМАЦЫЯ

Л. М. Лисова

Переезд НИАБ в новое здание. Год за годом: 1999

Более миллиона дел, 19 коллекций микрофильмов, около 40 тыс. экземпляров книг, газет, журналов, числящихся в научно-справочной библиотеке, было перевезено в здание по ул. Кропоткина, 55, коллективом Национального исторического архива Беларуси за 1996—2000 гг. При приближении конечной цели — завершения перемещения документов — все силы коллектива были сконцентрированы на ее достижение. Работа стала более ритмичной, целенаправленной, необходимой самим архивистам, постоянным пользователям архивных документов*.

На последнем этапе (его можно разделить на две части: 1999 г. — завершение перевозки дел, 2000 г. — перемещение научно-справочной библиотеки) нам пришлось преодолевать ряд организационных трудностей.

К началу погрузок 1999 г., проведя анализ состояния переезда в новое здание, руководство архива совместно с зав. отделом обеспечения сохранности документов и фондов А. А. Станкевич пришли к выводу о необходимости расстановки на стеллажи ранее складированных документов, даже если для этого потребуется перемещение из одной половины хранилища в другую еще невывезенных документов Национального архива Республики Беларусь (бывшего ЦГАОР БССР). Однако такой меры не потребовалось, так как по договоренности с директором НАРБ В. Д. Селеменевым был составлен уплотненный график. Если до обеда НАРБ вывозил документы, то после обеда сотрудники нашего архива расставляли дела на освободившиеся стеллажи**.

С установлением определенной системы погрузочно-разгрузочных работ (очередность отделов при погрузках на ул. Козлова и разгрузках на ул. Кропоткина; распределение людей на первом этаже, в одном из хранилищ с четвертого по восьмой этаж; мужчин пониже — на машину, остальных — у лифта и стеллажей) коллектив работал слаженно. Если возникали трудности или кого-то подводило здоровье — выход находи-

---

* См. приложение № 1.

** См. приложение № 2.

ли оперативно, действовала система взаимовыручки. И здесь как нельзя лучше проявилось лидерство зав. отделами: С. Ф. Адамович, Г. Е. Акулович, А. Ф. Александровой, А. А. Станкевич, Т. С. Михеенок. Они умело расставляли в цепочку своих сотрудников, своевременно определяли количество выбывающих на сессию, предвидели возможности тех, кто выходил на погрузку после перенесенных травм или имел противопоказания к тяжелым нагрузкам.

Как всегда больше всех был загружен отдел обеспечения сохранности документов и фондов (А. А. Станкевич, Г. Н. Кутукова, С. Я. Трацевская, Г. В. Барсукова, О. И. Акула, Т. В. Елисеева, С. Н. Хлябич, Н. Н. Корнеева и др.). Завершив погрузку, сотрудники отдела шли в хранилища, определяли: какие документы и куда перевозить завтра, чтобы не нарушить сложившуюся систему размещения дел, как установить на нужную высоту полки стеллажей или как передвинуть стеллажи, чтобы вместить нестандартные документы*. По очереди в отделе назначали дежурных сотрудников для подготовки документов исследователям, так как работа читального зала не прерывалась.

Решались проблемы и иного плана. В условиях кризиса снабжения горюче-смазочными материалами руководство автобазы № 4 шло навстречу архивистам, выделяя бензин для наших рейсов. График погрузок выдерживался строго. Поэтому небезынтересна еще одна деталь в обеспечении транспортом. В один из запланированных для перевозки дней автобаза подала вместо обычной крытой грузовой машины большую «фуру». Водитель не мог начать маневры для въезда во двор архива, поскольку по ул. Козлова шел ремонт трамвайного пути. И тогда мы решились на переговоры с сержантом и бригадой солдат, ремонтирующих путь. Они перекрыли движение, и машина все же стала в этот день на погрузку документов, висевшую «на волоске».

Загрузить машину нужно было так, чтобы документы не «разъехались» в дороге, чтобы полностью был использован объем кузова, а особенно, чтобы не потерялись в дороге связки. За четыре года переезда один такой случай был, при этом сопровождавшая машину С. Ф. Адамович отметила внимательность водителя машины, следовавшего за нашим грузовиком. Он знаками и сигналами остановил водителя грузовика и указал на место падения связки. Документы были найдены и доставлены по назначению.

В сентябре — начале октября 1999 г. был сделан последний рывок в перемещении дел. Событием стала перевозка нашего «заветно-

* См. приложение № 3.

го сундучка» — это деревянный ящик, в котором архив хранит уникальные пергаментные грамоты. Заранее продумывали его сопровождение, по телефону сообщили об отправке машины, а по приезду этот уникальный груз был доставлен в хранилище и восстановлен на место под руководством А. А. Станкевич.

И вот последняя машина. Как всегда ждем ее прибытия, выстраиваем цепочку. Постепенно разгрузка доходит до середины кузова (это где-то минут 20), затем вытягиваем головы: много ли еще? Вот уже видно окошко на переднем борте, дошли до нижнего ряда. Начинаем отсчет: 10, 9, 8 ... последняя коробка с документами! Отмечаем, что последняя — розовая, красивая.

Ну вот и все. Спасибо всем за работу![*]

Но последнюю точку предстояло поставить в 2000 г., т. е. перевезти библиотеку.

Приложение 1

Из выступления зав. читальным залом И. Л. Новиковой на собрании коллектива архива 25.01.1999 г. (протокол № 1)

Хочу выразить благодарность сотрудникам отдела обеспечения сохранности документов и фондов за обеспечение работы посетителей читального зала. Нужно ускорить переезд архива, чтобы быстрее доставить оставшиеся на ул. Козлова фонды, так как их отсутствие часто создает трудности в работе.

Приложение 2

Из выступления зав. отделом обеспечения сохранности документов и фондов А. А. Станкевич на заседании дирекции архива от 14.07.1999 г. (протокол № 6)

В первом полугодии было продолжено перемещение документов, но хранилище на Козлова полностью освободить не смогли, так как отсутствовали площади здесь на Кропоткина, 55. Необходимо расставить документы, которые были привезены и расположены бессистемно из-за отсутствия свободных стеллажей. В августе—сентябре 1999 г. нужно завершить перемещение документов.

В этом здании по Кропоткина, 55, мы уже четыре года, поэтому необходимо провести микологическое и энтомологическое обследо-

[*] См. приложение № 4.

вания. Требуется проверка гигрометров в метеорологической службе. Из-за большой загруженности сотрудников по выдаче дел, в полной мере не ведется работа по обеспечению сохранности документов (проверка наличия), перекартонирование.

Приложение 3

**Из справки комиссии Госкомархива,
проводившей комплексную проверку
Национального исторического архива Беларуси
с 11.10.1999 по 15.10.1999 г.**

Состояние работы по обеспечению сохранности документов

НИАБ является одним из крупнейших архивохранилищ республики. В его деятельности проблемы обеспечения сохранности документов всегда занимали ведущее место. Большую роль в решении сложного комплекса проблем сохранности документов сыграло перемещение фондов архива в специализированное здание по ул. Кропоткина, 55, согласно решению коллегии Госкомархива от 14.03.1996 «Об улучшении размещения документов, оборудования и сотрудников некоторых госархивов и архивных учреждений г. Минска». Процесс перемещения документов находился под контролем Госкомархива и еще дважды рассматривался на заседаниях коллегии (26.09.1996 и 26.03.1997). На момент проверки архива все документы перевезены в новое здание, кроме части научно-справочной библиотеки.

Документы размещены в пяти хранилищах рационально, в соответствии с планом-схемой:

1-е хранилище — документы учреждений Витебской и Могилевской губерний;

2-е — документы учреждений Минской губернии;

3-е — древние акты;

4-е — документы учреждений религиозного культа;

5-е — документы малоиспользуемых фондов (в основном судебных учреждений).

В целях сохранения ценного исторического наследия архив уделяет много внимания мероприятиям, направленным на поддержание оптимальных режимов хранения, ослабляющих разрушающее влияние среды на документы и способствующих их длительной сохранности.

Архив оборудован системами охранной и пожарной сигнализации, проводится плановое техническое обслуживание этих систем и электрооборудования.

Документы расположены на металлических стеллажах, хранятся в разной упаковке, коробках, связках, без упаковок (древние акты, крупноформатные журналы, карты). Для рационального размещения дел на стеллажах используется возможность изменения высоты между полками стеллажных модулей.

Объем закартонированных дел составляет 85%. В архиве имеется определенный резерв площади для возможного комплектования.

Световой режим в архивохранилищах обеспечивает необходимые условия для организации работы с документами. Помещения архивохранилищ содержатся в чистоте, для проведения санитарно-гигиенических работ предусмотрены санитарные дни.

В хранилищах осуществляется контроль за температурно-влажностным режимом, так как отклонения от оптимальных показателей температуры и влажности оказывают резко отрицательное воздействие на сохранность носителей…

В целях закрепления места хранения и поиска документов составлены постеллажные топографические указатели во всех хранилищах. Следует отметить, что эти данные вносились сразу в компьютер. Пофондовый топографический указатель (компьютерная версия) будет составлен на их базе, что значительно сократит затраты времени на его создание.

Приложение 4

Из отчета о работе
Национального исторического архива Беларуси за 1999 г.

В течение года архив продолжал перемещение документов, использовав бюджет рабочего времени — 1020 р. дн. Завершено перемещение документов из здания по ул. Козлова, 26. Документы размещены в пяти хранилищах в здании по ул. Кропоткина, 55. При этом учитывались рациональность размещения документов и интенсивность их использования. В то же время существенно не нарушено сложившееся традиционно деление документов на комплексы.

ЗМЕСТ

Уступ **3**

А. К. Голубович. Национальному историческому архиву Беларуси — 65 лет 5

І. Гісторыя **8**

Г. М. Брэгер. З гісторыі маёнтка Дамашкавічы 8
И. Л. Вернер. Неизвестные факты биографии И. А. Гошкевича 29
А. Л. Грывянёў. Царква Святой Марыі Магдаліны на Старажоўскіх могілках у Мінску (з пачатку XIX ст. да нашых дзён) 32
В. В. Губина. Конфессии Северо-Западного края Российской империи в литературе XIX в. 38
В. Н. Денисов. Минская усадьба Ваньковичей 49
А. А. Лашкевіч. Аб дзейнасці следчых камісій па справах аб паўстанні 1863—1864 гг. у Мінскай губерні паводле архіўных крыніц НГАБ 54
А. А. Лашкевіч. Барацьба мясцовых уладаў з паўстанцкім рухам 1863—1864 гг. у Мінскай губерні (па матэрыялах фондаў «Вайскова-павятовыя начальнікі 60-х гадоў XIX ст.») 59
С. А. Рыбчонак. Насельнікі Нясвіжскага замка ў сярэдзіне XIX ст. . 71
Т. И. Седляревич. С именем женщины-ученой связано 74
Зм. Л. Яцкевіч. Радавод Адама Ганорыя Кіркора ў святле новых архіўных дакументаў 77

ІІ. Публікацыі архіўных дакументаў **83**

В. У. Бабкова. Тры дакументы пра Зафею Слуцкую 83
В. У. Бабкова. Новы факт да біяграфіі Паўлюка Багрыма 92
А. К. Голубович. Рукописные документы Национального исторического архива Беларуси 93
У. М. Дзянісаў. Новыя дакументы да біяграфіі і радаводу Марка Шагала 96
А. А. Радаман. Элекцыйныя лісты як крыніца вывучэння дзейнасці соймікаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага другой паловы XVI — пачатку XVII ст. 99

А. А. Радаман. Справа аб парушэнні ваўкавыскім старостай Крыштафам Манвідам Дарагастайскім парадку ўступлення на пасаду і прынцыпаў прызначэння ўраднікаў гродскага суда і яе адлюстраванне ў дакументах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі 104
С. А. Рыбчонак. Разрабаванне Нясвіжскага замка ў 1812 годзе..... 114

III. Крыніцазнаўства 124

Р. С. Жаўняркевіч. Сфрагістыка рыма-каталіцкіх парафій былога Ігуменскага павета (XVIII—пачатак XX ст.)..... 124
А. А. Лашкевіч. Актавыя кнігі гродскіх і магістрацкіх судоў як гістарычная крыніца..... 132
У. М. Свяжынскі. Лацінскія і грэчаскія элементы ў старабеларускім кірылічным пісьме 136

IV. Архівазнаўства..... 152

А. І. Дзярновіч. Кёнігсбергскі таемны архіў: Фармаванне калекцый, публікацыі дакументаў і важнасць архіва для вывучэння гісторыі Беларусі..... 152

V. Крытыка і бібліяграфія..... 170

А. І. Дзярновіч. «METRICIANA» — спецыялізаванае выданне, прысвечанае Метрыцы ВКЛ..... 170
У. М. Свяжынскі. Radvanas Jonas. Radviliada. Parengė, įvadą, komentarus ir asmenų žodinėlį parašė, vertė iš lotinų į lietuvių kalbą Sigitas Narbutas. Bibliotheca Baltica. Vilnius, «Vaga», 1997 (Радванас Ёнас. Радзівіліяда. Падрыхтаваў, уводзіны, каментары і імянны слоўнічак напісаў, пераклаў з лацінскай на літоўскую мову Сігітас Нарбутас. Бібліятэка «Балтыка». Вільнюс, «Вага», 1997)..... 172
У. В. Фядосаў. Да пытання аб практычным значэнні сацыяльных функцый гістарычнай навукі..... 183

VI. Хроніка і інфармацыя..... 190

Л. М. Лисова. Переезд НИАБ в новое здание. Год за годом: 1999 .. 190

Навуковае выданне

Серыя: гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства

АРХІВАРЫУС

Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў

Выходзіць з 2001 года

Выпуск 2

Рэдактар *Н. М. Дзятчык*
Мастак *А. У. Леўчык*
Карэктар *З. Я. Губашына*
Камп'ютэрная вёрстка *П. А. Рэзванава*

ISBN 985-6733-06-5

Падпісана да друку 19.06.2004. Фармат 60×84 1/16. Гарнітура Times.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,25. Ул.-выд. арк. 9,0.
Тыраж 100 экз. Заказ № 86.

Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС). Ліцэнзія ЛІ № 02330/0133094 ад 30.04.2004.
220002, г. Мінск, вул. Крапоткіна, 55.